# Кароткі эканамічны слоўнік

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАНАМІЧНЫ
УНІВЕРСІТЭТ

# КАРОТКІ ЭКАНАМІЧНЫ СЛОЎНІК

Пад рэдакцыяй доктара эканамічных навук
прафесара М. І. Платніцкага

Мінск
1993

ББК 65.01я2
К 25

Рэцэнзент кандыдат філалагічных навук
В.К.Шчэрбін

Аўтарскі калектыў: Я.А.Александровіч, В.В.Асмалоўскі, І.В.Балдзін, Ф.В.Баравік, А.І.Бязлюдаў, Р.П.Валевіч, С.С.Васкоўскі, Т.І.Вуколава, А.С.Галавачоў, А.Г.Зав'ялкаў, Г.З.Захараў, Я.Г.Зонтаў, Г.Я.Кажэкін, Л.І.Карпенка, Г.І.Краўцова, С.Ю.Крычэўскі, М.С.Куняўскі, М.А.Лісіцын, Л.А.Лобан, В.К.Мацюшэўская, І.У.Мірачыцкая, Л.М.Міхневіч, Г.К.Мультан, М.М.Новікаў, М.І.Платніцкі, М.Г.Проніна, М.І.Савіцкі, Н.А.Самара, Г.Р.Санько, Т.У.Сарокіна, Л.М.Сініца, В.І.Стражаў, Н.М.Сухарава, М.І.Ткачук, М.К.Фісенка, А.К.Хамякоў, Я.А.Язвінская

Кароткі эканамічны слоўнік/Я.А.Александровіч,
К25 В.В.Асмалоўскі, І.В.Балдзін і інш.; Пад рэд.М.І.Плат - ніцкага.—Мн.:БДЭУ,1992. — 256 с.
ISBN №5-7830-0339-5.

Краткий экономический словарь

"Кароткі эканамічны слоўнік" упершыню выдаецца на беларускай мове. Ён уключае сучаснае тлумачэнне звыш 300 найбольш часта ўжывальных, а таксама новых тэрмінаў і эканамічных катэгорый. Выкарыстанне слоўніка будзе садзейнічаць пашырэнню сферы дзейнасці беларускай мовы і выкарыстанню яе ў грамадска-палітычным і гаспадарчым жыцці.

Для выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў, а таксама ўсіх, хто вывучае эканоміку.

К $\frac{0601000000--000}{}$ 92 ББК 65.01я2

ISBN 5-7830-0339-5

© Аўтарскі калектыў, 1992

## Ад аўтараў

"Кароткі эканамічны слоўнік" -- выданне, у пэўным сэнсе не падобнае на іншыя эканамічныя слоўнікі. З аднаго боку, ён прызначаны для шырокага азнаямлення чытачоў з сучасным тлумачэннем актуальных эканамічных катэгорый і паняццяў, а з другога - ён мае мэтанакіраванае вучэбна-метадычнае прызначэнне: дапамагчы дасягнуць адназначнага разумення сучасных працэсаў ў сацыяльна-эканамічнай галіне з пункту гледжання як палітычнай эканоміі, так і іншых эканамічных і грамадскіх навук.

Не менш істотную ролю слоўнік адыграе ва ўстанаўленні і службовым выкарыстанні двухмоўя ў сферы гаспадарчай дзейнасці, у замацаванні беларускай мовы ў якасці дзяржаўнай.

Для зручнасці ў карыстанні ў канцы пададзены руска-беларускі слоўнік паняццяў і тэрмінаў, змешчаных у слоўніку.

Пры падрыхтоўцы слоўніка аўтары карысталіся такімі выданнямі, як "Русско-белорусский словарь" у двух тамах (Мінск: Выдавецтва Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1982), "Беларуска-рускі слоўнік" (Мінск: Выдавецтва Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1988. Выданне 2-е, перапрацаванае і дапоўненае), "Краткий экономический словарь" (М.: Политиздат, 1987), "Краткий словарь по социологии" (М.: Политиздат, 1988) і інш.

Слоўнік распрацаваны калектывамі эканамічных кафедраў і кафедры правазнаўства Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта.

**А**

**АБАГУЛЕННЕ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Обобществление производства) -- сістэма адносін, якія выражаюць грамадскі характар вытворчасці і працы на аснове зліцця асобных працэсаў вытворчасці ў розных галінах народнай гаспадаркі ў адзіны грамадскі працэс. Ступень А.в. залежыць ад узроўню і тэмпаў развіцця прадукцыйных сіл: тэхнічных умоў вытворчасці, ступені падзелу працы

і спецыялізацыі. У сучасны момант ствараюцца раўнапраўныя ўмовы для развіцця і свабоднага спаборніцтва ўсіх форм уласнасці: агульнадзяржаўнай, мясцовай (камунальнай), кааператыўнай, заснаванай на арэндзе і паявых падатках (акцыянерная форма), на індывідуальнай працоўнай дзейнасці, а таксама розных змешаных форм, што выключае адчужэнне работнікаў ад родаў вытворчасці.

З ускладненнем сістэмы грамадскага падзелу працы, паглыбленнем спецыялізацыі пашыраюцца формы кааперацыі працы, становяцца больш цеснымі сувязі паміж прадпрыемствамі, фарміруюцца прамысловыя і аграпрамысловыя комплексы, канцэрны, міжгаліновыя аб'яднанні, саюзы і іншыя асацыяцыі. Такім чынам, А.в. стварае перадумовы для развіцця ініцыятывы і самастойнасці прадпрыемстваў, паслядоўнага іх пераходу на поўны гаспадарчы разлік, развіцця падраду, арэнды, акцыянерных таварыстваў. Роля цэнтра кіравання пры гэтым заключаецца ў стварэнні эканамічных і прававых умоў для эфектыўнай гаспадарчай дзейнасці на ўсіх узроўнях, развіцця інфраструктуры, правядзення навукова-тэхнічнай, фінансавай і падатковай палітыкі, забеспячэння абароненасці грамадзян. Вышэйшай праявай росту А.в. з'яўляецца эканамічная інтэграцыя некалькіх краін, якая ахоплівае шырокае кола ўзаемных сувязей ад непасрэднай кааперацыі да міжнароднай каардынацыі развіцця вытворчасці.

А.в. на справе азначае рэальны кантроль і рэгуляванне вытворчасці з удзелам працоўных, наладжванне новай сістэмы гаспадарання, стварэнне яе трывалай матэрыяльнай асновы. Усе гэта мае на ўвазе карэнную структурную перабудову эканомікі, паглыбленне грамадскага падзелу працы і павышэнне ступені канцэнтрацыі вытворчасці, фарміраванне сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базы, адпаведнай сістэмы новых арганізацыйна-эканамічных адносін.

**АБАРОТНЫЯ СРОДКІ** (Оборотные средства) -- грашовыя сродкі, прызначаныя для ўтварэння абаротных вытворчых фондаў і фондаў абарачэння. Першая частка А.с. дзейнічае ў сферы вытворчасці і набывае

форму вытворчых запасаў, незавершанай вытворчасці і расходаў будучых перыядаў, другая -- абслугоўвае сферу абарачэння і набывае форму гатовых вырабаў, грашовых сродкаў і сродкаў у разліках.

Па спосабу планавання патрэб А.с. падзяляюцца на нарміруемыя і ненарміруемыя. Нарміруемыя А.с. прызначаны для ўтварэння запасаў абаротных сродкаў і гатовай прадукцыі на складзе, ненарміруемыя -- абслугоўваюць сферу абарачэння (акрамя запасаў гатовай прадукцыі на складзе). Па крыніцах фарміравання А.с. падзяляюцца на ўласныя, пазычаныя і прыцягнутыя. Уласныя А.с. знаходзяцца ў пастаянным карыстанні прадпрыемстваў (аб'яднанняў) і забяспечваюць мінімальныя патрэбы ў грашовых сродках на вытворча-гаспадарчую дзейнасць у межах планавага аб'ёму работ. Пазыковыя А.с. ствараюцца для забеспячэння часовых патрэб прадпрыемства. Асноўнай крыніцай фарміравання першых з'яўляецца даход (прыбытак), другіх - кароткатэрміновыя крэдыты банка. Прыцягнутыя А.с. уяўляюць сабой крэдыторскую запазычанасць пастаўшчыкам, запазычанасць па заработнай плаце, а таксама розныя мэтавыя фонды прадпрыемстваў,якія не выкарыстоўваюцца.

А.с. знаходзяцца ў пастаянным абарачэнні і прымаюць то таварную, то грашовую форму. Працэс руху А.с., які перыядычна паўтараецца, называецца абарачальнасцю А.с. Эфектыўнасць выкарыстання А.с. характарызуецца колькасцю абаротаў (каэфіцыентам абарачэння ) і працягласцю аднаго абароту ( хуткасцю абароту ). Колькасць абаротаў вызначаецца па формуле $К_а = РП : А_{аср}$, дзе РП - аб'ём рэалізаванай прадукцыі па сабекошту за дадзены перыяд; $А_{аср}$ - сума сярэдняга астатку А.с. за гэты ж перыяд. Хуткасць аба- роту ў днях вызначаецца па формуле $Д_а = Д : К_а$, дзе Д - колькасць дзён у перыядзе (месяц -- 30, квартал -- 90, год -- 360). Паскарэнне абарачальнасці А.с. забяспечвае магчымасць выканаць зададзены аб'ём вытворчасці з меншымі затратамі, а вызваленыя сродкі выкарыстаць на іншыя мэты.

**АБАРОТНЫЯ ФОНДЫ** (Оборотные фонды) -- ча-

стка вытворчых фондаў прадпрыемства, якая цалкам спажываецца ў кожным вытворчым цыкле і цалкам пераносіць сваю вартасць на гатовую прадукцыю, відазмяняючы пры гэтым сваю натуральна-рэчыўную форму. Матэрыяльна-рэчыўную аснову А.ф. складаюць прадметы працы.

Па ўдзелу ў працэсе вытворчасці А.ф. падзяляюцца на вытворчыя запасы, незавершаную вытворчасць і расходы будучых перыядаў. Улічваюцца і плануюцца А.ф. у днях, натуральным і вартасным выражэнні. Нарматыў вытворчых запасаў у днях уключае ў сябе: час знаходжання сыравіны і матэрыялаў у дарозе (транспартны запас); час, неабходны для прыёмкі і аналізу якасці сыравіны і матэрыялаў, што паступаюць (падрыхтоўчы запас); час, неабходны для папярэдняй апрацоўкі сыравіны і матэрыялаў перад запускам іх у вытворчасць (тэхналагічны запас); час знаходжання матэрыяльных рэсурсаў на складзе спажыўца (бягучы запас); час, неабходны для дастаўкі сыравіны і матэрыялаў у выпадку перабою ў забеспячэнні (страхавы запас). Нарматывы вытворчых запасаў у натуральным і вартасным выражэнні вызначаюцца па кожнаму віду матэрыяльных рэсурсаў па наступных формулах: $Н_н = Н_д + Р_а$; $Н_в = Н_д + Р_а + Ц$, дзе $Н_н$, $Н_в$ -- нарматывы запасаў адпаведна ў натуральным і вартасным выражэнні; $Н_д$ -- нарматыў запасаў у днях; $Р_а$ -- аднадзённы расход матэрыялаў; Ц -- цана адзінкі матэрыялаў. Нарматыў А.ф. у незавершанай вытворчасці вызначаецца па формуле $Н_{н.в} = В_д + П + К_г$, дзе $В_д$ -- аднадзённы выпуск прадукцыі па сабекошту; П -- працягласць вытворчага цыкла ў днях; $К_г$ -- каэфіцыент нарастання затрат. Пры раўнамерным нарастанні затрат $К_г = (В_а + 0{,}5\ В_н) : (В_а + В_н)$, дзе $В_а$, $В_н$ -- адпаведна адначасовыя і наступныя затраты. Пры нераўнамерным нарастанні затрат

$$К_г = \left[\sum_{i=1}^{n} C_i\,(П - m)\right] : (C \cdot П),$$

дзе $C_i$ -- сабекошт незавершанай вытворчасці ў i-ты дзень вытворчага цыкла; П -- колькасць дзён у вытворчым цыкле; m -- колькасць дзён ад запуску да i-га дня вытворчага цыкла; i -- пара-

дкавы дзень вытворчага цыкла; С -- поўны сабекошт вырабу. Зніжэнне каэфіцыента нарастання затрат дасягаецца шляхам удасканалення нарміравання, зніжэння і страт, выкарыстання паўторных матэрыяльных рэсурсаў, скарачэння працягласці вытворчага цыкла.

**АБЛІГАЦЫІ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПАЗЫК** (Облигации государственных займов) - каштоўныя паперы на прад'яўніка. Яны выступаюць як даўгавое абавязацельства дзяржавы, па якому яна абавязуецца ў загадзя ўстаноўленыя тэрміны пагасіць (выкупіць) аблігацыю, а таксама выплаціць пэўны даход. Выпуск А.дз.п. уяўляе сабой адзін з метадаў планамернай мабілізацыі рэсурсаў насельніцтва ў дзяржаўны бюджэт на патрэбы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

**АБМЕН** (Обмен) -- узаемны абмен дзейнасцю паміж людзьмі, які праяўляецца непасрэдна ці ў форме абмену прадуктамі і паслугамі, як правіла, на эквівалентнай аснове. А.-- адна з самастойных стадый грамадскага ўзнаўлення, якая злучае вытворчасць і абумоўленае ёю размеркаванне, з аднаго боку, і спажыванне -- з другога. Ён уласцівы любой гістарычнай стадыі развіцця чалавецтва, з'яўляецца сродкам грамадскай сувязі, у якой адлюстроўваецца супрацоўніцтва людзей. Вытворчасць вызначыла неабходнасць А., а апошні актыўна уздзейнічае на вытворчасць. У аснове развіцця А. ляжыць грамадскі падзел працы. Ужо першы грамадскі падзел працы паміж земляробствам і жывёлагадоўляй, а затым адасабленне ад іх рамесніцтва зрабілі А. неабходным і рэгулярным, і ён прыняў форму тавараабмену. Узнік гандаль, з'явіліся тавары і грошы, рынак.

**АБНАЎЛЕННЕ АСНОЎНЫХ ФОНДАЎ** (Обновление основных фондов) - адзін з важнейшых напрамкаў сучаснай інвестыцыйнай палітыкі, які прадугледжвае замену тэхнікі, якая выкарыстоўваецца, больш дасканалай, высокапрадукцыйнай. Адрозніваюць некалькі форм А.а.ф. Магчыма простая замена фізічна зношанага парку абсталявання такім жа па канструкцыі, але новым. Пры другой форме абнаўлення да дзеючага абсталявання дабаўляецца такое ж або новае абсталяванне, павялічваецца "поле вытворчасці". Прыведзеныя фор-

мы па характару і выніках (яны, як правіла, не павялічваюць прадукцыйнасці) адносяцца да экстэнсіўнага абнаўлення. Перавагу мае такая форма абнаўлення, пры якой дзеючае абсталяванне замяняецца новым, больш дасканалым, высокаэфектыўным з эканамічнага і сацыяльнага пунктаў гледжання. У сучасных умовах пераважнае значэнне мае ўкараненне аўтаматычнага абсталявання з лічбавым праграмным кіраваннем, робатаў, апрацоўчых цэнтраў, аўтаматызаваных сістэм, мікрапрацэсарных сродкаў рэгулявання, устройстваў праграмнага кіравання і інш.

Паколькі А.а.ф. ідзе вельмі марудна, не выконваюцца заданні па замене актыўнай часткі асноўных фондаў з-за адсутнасці высокапрадукцыйнага абсталявання, яно застаецца адной з асноўных праблем сучаснай перабудовы, накіраванай на стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы вытворчасці і ўсёй сацыяльнай сферы.

**АГРАРНА-ПРАМЫСЛОВАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ** (Аграрно-промышленная интеграция) - арганічнае аб'яднанне і ўзаемадзеянне сельскай гаспадаркі і галін прамысловасці, узаемна звязаных з ёю. Неабходнасць у аграпрамысловай інтэграцыі ўзнікае ў выніку дзейнасці аб'ектыўнага закону грамадскага падзелу працы, паглыблення спецыялізацыі вытворчасці, узроўню яе канцэнтрацыі, развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу. Усё гэта вядзе да глыбокіх якасных змен у развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі і іншых звязаных з ёю галін, значнага пашырэння гэтых сувязей і ўскладнення ўзаемаадносін паміж галінамі. Так, у сучасны момант сельская гаспадарка ўзаемадзейнічае больш як з 90 галінамі народнай гаспадаркі. У такіх умовах вельмі важна забяспечыць цесную сувязь гэтых галін і знайсці такія формы арганізацыі вытворчасці, якія б адпавядалі сучаснаму ўзроўню прадукцыйных сіл сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Такімі формамі на сучасным этапе грамадскага развіцця з'яўляюцца аграпрамысловыя прадпрыемствы (АПП), аграпрамысловыя аб'яднанні (АПА), аграфірмы (АФ), вытворчыя і навукова-вытворчыя сістэмы (ВС, НВС), аграпрамысловыя камбінаты (АПК).

Дзякуючы аграпрамысловай інтэграцыі, лепш выкарыстоўваюцца сродкі вытворчасці, рабочая сіла, расце кваліфікацыя работнікаў, забяспечваецца больш поўная іх занятасць, мяняецца характар працы. Такім чынам, аграпрамысловая інтэграцыя вядзе да атрымання высокіх канчатковых вытворчых вынікаў.

**АГРАРНА-ПРАМЫСЛОВЫ КОМПЛЕКС** (Аграрно-промышленный комплекс) -- сукупнасць галін народнай гаспадаркі, звязаных паміж сабой эканамічнымі адносінамі па лініі вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання сельскагаспадарчай прадукцыі. Галоўнай задачай АПК з'яўляецца забеспячэнне краіны прадуктамі харчавання і сельскагаспадарчай сыравінай.

У склад АПК уваходзяць: 1) галіны прамысловасці, якія пастаўляюць сельскай гаспадарцы, харчовай прамысловасці, гандлю і грамадскаму харчаванню неабходную тэхніку, абсталяванне, будаўнічыя матэрыялы, мінеральныя рэчывы, іншыя сродкі вытворчасці; 2) непасрэдна сельская гаспадарка; 3) галіны, якія займаюцца перапрацоўкай і вытворчасцю канчатковай прадукцыі, яе продажам галоўным чынам для асабістага спажывання (мясная, малочная, харчовая, мукамольна-крупяная і іншыя галіны перапрацоўчай прамысловасці); 4) галіны, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку і звязаныя з ёю галіны прамысловасці (сістэма нарыхтовак, транспарт, сувязь, вытворчае абслугоўванне, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, навука, навучальныя ўстановы і інш.).

АПК займае ў эканоміцы краіны вядучае месца. Тут працуюць каля 42% ад усіх занятых у народнай гаспадарцы, сканцэнтравана амаль 37% асноўных вытворчых фондаў, сюды накіроўваецца трэцяя частка ўсіх капіталаўкладанняў і столькі ж атрымліваецца валавай прадукцыі.

Важнейшая задача новай аграрнай палітыкі заключаецца ў тым, каб удасканаліць эканамічныя адносіны на вёсцы, перабудаваць кіраванне АПК на дэмакратычных прынцыпах, развіць новыя формы гаспадарання, укараніць гаспадарчы разлік і стварыць умовы для далейшага пад'ёму сельскай гаспадаркі.

**АГРАРНАЯ ПАЛІТЫКА** (Аграрная политика) - гэта састаўная частка агульнага палітычнага курсу краіны, накіраваная на вырашэнне пытанняў аб шляхах развіцця сельскай гаспадаркі і іншых галін аграпрамысловага комплексу, аб уласнасці на зямлю і іншыя сродкі вытворчасці ў сельскай гаспадарцы, аб сацыяльна-класавых адносінах на вёсцы.

Сучасная аграрная палітыка будуецца з улікам асаблівасцей гістарычнага развіцця нашага грамадства. Яе канцэпцыя прадугледжвае, што аграрная палітыка павінна быць накіравана на стварэнне такіх вытворчых адносін, такіх форм гаспадарання, якія б забяспечылі селяніну цвёрдае становішча гаспадара зямлі.

Галоўныя напрамкі новай аграрнай палітыкі - рашучы пераход да развіцця аграпрамысловай вытворчасці на аснове шматлікіх форм валодання і карыстання ўласнасцю да ўтварэння аднолькавых эканамічных умоў для ўсіх відаў гаспадарання (калгасы, саўгасы, перапрацоўчыя і іншыя прадпрыемствы, арандатары, кааператывы, арэндныя калектывы, сялянскія гаспадаркі и г.д.); асваенне новага механізму гаспадарання; атрыманне поўнай самастойнасці асноўнага звяна сельскай гаспадаркі ў пытаннях арганізацыі вытворчасці, выкарыстання паводле свайго меркавання атрыманай прадукцыі і гаспадарча-разліковага даходу; пераход на новыя прынцыпы закупак прадукцыі, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы аграпрамысловага комплексу, яе глыбокае тэхнічнае пераўтварэнне пры актыўным удзеле ўсіх галін народнай гаспадаркі; перабудова арганізацыйнай структуры кіравання аграпрамысловай вытворчасцю, далейшая дэмакратызацыя вытворчых адносін і пашырэнне самакіравання; паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу і першачарговае развіццё перапрацоўчых галін прамысловасці; ажыццяўленне праграмы сацыяльнай перабудовы вёскі з улікам комплекснага развіцця эканомікі рэгіёнаў.

**АГРАРНЫЯ АДНОСІНЫ** (Аграрные отношения) -- частка вытворчых адносін, звязаных з сельскай гаспадаркай. А.а. вызначаюцца тым, хто і як валодае і карыстаецца зямлёй -- галоўным сродкам вытворчасці

ў сельскай гаспадарцы. Уладальнік зямлі можа карыстацца ёю, а можа перадаваць яе ў карыстанне іншым асобам.

У нашай краіне доўгі час адзіным, выключным уладальнікам зямлі з'яўлялася дзяржава. Калгасы, саўгасы, прамысловыя прадпрыемствы, установы, кааператывы маглі валодаць зямлёй толькі тады, калі дзяржава дазволіць ім атрымаць правы на валоданне ёю. У 80-я гады атрымалі распаўсюджанне новыя формы валодання зямлёй -- каротка- (да 5 гадоў) і доўгатэрміновая (з правам перадачы ў спадчыну) арэнда, а таксама стварэнне сялянскіх гаспадарак. Для эканамічнага развіцця нашай краіны вялікае значэнне мае ўдасканаленне эканамічнага механізма гаспадарання на зямлі, паляпшэнне практыкі арганізацыі вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі. Пашыраюцца правы гаспадарак у самастойным развіцці вытворчасці. Іх абавязкі перад дзяржавай па продажу сельскагаспадарчай прадукцыі адлюстроўваюцца ў дагаворах з нарыхтоўчымі арганізацыямі.

**АДНАРАЗОВЫЯ ВЫДАТКІ** (Единовременные затраты) - авансаваныя грамадствам (працоўным калектывам) сродкі на стварэнне асноўных і прырост абаротных фондаў, а таксама выдаткі на навукова-даследчыя, праектна-канструктарскія распрацоўкі і асваенне новай тэхнікі. Выступаюць у форме капітальных укладанняў. Уключаюць выдаткі на будаўніча-мантажныя работы, стварэнне (набыццё) машын, абсталявання, інструменту, інвентару, выкананне праектна-пошукавых, геолагаразведачных работ, падрыхтоўку кадраў і інш. Фінансуюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту, уласных сродкаў прадпрыемстваў (фонду развіцця вытворчасці, навукі і тэхнікі) і крэдытаў банка. А.в. матэрыялізуюцца ў назапашаных рэсурсах. Яны ўключаюць у сябе: асноўныя вытворчыя фонды ў выглядзе дзеючых і рэзервовых сродкаў працы, абаротныя фонды ў выглядзе запасаў сыравіны, матэрыялаў і паліва, незавершанага будаўніцтва вытворчых аб'ектаў, затраты на асваенне новай прадукцыі і дзяржаўныя матэрыяльна-тэхнічныя рэзервы. Да ўводу ў дзеянне вытворчых магутнасцей і

аб'ектаў А.в. на працяглы тэрмін выключаюцца з народнагаспадарчага абароту і амярцвяюцца ў незавершаным будаўніцтве. Таму важнейшай задачай з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці выкарыстання А.в. Скарачэнне іх дазваляе вызваліць вялікія сумы капітальных укладанняў і зменшыць долю фонду накаплення ў нацыянальным даходзе. Дасягаецца гэта на аснове скарачэння тэрмінаў будаўніцтва і асваення вытворчых магутнасцей, разнастайнай індустрыялізацыі будаўнічай вытворчасці і ўкаранення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, асваення новых форм арганізацыі працы і павышэння якасці будаўніча-мантажных работ, пераводу будаўнічых, праектных і канструктарскіх арганізацый на поўны гаспадарчы разлік і інш.

**АКЦЫЗ** (Акциз) - від ускоснага падатку на прадукты шырокага ўжытку шляхам павышэння цэн.

Аб'ектам абкладання з'яўляецца выручка тавара-вытворцаў, якая атрымана ад рэалізацыі выробленай прадукцыі. Пры гэтым пад рэалізацыяй разумеюцца не толькі продаж, але і абмен, бязвыплатная перадача тавараў, выкарыстанне іх на ўласныя патрэбы.

Стаўкі акцызаў устанаўліваюцца ў працэнтах да выручкі. Напрыклад, лікёра-гарэлачныя вырабы - 88 працэнтаў, каньяк - 60, піва - 45, бензін аўтамабільны - 40 працэнтаў і пр.

З сум выручкі ў замежнай валюце, атрыманай ад рэалізацыі абкладаемых тавараў, акцызы выплачваюцца у гэтай валюце.

**АКЦЫЯНЕРНЫЯ ТАВАРЫСТВЫ** (Акционерные общества) -- арганізацыі, створаныя шляхам аб'яднання ўкладанняў юрыдычнымі асобамі і грамадзянамі з мэтай ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці. З укладанняў А.т. стварае ўстаўны фонд, выпускае акцыі. Акцыя -- каштоўная папера, пацвярджаючая права акцыянера ўдзельнічаць у кіраванні таварыствам, прыносіць даход, называемы дывідэндам. А.т. выпускае імянныя акцыі і акцыі на прад'яўніка. Адрозніваюць простыя акцыі і прывілейныя з штогадова фіксаваным дывідэндам. Апошнія выпускаюцца на суму, якая не перавышае 10% устаўнага фонду. Дзейнасць А.т. вызначаецца Палажэн-

нем аб А.т. і таварыствах з абмежаванай адказнасцю.

А.т. атрымалі новы імпульс для свайго развіцця ў час фарміравання новага гаспадарчага механізма, перабудовы эканамічных адносін на асновах сапраўднага гаспадарчага разліку. Першым такім А.т. у нашай рэспубліцы стала акцыянерна-будаўнічае таварыства Гродзенскага прадзільна-нітачнага аб'яднання па вырашэнню жыллёвай праблемы. Членамі таварыства сталі шэраг прадпрыемстваў г.Гродна і вобласці. Яны аб'ядналі сродкі для того, каб на базе "Гроднажылбуда" будаваць новае жыллё і такім чынам забяспечваць акцыянераў кватэрамі.

**АМАРТЫЗАЦЫЯ** (Амортизация) - працэс планавага кампенсавання зносу асноўных фондаў шляхам паступовага пераносу імі сваёй вартасці (па меры зносу) на прадукт або паслугі, якія ствараюцца ў працэсе вытворчасці. З'яўляючыся грашовым выражэннем зносу ў абагульненай форме, А. характарызуе ступень фізічнага і маральнага зносу асноўных фондаў. Амартызацыйныя адлічэнні ўключаюцца ў сабекошт прадукцыі ў адпаведнасці з нормамі амартызацыі, якія характарызуюць гадавы працэнт пагашэння вартасці асноўных фондаў. Нормы А. распрацоўваюцца навукова-даследчымі інстытутамі, гаспадарчымі і іншымі арганізацыямі, зацвярджаюцца урадам і з'яўляюцца адзінымі для ўсіх прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый. Аб'ектам налічэння А. з'яўляецца сярэднегадавая вартасць асноўных фондаў. А. налічваецца як на дзеючыя, так і на нядзеючыя (за выключэннем закансерваваных) асноўныя фонды на працягу ўсяго фактычнага тэрміну іх службы. У нафтавай і газавай прамысловасці А. налічваецца на працягу 15 гадоў (для нафтавых свідравін) незалежна ад фактычнага тэрміну іх службы. Сума амартызацыйных адлічэнняў складае амартызацыйны фонд.

**АНАЛІЗ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ** (Анализ хозяйственной деятельности) адносіцца да метадаў пазнання рэальнай дзейнасці прадпрыемстваў і іншых гаспадарчых адзінак і з'яўляецца інструментам (сродкам) іх кіравання. А.г.дз. выконвае адну з асноўных функцый

кіравання, і яго аб'ектам выступае ўся гаспадарчая дзейнасць прадпрыемстваў, аб'яднанняў, комплексаў. У залежнасці ад таго, якія часткі гэтага аб'екта аналізуюцца, адрозніваюць асобныя віды А.г.дз. Напрыклад, па ўзбуйненых аб'ектах: функцыянальны, які вывучае функцыі прадукцыі ці паслуг; тэхнічны (інжыне- рны), які вывучае тэхнічныя працэсы стварэння прадукцыі (паслуг з зададзенымі функцыямі); эканамічны, які вывучае працэсы стварэння, размеркавання і пераразмеркавання вартасці прадукцыі (паслуг); сацыяльны, які вывучае сацыяльныя працэсы; экалагічны, які вывучае працэсы экалагічнага парадку. Аб'яднанне аб'ектаў гэтых відаў аналізу прыводзіць адпаведна да стварэння новага віду аналізу. Напрыклад, аб'яднанне аб'ектаў функцыянальнага і эканамічнага аналізу стварыла функцыянальна-эканамічны (вартасны) аналіз (ФВА), аб'яднанне эканамічнага аб'екта з тэхнічным, сацыяльным, экалагічным адпаведна выдзеліла тэхніка-эканамічны, сацыяльна-эканамічны, эканоміка-экалагічны віды А.г.дз.

Раздзяленне аб'ектаў прыведзеных відаў А.г.дз. на больш дробныя састаўныя часткі дае адпаведныя віды аналізу. Напрыклад, з выдзяленнем у эканамічным аб'екце вытворчасці і рэалізацыі таварнай прадукцыі сабекошту, фінансаў выдзяляюцца адпаведныя назвам частак і віды эканамічнага аналізу.

У залежнасці ад часавай характарыстыкі (цыклаў) кіравання гаспадарчай дзейнасцю пералічаныя віды А.г.дз. дзеляцца на аператыўны (кароткатэрміновы), бягучы (сярэднетэрміновы) і перспектыўны (доўгатэрміновы), а ў залежнасці ад маштабаў кіравання гаспадаркай яны дзеляцца яшчэ на ўнутрызаводскі, галіновы, рэгіянальны (тэрытарыяльны) і народнагаспадарчы аналіз.

Асноўныя задачы А.г.дз. у кіраванні гаспадаркай: выяўленне рэзерваў павышэння эфектыўнасці гаспадарчай дзейнасці, аб'ектыўная ацэнка вынікаў гаспадарча-разліковай дзейнасці, забеспячэнне кіраўніцтва адпаведных узроўняў неабходнай аналітычнай інфармацыяй, садзейнічанне распрацоўцы аптымальных наву-

кова абгрунтаваных планаў развіцця (функцыяніравання) аб'екта.

**АПЛАТА ПРАЦЫ** (Оплата труда) - асноўная форма праяўлення закону размеркавання па працы, якая ва ўмовах грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці з'яўляецца аб'ектыўнай мерай размеркавання жыццёвых даброт паміж членамі грамадства і крыніцай іх даходаў. А.п. у залежнасці ад яе колькасці, якасці і выніковасці забяспечвае матэрыяльную зацікаўленасць працоўных у выніках вытворчасці,стымулюе рост прадукцыйнасці працы, павышэнне кваліфікацыі, удасканаленне тэхнікі, арганізацыі вытворчасці і працы, садзейнічае выхаванню добрасумленных адносін да працы. А.п. не толькі з'яўляецца формай размеркавання грамадскага прадукту па працы, але і выступае важнейшым сацыяльна-эканамічным інструментам, стымулам далейшага развіцця вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці. Вызначэнне колькасці і якасці працы, затрачанай кожным работнікам, і ўстанаўленне залежнасці аплаты працы ад яе затрат і выніковасці дасягаюцца шляхам арганізацыі заработнай платы. Важнейшымі элементамі арганізацыі заработнай платы з'яўляюцца: тарыфная сістэма аплаты працы рабочых і сістэма службовых акладаў спецыялістаў; нарміраванне працы; формы і сістэмы заработнай платы.

*Тарыфная сістэма* і сістэма службовых акладаў рэгулююць заработную плату ў залежнасці ад выконваемай работы і ўмоў яе выканання. Нарміраванне працы служыць для вызначэння часткі ўдзелу кожнага работніка ў агульных выніках працы. Сувязь аплаты працы работнікаў з колькаснымі вынікамі іх работы ажыццяўляецца праз формы і сістэмы заработнай платы. Прымяняюцца дзве асноўныя формы зарплаты: пачасовая і здзельная, кожная з якіх падраздзяляецца на шэраг сістэм. На іх аснове атрымалі развіццё калектыўныя сістэмы аплаты працы, пры якіх заработная плата залежыць ад канчатковых вынікаў працы брыгады, участка, цэха. Пры такой сістэме зарплаты кожны работнік зацікаўлены ў выкананні не толькі свайго індывідуальнага задання, але і ўсяго аб'ёму работ дадзенага калек-

тыву. Гэта садзейнічае лепшаму выкарыстанню рабочага часу, абсталявання, развівае сумяшчэнне прафесій і ўзаемазамяняльнасць. Зарплата кожнага члена калектыву вызначаецца з улікам яго асабістага ўкладу ў агульныя канчатковыя вынікі работы.

Калектыўны заработак размяркоўваецца паміж членамі калектыву ў адпаведнасці з прысвоенымі тарыфнымі разрадамі і фактычна адпрацаваным часам. Для больш поўнага ўліку рэальнага ўкладу кожнага работніка ў агульныя вынікі прыработак і прэмія або ўвесь калектыўны заработак можа размяркоўвацца з прымяненнем каэфіцыента працоўнага ўдзелу.

**АПТОВЫ ГАНДАЛЬ СРОДКАМІ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Оптовая торговля средствами производства) - форма матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, якая абслугоўвае рынак сродкаў вытворчасці. Уяўляе сабой свабодную куплю-продаж без фондаў і лімітаў праз пасрэдніцкія звёны: аптовыя базы, склады, магазіны сістэмы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і збытавых органаў прамысловасці ці непасрэдна шляхам заключэння гандлёвых здзелак, доўгатэрміновых дагавораў пастаўкі паміж вытворцамі прадукцыі і іх спажыўцамі.

А.г.с.в. меў шырокае распаўсюджанне ў 1921-1928 гг. Цяпер яго ўдзельная вага ў аптовым абароце сродкаў вытворчасці нязначная, але хутка пашыраецца.

А.г.с.в. з’яўляецца вынікам і адначасова неабходнай умовай рэалізацыі эканамічнай рэформы, укаранення сапраўдных рыначных адносін у народнай гаспадарцы. З развіццём перабудовачных працэсаў і ператварэннем прадпрыемстваў і аб’яднанняў у самастойныя гаспадарчыя адзінкі А.г.с.в. павінен заняць пераважнае месца ў аптовым абароце сродкаў вытворчасці.

Дзяржаўнае рэгуляванне А.г.с.в. ажыццяўляецца эканамічнымі метадамі: шляхам устанаўлення дзяржаўных заказаў, праз фінансава-крэдытную сістэму, а таксама рэгуляваннем цэн, тарыфаў, мыт ных пошлін, імпартам неабходных тавараў, арганізацыяй адпаведнай вытворчасці.

**АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА КІРАВАН-**

**НЯ** (Организационная структура управления) -- упарадкаваная, устойлівая будова звязаных паміж сабой органаў і аб'ектаў кіравання. Структура кіравання ўяўляе сабой унутраную будову сістэмы кіравання. Пазнаць структуру -- значыць пазнаць заканамернасці сувязей элементаў у сістэме. А.с.к. ствараецца мэтанакіравана і рэгламентуе пазнаныя заканамерныя адносіны: вытворчыя, палітычныя, навуковыя, маральна-этычныя і іншыя адносіны ў сістэме кіравання. А.с.к. адлюстроўвае дасягнуты ўзровень развіцця спосабу вытворчасці. Пры гэтым непасрэдныя змяненні ў А.с.к. абумоўліваюцца перш за ўсё ўплывам вытворчых адносін. А.с.к. характарызуе элементы і сувязі, да якіх адносяцца органы, звёны і ступені кіравання, а таксама кіраўнікі. Сувязі ў А.с.к. падзяляюцца на вертыкальныя -- лінейныя і гарызантальныя -- функцыянальныя. Упарадкаванне вертыкальных і гарызантальных сувязей паміж элементамі ўтварае іерархію сістэмы кіравання.

Перабудова А.с.к. заклікана забяспечыць дасягненне мэт радыкальнай рэформы шляхам арганізацыйнага афармлення новых эканамічных адносін, звязаных з развіццём гаспадарчага разліку, арэндных, акцыянерных форм, кааперацыі. Комплекс задач па перабудове, якія рэалізуюцца цяпер, уключае ў сябе: пераход да пераважна двухзвённай сістэмы кіравання; інтэграцыю галін, стварэнне буйных народнагаспадарчых комплексаў; развіццё навукова-вытворчых і вытворчых аб'яднанняў, стварэнне і ўмацаванне міжгаліновых аб'яднанняў, канцэрнаў, комплексаў; пашырэнне правоў прадпрыемстваў і аб'яднанняў, змяненне на гэтай аснове ўзаемаадносін і пераразмеркаванне функцый паміж міністэрствамі і вытворчымі адзінкамі; змяненне статусу міністэрстваў; рацыянальнае спалучэнне галіновага і тэрытарыяльнага падыходу ў кіраванні эканомікай; павышэнне эфектыўнасці работы апарату кіравання, дакладнае размежаванне правоў, абавязкаў і адказнасці паміж органамі кіравання; скарачэнне колькасці работнікаў, занятых у кіраванні.

**АРГАНІЧНАЯ БУДОВА ВЫТВОРЧАСЦІ** (Органическое строение производства) -- узаемасувязь рэ-

чыўных (сродкі вытворчасці) і асабістага (рабочая сіла) фактараў вытворчасці. Эканамічная сутнасць А.б.в. заключаецца ў выражэнні арганізацыйна-эканамічных адносін, якія складваюцца ва ўзаемадзеянні сродкаў вытворчасці і рабочай сілы. Гэта спосаб рэгулявання зыходнай прапорцыі паміж масай сродкаў вытворчасці і неабходнай для іх выкарыстання рабочай сілай. На асобным прадпрыемстве гэта прапорцыя вызначаецца адпаведнасцю пэўнай колькасці і саставу работнікаў патрэбнай колькасці рабочых месц.

А.б.в. аб'ядноўвае тэхнічную і вартасную будову вытворчасці. Першая -- гэта адносіны масы сродкаў вытворчасці да масы працы. У практыцы работы прадпрыемстваў так вызначаюць, напрыклад, машынаўзброенасць працы, калі паказваюць колькасць станкоў, што абслугоўваюцца адным работнікам. Вартасная будова суадносін фактараў вытворчасці даецца ў грашовым выражэнні. Можна падлічыць, напрыклад, вартасць вытворчых фондаў (сродкаў вытворчасці) на адзінку неабходнага прадукту ў грашовым выражэнні. А.б.в. можна назваць фондаўзброенасцю працы. Яна паказвае, якая вартасць вытворчых фондаў выкарыстоўваецца адным работнікам. Такім чынам, А.б.в. мае вытворча-эканамічны і сацыяльны бакі. У першым выпадку яна характарызуе змяненне матэрыяльна-тэхнічнай базы вытворчасці па стварэнню неабходных умоў для высокапрадукцыйнай працы. Сацыяльнае ж значэнне А.б.в. заключаецца ў тым, што з яе дапамогай ажыццяўляюцца кіраванне занятасцю насельніцтва, перамена працы ў сувязі з выслабаненнем рабочай сілы пры механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці, удасканаленне якасці рабочай сілы ў адпаведнасці з патрабаваннямі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

**АРЭНДА** (Аренда) -- метад гаспадарання, заснаваны на тэрміновым і кампенсацыйным валоданні арандатарам асноўнымі фондамі і абаротнымі сродкамі, на дагаворнай форме адносін, поўнай самастойнасці ў вядзенні гаспадаркі і размеркаванні даходаў.

Гаспадарчая дзейнасць арэнднага прадпрыемства ажыццяўляецца на базе мадыфікаванай другой мадэлі

гаспадарчага разліку, заснаванай на размеркаванні прыбытку прадпрыемства, атрыманага пасля кампенсацыі з выручкі матэрыяльных выдаткаў. А. прымяняецца ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Арэндадаўцамі могуць быць дзяржаўныя органы, выканаўчыя камітэты Саветаў народных дэпутатаў, дзяржаўныя, кааператыўныя і іншыя грамадскія прадпрыемствы, установы, у распараджэнні, валоданні або ва ўласнасці якіх знаходзяцца вытворчыя фонды, зямля або іншая маёмасць. Арандатарамі могуць быць працоўныя калектывы дзяржаўных, кааператыўных і іншых грамадскіх прадпрыемстваў, іх падраздзяленняў, а таксама арганізацыі арандатараў, асобныя грамадзяне або групы грамадзян. Асноўным дакументам, які рэгламентуе адносіны арэндадаўцы з арандатарамі, з'яўляецца дагавор арэнды. У ім прадугледжваюцца абавязкі і правы арандатара і арэндадаўцы, велічыня арэнднай платы, тэрмін і іншыя ўмовы А. *Арэндная плата* ўяўляе сабой частку выручкі ад рэалізацыі прадукцыі (аказання паслуг), якую арандатар павінен пералічваць арэндадаўцу ў абумоўлены ў дагаворы тэрмін за права карыстання асноўнымі фондамі, абаротнымі сродкамі і іншай маёмасцю. Працоўны калектыў (арандатар) атрымлівае поўную свабоду гаспадарчай дзейнасці на ўвесь час арэнды. Умяшанне арэндадаўцы ў выкарыстанне арэндаванай маёмасці і гаспадарчую дзейнасць арандатара з'яўляецца недапушчальным. Арэнднае прадпрыемства плануе вытворчасць прадукцыі на аснове кантрольных лічбаў, дзяржаўных заказаў і прамых дагавароў спажыўцоў. Пры А. выкарыстоўваецца безнарматыўны метад размеркавання гаспадарча-разліковага прыбытку. Працоўны калектыў самастойна вызначае памеры фондаў рызыкі, развіцця вытворчасці і аплаты працы. Змяніць умовы дагавора арэнды або скасаваць яго можна па дамоўленасці бакоў або па заяве аднаго з бакоў судом альбо арбітражам. Пры ўнутрыгаспадарчай А. пытанне аб змяненні ці скасаванні дагавора арэнды вырашае працоўны калектыў.

**АРЭНДНАЯ ПЛАТА** (Арендная плата) -- форма рэалізацыі эканамічных інтарэсаў арэндадаўцы-ўласніка ў эфектыўным карыстанні аб'ектамі, якія аран-

дуюцца. Памер А.п. устанаўліваецца на ўвесь тэрмін заключэння з разбіўкай на гады, кварталы, месяцы.

Базай вызначэння велічыні А.п. з'яўляецца мінімальны ўзровень чыстага даходу, які мог бы атрымаць арэндадаўца без перадачы маёмасці ў арэнду. Велічыня А.п. залежыць ад ступені зносу асноўных фондаў, фінансавага стану прадпрыемства, яго галіновай прыналежнасці, устаноўленага парадку разліку па плацяжах з бюджэтам. Так, пры цэнтралізаваным парадку разліку з бюджэтам у склад А.п. уключаюцца ўсе віды плацяжоў, якія накіроўвае прадпрыемства вышэйстаячай арганізацыі і дзяржаўнаму бюджэту.

Вызначэнне памеру А.п. па кожнаму цэху (ў тым выпадку, калі ўсё прадпрыемства працуе на ўмовах арэнды) базіруецца на размеркаванні велічыны А.п. прадпрыемства па падраздзяленнях у залежнасці ад ступені ўдзелу кожнага цэха ў фарміраванні гаспадарча-разліковага даходу прадпрыемства. Калі прадпрыемства не перайшло на арэндны падрад, то велічыня А.п. цэха, які працуе на падрадзе, вызначаецца шляхам паэлементнага разліку. У яе склад уключаюць: плату за вытворчыя фонды, амартызацыйныя адлічэнні, плату на пэўнае аднаўленне асноўных фондаў; плату за прыродныя і працоўныя рэсурсы; кампенсацыі арэндным цэхам часткі агульназаводскіх і пазавытворчых расходаў прадпрыемства; частку прыбытку для разліку з бюджэтам, вышэйстаячымі і фінансава-крэдытнымі арганізацыямі.

**АРЭНДНЫ ПАДРАД** (Арендный подряд) -- форма рэалізацыі ўласнасці, заснаваная на перадачы сродкаў вытворчасці прадпрыемстваў ў карыстанне і валоданне працоўным калектывам на пэўны тэрмін і на пэўных умовах. А.п. дазваляе наблізіць уласнасць да працаўніка, робіць яго рэальным гаспадаром, павышае матэрыяльную зацікаўленасць і адказнасць працоўнага калектыву і кожнага работніка за канчатковыя вынікі працы.

А.п. развіваецца на двух узроўнях. Першы -- гэта арэндныя адносіны паміж кіраўніцтвам прадпрыемстваў і асобнымі працоўнымі калектывамі (брыгады, цэхі). Другі -- арэндныя адносіны па- між калектывам прадп-

рыемства і яго вышэйстаячай арганізацыяй ці іншымі органамі. Арэндныя адносіны замацоўваюцца ў дагаворы, дзе ўказваюцца ўмовы перадачы арэндным калектывам у іх карыстанне і распараджэнне сродкаў вытворчасці. У дагаворы фіксуюцца ўзаемныя абавязацельствы і правы бакоў. Прадпрыемствы (а ўнутры іх -- першасныя калектывы ці асобныя работнікі) абавязуюцца прыняць у арэнду вытворчыя будынкі, збудаванні, абсталяванне, нарміруемыя абаротныя сродкі, жылы фонд, аб'екты сацыяльна-культурнага комплексу і ўтрымліваць іх ў поўнай адпаведнасці з правіламі тэхнічнай эксплуатацыі, забяспечваць захаванне аб'ектаў уласнасці. У дагаворы адлюстроўваюцца арэндныя плацяжы, якасныя паказчыкі гаспадарання, абавязацельствы па пастаўках прадукцыі і інш. Арэндадаўца абавязуецца забяспечваць фондамі на сыравіну, матэрыялы, паліва, тэхніку, аказваць дапамогу ў тэхнічным пераўзбраенні, падрыхтоўцы кадраў. Дагавор заключаецца на працяглы тэрмін (5-20 год).

Працоўны калектыў мае поўную гаспадарчую самастойнасць. Ён, кіруючыся дзяржзаказам, кантрольнымі лічбамі і заказамі спажыўцоў прадукцыі, самастойна распрацоўвае планы, фарміруе сваю маёмасць, расшырае вытворчасць за кошт гаспадарча-разліковага даходу і асабістых зберажэнняў працуючых, распараджаецца гаспадарча-разліковым даходам. Арэндны калектыў нясе адказнасць за вынікі гаспадарчай дзейнасці, за парушэнні дагаворных абавязацельстваў.

А.п. стварае ўмовы для найбольш поўнага выяўлення ініцыятывы і прадпрымальнасці працоўных калектываў, ператварае іх у сапраўдных гаспадароў грамадскай уласнасці, якія клапоцяцца пра яе эфектыўнае выкарыстанне.

Дзяржава праз эканамічныя рычагі -- дзяржзаказ, арэндную плату, падаткі -- ўздзейнічае на эканамічныя інтарэсы таваравытворцаў, стымулюе вытворчасць патрэбных грамадству тавараў.

**АСАЦЫЯЦЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ** (Ассоциация предприятий) - аб'яднанне самастойных прадпрыемстваў з мэтай сумеснага ажыццяўлення некаторых

функцый гаспадарчай дзейнасці і сацыяльнага развіцця на аснове аб'яднання сродкаў членаў асацыяцыі. На этапе пераходу да рынку А.п. рэгулююць гарызантальныя эканамічныя сувязі прадпрыемстваў, каардынуюць работу прамысловасці рэгіёнаў. Так, створана, напрыклад, Беларуская навукова-прамысловая асацыяцыя, у якую ўвайшлі больш за 55 аб'яднанняў, заводаў і ўстаноў рэспублікі. Галоўныя праблемы, якія вырашае А.п. рэспублікі, гэта праблемы перспектыўнага развіцця, навукова-тэхнічнага прагрэсу, стварэння інфраструктуры прадпрыемстваў, развіцця сацкультбыту, выхаду на зарубежжа. Інтэнсіўна вывучаецца замежны вопыт, ствараюцца малыя прадпрыемствы па выпуску тавараў народнага спажывання, вядзецца перападрыхтоўка кадраў -- спецыялістаў па працы ва ўмовах рыначнай эканомікі. А.п. могуць замяніць і замяняюць сучасныя прамысловыя і іншыя міністэрствы.

**АСНОЎНЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ ФОНДЫ** (Основные производственные фонды) -- важнейшая частка вытворчых фондаў народнай гаспадаркі, яе галін, прадпрыемстваў (аб'яднанняў), якая ўяўляе сабой сродкі працы, уцягнутыя ў вытворчы працэс, што працягла функцыяніруюць у ім і паступова, часткамі, па меры зносу пераносяць сваю вартасць на нанава створаны гатовы прадукт. А.в.ф. з'яўляюцца рашаючым фактарам павелічэння грамадскага прадукту, развіцця эканомікі і асновай матэрыяльна-тэхнічнай базы краіны. Складаюцца з будынкаў, збудаванняў, перадатачных механізмаў, машын і абсталявання, інструменту, вытворчага, гаспадарчага інвентару і прылад, рабочай і прадукцыйнай жывёлы, шматгадовых пасадак і іншых асноўных фондаў. У залежнасці ад ролі, якую яны адыгрываюць у вытворчым працэссе, А.в.ф. падзяляюцца на актыўныя (рабочыя машыны і абсталяванне, прыборы, інструменты і інш.) і пасіўныя (будынкі, збудаванні, перадатачныя механізмы і іншыя элементы). Суадносіны актыўных і пасіўных элементаў у агульнай вартасці А.в.ф. характарызуюць іх відавую (тэхналагіч- ную) структуру. А.в.ф. улічваюцца ў натуральным і вартасным (грашовым) выражэнні. Натуральныя вымя-

ральнікі выкарыстоўваюцца для вызначэння вытворчай магутнасці, распрацоўкі балансу абсталявання, вызначэння тэхнічнага саставу і стану А.в.ф. Вартасная (грашовая) ацэнка выкарыстоўваецца для вызначэння іх агульнага аб'ёму, структуры, зносу, амартызацыі, рэнтабельнасці, размераў платы ў бюджэт, арэндных плацяжоў. А.в.ф. ацэньваюцца па першапачатковай, аднаўленчай і рэшткавай вартасці. Першапачатковая вартасць А.в.ф. уключае ў сябе затраты на стварэнне (пабудову), набыццё, транспарціроўку і іншыя работы. Аднаўленчая вартасць А.в.ф. -- гэта кошт іх аднаўлення ў сучасных умовах. Рэшткавая вартасць (вартасць з улікам зносу) уяўляе сабой розніцу паміж першапачатковай (аднаўленчай) вартасцю і сумай зносу А.в.ф., налічанай у адпаведнасці з вызначанымі нормамі амартызацыі.

**АСОБА ЮРЫДЫЧНАЯ** (Лицо юридическое) -- арганізацыя, якая валодае адасобленай маёмасцю, здольная ад свайго імя набываць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы і несці абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе. А.ю. - суб'ект грамадзянскага права.

Асноўныя прыкметы А.ю.: 1) валоданне арганізацыйным адзінствам, замацаваным у яе Статуце (Палажэнні), які вызначае структуру, мэты, парадак назначэння або выбрання органа; 2) наяўнасць адасобленай маёмасці; 3) выступленне ў грамадзянскім абароце ад свайго імя пры афармленні здзелак і іншых дзеянняў, якія параджаюць грамадзянскія правы і абавязкі, а таксама пры іх абароне ў судзе і арбітражы; 4) самастойная маёмасная адказнасць за свае абавязацельствы. А.ю. ў гэтым выпадку адказвае маёмасцю, якая належыць ёй ці замацавана за ёй і на якую па закону можа быць звернута спагнанне; дзяржава не нясе адказнасці па абавязацельствах дзяржаўных арганізацый, якія з'яўляюцца А.ю., а гэтыя арганізацыі не нясуць адказнасці па абавязацельствах дзяржавы, за выключэннямі, указанымі ў законе.

Закон вызначае наступныя віды А.ю.: 1) дзяржаўныя прадпрыемствы або іншыя арганізацыі, якія знаходзяцца на гаспадарчым разліку, маюць замацаваныя за імі

асноўныя і абаротныя сродкі і самастойны баланс; 2) установы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце і маюць самастойны каштарыс і кіраўнікі якіх карыстаюцца правамі і распарадцаў крэдытаў (не лічачы выключэнняў, вызначаных законам); 3) дзяржаўныя арганізацыі, якія фінансуюцца за кошт іншых крыніц і маюць самастойныя каштарыс і баланс (напрыклад, упраўленні і аб'яднанні, якія фінансуюцца за кошт адлічэнняў падпарадкаваных ім прадпрыемстваў); 4) заснаваныя на калектыўных формах уласнасці (арэндныя, калектыўныя прадпрыемствы, акцыянерныя таварыствы, калгасы, міжкалгасныя і іншыя кааператыўныя арганізацыі і іх аб'яднанні, іншыя грамадскія арганізацыі), а таксама ў выпадках, якія прадугледжаны заканадаўствам, прадпрыемствы і ўстановы гэтых арганізацый і іх аб'яднанняў, якія маюць адасобленую маёмасць і самастойны баланс; 5) заснаваныя на змешаных формах уласнасці -- сумесныя прадпрыемствы дзяржаўна-калгасныя і іншыя дзяржаўна-кааператыўныя арганізацыі; 6) заснаваныя на прыватнай уласнасці -- індывідуальныя, сямейныя прадпрыемствы; 7) іншыя арганізацыі ў выпадках, якія прадугледжаны заканадаўствам.

**АТЭСТАЦЫЯ КАДРАЎ** (Аттестация кадров) -- вызначэнне адпаведнасці дзелавых якасцей работніка тым кваліфікацыйным патрабаванням, якія прадугледжвае займаемая ім пасада. А.к. праводзіцца для найбольш рацыянальнага выкарыстання кіраўнікоў, спецыялістаў і служачых, павышэння эфектыўнасці іх працы і адказнасці за даручаную справу. А.к. садзейнічае паляпшэнню падбору і выхавання кадраў, павышэнню іх дзелавой кваліфікацыі і культурнага ўзроўню, праводзіцца адзін раз у тры--пяць год. Для яе правядзення з прадстаўнікоў адміністрацыі структурных падраздзяленняў, аддзела кадраў, грамадскіх арганізацый ствараецца атэстацыйная камісія.

У перыяд падрыхтоўкі да А.к. камісія распрацоўвае дакументы, якія рэгламентуюць яе правядзенне, знаёміць з імі атэстуемых работнікаў, праводзіць растлумачальную работу наконт мэт і парадку правядзення атэ-

стацыі, арганізуе напісанне характарыстык. Характарыстыкі складаюцца асабіста непасрэдным кіраўніком атэстуемага з улікам думкі грамадскіх арганізацый. У характарыстыцы адлюстроўваюцца адносіны атэстуемага работніка да справы, яго ўклад у павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і выкананне плана, якасць выканання даручанай работы, творчае выкананне заданняў, здольнасць прымаць самастойныя рашэнні, павышэнне ўзроўню сваёй кваліфікацыі, удзел у грамадскай рабоце. Могуць давацца рэкамендацыі па паляпшэнню дзейнасці,павышэнню кваліфікацыі атэстуемага і інш.

Атэстацыйная камісія ў прысутнасці работніка і яго непасрэднага кіраўніка разглядае прадстаўленыя матэрыялы, праводзіць з ім гутарку. На аснове ўліку вынікаў работы, узроўню выканання ім службовых абавязкаў, дзелавых і маральных якасцей, гутаркі з ім атэстацыйная камісія вызначае ступень адпаведнасці атэстуемага займаемай пасадзе і ўносіць рэкамендацыі аб прысваенні яму кваліфікацыйнай катэгорыі ці класнага звання, аб памеры службовага акладу, надбавак і даплат да яго.

**АТЭСТАЦЫЯ РАБОЧЫХ МЕСЦ** (Аттестация рабочих мест) -- сукупнасць мерапрыемстваў па комплекснай ацэнцы кожнага рабочага месца на яго адпаведнасць перадавому навукова-тэхнічнаму і арганізацыйнаму ўзроўню, які забяспечвае павышэнне прадукцыйнасці працы і высокую якасць прадукцыі.

У ходзе А.р.м. кожнае рабочае месца ацэньваецца комплексна па тэхнічнаму ўзроўню -- прагрэсіўнасць прымяняемай тэхналогіі, узровень прадукцыйнасці абсталявання,тэхналагічнай планіроўкі і абслугоўвання рабочага месца, адпаведнасць кваліфікацыі работніка складанасці і якасці работы, якасць дзеючых норм працы, эфектыўнасць выкарыстання рабочага месца; па ўмовах працы і тэхніцы бяспекі -- санітарна-гігіенічныя ўмовы працы, аб'ёмы ручной, цяжкай і манатоннай працы, забяспечанасць спецадзеннем.

Па выніках атэстацыі кожнае рабочае месца адносіцца да адной з трох груп: атэставаныя; якія падлягаюць дадатковай (паўторнай) атэстацыі; якія падлягаюць ліквідацыі.

Па выніках атэстацыі намячаюцца асноўныя напрамкі ўдасканалення вытворчасці, аб'ёмы і тэрміны рацыяналізацыі, колькасць малаэфектыўных і лішніх рабочых месц і тэрміны іх ліквідацыі, колькасць і састаў работнікаў, якія падлягаюць павышэнню кваліфіка цыі, перападрыхтоўцы і вызваленню,перагляд норм і нарматываў, паляпшэнне абслугоўвання рабочых месц, умоў працы.

**АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ СІСТЭМА КІРАВАННЯ** (Автоматизированная система управления) --сістэма "чалавек--машына", якая забяспечвае эфектыўнае функцыяніраванне аб'екта. Пры гэтым збор і перапрацоўка інфармацыі, неабходнай для рэалізацыі функцый кіравання, ажыццяўляюцца з прымяненнем аўта-матызацыі і вылічальнай тэхнікі ("Аўтаматызацыя сіс-тэмы кіравання. Тэрміны і вызначэнні", ДАСТ 24.003-84).

А.с.к., якія ствараюцца ў краіне, забяспечваюць больш высокі ўзровень метадаў кіравання, адкрываюць шырокія магчымасці павышэння эфектыўнасці работы не толькі асобных прадпрыемстваў і арганізацый, але і цэлых галін народнай гаспадаркі. Развіццё кібернетыкі і інфарматыкі спрыяла тэарэтычнай аснове стварэння і функцыяніравання А.с.к. не толькі ў навуковатэхнічных, але і ў сацыяльна-эканамічных галінах чалавечай дзейнасці.

А.с.к. уключае ў сябе мноства разнастайных састаўных частак (элементаў), якія характарызуюцца спецыфічнымі рысамі і адыгрываюць розную ролю ў вырашэнні задач кіравання. Функцыянальная частка А.с.к. адлюстроўвае змест яе прадметнай галіны, гэта значыць мэты, крытэрыі, задачы і спосабы іх рашэння, аперацыі і працэдуры кіравання.

Зона забеспячэння ўтварае інфармацыйна-матэрыяльную аснову А.с.к. і ўключае ў сябе комплекс тэхнічных сродкаў, інфармацыйнае, прававое, праграмна-матэматычнае забеспячэнне, якое выкарысто ўваецца спецыялістамі апарату кіравання для рэалізацыі функцый кіравання (прыняцця рашэння).

**АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Автоматизация производства) -- укараненне ў вытворчасць

сістэмы машын і механізмаў, якія вызваляюць работніка ад непасрэднага выканання функцый кіравання вытворчым працэсам. Пры А.в. за рабочым захоў- ваюцца функцыі кантролю за вытворчасцю, наладкі і рамонту машын. А.в. дазваляе павысіць эканамічную і сацыяльную эфектыўнасць вытворчасці. Эканамічная эфектыўнасць А.в. выяўляецца ў шматразовым павышэнні прадукцыйнасці працы, паляпшэнні якасці прадукцыі, забеспячэнні рытмічнасці і бесперапыннасці вытворчага працэсу. Сацыяльныя вынікі А.в. выяўляюцца ў росце культурна-тэхнічнага і кваліфікацыйнага ўзроўню работнікаў, паляпшэнні ўмоў працы, сціранні мяжы паміж разумовай і фізічнай працай. Адрозніваюць частковую, комплексную і поўную аўтаматызацыю. Частковая А.в. характарызуецца ўкараненнем аўтаматычных машын на асобных вытворчых аперацыях, комплексная -- укараненнем у вытворчасць сістэмы аўтаматычных машын, механізмаў і сродкаў аўта- матычнага кантролю і кіравання, якая забяспечвае выкананне вытворчага працэсу без непасрэднага ўдзелу чалавека. Поўная аўтаматызацыя -- вышэйшая ступень А.в. Яна характарызуецца перадачай усіх функцый па кіраванню і кантролю на ўсіх стадыях вытворчага працэсу комплексна-аўтаматызаваным сістэмам кіравання.

Поўная А.в. -- гэта сістэма, якая сама настройваецца і кіруецца ЭВМ. Комплексная і поўная А.в. -- важнейшы напрамак развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, важнейшая ўмова ўсебаковай інтэнсіфікацыі вытворчасці і дасягнення сусветнага ўзроўню якасці прадукцыі.

## Б

**БАЗА ДАНЫХ** (База данных) -- пайменаваная, нек аторым чынам арганізаваная (структурная) сукупнасць узаемазвязаных даных, якія адлюстроўваюць стан аб'ектаў канкрэтнай прадметнай сферы, што знаходзяцца пад цэнтралізаваным праграмным кіраваннем.

**БАЛАНС АСНОУНЫХ ФОНДАУ** (Баланс основных фондов) -- спосаб адлюстравання сукупнасці гэтых фондаў у цэлым па краіне і рэгіёнах з паказам іх утварэння і напрамкаў выкарыстання. Асноўныя фонды пад-

раздзяляюцца на два віды - вытворчыя і невытворчыя, кожны з якіх у сваю чаргу адлюстроўваецца па галінах вытворчай і невытворчай сфер.

Б.а.ф. складаецца ў дзвюх ацэнках: па поўнай першапачатковай вартасці і па першапачатковай вартасці з улікам зносу. Па першай ацэнцы характарызуецца фізічны аб'ём (стан) фондаў, і таму баланс уключае ў сябе наступныя артыкулы: 1) наяўнасць асноўных фондаў на пачатак года; 2) увод у дзеянне асноўных фондаў; 3) выбыццё асноўных фондаў; 4) асноўныя фонды на канец года. На аснове гэтага балансу вызначаюцца структура і дынаміка асноўных фондаў, суадносіны фондаў вытворчага і невытворчага прызначэння. Гэты баланс дазваляе абгрунтаваць вытворчую і сацыяльную праграмы на планавы перыяд асноўнымі фондамі.

Па другой ацэнцы адлюстроўваецца змяненне асноўных фондаў па вартасці. Таму баланс уключае ў сябе: 1) асноўныя фонды па астаткавай вартасці на пачатак года; 2) увод у дзеянне асноўных фондаў за год; 3) капітальны рамонт; 4) амартызацыйныя адлічэнні; 5) вартасць і асноўныя фонды з улікам зносу на канец года. Гэты баланс важны для ўвязкі ўзнаўлення асноўных фондаў і грамадскага прадукту, вызначэння крыніц капітальных укладанняў.

**БАЛАНС БУХГАЛТАРСКІ** (Баланс бухгалтерский) -- спосаб адлюстравання сродкаў прадпрыемстваў і іх крыніц на пэўную дату ў грашовым вымярэнні. Б.б. уяўляе сабой табліцу, якая складаецца з дзвюх частак: левай -- актыў, правай -- пасіў. У актыве адлюстроўваюцца сродкі, згрупаваныя па відах,устаноўленай структуры і размяшчэнню, а ў пасіве -- гэтыя ж сродкі, але згрупаваныя па крыніцах іх утварэння і мэтаваму прызначэнню. Таму вынікі актыву і пасіву балансу павінны быць роўнымі. Адсюль і назва: баланс-раўнавага. Групоўка сродкаў і іх крыніц прадстаўлена ў балансе ў выглядзе артыкулаў і раздзелаў. Б.б., побач з выкананнем кантрольнай функцыі правільнасці вядзення ўліку, з'яўляецца важнай састаўной часткай бухгалтарскай справаздачнасці, якая характарызуе фінансавы стан прадпрыемстваў і арганізацый. Па дадзеных Б.б. можна

вызначыць: суму сродкаў, якія знаходзяцца ў распараджэнні прадпрыемства; наяўнасць уласных і прыраўняных да іх абаротных сродкаў; забяспечанасць прадпрыемства ўласнымі сродкамі (лішак ці недахоп іх у параўнанні з нарматывам); суму імабілізацыі абаротных сродкаў; велічыню дэбіторскай і крэдыторскай запазычанасці; стан нарміруемых абаротных сродкаў; стан плацежаздольнасці прадпрыемства.

**БАЛАНС ВЫТВОРЧЫХ МАГУТНАСЦЕЙ** (Баланс производственных мощностей) -- спосаб абагулення вытворчых магутнасцей па прадпрыемствах (аб'яднаннях) і па галінах. Ён адлюстроўвае дынаміку магутнасці ў справаздачным або планавым перыядзе (звычайна на працягу года).

Вытворчая магутнасць прадпрыемства (аб'яднання), галіны мяняецца ў сувязі з інтэнсіфікацыяй вытворчасці, рэканструкцыяй і расшырэннем прадпрыемства, уводам у дзеянне новых аб'ектаў у выніку капітальнага будаўніцтва. Таму ў Б.в.м. адлюстроўваюцца: 1) вытворчая магутнасць на пачатак планавага (справаздачнага) года; 2) павелічэнне магутнасці на працягу года, у тым ліку за кошт арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў на дзеючых прадпрыемствах, іх рэканструкцыі і расшырэння, уводу ў дзеянне новых магутнасцей у выніку будаўніцтва новых прадпрыемстваў; 3) выбыццё вытворчых магутнасцей з-за трухлявасці, зносу і па іншых прычынах; 4) магутнасць на канец года; 5) сярэднегадавая магутнасць; 6) каэфіцыент выкарыстання сярэднегадавой магутнасці; 7) аб'ём выпрабу прадукцыі (як здабытак сярэднегадавой магутнасці на каэфіцыент яе выкарыстання).

Пры бягучым планаванні Б.в.м. служыць інструментам абгрунтавання галоўным чынам аб'ёмаў вырабу прадукцыі ў планавым годзе. У працэсе перспектыўнага планавання ён выкарыстоўваецца ў асноўным для абгрунтавання планаў уводу ў дзеянне новых магутнасцей за кошт перш за ўсё тэхнічнага пераўзбраення і рэканструкцыі дзеючых прадпрыемстваў: іх расшырэння, а ў шэрагу галін - і будаўніцтва новых прадпрыемстваў з мэтай забеспячэння запланаванага аб'ёму вырабу пра-

дукцыі.

**БАЛАНС ГРАМАДСКАГА ПРАДУКТУ** (Баланс общественного продукта) -- спосаб адлюстравання агульнага аб'ёму вытворчасці прадукцыі ў цэлым па краіне. Ён паказвае матэрыяльна-рэчыўную структуру прадукту (аб'ём вырабу сродкаў вытворчасці і прадметаў спажывання), галіновую структуру (выраб прамысловай, сельскагаспадарчай прадукцыі, прадукцыі будаўніцтва і іншых галін матэрыяльнай вытворчасці), сацыяльную структуру (вытворчасць на базе розных форм уласнасці).

Б.г.п., як і іншыя балансы, складаецца з дзвюх частак. У адной з іх паказваюцца рэсурсы грамадскага прадукту (уключаючы імпарт прадукцыі), у другой -- яго спажыванне, назапашванне і экспарт. Галоўная задача распрацоўкі гэтага балансу заключаецца ў тым, каб выявіць магчымасці павелічэння грамадскага прадукту, збалансаваць гэтыя магчымасці з патрэбамі, прычым не толькі ў цэлым па грамадскаму прадукту, але і асобна па вырабу, спажыванню і назапашванню сродкаў вытворчасці і прадметаў спажывання, па прадукцыі розных галін народнай гаспадаркі (прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўніцтва і інш.). Б.г.п. звязаны з усімі раздзеламі планаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны наогул, што дазваляе выкарыстоўваць яго ў якасці інструменту распрацоўкі і праверкі збалансаванасці гэтых планаў, асабліва з боку іх матэрыяльна-рэчыўных прапорцый.

**БАЛАНС ГРАШОВЫХ ДАХОДАЎ І РАСХОДАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА** (Баланс денежных доходов и расходов населения) -- зводныя даныя пра аб'ём, крыніцы і структуру грашовых даходаў, велічыню і напрамак расходаў насельніцтва. У канчатковым выніку ён вызначае змяненне грашовай масы ў насельніцтва як вынік суадносін яго даходаў і расходаў. Б.г.д. і р.н. адлюстроўвае грашовы абарот у наяўнай і безнаяўнай формах як вынік ўзаемаадносін насельніцтва і розных сацыяльных груп з прадпрыемствамі, арганізацыямі, установамі і паміж сабой. Разлікі балансу (планавыя і справаздачныя) робяцца ў тэрытарыяльным разрэзе: па краіне,

абласцях. На аснове даных балансу вызначаюцца: плацежаздольны попыт насельніцтва, магчымасці яго задавальнення; размяшчэнне грашовай масы па рэгіёнах, ступень яе міграцыі (перамяшчэння ў тэрытарыяльным разрэзе), разлікі балансу выкарыстоўваюцца пры планаванні аб'ёмаў тавараабароту, платных паслуг насельніцтву, вырабу тавараў народнага спажывання, пры вызначэнні рознічных цэн, тарыфаў на паслугі, а таксама памераў аплаты па працы, развіцця ашчаднай справы ў краіне, выпуску пазык, латарэйных білетаў і да т.п. Б.г.д. і р.н. служыць важнай крыніцай інфармацыі аб стане грашовага абарачэння ў краіне, наяўнасці лішніх грошай у абароце, іх абясцэньванні.

У сучасных умовах гэты баланс набывае асаблівае значэнне як рэгулятар грашовага абарачэння, барометр ступені дабрабыту народа, рэальнасці яго даходаў, магчымасцей ператварэння іх у тавары, паслугі.

**БАЛАНС МІЖГАЛІНОВЫ** (Баланс межотраслевой) -- састаўная частка балансу вырабу і размеркавання прадукцыі народнай гаспадаркі. Ён выкарыстоўваецца як інструмент эканамічнага аналізу і планавання прапорцый расшыранага ўзнаўлення ў галіновым разрэзе. Галоўная асаблівасць Б.м. заключаецца ў тым, што ён будуецца ў выглядзе табліц шахматнага тыпу, у дзейніку якіх звычайна паказваюцца аб'ёмы вырабу прадукцыі па галінах, а ў выказніку -- спажыванне гэтай прадукцыі таксама па галінах. Пры гэтым распрацоўка і аналіз даных Б.м. ажыццяўляюцца з дапамогай эканоміка-матэматычных метадаў і электронна-вылічальнай тэхнікі.

Па эканамічнаму зместу і характару інфармацыі выдзяляюцца наступныя разнавіднасці Б.м.: вартасныя, натуральныя і натуральна-вартасныя, якія у сваю чаргу падраздзяляюцца на справаздачныя і планавыя. Вартасны Б.м. характарызуе працэс узнаўлення прадукцыі ў грашовым выражэнні. Па сваёй структуры ён можа быць узбуйненым або дэталёвым. Б.м. у натуральным выражэнні распрацоўваецца па важнейшых відах прадукцыі. Яго наменклатура ўключае ў сябе некалькі соцень найменняў прадукцыі, але яна не ахоплівае ўсю разнастай-

насць відаў прадукцыі, якая вырабляецца ў народнай гаспадарцы. Натуральна-вартасны Б.м.уключае ў сябе ўсе галіны народнай гаспадаркі, а таксама важнейшыя віды прадукцыі ў натуральным і вартасным выражэнні.

Асноўныя сувязі і прапорцыі ўзнаўлення характарызуюцца галоўным чынам у вартасным выражэнні з дапамогай сістэмы паказчыкаў, якія групуюцца ў чатырох узаемазвязаных частках Б.м. і называюцца квадрантамі. У першым квадранце адлюстроўваюцца прапорцыі размеркавання прадукцыі кожнай галіны на выраб прадукцыі іншых галін (вытворчае спажыванне). Другі квадрант змяшчае паказчыкі выкарыстання прадукцыі на невытворчае спажыванне і накапленне (уключаючы страты і экспарт). У трэцім квадранце паказваецца размеркаванне нацыянальнага даходу, у чацвёртым -- некаторыя працэсы яго пераразмеркавання.

Распрацоўваюцца статыстычная і дынамічная мадэлі Б.м. Асабліва важнае значэнне для планавання мае дынамічная мадэль Б.м. Яна дазваляе вызначыць узаемазбалансаваную сістэму паказчыкаў, якія характарызуюць маштабы і напрамкі развіцця эканомікі, змяненне яе структуры ў планавым перыядзе. Метад Б.м. выкарыстоўваецца не толькі для планавання вырабу і размеркавання прадукцыі, але і для планавання асноўных фондаў, выкарыстання працоўных рэсурсаў, перагляду ўзроўняў цэн у галінах народнай гаспадаркі і прамысловасці.

**БАЛАНС НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ** (Баланс народного хозяйства) -- асаблівы спосаб звядзення сістэмы найбольш абагульненых, узаемазвязаных эканамічных паказчыкаў (грамадскі прадукт, валавы нацыянальны прадукт, прадукцыя I і II падраздзяленняў грамадскай вытворчасці, нацыянальны даход, фонд спажывання, фонд накаплення і інш.), якія характарызуюць узровень развіцця эканомікі, маштабы, тэмпы расшыранага ўзнаўлення і асноўныя народнагаспадарчыя прапорцыі.

У практыцы кіравання эканомікай распрацоўваюцца справаздачныя і планавыя Б.н.г. У справаздачных балансах адлюстроўваюцца з дапамогай указаных паказ-

чыкаў вынікі эканомікі за мінулы перыяд (звычайна за год). Планавыя балансы характарызуюць умовы і вынікі расшыранага ўзнаўлення, якія павінны ажыццявіцца з улікам патрабаванняў аб'ектыўных эканамічных законаў, гаспадарча-палітычных і сацыяльных задач, вызначаных на планавы перыяд. Яны складаюцца галоўным чынам як інструмент распрацоўкі збалансаваных перспектыўных планаў. З іх дапамогай вызначаюцца зыходныя даныя для складання гэтых планаў, устанаўліваюцца асноўныя народнагаспадарчыя прапорцыі (паміж вырабам і спажываннем грамадскага прадукту з улікам яго экспарту і імпарту, паміж вырабам сродкаў вытворчасці і прадметаў спажывання, паміж фондамі спажывання і накаплення і да т.п.).

Паколькі Б.н.г. адлюстроўвае разнастайныя і складаныя сувязі, ён складаецца з некалькіх узаемазвязаных, але самастойных балансавых табліц, якія ўяўля-юць сабой асобныя раздзелы гэтага балансу. Важнейшымі з іх з'яўляюцца наступныя: баланс стварэння, спажывання і накаплення грамадскага прадукту; баланс стварэння, размеркавання і выкарыстання нацыянальнага даходу; баланс працы; баланс элементаў нацыянальнага багацця.

**БАЛАНС НАЦЫЯНАЛЬНАГА ДАХОДУ** (Баланс национального дохода) -- табліца аб'ёму створанага нацыянальнага даходу за пэўны перыяд (звычайна за год), яго размеркавання і канчатковага выкарыстання. У першай частцы балансу паказваецца стварэнне нацыянальнага даходу ў цэлым па матэрыяльнай сферы і ў розных яе галінах. Пры вызначэнні гэтага паказчыка на плануемы перыяд задача заключаецца ў пошуку магчымасцей яго павелічэння. Другая частка балансу адлюстроўвае размеркаванне і пераразмеркаванне нацыянальнага даходу. Нацыянальны даход як зноў створаная вартасць спачатку размяркоўваецца ў вытворчай сферы на даходы работнікаў і прадпрыемстваў гэтай сферы,затым ён пераразмяркоўваецца паміж галінамі самой вытворчай сферы, частка яго накіроўваецца на ўтрыманне і развіццё невытворчай сферы, ажыццяўляецца таксама пераразмеркаванне нацыянальнага даходу паміж саюз-

нымі рэспублікамі і іншымі рэгіёнамі краіны. У трэцяй частцы балансу адлюстроўваецца канчатковае выкарыстанне нацыянальнага даходу на фонд спажывання і фонд накаплення (уключаючы рэзервы). Усе тры часткі (створаны, размяркоўваемы і канчаткова выкарыстоўваемы нацыянальны даход) павінны быць збалансаваны паміж сабой. Пры гэтым важна прывесці ў адпаведнасць вартасны аб'ём фонду спажывання і фонду накаплення з іх матэрыяльна-рэчыўным складам, гэта значыць такія фонды павінны быць забяспечаны рэсурсамі прадметаў спажывання і сродкаў вытворчасці. На аснове гэтага балансу вырашаюцца пытанні, звязаныя з павелічэннем рэальных даходаў насельніцтва, стварэннем умоў для расшыранага ўзнаўлення, развіцця невытворчай сферы, з умацаваннем абараназдольнасці краіны. Б.н.д. служыць базай для распрацоўкі дзяржаўнага бюджэту, балансу грашовых даходаў і расходаў насельніцтва, фінансавых планаў міністэрстваў і іншых вартасных балансаў.

**БАЛАНС ПРАЦОЎНЫХ РЭСУРСАЎ** (Баланс трудовых ресурсов) -- сістэма паказчыкаў, якія характарызуюць расшыранае ўзнаўленне працоўных рэсурсаў грамадства, іх выкарыстанне. Ён распрацоўваецца як інструмент аналізу і планавання гэтых працэсаў. Б.п.р. складаецца з двух узаемазвязаных раздзелаў. У першым раздзеле адлюстроўваюцца колькасць і склад працоўных рэсурсаў (мужчыны ва ўзросце 16 -- 59 год, жанчыны -- 16 -- 54 год) за выключэннем непрацуючых інвалідаў 1-й і 2-й груп, а таксама асобы старэй працаздольнага ўзросту і падлеткі да 16 год, занятыя ў грамадскай гаспадарцы, у другім -- размеркаванне гэтых рэсурсаў па відах занятасці, галінах народнай гаспадаркі і грамадскіх групах (рабочыя, служачыя, калгаснікі).

Б.п.р. распрацоўваюцца як справаздачныя, так і планавыя. Справаздачныя балансы паказваюць фактычны стан працоўных рэсурсаў, прапорцыі, якія складаліся ў іх размеркаванні, рэзервы рабочай сілы. Планавыя балансы вызначаюць колькасць працоўных рэсурсаў у планавым перыядзе зыходзячы з дэмаграфічных даных насельніцтва і паказваюць тое размеркаванне іх па

галінах і па відах занятасці, якое неабходна для развіцця народнай гаспадаркі, прадугледжанага народнагаспадарчым планам.

Б.п.р. распрацоўваецца ў цэлым па краіне, краях і абласцях. Тэрытарыяльныя балансы дазваляюць улічваць асаблівасці ўзнаўлення працоўных рэсурсаў у кожным рэгіёне, абгрунтоўваць маштабы і напрамкі міжраённага пераразмеркавання рабочай сілы шляхам арганізаванага яе набору, перасялення сем'яў, грамадскіх заклікаў і да т.п. На аснове Б.п.р. распрацоўваюцца планы падрыхтоўкі кадраў рабочых і спецыялістаў.

**БАЛАНСАВЫ МЕТАД ПЛАНАВАННЯ** (Балансовый метод планирования) - такая сістэма разлікаў пры распрацоўцы планаў, якая дазваляе ўвязаць, збалансаваць магчымасці з патрэбамі народнай гаспадаркі і насельніцтва ў розных відах прадукцыі, рэсурсаў ( матэрыяльных, працоўных, фінансавых), забяспечыць адпаведнасць паміж даходамі і расходамі на ўсіх узроўнях планавання. Карыстаючыся Б.м.п., можна найбольш правільна вызначыць існуючыя прапорцыі, выявіць з'яўленне дыспрапорцый у народнай гаспадарцы, нявыкарыстаныя рэзервы, устанавіць і забяспечыць новыя прапорцыі на планавы перыяд.

У народнай гаспадарцы фарміруюцца разнастайныя эканамічныя прапорцыі: агульнаэканамічныя (паміж вырабам сродкаў вытворчасці і прадметаў народнага спажывання, паміж фондам спажывання і фондам накаплення ў нацыянальным даходзе і да т.п.), міжгаліновыя і ўнутрыгаліновыя (паміж прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, паміж здабываючай і апрацоўчай прамысловасцю і да т.п.); міжраённыя і ўнутрыраённыя, знешнеэканамічныя. Для ўстанаўлення ўсіх гэтых прапорцый выкарыстоўваецца Б.м.п. шляхам распрацоўкі цэлай сістэмы балансаў, якая ўключае прыватныя эканамічныя балансы і баланс народнай гаспадаркі. Усе асобныя прыватныя эканамічныя балансы дзеляцца на тры групы: матэрыяльныя, вартасныя і працоўныя. З дапамогай першай групы балансаў устанаўліваюцца матэрыяльна-рэчыўныя прапорцыі вытворчасці, дасягаецца іх узаемная ўвязка ў плане развіцця асобных галін.

Вартасныя балансы заклiканы ўвязваць даходы i расходы прадпрыемстваў (аб'яднанняў), мiнiстэрстваў, насельнiцтва i да т.п. Працоўныя балансы выкарыстоўваюцца для ўстанаўлення адпаведнасцi памiж працоўнымi рэсурсамi i патрэбамi народнай гаспадаркi ў гэтых рэсурсах. Баланс народнай гаспадаркi ў цэлым дазваляе абгрунтаваць у працэсе планавання найбольш абагульненыя паказчыкi i агульнаэканамiчныя прапорцыi.

**БАЛАНСЫ МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ** (Балансы материальные) -- сукупнасць балансаў, якiя характарызуюць суадносiны памiж вырабам i спажываннем асобных вiдаў прадукцыi, аб'ём якой вымяраецца ў натуральных адзiнках або ў грашовым выражэннi. Б.м.з'яўляюцца адным з важнейшых iнструментаў аналiзу i планавання забеспячэння прапарцыянальнасцi памiж рознымi галiнамi i падгалiнамi народнай гаспадаркi. Б.м. распрацоўваюцца па такiх вiдах прадукцыi, як палiва, электраэнергiя, металы,будаўнiчыя матэрыялы, асноўныя вiды прадукцыi хiмiчнай i нафтахiмiчнай прамысловасцi, лесаматэрыялы, машыны i абсталяванне, сельскагаспадарчая сыравiна, важнейшыя тавары народнага спажывання.

Структура Б.м. па асобных вiдах сродкаў вытворчасцi i прадметах спажывання мае сваю спецыфiку. Але ўсе гэтыя балансы маюць дзве часткi: з аднаго боку, паказваюцца рэсурсы па асноўных крынiцах паступлення (астаткi на пачатак, выраб, iмпарт, разбранiраванне дзяржаўных рэзерваў, iншыя паступленнi), з другога -- вызначаюцца патрэбы народнай гаспадаркi па асноўных вiдах спажывання (вытворча-эксплуатацыйныя патрэбы капiтальнага будаўнiцтва, рыначныя фонды, экспарт, папаўненне дзяржаўных рэзерваў, астаткi на канец года). Галоўная задача распрацоўкi ўсiх гэтых балансаў заключаецца ў забеспячэннi поўнай адпаведнасцi рэсурсаў запланаваным патрэбам народнай гаспадаркi i насельнiцтва ў той цi iншай прадукцыi.

**БАНК ДАНЫХ** (Банк данных) -- сiстэма спецыяльным спосабам арганiзаваных даных (баз даных), прызначаных для забеспячэння цэнтралiзаванага назапашвання i калектыўнага многамэтавага выкарыстання гэ-

тых даных.

**БАНКАЎСКАЯ СІСТЭМА** (Банковская система) -- сукупнасць эканамічных адносін і розных відаў устаноў у іх узаемасувязі, якія абслугоўваюць адпаведныя крэдытныя адносіны. Згодна з асноўнымі палажэннямі карэннай перабудовы кіравання эканомікай, з мэтай павышэння ролі банкаў у развіцці народнай гаспадаркі, больш поўнага ўліку асаблівасцей вытворчай дзейнасці прадпрыемстваў, метадаў гаспадарання праведзены рэарганізацыі Б.с. у 1988 і 1990 гг. Важнейшымі задачамі банкаў вызначаны: радыкальнае ўдасканаленне крэдытнага механізму, прывядзенне яго ў адпаведнасць з патрабаваннямі перабудовы кіравання народнай гаспадаркай, эканамічнае стымуляванне пры дапамозе крэдыту і іншых банкаўскіх рычагоў дасягнення высокіх канчатковых вынікаў у дзейнасці ўсіх звёнаў народнай гаспадаркі, разнастайнае ўмацаванне грашовага абарачэння, павышэнне ўстойлівасці і пакупной здольнасці рубля, арганізацыя найбольш эканамічных форм крэдытавання і разлікаў, удасканаленне валютна-фінансавых і крэдытна-разліковых адносін з замежнымі краінамі, укараненне камерцыйных пачаткаў у дзейнасці саміх банкаў. Ставіцца задача ператварэння банкаў са сціплых пасрэднікаў у арганізатараў гаспадарча-эканамічных сувязей прадпрыемстваў на аснове поўнага гаспадарчага разліку і з улікам усялякага выкарыстання розных форм гаспадарання.

Б.с. Рэспублікі Беларусь з'яўляецца дзвюхузроўневай і ўключае Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, камерцыйныя банкі і другія крэдытныя арганізацыі, зарэгістраваныя ва ўстаноўленым парадку.

*Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь* -- цэнтральны банк рэспублікі знаходзіцца ў яе ўласнасці і падпарадкаваны Вярхоўнаму Савету. Галоўнымі функцыямі Нацыянальнага банка з'яўляюцца: грашова-крэдытнае рэгуляванне, арганізацыя межбанкаўскіх разлікаў і касавае абслугоўванне камерцыйных банкаў; арганізацыя (сумесна з Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь касавага выканання дзяржаўнага бюджэту праз камерцыйныя банкі; кантроль за рэгістрацыяй камер-

цыйных банкаў і выкананне імі абавязковых нарматываў; прымяненне банкаўскага заканадаўства; кантроль за адкрыццём філіялаў і прадстаўніцтваў замежных банкаў у рэспубліцы; рэгуляванне знешнеэканамічнай банкаўскай дзейнасці; рэгуляванне крэдытнага рынку; забеспячэнне адзінага парадку бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці ў банкаўскай сістэме рэспублікі.

*Камерцыйныя банкі* на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, арганізаваныя на паявых ці акцыянерных пачатках, ажыццяўляюць сваю дзейнасць галоўным чынам з мэтай акумуляцыі часова свабодных грашовых сродкаў прадпрыемстваў, арганізацый, насельніцтва і іх рацыянальнага выкарыстання на патрэбы развіцця галіны, падгаліны народнай гаспадаркі, групы прадпрыемстваў або рэгіёну, ажыццяўляюць і іншыя банкаўскія аперацыі. Па формах уласнасці гэтыя банкі могуць быць дзяржаўнымі, кааператыўнымі, змешанымі, а таксама з удзелам замежнага капіталу; па відах дзейнасці -- універсальнымі ці спецыялізаванымі на асобных банкаўскіх аперацыях. Яны лічацца створанымі і набываюць статут юрыдычнай асобы з моманту рэгістрацыі ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь.

**БАНКІ** (Банки) -- асобныя крэдытныя інстытуты, якія акумулююць свабодныя грашовыя сродкі, выдаюць крэдыты, ажыццяўляюць разлікі, эмісійна-касавыя аперацыі, рэгулююць грашовае абарачэнне, праводзяць аперацыі з валютай, каштоўнымі паперамі. Узніка- юць у грамадска-эканамічных фармацыях, дзе існуюць таварна-грашовыя адносіны.

Па функцыях і характару выконваемых аперацый могуць быць Б. доўгатэрміновых і кароткатэрміновых укладанняў, эмісійныя (цэнтральныя), змешаныя. Б. могуць стварацца па ініцыятыве дзяржавы (дзяржаўныя) і па рашэннях аб'яднанняў, фірм, кааперацыі і г.д. (камерцыйныя, кааператыўныя, інавацыйныя і інш.). У сферы міжнароднага абароту ўзнікаюць міжнародныя Б.

**БРАК ВЫТВОРЧЫ** (Брак производственный) -- прадукцыя (вырабы, дэталі, загатоўкі і да т.п.), выраблена з адхіленнем ад стандартаў, чарцяжоў і тэхнічных

умоў. Б.в. падраздзяляецца на брак, які можна выправіць (калі гэта тэхнічна магчыма і эканамічна мэтазгодна), і брак канчатковы, які падлягае ўтылізацыі. Па месцы выяўлення Б.в. адрозніваецца: унутры прадпрыемства, выяўлены ў ходзе вытворчага працэсу, і знешні брак, выяўлены за межамі прадпрыемства, у спажыўца. Выпуск бракаванай прадукцыі і рэалізацыя яе па прамому прызначэнню забаронены законам. Б.в. ва ўсіх выпадках з'яўляецца стратай. Ён павялічвае расход матэрыялаў, інструментаў, энергіі, паніжае прадукцыйнасць працы, памяншае колькасць выпускаемай прадукцыі, пагаршае выкарыстанне абсталявання і вытворчых магутнасцей, парушае раўнамерную работу, вядзе да павышэння сабекошту прадукцыі.

Для выяўлення прычын і вінаватых у дапушчэнні Б.в. праводзіцца яго аналіз. Прычынамі Б.в. з'яўляюцца: парушэнні тэхналагічнага працэсу, няспраўнасць абсталявання ці выкарыстанне яго не па прызначэнню, недастатковая кваліфікацыя ці неахайнасць работніка, дэфекты зыходнага матэрыялу, памылкі ў чарцяжах і тэхналагічных картах, нізкі ўзровень тэхнічнага кантролю за якасцю прадукцыі і да т.п. Велічыня страт ад Б.в. улічваецца ў натуральным і вартасным выражэнні. Улік у натуральным выражэнні дае магчымасць вызначыць удзельную вагу бракаванай прадукцыі ў агульным яе выпуску па кожнаму найменню і распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па яе зніжэнню. Агульныя страты цэха, прадпрыемства ад Б.в. улічваюцца ў вартасным выражэнні. Працэнт страт ад браку вызначаецца шляхам аднясення іх да сабекошту валавога выпуску прадукцыі, памножанага на 100. У страты ўключаюцца: кошт матэрыялаў, заработная плата, цэхавыя расходы, затраты на выпраўлен- не браку за мінусам кошту ўтылю.

Вінаватай у дапушчэнні Б.в. лічыцца канкрэтная асоба. Працоўным заканадаўствам устаноўлена матэрыяльная адказнасць за ўрон, нанесены прадпрыемству.

**БРЫГАДА ВЫТВОРЧАЯ** (Бригада производственная) -- пярвічная ячэйка працоўнага калектыву, нізавое звяно кіравання. Б.в. аб'ядноўвае рабочых для сумесна-

га і найбольш эфектыўнага выканання вытворчага задання на аснове найбольш рацыянальнага выкарыстання абсталявання, рабочага часу, таварыскай узаемадапамогі, агульнай зацікаўленасці і адказнасці за вынікі работы. Яна з'яўляецца і эфектыўнай формай удзелу рабочых у кіраванні вытворчасцю, выхавання гаспадарлівых адносін да справы. У залежнасці ад форм раздзялення і кааперацыі працы,характару прымяняемай тэхналогіі, узроўню механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці ствараюцца спецыялізаваныя і комплексныя брыгады.

Спецыялізаваныя Б.в. аб'ядноўваюць рабочых адной прафессіі, занятых на аднародных тэхналагічных працэсах. Яны ствараюцца тады, калі аб'ём і характар работы дазваляюць забяспечыць поўную загрузку рабочых ў адпаведнасці з іх прафесіяй і кваліфікацыяй, а канчатковы вынік працы поўнасцю залежыць ад дадзенага калектыву. Комплексныя брыгады ствараюцца з рабочых розных прафесій для выканання комплексу тэхналагічна разнародных, але ўзаемазвязаных работ, якія ахопліваюць поўны цыкл вырабу прадукцыі або яе закончаную частку. Яны прымяняюцца ва ўмовах прадметнай спецыялізацыі вытворчасці, калі канчатковы вы нік работы брыгады залежыць ад узгодненых дзеянняў рабочых розных прафесій і іх кваліфікацыі.

Спецыялізаваныя і комплексныя брыгады могуць быць зменнымі, калі ўсе рабочыя гэтых брыгад працуюць у адну змену, або скразнымі, калі ў іх уключаны рабочыя ўсіх змен. У скразных брыгадах лягчэй вызначаецца канчатковы вынік іх працы, паляпшаецца аб'ём незавершанай вытворчасці, скарачаецца цыкл вытворчасці, павышаецца якасць прадукцыі, ствараюцца лепшыя ўмовы для захавання абсталявання, інструменту, матэрыялаў.

Б.в. узначальвае брыгадзір -- перадавы кваліфікаваны рабочы, які валодае арганізатарскімі здольнасцямі і карыстаецца аўтарытэ- там у членаў брыгады.

На этапе праектавання Б.в. вызначаюцца формы падзелу і кааперацыі працы, аб'ёмы работы, вытворчыя плошчы і абсталяванне, якія замацоўваюцца за брыга-

дай, рэжым працы і адпачынку, парадак чаргавання выконваемых работ, колькасны склад брыгады, сістэма матэрыяльнага і маральнага стымулявання, удакладняюцца тэхналагічны працэс, нормы часу і выпрацоўкі, планавыя паказчыкі работы.

**БРЫГАДНЫ ГАСПАДАРЧЫ РАЗЛІК** (Бригадный хозрасчет) -- арганічная частка гаспадарчага разліку прадпрыемства; пабудаваны на аператыўна-вытворчай самастойнасці брыгады, на сувымярэнні затрат і атрыманага эфекту, устанаўленні прамой залежнасці аплаты працы ад канчатковых яе вынікаў. Гаспадарчаразліковай брыгадзе побач з аб'ёмам вытворчасці, зніжэннем працаёмкасці (ростам прадукцыйнасці працы) і павышэннем якасці працы) ўстанаўліваюцца планавыя паказчыкі па фонду заработнай платы, нормы расходу сыравіны, матэрыялаў, паўфабрыкатаў, паліва, энергіі і іншых матэрыяльных рэсурсаў, выкарыстанне якіх залежыць ад яе работы. Абавязковай умовай брыгаднага гаспадарчага разліку з'яўляюцца распрацоўка і давядзенне да брыгады абгрунтаваных нарматываў на затраты жывой працы і матэрыяльных рэсурсаў, а таксама арганізацыя ўліку фактычнага іх выкарыстання.

Аплата працы вядзецца па адзінаму нараду па канчатковых выніках. Акрамя заработнай платы брыгада можа атрымліваць прэміі за асноўныя вынікі работы, за эканомію матэрыяльных рэсурсаў. Размеркаванне калектыўнага заработку паміж членамі брыгады вядзецца з улікам індывідуальнага ўкладу кожнага работніка ў агульныя працоўныя вынікі брыгады.

Далейшым развіццём брыгаднага гаспадарчага разліку з'яўляец ца брыгадны падрад, пры якім уся вытворчая дзейнасць падраднага калектыву будуецца на аснове дагавора з адміністрацыяй, які заключаецца на пэўны тэрмін і вызначае правы і абавязкі падраднага калектыву і адміністрацыі, адказнасць бакоў.

Падраднаму калектыву ў адпаведнасці з дагаворам даручаецца выкананне пэўнага аб'ёму работ, адначасова за ім замацоўваюцца прылады і сродкі працы, прадастаўляюцца неабходныя вытворчыя рэсурсы, ствараюцца ўмовы для паспяховай работы і ўстанаўліваюцца

доўгатэрміновыя нарматывы вызначэння сродкаў на аплату працы. Калектыву гарантуецца адпаведная зарплата пры якасным выкананні вызначанага дагаворам аб'ёму работ у абумоўленыя тэрміны, незалежна ад таго, якой колькасцю рабочых ён выкананы.

**БЮДЖЭТ ДЗЯРЖАЎНЫ** (Бюджет государственный) -- асноўны фінансавы план краіны, які выражае сістэму грашовых адносін, што звязаны з утварэннем і выкарыстаннем цэнтралізаванага фонду грашовых сродкаў дзяржавы.

У Б.дз.паступаюць плацяжы дзяржаўных прадпрыемстваў, арганізацый, падаткі і зборы з насельніцтва.

У адпаведнасці з Законам аб прадпрыемстве ўзаемаадносіны прадпрыемстваў з бюджэтам пераведзены на доўгатэрміновую нарматыўную базу. Асноўнымі плацяжамі ў бюджэт выступаюць падатак з прыбытку і даходаў, падатак на дадатковую вартасць, а таксама экалагічны падатак, акцызы і інш. Гэта мае вялікае значэнне для павышэння даходнай базы бюджэту. Падаткі з насельніцтва складаюць нязначную частку.

Б.дз. складаецца на аснове плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Ён звязаны і актыўна ўздзейнічае на фарміраванне і выкарыстанне фінансавых планаў прадпрыемстваў, галін народнай гаспадаркі, выконвае вядучую ролю ў сістэме фінансавых планаў.

Прызначэнне бюджэту заключаецца ў тым, каб забяспечыць фінансавымі рэсурсамі патрэбы развіцця народнай гаспадаркі, сацыяльна-культурныя мерапрыемствы, утрыманне органаў дзяржаўнага кіравання,абарону краіны. Праз Б.дз. адбываецца міжгаліновае і міжтэрытарыяльнае пераразмеркаванне грашовых сродкаў, што з'яўляецца асновай для выраўноўвання ўзроўняў развіцця розных рэгіёнаў, рацыянальнага размяшчэння прадукцыйных сіл, забеспячэння планавых прапорцый. Ён неабходны для фінансавання расходаў на асвету, ахову здароўя, навуку, культуру, сацыяльнае забеспячэнне, павышэнне дабрабыту народа.

У аснове складання бюджэту ляжыць прынцып збалансаванасці яго даходаў і расходаў. Недахоп фінансавых рэсурсаў для пакрыцця расходаў

з'яўляецца прычынай дэфіцыту бюджэту. Бюджэтны дэфіцыт назіраецца з 70-х гадоў як вынік матэрыяльна-фінансавых дыспрапорцый у эканоміцы, вялікіх маштабаў датацыйнасці, значных страт у народнай гаспадарцы. Пераадольванне незбалансаванасці бюджэту павінна ажыццяўляцца праз аздараўленне фінансаў краіны,умацаванне ўсёй эканомікі.

**БЮДЖЭТНАЯ СІСТЭМА** (Бюджетная система) уяўляе сабой сукупнасць розных відаў бюджэтаў, аб'яднаных па адзіных прынцыпах у Дзяржаўным бюджэце. Бюджэтная будова выражае арганізацыю Б.с. і прынцыпы яе пабудовы. Б.с. будуецца на прынцыпах адзінства, дэмакратычнага цэнтралізму. Дзяржаўны бюджэт рэспублікі аб'ядноўвае рэспубліканскі і самастойныя мясцовыя бюджэты. Да мясцовых бюджэтаў адносяцца бюджэты абласцей, раёнаў, гарадоў, сельскія і пасялковыя бюджэты. Ім належыць важная роля ў забеспячэнні комплекснага эканамічнага і сацыяльнага развіцця тэрытарыяльнай адзінкі. Важным элементам бюджэтнай будовы з'яўляецца бюджэтнае права, якое ўяўляе сабой сукупнасць юрыдычных норм, што вызначаюць асновы бюджэтннай будовы, правы органаў дзяржаўнай улады і кіравання па складанню, разгляду, зацвярджэнню бюджэту, а таксама па кантролю за яго выкананнем.

## В

**ВАЛАВЫ ДАХОД** (Валовой доход) -- сукупны даход, створаны жывой працай як у межах адасобленых прадпрыемстваў, так і ў маштабе ўсёй грамадскай вытворчасці. З пункту гледжання вартасці В.б. уяўляе сабой нанава створаную вартасць, а з пункту гледжання матэрыяльна-рэчыўнага -- чысты прадукт.  В.д. усёй грамадскай вытворчасці ўяўляе сабой нацыянальны даход грамадства.

На ўзроўні прадпрыемства В.д. вызначаецца як розніца паміж коштам валавой або рэалізаванай прадукцыі і коштам матэрыяльных і прыроўненых да іх затрат. Прынцыпова такім жа шляхам вызначаецца В.д. на ўзроўні грамадскай вытворчасці.

Ва ўмовах гаспадарчага разліку і арэнды В.д. стаў важным паказчыкам дзейнасці прадпрыемстваў.

**ВАЛАВЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПРАДУКТ** (Валовой национальный продукт) -- адзін з абагульненых паказчыкаў грамадскай вытворчасці, які характарызуе ўсю сукупнасць матэрыяльных даброт і паслуг у спецыфічнай ацэнцы -- па цэнах без вартасці выкарыстаных матэрыяльных затрат. Прымяняецца ў нашай практыцы з 1988 г., у міжнароднай жа практыцы і замежных краінах выкарыстоўваецца даўно. Істотнае адрозненне В.н.п. ад іншых абагульненых паказчыкаў, напрыклад ад сукупнага грамадскага прадукту, у тым, што ў склад В.н.п. уключаюцца паслугі невытворчай сферы. Тым самым В.н.п. характарызуе канчатковыя вынікі эканамічнай дзейнасці як матэрыяльнай вытворчасці, так і невытворчай сферы,што мае важнае значэнне для планавання і ацэнкі росту дабрабыту насельніцтва.

В.н.п. адрозніваецца і ад нацыянальнага даходу, папершае, тым, што ў яго ўключаецца знос асноўных фондаў (гэтым В.н.п. набліжаецца да канчатковага прадукту). Па-другое, на стадыі фарміравання даходаў В.н.п. вызначаецца як агульная сума даходаў усіх прадпрыемстваў і насельніцтва, уключаючы даходы невытворчай сферы і занятых ў ёй работнікаў, даходы, атрыманыя ад індывідуальнай працоўнай дзейнасці, і амартызацыйныя адлічэнні. Выкарыстаны В.н.п. выяўляецца як канчатковае спажыванне матэрыяльных даброт і паслуг, капітальныя ўкладанні, прырост матэрыяльных абаротных сродкаў і сальда знешняга гандлю. Як бачна, В.н.п. дазваляе больш шырока і глыбока аналізаваць працэсы ўзнаўлення, узаемасувязь матэрыяльнай і нематэрыяльнай вытворчасці, фарміраванне даходаў і працэс спажывання матэрыяльных даброт і паслуг. З дапамогай В.н.п. можна праводзіць міжнародныя параўнанні эканамічных паказчыкаў.

**ВАЛЮТА** (Валюта) -- 1) грашовая адзінка краіны (напрыклад, рубель -- валюта СНД, долар -- валюта ЗША і г.д.) і яе тып (залатая, сярэбраная, папяровая); 2) грашовыя знакі замежных дзяржаў, а таксама крэдытныя сродкі абарачэння і плацяжу, выражаныя ў замежных грашовых адзінках (вэксалі, чэкі і да т.п.), якія выкарыстоўваюцца ў міжнародных разліках (замежная

валюта). Формы арганізацыі грашовых адносін, уключаючы нацыянальныя валютныя і банкаўскія ўстановы, ствараюць валютныя сістэмы, якія ахопліваюць спачатку нацыянальную гаспадарку той ці іншай краіны, а потым і міжнародныя эканамічныя сувязі. Спачатку яны былі заснаваны на базе залатога стандарту, пры якім валюты асобных краін свабодна разменьваліся на золата, а золата - на любую валюту. Золата мела цвёрдую цану, і *курс В.* вызначаўся яе залатым утрыманнем. На змену залатому стандарту прыйшла сістэма золатавалютнага стандарту, для якой характэрна папяровая В. Яе курс падтрымліваецца золатам, а неразменныя (на золата) банкноты і папяровыя грошы з'яўляюцца знакамі золата і замяняюць яго толькі ў функцыях сродкаў абарачэння і плацяжу. Калі ў абарачэнні знаходзіцца больш папяровых грошай,чым патрэбна, то наступае іх абясцэньванне -- *інфляцыя.*

Валютныя адносіны паміж краінамі засноўваюцца цяпер на "плаваючых", зменлівых курсах адной нацыянальнай В. у адносінах да іншых валют ці долара, якія вызначаюцца іх пакупной здольнасцю на ўнутраных рынках краін, а таксама попытам і прапановай гэтых валют на міжнародным рынку.

**ВАРТАСЦЬ** (Стоимость) -- увасобленая ў тавары і арэчаўленая ў ім грамадская праца таваравытворцаў. Гэта эканамічная катэгорыя таварнай вытворчасці адлюстроўвае грамадскія адносіны людзей у форме таварна-грашовага абмену. Прадукт працы таваравытворцаў выступае ў форме тавару, які мае дзве ўласнасці: спажывецкую В. і абменную В. *Спажывецкая В.* як здольнасць знешняга прадмету, рэчы задавальняць, дзякуючы яе ўласнасці, якую-небудзь патрэбу чалавека існавала заўсёды. Але ў тавары яна павінна задавальняць патрэбы не самога вытворцы, а іншых, быць грамадскай спажывецкай В., матэрыяльным носьбітам другой уласнасці тавара -- *абменнай В.*, яго цаны. Пры абмене ідзе сувымярэнне тавараў з рознай спажывецкай В. Гэта магчыма таму, што ва ўсіх таварах арэчаўлена адна і тая ж субстанцыя -- грамадская праца. У гэтай якасці яны і ёсць вартасць, таварная В., якая праяўляе сябе ў форме

абменнай В. Апошняя прайшла гістарычны шлях развіцця ад першых простых форм абмену да абарачэння тавараў з дапамогай грошай, якія сталі канчатковай формай В.

Праца таваравытворцаў мае дваісты характар. Абменьваючыся таварамі як спажывецкімі вартасцямі, таваравытворцы абменьваюцца пры гэтым рознымі відамі канкрэтнай працы, якія яны ствараюць. Кожны таваравытворца, аддаўшы сваю рэч, атрымлівае яе эквівалент -- другую рэч, у якой таксама будзе ўвасоблена грамадская праца, праца наогул, абстрактная праца як матэрыяльны згустак затрат чалавечых мускулаў, нерваў, мозгу. *Абстрактная праца* і стварае В. тавара. Але праца наогул і грамадская праца як праца на іншых існуюць на ўсіх этапах развіцця грамадства. Абстрактная праца -- не проста грамадская праца, а яе спецыфічная форма, уласцівая толькі тварнай вытворчасці. Гэта спецыфіка заключаецца ў тым, что праца таваравытворцаў, раз'яднаных прыватнай уласнасцю, выступае непасрэдна як прыватніцкая. У той жа час таваравытворцы звязаны паміж сабой грамадскім падзелам працы, і іх праца носіць грамадскі характар. Але ён схаваны пад абалонкай *спажывецкай В.* Сваё грамадскае значэнне праца выяўляе толькі ў абмене, толькі пасля таго, як яна здзейнілася. Абстрактная праца, якая стварае В., уласціва толькі тварнай вытворчасці і адлюстроўвае эканамічныя адносіны адасобленых таваравы-творцаў. Дадзенае вызначэнне ў аднолькавай ступені адносіцца і да матэрыялізацыі абстрактнай працы.В.- гэта не прыродная, а грамадская ўласнасць тавару.

Адкрыццё сутнасці В. як адносін паміж таваравытворцамі ў плане затрат грамадскай працы на вытворчасць тавараў і іх абмен дазваляе ўстанавіць і *велічыню В. тавару.* Яна колькасна вызначаецца грамадска неабходным рабочым часам, затрачаным на вытворчасць пераважнай большасці тавараў. Зразумела, што велічыня В. тавару прама прапарцыянальна колькасці і адваротна прапарцыянальна вытворчай сіле працы. Неабходнасць вырабу і абмену тавараў у адпаведнасці з велічынёй В. выяўляе дзеянне закону вартасці.*Закон В.*

праяўляецца як закон цэн, у аснове якіх ляжыць В. Адхіленне цаны ад В. як аб'ектыўны закон стыхійна рэгулюе грамадскую вытворчасць, сувязі паміж яе ўдзельнікамі, размеркаванне і стымуляванне грамадскай працы ва ўмовах таварна-грашовых адносін, вызначае лёс таваравытворцаў.

**ВЕДАМАСНАСЦЬ** (Ведомственность) -- паняцце, вытворнае ад слова "ведамства", якое азначае галіну дзяржаўнага кіравання і сістэму абслугоўваючых яе ўстаноў або ўстаноў, якія знаходзяцца ў распараджэнні якога-небудзь афіцыйнага органа ці асобы. В. азначае абмежаванне пры вырашэнні сацыяльна-эканамічных пытанняў вузкімі інтарэсамі толькі сваёй установы, міністэрства. В. у гэтым сэнсе ўступае ў супярэчнасць з народнагаспадарчымі, грамадскімі інтарэсамі. Задача планавага навукова абгрунтаванага кіравання заключаецца ў тым, каб падпарадкаваць ведамасныя інтарэсы інтарэсам грамадства і кожнага чалавека.

**ВОЛЬНЫ ЧАС** (Свободное время) -- частка пазаработнага часу членаў грамадства, якая выкарыстоўваецца на адпачынак, вучобу, павышэнне кваліфікацыі, ажыццяўленне імі сваіх правоў як чалавека, сем'яніна, грамадзяніна.

В.ч. -- складаная эканамічная і сацыяльная катэгорыя, у якой адлюстроўваюцца лад жыцця членаў грамадства, аб'ём і структура іх матэрыяльных і духоўных патрэб. Велічыня В.ч. вызначаецца шляхам выключэння з пазарабочага часу такіх элементаў, як вядзенне хатняй гаспадаркі, сон, яда і да т.п.

В.ч. з'яўляецца адным з фактараў усебаковага, гарманічнага развіцця асобы, паказчыкам больш высокага ўзроўню жыцця, сродкам павышэння магчымасцей для развіцця творчых здольнасцей і дараванняў чалавека, паказчыкам і фактарам павелічэння нацыяльнага багацця краіны.

Існуе цесная дыялектычная ўзаемасувязь паміж прадукцыйнасцю працы і В.ч. Крыніцай павелічэння В.ч. служыць перш за ўсё скарачэнне працягласці рабочага дня, рабочага тыдня, якое дасягаецца на аснове павышэння прадукцыйнасці працы. Важную ролю ў па-

велічэнні В.ч. адыгрывае таксама больш рацыянальнае выкарыстанне пазарабочага часу.

В.ч.,садзейнічаючы павышэнню культурна-тэхнічнага ўзроўню і кваліфікацыі працоўных, развіццю іх творчых здольнасцей, аказвае адваротны актыўны ўплыў на рост прадукцыйнасці працы і больш плённае выкарыстанне рабочага часу.

**ВЫДАТКІ АБАРАЧЭННЯ** (Издержки обращения) -- затраты жывой і арэчаўленай працы, выражаныя ў грашовай форме, на давядзенне тавару ад вытворчасці да непасрэднага спажыўца.

В.а. падраздзяляюцца на дзве групы: "чыстыя" і дадатковыя. "Чыстыя" В.а. звязаны з актам куплі-продажу, гэта значыць ператварэннем таварнай вартасці ў грашовую ў працэсе рэалізацыі тавару. Яны не дадаюць да тавару ніякай вартасці і з'яўляюцца непрадукцыйнымі затратамі. Кампенсаванне гэтых В.а. ажыццяўляецца за кошт прыбавачнага прадукту, створанага ў прамысловасці. Дадатковы В.а. абумоўлены працягам працэсу вытворчасці ў сферы абарачэння. Гэтыя В.а. з'яўляюцца прадукцыйнымі і дадаюць да вартасці тавару новую вартасць. Крыніцай кампенсавання дадатковых В.а. з'яўляецца вартасць, створаная ў самім таварным абарачэнні.

"Чыстыя" В.а. складаюць прыблізна 35 -- 40 %, дадатковыя -- 60 -- 65 %. Паколькі галоўная функцыя гандлю -- гэта змена форм вартасці, рэалізацыя тавару насельніцтву, павышэнне якасці абслугоўвання, то перад прамысловасцю пастаўлена задача павелічэння выпрабу тавараў, максімальна падрыхтаваных да продажу і спажывання. Таму доля "чыстых" В.а. узрастае.

У сувязі з пераходам гандлю на гаспадарчы разлік і самафінансаванне рэзка ўзрасла зацікаўленасць гандлёвых работнікаў у эканоміі В.а. Асноўныя фактары, якія садзейнічаюць зніжэнню В.а.: рост прадукцыйнасці працы ў сферы абарачэння, тавараруху, навуковая арганізацыя працы, паляпшэнне выкарыстання гандлёвых, дапаможных складскіх памяшканняў, абсталявання, паскарэнне тавараабароту, развіццё прагрэсіўных форм абслугоўвання.

**ВЫДАТКІ ГРАМАДСТВА** (Издержки общества) -- від выдаткаў вытворчасці, якія ўяўляюць сабой сукупныя затраты працы (жывой і мінулай) на выраб прадукту; гэта сапраўдныя або іманентныя выдаткі на выраб прадукту, вымераныя працоўным часам.

В.г. адлюстроўваюць, колькі каштуе для грамадства прадукт або тавар. Акрамя В.г. існуюць выдаткі прадпрыемства, якія ўказваюць на кошт прадукту для прадпрыемства. Выдаткі прадпрыемства звычайна меншыя, чым В.г., на велічыню прыбавачнай вартасці.

В.г. увасабляюцца ў вартасці тавару, а выдаткі прадпрыемства -- у яго сабекошце. Велічыня В.г., змешчаная ў прадукце,залежыць ад эфектыўнасці сродкаў працы і ад прадукцыйнасці працы. Чым вышэйшая эфектыўнасць сродкаў працы і яе прадукцыйнасць, тым меншыя В.г. на выраб прадукту.

**ВЫДАТКІ ПРАДПРЫЕМСТВА** (Издержки предприятия) -- сукупнасць выдаткаў мінулай працы, роўная вартасці выкарыстаных сродкаў вытворчасці і выдаткаў жывой працы, якія ствараюць неабходны прадукт. У грашовай форме В.п. адлюстроўваюцца ў сабекошце прадукцыі. У гаспадарчай практыцы сабекошт адхіляецца ад В.п. з прычыны кампенсацыі часткі затрат на вытворчасць з дзяржаўнага бюджэту ў форме датацый і інш. В.п. уяўляюць сабой частку вартасці прадукцыі, якая адлюстроўвае грамадскія выдаткі вытворчасці. Яны меншыя, чым грамадскія выдаткі вытворчасці, на велічыню затрат жывой працы, якія ствараюць прабавачны прадукт. Зніжэнне В.п. -- важнейшая ўмова ўсебаковай інтэнсіфікацыі і павышэння эфектыўнасці вытворчасці. Дасягаецца яно шляхам павышэння прадукцыйнасці працы, паляпшэння выкарыстання сыравіны, матэрыялаў і асноўных вытворчых фондаў, далейшага паглыблення спецыялізацыі і кааперыравання, развіцця камбінавання. Важнейшымі фактарамі зніжэння В.п. з'яўляюцца ўдасканаленне гаспадарчага механізму, пераход да эканамічных метадаў кіравання, ліквідацыя безгаспадарчасці.

**ВЫПРАЦОЎКА** (Выработка) -- паказчык прадукцыйнасці працы, які характарызуе эфектыўнасць жывой

працы. В. як паказчык выкарыстоўваецца пры планаванні і ўліку на ўсіх узроўнях прамысловай вытворчасці і вызначаецца як адносіны выпрацаванай прадукцыі да сярэднеспісачнай колькасці прамыслова-вытворчага персаналу за год, квартал, месяц або да адпрацаванай ім колькасці чалавека-дзён (чалавека-гадзін). Згодна з гэтым адрозніваюць гадавую, квартальную, месячную, дзённую і гадзінную В. У залежнасці ад метаду вымярэння аб'ёму прадукцыі В. вызначаецца ў натуральным, вартасным і працоўным вымярэнні.

В. у натуральным вымярэнні найбольш поўна характарызуе эфектыўнасць працы, але прымяняецца яна толькі на прадпрыемствах і ў галінах з вырабам аднароднай прадукцыі (вугальная, хімічная, нафтавая).

Пры выпуску разнастайнай прадукцыі прымяняецца вартасны метад, заснаваны на вымярэнні аб'ёму вырабу прадукцыі паказчыкамі валавой і таварнай прадукцыі ў аптовых цэнах.Іх велічыню ў пэўнай ступені скажаюць матэрыялаёмкасць прадукцыі, асартыментныя змены, узровень кааператыўных паставак. Больш правільна вызначаць вартасны паказчык В. на аснове "чыстай" прадукцыі, якая пазбаўляе ўказаных недахопаў.

Пры працоўным метадзе вымярэння В. аб'ём выпрацаванай прадукцыі вымяраецца ў нарматыўным рабочым часе, а велічыня В. -- шляхам дзялення аб'ёму вытворчасці ў норма-гадзінах на адпрацаваны час. Прымяняецца гэты метад ва ўнутрызаводскім планаванні (у механічных, рамонтных і інструментальных цэхах, у брыгадах і на рабочых месцах). Неабходная ўмова яго прымянення -- высокі ўзровень арганізацыі нарміравання і ўлік фактычных затрат працы. Важнейшымі фактарамі росту В. з'яўляюцца: укараненне навукова-тэхнічных дасягненняў у вытворчасць, навуковая арганізацыя вытворчасці і працы, павышэнне кваліфікацыі работнікаў, узмацненне матэрыяльнай зацікаўленасці ў канчатковых выніках працы.

**ВЫРУЧКА АД РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАДУКЦЫІ** (Выручка от реализации продукции) -- сума грашовых сродкаў, якія паступілі на разліковы ці спецыяльны пазыковы рахунак прадпрыемства (аб'яднання) за адгру-

жаную пакупнікам прадукцыю і аказаныя ім паслугі. У склад В. ад р.п. уключаюцца таксама паступленні сродкаў ад іншай рэалізацыі і аказаных паслуг, кошт капітальнага рамонту, выкананага гаспадарчым спосабам, паступленні сродкаў за прадукцыю дапаможнай сельскай гаспадаркі, ад продажу матэрыялаў, якія аказаліся ў лішку або выбылі з вытворчага цыклу, і да т.п.

На памер В. ад р.п. уплываюць аб'ём выпускаемай прадукцыі, яе асартымент, якасць, узровень цэн, змяненне пераходных астаткаў гатовай прадукцыі на складзе прадпрыемства і пры адгрузцы. В. ад р.п. з'яўляецца крыніцай кампенсавання затрат на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі, а таксама фарміравання грашовых даходаў.

**ВЫТВОРЧАСЦЬ** (Производство) -- працэс стварэння матэрыяльных даброт, неабходных для існавання і развіцця грамадства, зыходны і вызначальны момант грамадскага ўзнаўлення. Асновай і крыніцай жыцця грамадства з'яўляецца матэрыяльная В., прагрэс якой забяспечвае паступальнае развіццё чалавечай цывілізацыі. Ствараючы матэрыяльныя даброты, прызначаныя для задавальнення патрэб людзей, В. прайшла доўгі гістарычны шлях ад здабычы харчавання першабытным чалавекам да сучасных тэхналогій, заснаваных на навейшых дасягненнях НТР другой паловы XX ст. Сваім развіццём В. у канчатковым выніку абумоўлівала сацыяльныя структуры грамадства, яго ідэі і ўстановы, пераход чалавецтва ад ніжэйшай ступені да вышэйшай. В. заўсёды прадугледжвае ўзаемадзеянне трох асноўных фактараў: 1) рабочай сілы чалавека, яго працы; 2) прадметаў працы, на якія накіравана праца чалавека; 3) сродкаў працы, з дапамогай якіх чалавек уздзейнічае на прадмет працы. Сярод апошніх прылады працы з'яўляюцца своеасаблівым працягам прыродных органаў працы самога чалавека. Прадметы і сродкі працы ў сукупнасці выступаюць як сродкі вытворчасці. У адрозненне ад рабочай сілы, якая з'яўляецца асабістым фактарам вытворчасці, сродкі вытворчасці складаюць яго рэчыўны фактар. Самі па сабе яны нічога стварыць не могуць. Толькі праца чалавека надае, ператварае іх у сап-

раўдныя сродкі вытворчасці.

У працэсе В. людзі ўздзейнічаюць на прыроду і адзін на другога. У адпаведнасці з гэтым грамадская В. мае два бакі: прадукцыйныя сілы (асабістыя і рэчыўныя фактары вытворчасці ў іх сукупнасці і ўзаемадзеянні) і вытворчыя адносіны (грамадскія адносіны, якія складваюцца паміж людзьмі ў працэсе вытворчасці). В., якая разглядаецца як адзінства і ўзаемадзеянне прадукцыйных сіл і вытворчых адносін, складае спосаб вытворчасці матэрыяльных даброт. Галоўным у яго ажыццяўленні з'яўляецца В., якая вызначае спосаб і сацыяльную асабліваць размеркавання, абмену і спажывання, а яны, у сваю чаргу, таксама ўздзейнічаюць і на В. Сістэма гэтых сацыяльна-эканамічных адносін ёсць грамадская форма В., сутнасць і аснову якой складаюць адносіны ўласнасці на сродкі вытворчасці. Яны і вызначаюць характар В. і яе мэтанакіраванасць, падпарадкаванасць інтарэсам уласніка. В. развіваецца ў адпаведнасці з эканамічнымі законамі.

**ВЫТВОРЧАЯ МАГУТНАСЦЬ** (Производственная мощность) -- максімальна магчымы гадавы (сутачны, зменны) выпуск прадукцыі ці аб'ём здабычы і перапрацоўкі сыравіны ў наменклатуры, асартыменце і якасці, прадугледжаных планам, пры поўным і эфектыўным прымяненні перадавой тэхналогіі, арганізацыі вытворчасці, навуковай арганізацыі працы. Разлік велічыні В.м. выкарыстоўваецца для абгрунтавання вытворчай праграмы,плана капітальнага будаўніцтва, выяўлення ўнутрывытворчых рэзерваў. В.м. вымяраецца ў тых жа адзінках, што і выраб прадукцыі. Адрозніваюць В.м. уваходную -- на пачатак года, выхадную -- на канец года і сярэднегадавую -- сярэдняя за год. Разлік сярэднегадавой В.м. вядзецца шляхам падсумоўвання магутнасці на пачатак года і сярэднегадавой магутнасці, што ўводзіцца на працягу года, за мінусам сярэднегадавой магутнасці, якая выбывае. В.м. -- велічыня пераменная, яе разлічваюць на пяць год з разбіўкай па гадах са штогадовым удакладненнем. Пры разліку В.м. улічваецца ўсё наяўнае абсталяванне, замацаванае за ўчасткам, цэхам (акрамя таго, што знаходзіцца ў рэзерве).

Фонд часу работы абсталявання бярэцца па галіновых нарматывах. На аснове прымянення перадавой тэхналогіі і навуковай арганізацыі працы выкарыстоўваюцца прагрэсіўныя нормы часу (выпрацоўкі), якія вызначаюцца на ўзроўні ўстойлівага дасягнення 20-25 працэнтамі рабочых дадзенай прафесіі за лепшы па паказчыках квартал прайшоўшага года. Склад і якасць выкарыстоўваемай сыравіны, матэрыялаў, паліва бяруцца стандартныя, наменклатура і асартымент -- планавыя. В.м. адзінкі абсталявання вызначаецца шляхам дзялення планавага фонду часу работы абсталявання на прагрэсіўную працаёмкасць адзінкі прадукцыі. В.м. падраздзялення вызначаецца па магутнасці вядучага падраздзялення папярэдняй ступені, дзе выконваюцца асноўныя тэхналагічныя працэсы па вырабу прадукцыі і дзе знаходзіцца значная частка асноўных фондаў і працазатрат. На базе разлікаў В.м. на прадпрыемстве складаецца "Баланс вытворчых магутнасцей і іх выкарыстанне", дзе ўказваюцца В.м. і ўзровень яе выкарыстання. Узровень выкарыстання В.м. вызначаецца адносінамі вытворчай праграмы да магутнасці. Паляпшэнне яе выкарыстання -- важны рэзерв росту выпуску прадукцыі. Павелічэнне В.м. забяспечваецца шляхам укаранення дасканалага абсталявання, прагрэсіўнай тэхналогіі, удасканалення арганізацыі вытворчасці і працы.

**ВЫТВОРЧАЯ ПРАГРАМА** (Производственная программа) -- сістэма паказчыкаў па выпуску прадукцыі, прызначанай для задавальнення патрэб народнай гаспадаркі. У ёй вызначаюцца наменклатура, аб'ём, якасць прадукцыі, тэрміны яе выпуску. В.п. займае вядучае месца ў бягучых і перспектыўных планах галіны, прадпрыемства (аб'яднання), цэха, участка. На яе аснове распрацоўваюцца ўсе іншыя раздзелы і паказчыкі плана. Для вымярэння аб'ёму вытворчасці прымяняюцца натуральныя і вартасныя паказчыкі. Натуральныя паказчыкі (штукі, кілаграмы, метры, камплекты) выкарыстоўваюцца для арганізацыі працэсу вытворчасці, распрацоўкі матэрыяльных балансаў вытворчасці і размеркавання прадукцыі, устанаўлення навукова абгрунтаваных прапорцый у народнай гаспадарцы. Вартас-

ныя вымяральнікі (таварная, рэалізаваная, "чыстая" прадукцыя) неабходны для ацэнкі агульных аб'ёмаў вытворчасці разнароднай прадукцыі, для параўнання затрат з вынікамі работы. Пры распрацоўцы В.п. вырашаюцца наступныя задачы: больш поўнае задавальненне патрэб у выпускаемай прадукцыі; няўхільнае павышэнне якасці вырабаў; паляпшэнне выкарыстання вытворчых рэсурсаў.

В.п. распрацоўваецца на аснове прагрэсіўных тэхніка-эканамічных норм, з улікам попыту на выпускаемую прадукцыю, які вызначаецца на аснове вывучэння рынку, прамых працяглых сувязей з прадпрыемствамі-спажыўцамі і тэрытарыяльнымі органамі дзяржзабеспячэння. Патрэбы ў важнейшых відах прадукцыі ўстанаўліваюць ў дзяржаўным заказе. Пры вызначэнні наменклатуры зыходзяць са спецыялізацыі прадпрыемства, дзяржаўнага заказу, заказаў спажыўцоў і заключаных дагавораў на пастаўкі. Якасць і тэрміны пастаўкі прадукцыі ўстанаўліваюцца пры заключэнні дагавораў. В.п. павінна адпавядаць вытворчым магчымасцям. Для гэтага яе супастаўляюць з вытворчай магутнасцю, выяўляюць магчымасці забеспячэння працоўнымі і матэрыяльнымі рэсурсамі. На аснове выкарыстання ЭММ і ЭВМ распрацоўваецца аптымальная В.п., якая забяспечвае найбольш поўнае задавальненне патрэб спажыўцоў пры найбольш рацыянальным выкарыстанні рэсурсаў.

**ВЫТВОРЧАЯ СФЕРА** (Производственная сфера) - сукупнасць галін народнай гаспадаркі або відаў дзейнасці, дзе ствараюцца матэрыяльныя каштоўнасці ў форме рэчавых прадуктаў ці рэчавых паслуг.

Звычайна В.с. атаясамліваюць з так званай сферай матэрыяльнай вытворчасці. Да апошняй савецкая статыстыка адносіць прамысловасць, будаўніцтва, сельскую, лясную і водную гаспадарку, а таксама грузавы транспарт, вытворчую сувязь,гандаль, грамадскае харчаванне, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, збыт і г.д.З матэрыяльнай вытворчасцю звязваецца вытворчасць грамадскага прадукту і нацыянальнага даходу.

В.с. адыгрывае вельмі значную ролю ў сістэме гра-

мадскай вытворчасці, бо тут працай работнікаў ствараюцца прадукты, якія задавальняюць галоўныя матэрыяльныя патрэбы грамадства. Нягледзячы на тое, што ў сучасных умовах велізарная роля ў развіцці грамадства, у дасягненні яго мэт належыць не вытворчай, а так званай нематэрыяльнай сферы, значэнне В.с. нельга недаацэньваць. Неабходна збалансаванае развіццё як адной, так і другой сферы.

**ВЫТВОРЧЫ ЦЫКЛ** (Производственный цикл) - інтэрвал каляндарнага часу ад запуску ў вытворчасць прадметаў працы (зыходнай сыравіны) да атрымання цалкам гатовага прадукту. В.ц. уключае ў сябе тэхналагічны перыяд і перапынкі ў вытворчасці.

Тэхналагічны перыяд складае асноўную частку В.ц. і ўключае ў сябе час, неабходны для выканання аперацый па выбару прадукцыі і ажыццяўлення натуральных працэсаў. Працягласць гэтага перыяду залежыць у значнай ступені ад метаду спалучэння аперацый у працэсе вытворчасці: паслядоўнага, паралельнага ці паралельна-паслядоўнага. Выбар метаду - адна з умоў рацыянальнай арганізацыі вытворчасці.

Перапынкі, у сваю чаргу, раздзяляюцца на міжаперацыйныя і абумоўленыя рэжымам работы прадпрыемства. Міжаперацыйныя перапынкі бываюць тэхналагічныя (залежаць ад тэхналогіі вырабу прадукцыі), тэхнічныя (залежаць ад тэхнікі, што прымяняецца) і арганізацыйныя (звязаныя з недахопамі ў арганізацыі рабочых месц і іх матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні). Апошнія ўлічваюцца толькі пры вызначэнні фактычнай працягласці В.ц.

Агульная працягласць В.ц. характарызуе ўзровень арганізацыі вытворчага працэсу па часе і залежыць ад умоў, характару прадукцыі, што вырабляецца, узроўню механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці, тэхнікі і тэхналогіі, відаў руху прадметаў працы з адной аперацыі на другую, прынятай арганізацыі працы і іншых фактараў.

В.ц. прадвызначае размеркаванне работ па часе і па асобных вытворчых падраздзяленнях, адлюстроўваецца ў аператыўна-каляндарным планаванні.

Скарачэнне працягласць В.ц. дае магчымасць па-

вялічваць аб'ём выпуску прадукцыі ў адзінку часу за кошт больш эфектыўнага выкарыстання вытворчых фондаў у адзінку часу. Апошняе дасягаецца шляхам скарачэння працягласці тэхналагічнага перыяду і скарачэння міжаперацыйных і міжзменных перапынкаў.

**ВЫТВОРЧЫЯ АДНОСІНЫ** (Производственные отношения) - адносіны паміж людзьмі, якія складаюцца ў грамадскай вытворчасці. Гэта грамадскі бок вытворчасці, грамадская форма развіцця прадукцыйных сіл у адрозненне ад тэхнічна-тэхналагічнага, які адлюстроўвае тэхнічную арганізацыю вытворчасці.

Адрозніваюць сацыяльна-эканамічныя і арганізацыйна-эканамічныя В.а. Першыя даюць сутнасную, глыбінную характарыстыку В.а., якая закранае інтарэсы ўсіх удзельнікаў, суб'ектаў адносін. Аснову гэтых адносін складае пануючая форма ўласнасці на сродкі вытворчасці і прадукты працы. Сацыяльна-эканамічны бок В.а. выяўляецца таксама ў характары працы і размеркавання, абмену і спажывання, у прыродзе таварнаграшовых адносін. Арганізацыйна-эканамічныя В.а. узнікаюць у сферы ўзаемадзеяння прадукцыйных сіл і вытворчых адносін, складаюцца ў галіне гаспадарчых адносін. Сюды ж уключаюцца і адносіны гаспадарчага механізму, адносіны ў сферы арганізацыі і кіравання грамадскай вытворчасцю. В.а. маюць і ўзнаўленчы аспект, гэта значыць у іх складзе можна выдзеліць адносіны непасрэднай вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання.

В.а. ва ўсёй іх сукупнасці ўтвараюць базіс грамадства. Яны развіваюцца і ўдасканальваюцца. Найбольш істотныя заканамернасці В.а. выяўляюцца ў эканамічных законах, асобныя іх бакі - у эканамічных катэгорыях. Пазнаючы эканамічныя законы, улічваюцца эканамічныя катэгорыі, грамадства ўздзейнічае на развіццё прадукцыйных сіл, дасягае намечанай мэты. Перабудова грамадскага жыцця, якая праводзіцца ў краіне, ахапіла рэвалюцыйнымі пераўтварэннямі ўсе слаі і ўзроўні В.а. і прадугледжвае развіццё іх разнастайных форм, карэнную рэформу кіраваннння і дэмакратызацыі грамадства.

**ВЫТВОРЧЫЯ ФОНДЫ** (Производственные фонды) - грамадская форма сродкаў вытворчасці народнай гаспадаркі, яе галін, прадпрыемстваў (аб'яднанняў), неабходных для ажыццяўлення працэсу матэрыяльнай вытворчасці. Матэрыяльна-рэчыўны састаў В.ф. складаюць сродкі працы і прадметы працы. Па характару ўдзелу ў вытворчым працэсе В.ф. падзяляюцца на асноўныя і абаротныя. *Асноўныя В.ф.* уяўляюць сабой сродкі працы, уцягнутыя ў вытворчы працэс, якія працягла функцыяніруюць у ім і паступова, часткамі, па меры зносу пераносяць сваю вартасць на новастораны гатовы прадукт. *Абаротныя В.ф.* - гэта прадметы працы, якія спажываюцца ў кожным вытворчым цыкле і цалкам пераносяць сваю вартасць на гатовую прадукцыю, відазмяняючы пры гэтым сваю натуральна-рэчыўную форму. В.ф. плануюцца ў натуральным і вартасным грашовым выражэнні. У працэсе ўзнаўлення яны робяць няспынны абарот. Паслядоўна праходзячы стадыі вытворчасці і абарачэння, яны мяняюць сваю форму: грашовая форма пераходзіць у вытворчую, вытворчая - у таварную, таварная - у грашовую. Рашаючае значэнне мае такая стадыя вытворчасці, калі В.ф. знаходзяцца ў прадукцыйнай форме, у якой адбываецца іх злучэнне з рабочай сілай. У працэсе вытворчага выкарыстання вартасць В.ф. пераносіцца на новастораны прадукт, паслугі і ўключаецца ў яго вартасць. Пры рэалізацыі выпрабленай прадукцыі В.ф. вяртаюцца прадпрыемству ў форме грашовых сродкаў, чым забяспечваецца іх кампенсацыя.

В.ф. з'яўляюцца матэрыяльнай асновай развіцця эканомікі краіны і росту дабрабыту працоўных. Павышэнне эфектыўнасці іх выкарыстання спрыяе скарачэнню аднаразовых капітальных укладанняў на іх стварэнне, прыводзіць да зніжэння матэрыяла і фондаёмкасці прадукцыі. Паляпшэнне выкарыстання В.ф. дасягаецца за кошт павышэння каэфіцыента работы машын і абсталявання, больш поўнага выкарыстання іх магутнасці, зніжэння матэрыялаёмкасці на аснове прымянення прагрэсіўных тэхналогій, змяншэння адходаў і страт сыравіны і матэрыялаў.

## Г

**ГАНДАЛЬ** (Торговля) уяўляе сабой сферу таварнага абарачэння, дзе ажыццяўляецца абмен аднаго віду тавару на другі. З дапамогай Г. адбываецца абмен грашовых даходаў насельніцтва на прадметы спажывання, а тавар пераходзіць з грамадскай уласнасці ў асабістую ўласнасць членаў грамадства, са сферы вытворчасці і абарачэння ў сферу асабістага спажывання.

Г. як галіна народнай гаспадаркі выконвае тры функцыі: рэалізацыя сукупнага грамадскага прадукту і яго састаўных частак; давядзенне тавараў да спажыўца - аперацыі транспарціроўкі, упакоўвання, фасоўкі тавараў, іх захаванне і г.д.; абмен таварнай масы на грашовую. У залежнасці ад формы арганізацыі гандлёвага працэсу і выконваемых функцый адрозніваюць знешні і ўнутраны гандаль, а ў межах унутранага - аптовы, рознічны гандаль і грамадскае харчаванне.

**ГАНДЛЁВЫ ПРЫБЫТАК** (Торговая прибыль) уяўляе сабой грашовае выражэнне часткі прыбавачнага прадукту, які створаны галоўным чынам прадукцыйнай працай работнікаў матэрыяльнай вытворчасці і часткова прадукцыйнай працай работнікаў гандлю ў выніку працягу працэсаў вытворчасці ў абарачэнні (транспарціроўка тавараў,іх захаванне, фасоўка і інш.). Колькасна Г.п. вызначаецца як розніца паміж гандлёвай нацэнкай і выдаткамі абарачэння. Прадпрыемствы, якія вырабляюць тавары народнага спажывання, уступаюць гандлю частку свайго прыбытку праз механізм гандлёвых і аптова-збытавых скідак на тавары, якія служаць асноўнай крыніцай утварэння гандлёвага прыбытку. Другой часткай Г.п. з'яўляецца прыбавачны прадукт, створаны працай гандлёвых работнікаў.

**ГАСПАДАРЧА-РАЗЛІКОВАЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ** (Хозрасчетная эффективность) - эфектыўнасць вытворча-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства, абумоўленая яго адноснай эканамічнай адасобленасцю. Колькасна Г.-р.э. вызначаецца як адносіны гаспадарча-разліковага эфекту (прыбытку або даходу) дагаспадарча-разліковых затрат прадпрыемства. Важнейшымі напрамкамі павышэння Г.-р.э. з'яўляюцца выпуск рэнта

бельнай прадукцыі і зніжэнне гаспадарча-разліковых затрат прадпрыемства шляхам тэхнічнага і арганізацыйнага ўдасканалення вытворчасці. Г.-р.э. з'яўляецца арганічнай састаўной часткай і фактарам павышэння народнагаспадарчай эфектыўнасці вытворчасці. Найбольшы рост эфектыўнасці грамадскай вытворчасці можа быць атрыманы ў тым выпадку, калі рэзультатыўнасць выкарыстання гаспадарча-разліковых сродкаў і рэсурсаў прадпрыемства для дасягнення сваёй мэты ўзгадняецца з рэзультатыўнасцю іх выкарыстання адносна мэты грамадскай вытворчасці ў цэлым, гэта значыць калі гаспадарча-разліковая і народнагаспадарчая эфектыўнасць адпавядаюць адна адной.

Супярэчлівасць агульнанародных і калектыўных інтарэсаў прыводзіць да магчымасці рознанакіраванага змянення гаспадарча-разліковай і народнагаспадарчай эфектыўнасці, гэта значыць, павышэнне народнагаспадарчай эфектыўнасці можа ажыццяўляцца ў формах, якія супярэчаць гаспадарча-разліковым інтарэсам прадпрыемства. І наадварот,улік прадпрыемствам толькі гаспадарча-разліковых інтарэсаў можа не забяспечыць росту народнагаспадарчай эфектыўнасці. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне мае ўзгодненасць гаспадарча-разліковай і народнагаспадарчай эфектыўнасці, што дасягаецца шляхам удасканалення гаспадарчага механізму.

**ГАСПАДАРЧА-РАЗЛІКОВЫ ДАХОД** (Хозрасчетный доход) - новая эканамічная форма (катэгорыя, якая ўяўляе сабой крыніцу вытворчага і сацыяльнага развіцця прадпрыемства, аплаты працы; утвараецца на прадпрыемствах, якія дзейнічаюць на прынцыпах поўнага гаспадарчага разліку і самафінансавання; уключае ў сябе частку прыбытку (даходу), які паступае ў поўнае распараджэнне працоўнага калектыву пасля выканання абавязкаў перад бюджэтам, банкамі і вышэйстаячым органам, і сродкі на аплату працы; знаходзіцца ў распараджэнні прадпрыемства, выкарыстоўваецца самастойна і зняццю не падлягае.

У аснове гэтай катэгорыі - адносная адасобленасць прадпрыемства як таваравытворцы, якое функцыяніруе ў адзіным народнагаспадарчым комплексе і мае свой

асабісты інтарэс, які служыць рухаючай сілай прагрэсу прадпрыемства. Імкнучыся падняць свой Г.-р.д., прадпрыемствы эканамічна зацікаўлены павялічыць эфектыўнасць вытворчасці. Так ствараецца механізм, пры якім інтарэс асобнага прадпрыемства ў атрыманні Г.-р.д. пачынае актыўна "працаваць" на агульны народнагаспадарчы інтарэс.

Па першай форме гаспадарчага разліку нарматыўнае размеркаванне прыбытку Г.-р.д. разлічваецца наступным чынам: $ГРД_1$ = $Пр_{аст}$ + ФЗП = ФРВНТ + ФСР+ +ФМЗ + ФЗП, дзе $Пр_{аст}$ - прыбытак астатковы, які паступае ў поўнае распараджэнне прадпрыемства; ФЗП - фонд заработной платы; ФРВНТ - фонд развіцця вытворчасці, навукі і тэхнікі; ФСР - фонд сацыяльнага развіцця; ФМЗ - фонд матэрыяльнага заахвочвання. Па другой форме гаспадарчага разліку (нарматыўнае размеркаванне даходу) Г.-р.д. утвараецца так: $ГРД_2$ = =ФРВНТ + ФСР + ФАП = ФРВНТ + ФСР + ФЗП, дзе ФАП - фонд аплаты працы, які атрымліваецца як астатак Г.-р.д. (астаткавым метадам) і ўяўляе сабой суму ФЗП і ФМЗ, якія ў дадзеным выпадку ўтвараюцца без нарматываў, што спрашчае методыку іх разліку.

Ва ўсіх формах (мадэлях) гаспадарчага разліку велічыня Г.-р.д. калектыву застаецца пастаяннай і аднолькавай (гэта значыць $ГРД_1$ = $ГРД_2$). Г.-р.д. стварае ў прадпрыемстваў новую ступень адказнасці. Калі яны расходуюць рэсурсы неэканомна, не выпускаюць высакаякасную прадукцыю ў неабходнай колькасці, не паскараюць навукова-тэхнічны прагрэс, то калектыў, у сваю чаргу, пры рэалізацыі такой прадукцыі не атрымае дастатковых сродкаў для задавальнення сваіх патрэб ва ўдасканаленні вытворчасці, у павелічэнні заработнай платы, будаўніцтве сацыяльных аб’ектаў. Г.-р.д. закладвае фундамент для доўгатэрміновага развіцця вытворчай базы прадпрыемства і правядзення сацыяльнай палітыкі.

**ГАСПАДАРЧЫ МЕХАНІЗМ** (Хозяйственный механизм) -- сукупнасць форм і метадаў кіравання эканомікай, прыведзеных у пэўную сістэму ў адпаведнасці з патрабаваннямі аб’ектыўных эканамічных законаў.

Асноўныя элементы Г.м. -планаванне, фінансаванне, эканамічнае стымуляванне, арганізацыйныя структуры кіравання. Гаспадарча-разліковыя і асабістыя інтарэсы працоўных рэалізуюцца з дапамогай эканамічнага стымулявання. Арганізацыйныя структуры кіравання садзейнічаюць спалучэнню галіновага і тэрытарыяльнага кіравання, развіццю самакіравання прадпрыемстваў. Формы і метады Г.м. павінны пастаянна ўдасканальвацца па меры змянення канкрэтных гістарычных умоў развіцця эканомікі. Галоўныя напрамкі перабудовы Г.м. на сучасным этапе: павышэнне дзейнасці кіравання эканомікай і самастойнасці прадпрыемстваў (аб'яднанняў); пераход да эканамічных метадаў кіравання на ўсіх узроўнях народнай гаспадаркі, удасканаленне арганізацыйных структур і ўзмацненне сувязі галіновага і тэрытарыяльнага кіравання; усямерная дэмакратызацыя гаспадарання і павышэнне ролі працоўных калектываў. Пашырэнне самастойнасці праяўляецца ў самакіраванні і дэмакратызацыі ўсіх бакоў дзейнасці працоўных калектываў. Пераход да эканамічных метадаў кіравання характарызуецца пераводам прадпрыемстваў (аб'яднанняў) на поўны гаспадарчы разлік, арэнду, калектыўны падрад. Удасканаленне арганізацыйных структур выяўляецца ў стварэнні буйных вытворча-гаспадарчых комплексаў, разнастайных відаў аб'яднанняў дзяржаўных прадпрыемстваў, асацыяцый, кансорцыумаў, канцэрнаў, акцыянерных таварыстваў, сіндыкатаў.

**ГАСПАДАРЧЫ РАЗЛІК** (Хозяйственный расчет) -- сістэма забеспячэння бясстратнай, прыбытковай работы вытворчых звёнаў гаспадаркі і іх поўнай адказнасці за сваю дзейнасць. Можа разглядацца як эканамічная катэгорыя і метад гаспадарання. Пры Г.р. усе формы грамадскай уласнасці дазваляюць узгадняць існуючыя ў адзінстве супярэчлівыя інтарэсы асобных людзей і калектываў, дасягаць сацыяльнай справядлівасці. Праз Г.р. працоўны чалавек далучаецца да ўласнасці і выхоўвае ў сабе пачуццё гаспадара і асабістай адказнасці за зробленае. Г.р.праяўляе сябе як спецыфічная эканамічная катэгорыя, якая адлюстроўвае таварна-грашовыя сувязі паміж гаспадарча-разліковымі

звёнамі і ўнутры іх, паміж імі і грамадствам. Гэта сувязі планамернай арганізацыі, уліку і кантролю за вытворчасцю і размеркаваннем сукупнага грамадскага прадукту, якія вызначаюць долю кожнага чалавека, вытворчага калектыву або тэрытарыяльнай арганізацыі працоўных у яго стварэнні і размеркаванні. Яны дазваляюць улічыць і па магчымасці задаволіць інтарэсы асобы, калектыву і грамадства, уздзейнічаць на іх, кіраваць імі.

Прырода Г.р. аб'ектыўная. Але Г.р. набывае сваё жывое аблічча і становіцца актыўнай сілай, калі сістэма пэўных вытворчых адносін эканамічна прымушае асобных людзей (калектывы) імкнуцца да атрымання найбольшых канчатковых вынікаў і кантралюе іх дзейнасць. Адсюль Г.р. можна разглядаць як метад гаспадарання. Ён павінен забяспечваць спалучэнне на дэмакратычнай аснове планавання з эканамічнай самастойнасцю прадпрыемстваў, з развіццём рыначных адносін, арыентаваць працоўныя калектывы на эфектыўную работу па стварэнню высакаякаснай і канкурэнтаздольнай прадукцыі, на ўкараненне умоў працы і жыцця, вартых чалавека. Г.р. павінен забяспечваць рэалізацыю ва ўсіх адносінах патэнцыяльных пераваг і гуманнага зместу грамадства. Г.р. як метад гаспадарання характарызуюць прынцыпы самаакупнасці, самафінансавання, самакіравання, стымулявання, грашовага кантролю. Укараненне гэтых прынцыпаў у комплексе ёсць поўны Г.р.

Галоўным звяном Г.р. з'яўляюцца вытворчыя прадпрыемствы (аб'яднанні), таваравытворцы, дзейнасць якіх так або інакш падпарадкавана механізму рыначных адносін. Імі ахоплены як знешнія (Г.р. прадпрыемстваў), так і ўнутрывытворчыя сувязі прадпрыемстваў аж да рабочага месца (унутрыгаспадарчы Г.р.). Практыка ўжывання прынцыпаў Г.р. распаўсюджваецца і ў невытворчай сферы. На аснове Г.р. прадпрыемстваў ажыццяўляюцца меры пераходу на самакіраванне, самаакупнасць і самафінансаванне.

**ГРАМАДСКІ ПРАДУКТ** (Общественный продукт) -- уся сума матэрыяльных даброт, выраблены за пэўны перыяд часу (звычайна за год). Ён называецца сукупным або валавым. Г.п. ствараецца прадукцыйнай працай

у галінах матэрыяльнай вытворчасці, гэта значыць, у прамысловасці, будаўніцтве, сельскай гаспадарцы, на транспарце і ў сувязі (абслугоўванне матэрыяльнай вытворчасці), у гандлі, грамадскім харчаванні, нарыхтоўках і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні, іншых сферах вытворчасці (у асабістай дапаможнай гаспадарцы, індывідуальнай працоўнай дзейнасці і інш.).

Асноўны фактар росту Г.п. - прадукцыйнасць працы, якая дае звыш 90 % усяго прыросту. Другім фактарам росту Г.п. з'яўляецца павелічэнне колькасці работнікаў, якія заняты ў матэрыяльнай вытворчасці (павелічэнне масы працы). Ставіцца і паспяхова вырашаецца задача дасягнення ўсяго прыросту Г.п. за кошт павышэння прадукцыйнасці працы, памяншэння колькасці занятых у галінах матэрыяльнай вытворчасці. У 1988 г., напрыклад, было вызвалена з матэрыяльнай сферы больш як 1 млн чал., значная частка якіх накіравана ў невытворчую сферу, у сферу паслуг.

Г.п. выступае ў розных формах. Адрозніваюць валавы, прамежкавы і канчатковы Г.п. Апошні для грамадства ў цэлым ўяўляе сабой матэрыяльныя даброты і паслугі, якія выкарыстоўваюцца на канчатковае спажыванне. Гэта ў асноўным прадметы ўжытку для асабістага спажывання працоўных. Сюды ўваходзяць таксама і сродкі вытворчасці, якія накіроўваюцца на кампенсаванне зносу асноўных фондаў (прадукцыйнае спажыванне). Для прадпрыемстваў канчатковы прадукт - прадукт, які поўнасцю закончаны апрацоўкай і адпускаецца за межы прадпрыемства. Для галін і рэспублік канчатковым прадуктам з'яўляецца прадукт, спажыты ў вышэй азначаным сэнсе, а таксама той, які прадаецца за межы галіны, рэгіёна. Прамежкавы прадукт -- прадукт паўторнага ліку зыходнага сырога матэрыялу пры паслядоўнай перапрацоўцы яго ў розных цыклах вытворчасці.

**ГРАМАДСКІЯ ФОНДЫ СПАЖЫВАННЯ** (Общественные фонды потребления) -- форма размеркавання часткі нацыянальнага даходу, якая прызначаецца для мэтанакіраванага эканамічнага ўздзеяння на структуру расхода і спажывання ў інтарэсах усебаковага

фізічнага і духоўнага развіцця асобы і паступовага збліжэння і выраўноўвання сацыяльна-эканамічнага становішча людзей, сацыяльных груп.

Гэта - спецыфічны від размеркавання. Як правіла, Г.ф.с. размяркоўваюцца паміж працоўнымі паза прамой сувяззю з іх працоўным укладам. Пры дапамозе гэтых фондаў задавальняюцца ў рашаючай ступені патрэбы ў адукацыі, ахове здароўя, культуры, жыллі, утрымліваюцца непрацаздольныя члены грамадства. Адметная асаблівасць размеркавання праз Г.ф.с. - іх канкрэтная мэтавая накіраванасць.

Размеркаванне праз Г.ф.с. мае многаўзроўневы характар. Частка іх ствараецца на народнагаспадарчым узроўні, а частка - на ўзроўні прадпрыемстваў. Яны фарміруюцца за кошт неабходнага, а часткова за кошт прыбавачнага прадукту.

Г.ф.с. выконваюць наступныя функцыі: забяспечваюць задавальненне найбольш прыярытэтных для грамадства і асобы патрэб у адукацыі, ахове здароўя, культуры, жыллі, адпачынку; выраўноўваюць рэальныя даходы сем'яў з рознай колькасцю непрацаздольных членаў, ствараюць прыблізна аднолькавыя ўмовы для развіцця здольнасці да працы; матэрыяльна забяспечваюць часова ці пастаянна непрацаздольных членаў грамадства.

**ГРАШОВАЯ СІСТЭМА** (Денежная система) - арганізацыя грашовага абарачэння краіны, якая рэгулюецца дзяржаўнымі законамі. Асноўныя элементы Г.с.: найменне грашовай адзінкі; віды грашовых знакаў; парадак забеспячэння грошай, падтрымання іх устойлівасці; парадак абарачэння грошай, іх выпуск, зняцце з абароту і да т.п.; формы планавання грашовага абарачэння; арганізацыя безнаяўных разлікаў; банк, які рэгулюе грашовае абарачэнне; валютны курс. Грашовай адзінкай у рэспубліцы з'яўляецца рубель, які раўняецца 100 кап. (капейка -- разменная грашовая манета невялікай вартасці для больш дакладнага ўліку і сувымярэння вартасці). Грашовая адзінка выкарыстоўваецца для выражэння цэн усіх тавараў, тарыфаў на платныя паслугі і да т.п. Грашовыя знакі - знакі, якія замяняюць

у абарачэнні паўнацэнныя грошы (золата). У Рэспубліцы Беларусь гэта банкаўскія (10, 25, 50, 100, 200, 500,1000 руб.), казначэйскія білеты (1, 3, 5 руб.), разменная манета.

Падтрыманне ўстойлівасці грошай забяспечваецца шляхам захавання правільнай, эканамічна абгрунтаванай прапарцыянальнасці таварнай і грашовай масы ў абарачэнні, а таксама залатымі (валютнымі) запасамі суверэннай рэспублікі.

Для планавання грашовага абарачэння выкарыстоўваюцца баланс грашовых даходаў і расходаў насельніцтва (гл. Баланс грашовых даходаў і расходаў насельніцтва), баланс (план) касавых абаротаў і крэдытны план. У плане касавых абаротаў вызначаны напрамкі руху наяўных грошай,аб'ём і крыніцы іх паступлення, памеры і мэты іх выдачы, а таксама выпуск (або зняцце з абароту) грошай у абарачэнне ў тэрытарыяльным разрэзе. Крэдытны план адлюстроўвае крыніцы (рэсурсы) крэдытавання і размяшчэння крэдытных укладанняў (накіраванне рэсурсаў).

Формы безнаяўных разлікаў рэгламентуюць парадак дакументальнага афармлення таварных і нетаварных аперацый, іх аплаты, пераводу плацяжу. Прымяняюцца на аснове пагадненняў (дагавораў) паміж пастаўшчыком (падрадчыкам) і пакупнікам (заказчыкам). У краіне найбольшае распаўсюджанне атрымалі разлікі плацёжнымі патрабаваннямі, плацёжнымі даручэннямі, акрэдытывамі, чэкамі і інш.

*Валютны курс* як элемент Г.с. вызначае ацэнку грашовай адзінкі адной краіны ў грашовых адзінках іншых краін з улікам пакупной здольнасці валют.

З 1 студзеня 1991 г. ва ўзаемным разліку рэспублікі з краінамі свету выкарыстоўваецца свабодна канверсаваная валюта, а ва ўзаемным гандлі - бягучыя цэны сусветнага рынку з абавязковым улікам узроўню канкурэнтаздольнасці і якасці ўзаемапастаўляемых тавараў.

Ва ўмовах перабудовы нашай эканомікі далейшае развіццё атрымліваюць таварна-грашовыя адносіны і ўзмацняецца роля грошай як параджэнне гэтых адносін.

**ГРАШОВЫ КАНТРОЛЬ** (Денежный контроль) - эканамічны кантроль, кантроль рублём, які ажыццяўляецца з выкарыстаннем вартасных катэгорый (грошы, цэны, прыбытак, крэдыт, прэміі і да т.п.). Гэта важны рычаг ажыццяўлення таварнай вытворчасці, заснаваны на рэальным абарачэнні грашовых сродкаў. Пры такім кантролі вырашаюцца наступныя задачы: выяўленне якасных вынікаў і ацэнка работы ўдзельнікаў ўзнаўленчага працэсу, усебаковае ўздзеянне на развіццё ўзнаўлення і павышэнне эфектыўнасці ўзнаўлення, больш поўная мабілізацыя ўнутраных рэзерваў, садзейнічанне ўкараненню перадавых метадаў гаспадарання. Г.к. дзейнічае на розных ўзроўнях гаспадаркі, у тым ліку ўнутры прадпрыемстваў (аб'яднанняў), арганізацый (у гэтым выпадку Г.к. засноўваецца на гаспадарчым разліку брыгад, звёнаў, цэхаў). З'яўляецца адным з прынцыпаў гаспадарчага разліку. Віды Г.к. разнастайныя: узаемны кантроль на аснове заключаных дагавораў, пагадненняў паміж прадпрыемствамі; унутрыведамасны і міжведамасны кантроль, звязаны ў асноўным з пераразмеркаваннем грашовых сродкаў; агульнадзяржаўны кантроль рублём. Апошні ажыццяўляецца ў маштабах краіны органамі цэнаўтварэння, сістэмай фінансава-крэдытных устаноў, міністэрствамі і ведамствамі. Эфектыўнасць Г.к. у многім залежыць ад працэсаў пераразмеркавання нацыянальнага даходу, сістэмы фінан- савання і крэдытавання, цэнаўтварэння і інш.

**ГРОШЫ** (Деньги) - асаблівы тавар, які выконвае ролю ўсеагульнага эквіваленту, усеагульная форма ўліку затрат грамадскай працы, планавання вырабу, размеркавання і пераразмеркавання сукупнага грамадскага прадукту.

Г. выражаюць вытворчыя адносіны. Іх сутнасць выяўляецца ў функцыях. Як мера вартасці Г. служаць для вымярэння затрат грамадскай працы на выраб тавараў. Гэта выяўляецца ў працэсе цэнаўтварэння. Ігнараванне грамадска неабходнай меры затрат прыводзіць да неабгрунтаваных цэн, да парушэнняў у адпаведнасці меры працы і спажывання. У сваёй функцыі

сродку абарачэння Г. абслугоўваюць абмен тавараў. Для гэтай функцыі характэрны адначасовы рух наяўных грошай да прадаўца, тавару - да пакупніка. Г. як сродак абарачэння выкарыстоўваецца ў рознічным таварааба-роце, сферы аказання платных паслуг, грамадскім харчаванні. У такіх выпадках Г. не проста апасродкуюць працэс абарачэння тавараў, але і актыўна уздзейнічаюць на іх выраб, забяспечваюць кантроль за захаваннем адпаведнасці аб'ёму выпуску грамадскім патрэбам. У працэсе інфляцыі гэта адпаведнасць значна паслабляецца.

Г. могуць часова прыпыняць свой рух і назапашвацца на рахунках у касах, у насельніцтва (сродкі накаплення). У такім выпадку яны забяспечваюць магчымасць набыцця матэрыяльных каштоўнасцей і атрымання паслуг, якія рэальна павінны знаходзіцца ў працэсе расшыранага ўзнаўлення.

У якасці сродку плацяжу Г. выкарыстоўваюцца для пагашэння разнастайных даўгавых абавязацельстваў як у наяўнай, так і ў безнаяўнай форме. Асобнае месца тут займаюць крэдытныя адносіны, у якіх за апошні час адбыліся істотныя пераўтварэнні дзеля ўзмацнення іх уздзеяння на канчатковыя вынікі расшыранага ўзнаўлення (гл. Крэдыт). Сусветныя Г. выкарыстоўваюцца пры ажыццяўленні міжнародных сувязей, развіцці перш за ўсё эканамічных адносін у гэтай сферы.

Рух Г. у наяўнай і безнаяўнай формах у якасці сродку абарачэння і плацяжу ў працэсе абмену тавараў, аплаты паслуг і іншых плацяжоў нетаварнага характару называецца грашовым абарачэннем. Для грашовага абарачэння характэрны: цэнтралізаванае кіраванне і рэгуляванне праз адзіны цэнтр - Нацыянальны банк, павелічэнне колькасці безнаяўных разлікаў, планаванне і рэгуляванне грашовага абарачэння, канцэнтрацыя ў банках грашовага абароту.

Грашовы абарот выступае ў асноўным у безнаяўнай форме - шляхам пераводу (запісаў) Г. на рахунак, заліку ўзаемных патрабаванняў. Наяўны абарот характарызуе, як правіла, працэс фарміравання даходаў насельніцтва і іх расходаванне. Увесь аб'ём выпушчаных

у абарачэнне наяўных Г. складае грашовую масу. Сумарна яна ўключае ў сябе наяўныя Г., якія знаходзяцца ў касах крэдытных устаноў (акрамя рэзервовай), прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый і устаноў, а таксама ў насельніцтва. Г. на ўкладах з'яўляюцца Г. у абарачэнні ў тым выпадку, калі яны служаць для бягучых расходаў. На памер грашовай масы, якая знаходзіцца ў абарачэнні (як павелічэнне, так і памяншэнне), уплываюць: узрастанне маштабаў вытворчасці, размеркавання і спажывання, а значыць, і грашовых даходаў і расходаў насельніцтва, структура грашовага абароту (наяўнага і безнаяўнага), хуткасць абароту грошай, велічыня іх астаткаў у касах і іншыя фактары.

Суадносіны сумы грашовых знакаў рознай вартасці (купюр) утвараюць купюрную будову (структуру) грашовай масы. Купюрная будова грашовай масы залежыць ад узроўню грашовых даходаў розных груп насельніцтва, рознічных цэн і тарыфаў на паслугі, суадносін продажу харчовых і нехарчовых тавараў, зменлівых спецыфічных фактараў у асобных рэгіёнах.

**ГУМАНІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Гуманизация производства) - стварэнне матэрыяльна-рэчыўных, арганізацыйна-эканамічных і сацыяльных умоў на вытворчасці, якія адэкватны грамадскай прыродзе чалавека і садзейнічаюць свабоднаму развіццю і рэалізацыі ўсіх яго творчых здольнасцей і дараванняў, стварэнне даброт для чалавека ў якасці крытэрыю ацэнкі грамадскіх адносін.

Г.в. - аб'ектыўная неабходнасць развіцця вытворчасці ва ўмовах НТР у напрамку няспыннага ўзмацнення яго сацыяльнай накіраванасці. Яна абумоўлена, па-першае, пастаянным узвышэннем патрэб работнікаў, і перш за ўсё іх задаволенасці працай; па-другое, прамой сувяззю паміж больш высокім узроўнем прадукцыйнасці працы, эфектыўнасці вытворчасці, якасці прадукцыі і стварэннем для работнікаў неабходных умоў працы. Такім чынам, Г.в. з'яўляецца аднача-сова і вынікам НТР, і ўмовай эфектыўнай рэалізацыі яе дасягненняў.

На кожным этапе развіцця грамадскай вытворчасці

Г.в. напаўняецца пэўным канкрэтным зместам. На сучасным этапе развіцця Г.в. мае на ўвазе ліквідацыю цяжкай фізічнай працы, ручной, непрывабнай працы, больш поўную рэалізацыю закону перамены працы, аптымальнае вырашэнне праблемы ратацыі кадраў, паляпшэнне ўмоў працы, больш высокія сацыяльныя патрабаванні да новай тэхнікі, тэхналогіі і да якасці самой працоўнай дзейнасці, стварэнне магчымасцей для рэалізацыі схільнасцей, здольнасцей, назапашаных ведаў і вопыту, самавыяўлення, самасцвярджэння асобы ў працы.

## Д

**ДАБРАБЫТ** (Благосостояние) -- забяспечанасць насельніцтва матэрыяльнымі, духоўнымі і сацыяльнымі дабротамі, а таксама адэкватнымі прыродзе ўмовамі працы і быту. Характарызуецца сістэмай колькасных і якасных паказчыкаў, агульным аб'ёмам спажываемых матэрыяльных і духоўных даброт, умовамі працы, працягласцю рабочага і вольнага часу, развіццём адукацыі, аховы здароўя, культуры, сацыяльнай актыўнасцю асобы.

Д. - шматграннае паняцце, якое ўключае ў сябе матэрыяльны, духоўны і сацыяльны аспекты. Узровень яго вызначаецца развіццём прадукцыйных сіл і характарам вытворчых адносін. Прадукцыйныя сілы, эфектыўнасць грамадскай вытворчасці ствараюць матэрыяльныя прадпасылкі для росту Д., а характар вытворчых адносін вызначае магчымасць карыстання гэтымі дабротамі як грамадства ў цэлым, так і асобнага чалавека.

**ДАГАВОР ГАСПАДАРЧЫ** (Договор хозяйственный) -- пагадненне паміж прадпрыемствамі аб вызначэнні правоў і абавязкаў у сферы іх гаспадарчай дзейнасці. Да іх ліку адносяцца дагаворы пастаўкі, падраду на капітальнае будаўніцтва, грузавой перавозкі, кантрактацыі сельскагаспадарчай прадукцыі, арэнды на выкананне навуковых, праектных канструктарскіх работ, па аказанню паслуг і інш.

Д.г. рэгулюецца шматлікімі нарматыўнымі актамі - Палажэннямі аб пастаўках, Правіламі аб дагаворах падраду на капітальнае будаўніцтва, Палажэннем аб пара-

дку заключэння і выканання дагавораў кантрактацыі сельскагаспадарчай прадукцыі, транспартнымі статутамі і кодэксамі і г.д.

У апошні час Д.г. выкарыстоўваецца і як прававая форма арганізацыі ўнутрыгаспадарчай дзейнасці (пагадненні аб арэндзе, падрадзе, у тым ліку брыгадным).

**ДАГАВОР ПАСТАЎКІ** (Договор поставки) -- пагадненне, у адпаведнасці з якім пастаўшчык, які з'яўляецца прадпрымальнікам, абавязваецца прадаць у вызначаныя тэрміны ці тэрмін ва ўласнасць ( у поўны гаспадарчы нагляд ці аператыўнае кіраванне) пакупніку прадукцыю (тавары), прызначаныя для прадпрымальніцкай дзейнасці ці іншых мэт, якія не звязаны з асабістым (сямейным, хатнім) спажываннем, пакупнік - прыняць тавар і заплаціць за яго вызначаную цану.

Прадпрымальнікі маюць права (у парадку аптовага гандлю) заключыць паводле свайго меркавання дагавор на пастаўку прадукцыі, якая вырабляецца звыш дзяржзаказу або не знайшла збыту па планавых актах у тэрмін, што не супадае з момантам заключэння дагавора.

Заключэнне і выкананне Д.п. рэгулююцца Грамадзянскім кодэксам (артыкулы 44-50), Палажэннямі аб пастаўках прадукцыі  і вытворча-тэхнічнага прызначэння і тавараў народнага спажывання, а таксама прыкладнымі дагаворамі. Д.п. заключаецца на 5 гадоў, на год або іншы перыяд шляхам складання аднаго дакумента, які пад- пісваецца бакамі; прыняцця заказу пакупніка да выканання; абмену пісьмамі, тэлеграмамі, тэлетайпграмамі, тэлефонаграмамі, радыёграмамі. У Д.п. павінны абавязкова вызначацца наменклатура (асартымент), колькасць і якасць прадукцыі (тавараў), тэрміны пастаўкі і цана, а ў доўгатэрміновым дагаворы па працяглых прамых гаспадарчых сувязях - найменне, групавая наменклатура (асартымент) і колькасць прадукцыі, парадак і тэрмін узгаднення і прадастаўлення спецыфікацый. Пры адсутнасці гэтых умоў Д.п. лічыцца незаключаным.

За парушэнне абавязкаў Д.п. плаціцца няўстойка (штраф, пеня), абумоўленая палажэннямі аб пастаўках,

дагаворамі, а таксама кампенсуюцца страты (панесеныя расходы і неатрыманы прыбытак). У Д.п. можа быць прадугледжана кампенсацыя страт у цвёрдай суме.

**ДАТАЦЫЯ** (Дотация) - грашовыя сродкі, выдадзеныя дзяржавай прадпрыемству ці арганізацыі для пакрыцця разрыву паміж даходамі і расходамі, а таксама тыя сродкі, якія выдаюцца ніжэйстаячаму бюджэту са сродкаў вышэйстаячага.

Адрозніваюць, такім чынам, Д. прадпрыемствам, сабекошт прадукцыі якіх перавышае выручку ад яе рэалізацыі, і бюджэтную датацыю.

Д. прадпрыемствам шырока прымянялася ў аднаўленчы перыяд у гады індустрыялізацыі, Вялікай Айчыннай вайны для развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі. Аднак Д. аслабляе зацікаўленасць прадпрыемстваў у паляпшэнні вынікаў іх дзейнасці. Развіццё гаспадарча-разліковых адносін дазволіла адмовіцца ад сістэмы Д. у большасці галін народнай гаспадаркі. Яна захавалася толькі ў сельскай гаспадарцы, некаторых галінах перапрацоўчай і здабываючай прамысловасці, на планава-стратных прадпрыемствах, у асобных арганізацыях невытворчай сферы.

Д. са сродкаў вышэйстаячага бюджэту ніжэйстаячаму ўстанаўліваецца ў тых выпадках, калі пры перадачы ў мясцовыя бюджэты адлічэнняў ад дзяржаўных даходаў і падаткаў у памеры да 100 % ад іх паступленняў на тэрыторыі дадзенага Савета пакрыць суму расходаў мясцовага бюджэту не ўяўляецца магчымым.

Датацыйны метад трэба разглядаць толькі як дадатковы да асноўнага - прадастаўлення працэнтных адлічэнняў. Да яго звяртаюцца з прычыны існуючага парадку размеркавання даходаў і расходаў паміж асобнымі відамі бюджэту. Субвенцыя адрозніваецца ад Д. тым, што мае на ўвазе перадачу сродкаў з вышэйстаячых бюджэтаў у ніжэйстаячыя з указаннем канкрэтнага накіравання іх расходавання. У выпадках, калі даходы ад мясцовых крыніц паступлення перавышаюць расходы, узнікае неабходнасць у канфіскацыі сродкавых лішкаў у ніжэйстаячых бюджэтаў і перадачы іх у вы-

шэйстаячыя.

**ДАХОДЫ ПРАДПРЫЕМСТВА** (Доходы предприятия) - грашовыя паступленні ад вытворчай і невытворчай дзейнасці за вылікам затрат на яе ажыццяўленне.

Крыніцай фарміравання даходаў з'яўляецца выручка ад рэалізацыі прадукцыі асноўнай вытворчасці, цэхаў шырпатрэбу з адходаў дапаможных гаспадарак, а таксама ад выканання работ і аказання паслуг па-за вытворчасцю (уключаючы капітальны рамонт уласнага абсталявання,рэалізацыю прадукцыі свайму капітальнаму будаўніцтву і непрамысловым гаспадаркам).

Выручка ад рэалізацыі прадукцыі складае больш за 90% ад ўсіх Д.п. Больш высокія даходы атрымліваюць прадпрыемствы ад выпуску і рэалізацыі прадукцыі палепшанай якасці і асартыменту. Гэтыя даходы ўтвараюцца за кошт заахвочвальных надбавак да цэн. Адначасова прадпрыемствы нясуць страты ў даходах, звязаныя са скідкамі за выпуск прадукцыі нізкай якасці. Сумы надбавак і скідак не плануюцца, але прымаюцца ў разлік пры ацэнцы выканання плана Д.п.

Д.п. знаходзяцца ў непасрэднай залежнасці ад узроўню цэн на прадукцыю і матэрыяльных затрат на яе выраб. Зніжэнне матэрыялаёмістасці вырабаў - галоўны напрамак павелічэння даходнасці прадпрыемстваў. Д.п. выкарыстоўваюцца для выплаты плацяжоў дзяржаўнаму бюджэту, вышэйстаячай арганізацыі, органам сацыяльнага страхавання; пагашэння запазычанасці па ссудах і уплаты працэнтаў за карыстанне імі; утварэння фондаў эканамічнага стымулявання, якія забяспечваюць фарміраванне фонду аплаты працы калектыву работнікаў прадпрыемства, а таксама фінансаванне расшыранага ўзнаўлення і рацыянальнай праграмы.

Трэба адрозніваць валавы і гаспадарча-разліковы Д.п. Валавы Д.п. вызначаецца як розніца паміж аб'ёмам выручкі ад рэалізацыі прадукцыі, выкананых работ і паслуг і велічынёй матэрыяльных і прыраўняных да іх затрат (амартызацыйных адлічэнняў і адлічэнняў органам сацыяльнага страхавання). Частка валавога даходу па ўстаноўленых нарматывах накіроўваецца ў дзяржаўны бюджэт, вышэйстаячай арганізацыі, банку ў

форме платы працэнтаў за карыстанне ссудамі. Астатняя частка выступае як гаспадарча-разліковы даход, гэта значыць даход, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемства.

Гаспадарча-разліковы даход з'яўляецца крыніцай і паказчыкам для ўтварэння па вызначаных нарматывах фонду развіцця вытворчасці, навукі і тэхнікі, фонду сацыяльнага развіцця і фонду аплаты працы.

**ДЗЯРЖЗАКАЗ** (Госзаказ) - заданне дзяржавы прадпрыемствам (аб'яднанням) на пастаўкі некаторых відаў прадукцыі, неабходнай перш за ўсё для вырашэння навукова-тэхнічных праграм, умацавання абараназдольнасці і забеспячэння эканамічнай незалежнасці краіны.

У склад Дз.з. уключаюцца таксама заданні на ўвод у дзеянне вытворчых магутнасцей і аб'ектаў сацыяльнай сферы за кошт цэнтралізаваных капітальных укладанняў.

Прадпрыемства, аб'яднанне атрымлівае Дз.з. ад вышэйстаячага органа; ён можа размяшчацца на конкурснай аснове і абавязковы для ўключэння ў план. Пры выдачы Дз.з. прадугледжваецца ўзаемная адказнасць бакоў - выканаўцы і заказчыка. Дз.з. гарантуе задавальненне першачарговых грамадскіх патрэб. Ён у першую чаргу забяспечваецца неабходнымі матэрыяльнымі рэсурсамі, гарантаваным збытам прадукцыі, характарызуецца ўстойлівасцю і выгаднасцю цэн рэалізацыі і іншымі льготнымі ўмовамі. Дз.з., як правіла, складае толькі частку вытворчай праграмы прадпрыемства, пакідаючы вытворчаму калектыву прастор для ініцыятывы і самастойнасці.

**ДРЭВА МЭТ** (Дерево целей) - графічнае адлюстраванне ўзаемасувязей, супадпарадкаванасці і суадноснай важнасці мэт і задач функцыяніравання сістэм, інструмент праграмнамэтавага падыходу ў кіраванні сацыяльна-эканамічнымі сістэмамі.

Мэты у сваёй аснове аб'ектыўныя. У іх адлюстроўваюцца патрабаванні законаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця, а таксама асаблівасці пэўнага этапа развіцця. Мэты адрозніваюцца па зместу (палітычныя,

сацыяльна-эканамічныя, навукова-тэхнічныя), па ўзроўнях кіравання (народнагаспадарчыя, галіновыя, тэрытарыяльныя, мэты прадпрыемстваў, арганізацый аж да асобных работнікаў), па часоваму аспекту (кароткатэрміновыя, сярэднетэрміновыя, доўгатэрміновыя). Мэты валодаюць уласцівастямі супадпарадкаванас- ці, разгортваемасці і суадноснай важнасці. Гэтыя ўласцівасці з'яўляюцца асновай для ўпарадкавання мэт з дапамогай Д.м.

Д.м. складаецца з мэт некалькіх узроўняў, якія выяўляюць іх супадпарадкаванне і ўнутраныя ўзаемасувязі. На верхнім ўзроўні знаходзіцца генеральная мэта, далей ідуць падмэты I узроўню (галоўныя мэты), падмэты II узроўню і г.д. Для дасягнення генеральнай мэты неабходна рэалізацыя некалькіх больш канкрэтных мэт I узроўню (галоўных), якія з'яўляюцца сродкам дасягнення генеральнай. Для дасягнення мэт I узроўню неабходна выкананне мэт II узроўню і г.д. Падмэты пэўнага ўзроўню, для рэалізацыі якіх не патрэбна ўвязка са сродкамі, называюць задачамі. Задача з'яўляецца асновай для пабудовы праграм дасягнення асобных мэт. Рашэнне задачы ўяўляе сабой комплекс мерапрыемстваў, якія забяспечваюць дасягненне мэты. Мэта вышэйшага ўзроўню разбіваецца на абмежаваную колькасць падмэт (звычайна 7-9) у залежнасці ад задачы. Гэта вызначана магчымасцямі экспертаў даць параўнальную якасную ацэнку 7-9 разнародных элементаў. Пры гэтым неабходна выбіраць такую раскладку падмэт, для дасягнення якіх існуюць незалежныя адзін ад аднаго спосабы і сродкі. Мэты аднаго ўзроўню не павінны ўяўляць сабой паслядоўныя этапы рэалізацыі мэты больш высокага ўзроўню. Глыбіня раскладвання мэты павінна быць такой, каб канчатковыя падмэты (задачы) былі незалежнымі. Мэтазгодна абмяжоўвацца 4-5 узроўнямі ў залежнасці ад маштабаў аб'екта. Мэтавы падыход дазваляе забяспечыць адзіную мэтавую арыентацыю і ўзгодненасць функцыяніравання сістэмы, вызначае адпаведную структуру кіравання і метады, якія забяспечваюць дасягненне мэт.

**ДЫСБАЛАНС** (Дисбаланс) - неадпаведнасць паміж

пакупніцкім попытам і прапанаваннем, які характэрны для сучаснага стану ўнутранага рынку краіны, спароджаны дэфіцытам, дэфіцытнасцю эканомікі, неспрыяльнымі сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі развіцця народнай гаспадаркі.

Рэзкае разыходжанне вартасных і матэрыяльна-рэчыўных прапорцый прывяло да з'яўлення "лішніх грошай", якія не маюць рэальнага таварнага забеспячэння, да росту цэн, "вымывання" таннага асартыменту, нарміраванага гандлю па талонах. Тэмпы прыросту зберажэнняў на ўкладах насельніцтва значна абганяюць тэмпы прыросту рознічнага тавараабароту і выпуску тавараў народнага спажывання. Неадпаведнасць прапанавання попыту, дэфіцыт на спажывецкім рынку прыводзяць да рэзкай палярызацыі ўзроўню жыцця розных слаёў насельніцтва, асабліва нізкааплатных, з цвёрдымі акладамі, памерамі пенсій, стыпендый, да нямэтавага выкарыстання грашовых сродкаў, а гэта, у сваю чаргу, - да падзення пакупной здольнасці рубля і рэальных даходаў, да абвастрэння інфляцыі, з'яўлення "чорнага рынку", зніжэння стымулаў да працы. Дэфіцыт спараджае пакупніцкую актыўнасць, ажыятажны попыт.

Асноўныя прычыны Д. на спажывецкім рынку: адставанне вытворчасці ў параўнанні з пакупной магчымасцю насельніцтва, недахоп сыравінных рэсурсаў, слабая тэхнічная аснашчанасць прадпрыемстваў, якія вырабляюць тавары народнага спажывання, выплата незаробленых грошай, непісьменныя камерцыйныя і кіраўніцкія рашэнні, скарачэнне імпарту, арыентацыя на вартасныя паказчыкі, нізкая якасць прадукцыі, адсутнасць валюты і інш.

У Рэспубліцы Беларусь распрацаваны асноўныя першачарговыя напрамкі ліквідацыі Д.: фінансавае аздараўленне эканомікі краіны, адцягненне часткі грашовых сродкаў ад бягучага попыту, павелічэнне працэнтаў па тэрміновых укладах, продаж кватэр, устанаўленне цеснай сувязі зарплаты з канчатковымі вынікамі, актыўнае прыцягненне грашовых сродкаў насельніцтва у сферу кааператыўнай вытворчасці, распаўсюджванне акцый сярод членаў працоўных калектываў, далейшае раз-

віццё новых метадаў гаспадарання, рэзкае пашырэнне прапанавання тавараў і паслуг шляхам дадатковага стымулявання іх вырабу, манеўраванне рэсурсамі, развіццё кааперацыі і арэнды, перагляд імпартнай палітыкі, падключэнне абароннага комплексу да вырабу тавараў народнага спажывання, упарадкаванне цэнаўтварэння, паскарэнне перабудовы палітычнай сістэмы, перамены ў сацыяльнай і духоўна-ідэалагічнай сферах.

**ДЫСЦЫПЛІНА** (Дисциплина) - вызначаны парадак паводзін людзей, які адпавядае нормам права і маралі, што дзейнічаюць у грамадстве, а таксама патрабаванням той ці іншай дзейнасці. Асновай Д. з'яўляецца ўстаноўлены дзяржавай парадак адносін, згодна з якім усе дзяржаўныя ўстановы, грамадскія арганізацыі, службовыя асобы і асобныя грамадзяне павінны своечасова і дакладна вырашаць ускладзеныя на іх задачы і выконваць абавязкі ў адносінах да дзяржавы, працоўнага калектыву і сям'і. Д. неабходна ва ўсіх сферах жыцця людзей. Але асаблівае значэнне трэба надаваць Д. у вытворчых адносінах, якія забяспечваюць эфектыўныя шляхі стварэння і размеркавання матэрыяльных даброт. Сюды адносіцца Д. працоўная, планавая, дагаворная, тэхналагічная і інш.

*Працоўная Д.* - гэта такая форма сувязі людзей у працэсе працы, пры якой кожны ўдзельнік вытворчасці забяспечвае строгае і дакладнае выкананне ўстаноўленага парадку, выконвае функцыі кіравання сваёй працай. Яна забяспечвае ўзгодненасць у дзейнасці ўсіх элементаў вытворчасці, аб'ядноўвае людзей у калектыў, ператварае індывідуальную рабочую сілу ў сукупную. Умацаванне працоўнай Д. - рашаючая ўмова эканамічнага ўздыму краіны, яе перабудовы. Гэта ж патрабуецца і ад планавай Д. З пераходам да эканамічных метадаў кіравання гаспадарчыя органы, прадпрыемствы (аб'яднанні) і іх падраздзяленні атрымалі шырокую самастойнасць у планаванні сваёй дзейнасці. Пры гэтым яны нясуць строгую і няўхільную адказнасць за канчатковыя вынікі гаспадарчай дзейнасці. Планавая Д. падтрымліваецца *Д. дагаворнай* - сістэмай узаемнай матэрыяльнай адказнасці за выкананне дагаворных абавяза-

цельстваў. Д. падтрымліваецца і ўмацоўваецца з дапамогай мер матэрыяльнага і маральнага стымулявання, выхаваўчых мер, а ў асобных выпадках да яе парушальнікаў ужываюцца меры грамадскага і адміністрацыйнага ўздзеяння.

**ДЭФІЦЫТ** (Дефицит) - доўгатэрміновая няхватка тавараў або перавышэнне расходаў перад даходамі (дэфіцытная эканоміка, бюджэтны дэфіцыт).

Дэфіцытнасць эканомікі, што асабліва праявілася ў 80-я гады, характарызуецца наступнымі з'явамі: незбалансаванасць попыту і прапанавання як па аб'ёму, так і па структуры, як па таварах народнага спажывання, так і па сродках вытворчасці; дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту; разладжанне фінансава-крэдытнай сістэмы; вялікі памер знешнеэканамічнага доўгу, рост цэн пры пагаршэнні якасці прадукцыі; недасканаласць дзяржаўнага рэгулявання цэн; інфляцыя; марнатраўства; манапалізацыя тавараvытворцаў; недастатковае вырашэнне экалагічных праблем.

Асноўныя прычыны крызіснага стану эканомікі: празмерная цэнтралізацыя планавання; адсутнасць рынку сродкаў вытворчасці і тавараў народнага спажывання; высокі ўзровень спецыялізацыі і канцэнтрацыі вытворчасці; пераважнае развіццё галін групы "А" на шкоду галінам групы "Б", якія выпрацоўваюць тавары народнага спажывання; сыравінная накіраванасць знешняга гандлю; безгаспадарчасць; вялікія расходы па абароту; каманднa-адміністрацыйныя метады кіравання; ведамасны манапалізм. Ведамствы навязваюць грамадству дарагія і неэфектыўныя праекты гаспадарчага будаўніцтва, якія пагаршаюць эканамічную сітуацыю, вядуць да росту грашовай масы ў прадпрыемстваў і насельніцтва без неабходнага тованарнага пакрыцця, павышэння цэн на прадукцыю без паляпшэння якасці.

У адпаведнасці з задачамі пераходу да рынку распрацаваны наступныя шляхі аздараўлення эканомікі: далейшае паглыбленне эканамічнай рэформы, дэмакратызацыя грамадства, структурная перабудова эканомікі дзеля яе сацыяльнай пераарыентацыі і насычэння рынку, канверсія ваеннай вытворчасці, скарачэнне вытвор-

часці ў здабываючай і паліўна-сыравіннай галіне, масавае будаўніцтва жылля за кошт сродкаў насельніцтва, значны рост вырабу тавараў народнага спажывання, замарожванне цэн і даходаў, строгае фан дзіраванне матэрыяльных рэсурсаў, кантроль за выкарыстаннем працоўных і фінансавых рэсурсаў, аздараўленне фінансаў, паляпшэнне знешнеэканамічных сувязей, скарачэнне і ўдасканаленне апарату кіравання.

З

**ЗАКОН АДПАВЕДНАСЦІ ВЫТВОРЧЫХ АДНОСІН ХАРАКТАРУ І ЎЗРОЎНЮ РАЗВІЦЦЯ ПРАДУКЦЫЙНЫХ СІЛ** (Закон соответствия производственных отношений характеру и уровню развития производительных сил) - адзін з агульнаэканамічных і агульнасацыялагічных законаў, які вызначае аб'ектыўную, прычынна-выніковую залежнасць вытворчых адносін ад ступені развіцця прадукцыйных сіл, іх дыялектычнае адзінства і супярэчлівасць.

Вырашэнне дыялектычнай супярэчнасці паміж прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі, а значыць, і рух самога закону, яго выкарыстанне мае на ўвазе развіццё і першых, і другіх. У ходзе перабудовы атрымала прызнанне, з аднаго боку, палажэнне аб тым, што галоўная прычына павольнага змянення становішча спраў у эканоміцы заключаецца ў недасканаласці сістэмы вытворчых, эканамічных адносін, уключаючы і адносіны ўласнасці. З другога боку, у сістэме мер па правядзенню ў жыццё радыкальнай эканамічнай рэформы на першы план выступаюць новыя падыходы да арганізацыі эканамічных адносін, стаўка робіцца на развіццё разнастайных форм уласнасці, форм гаспадарання, якія забяспечваюць спалучэнне ўсёй разнастайнасці інтарэсаў, актывізацыю чалавечага фактару, што з'яўляецца самым істотным ва ўдасканаленні вытворчых адносін у адпаведнасці з патрэбамі прадукцыйных сіл. Новым прадукцыйным сілам прапанаваны новыя падыходы ў арганізацыі сістэмы гаспадарання, дэмакратызацыя эканамічнага жыцця - у гэтым галоўная сутнасць дзеяння і выкарыстання дадзенага закону.

**ЗАКОН ГРАШОВАГА АБАРАЧЭННЯ** (Закон де-

нежного обращения) - эканамічны закон, які вызначае колькасць грошай, неабходных для абарачэння. Згодна з законам, колькасць грошай павінна быць роўнай суме цэн тавараў, якія падлягаюць рэалізацыі, за мінусам сумы цэн тавараў, прададзеных у крэдыт, і ўзаемапагашальных плацяжоў, але з дабаўленнем плацяжоў, для якіх падышоў тэрмін аплаты. Лічба, атрыманая ў выніку, дзеліцца на сярэднюю колькасць абаротаў аднайменных грашовых адзінак. Гэты закон дзейнічае ва ўсіх спосабах вытворчасці, дзе існуе таварнае і грашовае абарачэнне. З.г.а. патрабуе пэўных суадносін паміж грашовай і таварнай масамі, якія знаходзяцца ў абарачэнні, усебаковага і правільнага ўліку вырабу тавараў, узроўню цэн і колькасці грошай, якія выпускаюцца ў абарачэнне. Парушэнне гэтых патрабаванняў прыводзіць да абясцэньвання грошай (*гл. Інфляцыя*). Хуткасць абароту грошай - колькасць абарачэння грашовай масы за пэўны прамежак часу праз касы банкаў. Павелічэнне хуткасці абарачэння грошай пры адным і тым жа аб'ёме таварнага абароту патрабуе меншай іх масы. Рашаючы ўплыў на фарміраванне грашовай масы ў абарачэнні аказвае аб'ём тавараабароту і паслуг. Пры гэтым улічваюцца грошы, якія могуць быць выкарыстаны насельніцтвам для аплаты набытых тавараў і аказаных паслуг. У выпадку, калі адбываецца зніжэнне аб'ёму тавараабароту і сумы запланаваных плацяжоў, лішнія грошы аўтаматычна не выходзяць са сферы абарачэння. Дзяржава павінна эканамічнымі мерамі рэгуляваць абгрунтаваныя змены ў аб'ёме грашовай масы з улікам патрабаванняў З.г.а.

**ЗАКОН ПЕРАМЕНЫ ПРАЦЫ** (Закон перемены труда) - аб'ектыўныя змяненні структуры ўцягнутай у працоўную дзейнасць рабочай сілы грамадства і прывядзенне яе ў адпаведнасць з грамадскімі патрэбамі ў працы шляхам перамены работнікамі працоўных функцый. Перамена працы - гэта адметная форма руху рабочай сілы, абумоўленая развіццём рэчыўных і асабістых фактараў вытворчасці, з'яўленнем новых відаў працоўнай дзейнасці, відазмяненнем і адміраннем старых. Перамена працы як заканамерны працэс дыктуецца су-

купнасцю наступных аб'ектыўных фактараў: навукова-тэхнічны прагрэс, які скасоўвае адны віды працы і спараджае іншыя; рост прадукцыйнасці працы, які дазваляе задаволіць патрэбы грамадства ў асобных відах працы меншай колькасцю працуючых; павелічэнне аб'ёму вытворчасці пры нязменнай колькасці працуючых; сацыяльна-дэмаграфічныя змяненні, якія вымушаюць работнікаў перапыняць выкананне ранейшых функцый і мяняць від працы.

Перамена працы праяўляецца як адзінкавая - адносна асобнага работніка, і як грамадская - адносна сукупнай рабочай сілы грамадства. Адзінкавая перамена працы азначае выкліканае аб'ектыўнымі ўмовамі спыненне выканання работнікам працоўнай функцыі, якой ён валодаў, і ўключэнне яго ў працоўную дзейнасць па новай прафесіі і іншаму ўзроўню складанасці працы. Грамадская перамена працы - гэта працэс пераразмеркавання сукупнай рабочай сілы ў пэўных прапорцыях па якасна розных відах працы, па прафесіях і ўзроўнях кваліфікацыі ў межах прафесій. Задачы перамены працы служыць адзіная сістэма бесперапыннай адукацыі, і ў прыватнасці прафесійна-тэхнічная, сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя, сістэма павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

**ЗАКОН ПОПЫТУ І ПРАПАНАВАННЯ** (Закон спроса и предложения) - гэта аб'ектыўна абумоўленая неабходнасць у адпаведнасці (ў часе і прасторы) вартасных і натуральна-рэчыўных форм плацежаздольнага попыту таварнаму прапанаванню. З.п. і п., як і ўсе эканамічныя законы грамадскага развіцця, не рэалізуецца ў кожны дадзены момант, а дзейнічае ў выглядзе тэндэнцыі. З.п. і п. праз эканамічныя катэгорыі "прапанаванне" і "попыт" выяўляе істотныя ўстойлівыя, неабходныя сувязі паміж вытворчасцю і спажываннем. З.п. і п. уласцівы прычынна-выніковы характар іх сувязей: попыт вызначае прапанаванне, прапанаванне вызначае попыт. Аналагічныя сувязі назіраюцца паміж попытам і прапанаваннем з пункту гледжання вартасці і спажывецкай вартасці: дынаміка цэн, грашовых даходаў цягне за сабой змяненні ў адносінах попыту і прапанавання па

спажывецкай вартасці тавараў, і, наадварот, змяненні ў суадносінах попыту і прапанавання па спажывецкай вартасці выклікаюць ваганні цэн і попыту.

З.п. і п. выяўляе супярэчнасць паміж вытворчасцю і спажываннем, попытам і прапанаваннем, пакупнымі і тварнымі фондамі, прадпрыемствамі-пастаўшчыкамі і прадпрыемствамі-пакупнікамі,таварамі і грашыма, спажывецкай вартасцю і вартасцю. Нявывучанасць закону попыту і прапанавання нанесла эканоміцы нашай рэспублікі дастаткова адчувальную шкоду, што ў пэў-най ступені праявілася ў незбалансаванасці попыту і прапанавання як па аб'ёму, так і па структуры, у дэфіцыце.

**ЗАКОН УЗВЫШЭННЯ ПАТРЭБ** (Закон возвышения потребностей) - агульны эканамічны закон, які выяўляе дынамізм патрэб, што спараджаюцца вытворчасцю, пастаянны працэс развіцця і якаснага ўдасканалення існуючых і з'яўленне і прымнажэнне новых патрэб, якія абумоўліваюць далейшае развіццё вытворчасці.

Супярэчлівае ўзаемадзеянне вытворчасці са спажываннем з'яўляецца самай агульнай асновай і рухаючай сілай развіцця незалежна ад яго грамадскай формы. Прагрэсіўныя змены ў прадукцыйных сілах грамадства выклікаюць узнікненне новых патрэб, якаснае ўдасканаленне існуючых і адміранне старых. У сваю чаргу задавальненне патрэб стымулюе далейшае развіццё вытворчасці, укараненне новай тэхнікі і тэхналогіі, змяненне структуры вытворчасці.

Патрэбы, якія ўзнікаюць аб'ектыўна, праламляюцца ў чалавечай свядомасці, а таму неабходна карпатлівая работа па фарміраванню ў людзей здаровых, разумных патрэб. У іх структуры паступова павінна павялічвацца доля інтэлектуальных, сацыяльных патрэб. Адметнасць дынамізму дзеяння надае З.у.п. навукова-тэхнічная рэвалюцыя, якая паскорыла пераход ад аднаго якаснага ўзроўню спажывання да другога. Аднак развіццё вытворчасці і ўзвышэнне патрэб не павінны падрываць экалагічныя асновы існавання грамадства, наносіць шкоду навакольнаму асяроддзю. Ва ўмовах дэфіцыту тавараў і паслуг не забяспечваецца неабходны рост за-

давальнення патрэб, што адмоўна ўплывае на развіццё вытворчасці.

**ЗАКОН ЭКАНОМІІ ЧАСУ** (Закон экономии времени) - адзін з усеагульных законаў, які характарызуе аб'ектыўную неабходнасць пастаяннай эканоміі жывой і арэчаўленай працы як крыніцы і спосабу павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці. Як першы эканамічны закон на аснове калектыўнай вытворчасці, З.э.ч. адлюстроўвае самую агульную аснову і ўнутраную логіку эканамічнага, а значыць, і ўсяго грамадскага прагрэсу. З.э.ч. выяўляецца ва ўсіх сферах грамадскай вытворчасці, ён распаўсюджваецца і на тую частку пазарабочага часу, якая звязана з выкананнем сямейна-бытавых абавязкаў за межамі ўласнага часу вытворчасці. Такім чынам, З.э.ч. шырэйшы, чым закон росту прадукцыйнасці працы, які дзейнічае ў вытворчай сферы. Да эканоміі рабочага часу зводзіцца ў канчатковым выніку любая эканомія матэрыяльных і працоўных рэсурсаў на аснове прагрэсіўных змяненняў у тэхніцы і тэхналогіі, у прафесійным майстэрстве работніка, у арганізацыі вытворчасці, працы і кіравання. У эканоміі часу выяўляецца і павышэнне спажывецкіх уласцівасцей прадукту - магутнасці і надзейнасці абсталявання, дакладнасці і тэрміну службы прыбораў, пажыўных каштоўнасцей прадуктаў, якасці адзення, абутку і г.д. Эканомія часу з'яўляецца вышэйшым крытэрыем эканамічнасці ўсіх гаспадарчых мерапрыемстваў.

Эканомія часу, дасягненне больш высокай прадукцыйнасці працы - гэта адначасова і сведчанне росту ўзроўню развіцця прадукцыйных сіл грамадства, і крытэрый яго багацця, забяспечанасці разнастайнымі матэрыяльнымі і духоўнымі дабротамі, паслугамі. Канкрэтным выяўленнем З.э.ч. з'яўляюцца паказчыкі вытворчасці валавога нацыянальнага прадукту, нацыянальнага даходу, а таксама разнастайных відаў прадукцыі ў натуральным вымярэнні на душу насельніцтва. З.э.ч. патрабуе ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі ўсебаковай інтэнсіфікацыі грамадскага ўзнаўлення, павышэння яго эфектыўнасці.

**ЗАКОНЫ ЭКАНАМІЧНЫЯ** (Законы экономиче-

ские) - істотныя, прычынна-выніковыя, устойлівыя і паўтаральныя сувязі працэсаў і з'яў грамадскага жыцця. Гэта законы развіцця прадукцыйных сіл і вытворчых адносін, усёй грамадска-эканамічнай фармацыі. Яны дзейнічаюць як аб'ектыўная неабходнасць і аб'ектыўная магчымасць, асноўная скіраванасць развіцця, яго пануючая тэндэнцыя. Аб'ектыўны характар дзеяння З.э. азначае іх незалежнасць ад волі і жадання людзей, класаў, але ў той жа час у адрозненне ад законаў прыроды З.э. выяўляюцца ў грамадстве, у дзеяннях людзей, класаў, сацыяльных груп. А гэта азначае, што грамадства, людзі могуць пазнаваць і пазнаюць З.э., выкарыстоўваць іх для дасягнення сваіх мэт.

У эканамічнай навуцы адрозніваюць усеагульныя, агульныя і спецыфічныя З.э. Да першых адносяцца З.э.,якія дзейнічаюць ва ўсіх грамадска-эканамічных фармацыях: законы адпаведнасці вытворчых адносін узроўню і характару прадукцыйных сіл, росту прадукцыйнасці грамадскай працы, перамены працы, узвышэння патрэб і інш. Агульнымі З.э. з'яўляюцца законы, якія дзейнічаюць у некалькіх фармацыях. Гэта законы таварнай вытворчасці (вартасці, грашовага абарачэння, суадносін попыту і прапанавання), а таксама пераважнага росту вырабу сродкаў вытворчасці ў параўнанні з вырабам прадметаў спажывання. Спецыфічнымі з'яўляюцца законы, характэрныя толькі для дадзенай фармацыі ці пэўнага этапа яе развіцця.

З.э. дзейнічаюць як сістэма, у якой вядучую ролю адыгрывае асноўны эканамічны закон. Іншыя З.э. узаемадзейнічаюць з асноўным, адзін з адным, а ўся сістэма выступае як рэгулятар грамадскай вытворчасці. Механізм дзеяння З.э. азначае іх пазнанне, устанаўленне прычынна-выніковых сувязей паміж з'явамі грамадскага жыцця, выяўленне іх у эканамічных інтарэсах, аб'ектыўных эканамічных катэгорыях. Механізм выкарыстання З.э. мае на ўвазе распрацоўку і ажыццяўленне эканамічнага, гаспадарчага механізму, арганізацыю і кіраванне народнай гаспадаркай, навукова абгрунтаваную эканамічную палітыку і эканамічную стратэгію.

**ЗАКУПКІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ПРА-**

**ДУКЦЫІ (ДЗЯРЖАЎНЫЯ)** (Закупки сельскохозяйственной продукции) - форма цэнтралізаванага фарміравання дзяржаўных харчовых і сыравінных рэсурсаў пры дапамозе набыцця (закупкі) іх у сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і насельніцтва. Дзяржаўныя закупкі адлюстроўваюць вытворча-эканамічныя сувязі паміж горадам і вёскай, прамысловасцю і сельскай гаспадаркай. Удасканаленне сістэмы закупак сельскагаспадарчай прадукцыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з развіццём вытворчых сіл і змяненнем патрабаванняў грамадства.

На сучасным этапе пераходу да рыначных адносін, узмацнення зацікаўленасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў удасканаленне дзяржаўных закупак ажыццяўляецца шляхам расшырэння свабодных дагаварных сувязей вытворцаў сельскагаспадарчых прадуктаў з дзяржаўнымі нарыхтоўшчыкамі, перапрацоўчымі прадпрыемствамі і гандлёвымі арганізацыямі. Пры гэтым прадпрыемствы-вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі дабравольна прымаюць на сябе заказ па яе продажу з улікам узаемных інтарэсаў вытворцаў і пакупнікоў (нарыхтоўшчыкаў).

У сувязі з развіццём перапрацоўкі сельгаспрадукцыі на месцах яе вытворчасці непасрэдна ў сельскагаспадарчых прадпрыемствах пашыраецца сфера дзяржаўных закупак канечнай прадукцыі аграрнай вытворчасці.

**ЗАЛАТЫ СТАНДАРТ** (Золотой стандарт) - форма арганізацыі грашовай сістэмы, заснаваная на выкарыстанні золата як грашовага тавару. Вядомы некалькі форм З.с. - золатаманетны, золатазліткавы і золатадэвізны. Для золатаманетнага стандарту характэрна свабодная чаканка залатых манет пры пэўным утрыманні грашовай адзінкі, а таксама знаходжанне ў абарачэнні золата і грашовых знакаў, якія свабодна разменьваюцца на залатыя манеты. Пры золатазліткавым стандарце банкноты (грашовыя знакі) разменьваюцца толькі на золата ў злітках, а не залатыя манеты пры ўмове прад'яўлення іх на буйную суму. Золата-дэвізны стандарт мае на ўвазе абмен банкнотаў не непасрэдна на золата, а на валюту іншых краін, якая абменьваецца на

залатыя злiткi.

Золатаманетны стандарт быў тыповым для перыяду свабоднай канкурэнцыі і праіснаваў амаль да пачатку першай сусветнай вайны. Золатазліткавы і золатадэвізны стандарты выкарыстоўваліся ў гады першай сусветнай вайны, сусветнага эканамічнага крызісу. На пачатку другой сусветнай вайны банкноты абменьваліся на золата практычна толькі ў ЗША. Пасля другой сусветнай вайны склалася Брэтан-Вудская сістэма, пры якой у краінах са свабодна канверсаванай валютай захаваліся некаторыя прыкметы золата-дэвізнага стандарту. Пры гэтым адна валюта - долар ЗША - захавала сувязь з золатам (золата - доларавы стандарт). З 1971 г. ЗША афіцыйна спынілі продаж залатых зліткаў на долары. Рашэннямі канферэнцыі Сусветнага камітэта Міжнароднага валютнага фонду ў 1976 г. у Кінгстане (Ямайка) золата было пазбаўлена грашовых функцый.

**ЗАПАСЫ ВЫТВОРЧЫЯ** (Запасы производственные) - частка сукупных запасаў грамадства і асноўная форма абаротных вытворчых фондаў прадпрыемстваў (аб'яднанняў).

Сыравіна, матэрыялы, камплектуючыя вырабы, якія паступілі ў сферу вытворчасці, але яшчэ не падвергліся апрацоўцы і не згубілі сваіх першапачатковых уласцівасцей, адносяцца да З.в.

Неабходнасць у З.в. абумоўліваецца асаблівасцямі вытворчасці розных відаў прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння, несупадзеннем вытворчых цыклаў, а таксама тэрытарыяльным размяшчэннем асобных, звязаных між сабой, вытворчасцей.

На памер З.в. аказвае ўплыў ступень развіцця сферы таварнага абарачэння сродкаў вытворчасці, вытворчай інфраструктуры. У выніку дзеяння гэтых фактараў рост З.в. у гады экстэнсіўнага развіцця абганяў па тэмпах рост аб'ёму вытворчасці і цяпер дасягнуў звыш 180 млрд руб.

З.в. па той функцыі, якую яны выконваюць, падзяляюцца на падрыхтоўчыя, бягучыя і страхавыя. Яны размешчаны на складах служб забеспячэння прадпрыемстваў (аб'яднанняў), упраўленняў вытворча-тэхна-

лагічнай камплектацыі (УВТК) будаўнічых арганізацый, а таксама ў вытворчых падраздзяленнях. Функцыянальна да З.в. прыпадабняецца незавершаная вытворчасць. Па сутнасці гэта таксама запас сродкаў вытворчасці, які ўступіў непасрэдна ў вытворчы працэс.

**ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА** (Заработная плата) - форма ўзнагароды за працу работнікаў, тая частка ў сукупным грамадскім прадукце ці нацыянальным даходзе, якая ў грашовай форме размяркоўваецца паміж імі ў залежнасці ад колькасці і якасці затрачанай працы. Як эканамічная катэгорыя яна выяўляе складаныя эканамічныя адносіны паміж асобным работнікам і грамадствам наогул, а таксама паміж работнікамі і працоўнымі калектывамі, у якіх яны працуюць, наконт фарміравання і размеркавання асноўнай часткі неабходнага прадукту.

Сутнасць З.п. праяўляецца ў яе функцыях: узнаўленчай, уліковай і кантрольнай, стымулюючай і сацыяльнай. Перш за ўсё З.п. разам з грамадскімі фондамі спажывання забяспечвае расшыранае ўзнаўленне рабочай сілы, пастаянную падтрымку і развіццё здольнасцей чалавека да працы. З яе дапамогай ажыццяўляюцца ўлік і кантроль за мерай працы і мерай яе ўзнагароджання, укараняецца правіла: больш зрабіў - больш і атрымаў. А гэта, у сваю чаргу, стымулюе рост вытворчасці і дасягненне працоўнымі высокіх эканамічных вынікаў (вытворчасць працы, эканомія рэсурсаў, якасць прадукцыі). Толькі такім шляхам яны могуць павялічваць нацыянальны даход, паляпшаць дабрабыт грамадства і дабрабыт сваёй сям'і, вырашаць іншыя сацыяльныя задачы. З.п. - галоўная крыніца даходаў насельніцтва, якія ідуць у індывідуальнае спажыванне. Таму зыходным пунктам вызначэння велічыні З.п. з'яўляецца пражытачны мінімум той мінімальны ўзровень зарплаты, які неабходны для ўзнаўлення простай, некваліфікаванай рабочай сілы. З развіццём вытворчасці кваліфікацыя работнікаў становіцца ўсё больш высокай, узвышаюцца іх патрэбы, і разам з тым растуць магчымасці па павышэнню мінімальнай зарплаты. Яе вышэйшы ўзровень не ўстаноўлены. Практычна

велічыня З.п. вызначаецца ў рамках прадпрыемстваў і ўстаноў працоўнымі калектывамі з дапамогай тарыфнай сістэмы. Праз яе дзяржава рэгулюе ўзровень зарплаты рабочых і служачых па галінах вытворчасці ў адпаведнасці з іх народнагаспадарчым значэннем, а таксама ўнутры асобных галін з улікам кваліфікацыі, характару і ўмоў працы розных катэгорый работнікаў і асаблівасцей работы. У сувязі з эканамічнай рэформай, з укараненнем гаспадарчага разліку ўдасканальваецца арганізацыя аплаты працы. Удасканальваюцца пры гэтым дзве традыцыйныя формы З.п. - пачасовая і здзельная. Разам з тым усё шырэй распаўсюджваюцца формы спалучэння індывідуальнай і калектыўнай зацікаўленасці і адказнасці за вынікі працы (падрад, арэнда і г.д.). Галоўная задача, якая вырашаецца пры гэтым, заключаецца ў тым, каб паставіць заработак у непасрэдную залежнасць ад канчатковых вынікаў гаспадарчай дзейнасці і тым самым узняць зацікаўленасць працоўнага калектыву і асобнага работніка ў эфектыўнай працы і кіраванні вытворчасцю, а разам з тым і іх адказнасць, стварыць у кожным калектыве здаровы маральны клімат, стан узаемнай адказнасці і патрабавальнасці.

Трэба адрозніваць намінальную З.п. ад рэальнай З.п. Першая - гэта выплачаная сума грошай, а другая - тая колькасць сродкаў жыцця, якія можна купіць за гэтыя грошы. З.п. разам з выплатамі, ільготамі з грамадскіх фондаў спажывання складае рэальныя даходы насельніцтва. Апошнія залежаць як ад атрыманых грашовых сум, так і ад узроўню цэн. З развіццём эканомікі, павелічэннем зарплаты і выплат з грамадскіх фондаў спажывання пры стабільнасці рознічных цэн расце і рэальны прыбытак насельніцтва.

**ЗБАЛАНСАВАНАСЦЬ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ** (Сбалансированность народного хозяйства) - узгодненае развіццё ўсіх яе сфер, падраздзяленняў, галін, рэгіёнаў з улікам вырашэння сацыяльна-эканамічных задач, вызначаных на планавы перыяд. З.н.г. дасягаецца з дапамогай распрацоўкі і ажыццяўлення планаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця, у якіх увязваецца функцыяніраванне ўсіх звёнаў народнай гаспадаркі з

дапамогай балансавага, праграмна-мэтавага, нарматыўнага і іншых метадаў і шляхам стварэння адпаведных рэзерваў розных вытворчых рэсурсаў (матэрыяльных, працоўных, фінансавых).

**ЗНЕШНІ ГАНДАЛЬ** (Внешняя торговля) - форма вартаснага абмену прадуктамі працы і паслугамі паміж краінамі. З.г. складаецца з увозу (імпарту) і вывазу (экспарту) тавараў. У аснове З.г. ляжыць міжнародны падзел працы.

Рэспубліка Беларусь развівае знешнегандлёвыя адносіны кіруючыся прынцыпамі поўнай роўнасці бакоў і ўзаемнай выгады, неўмяшання ва ўнутраныя справы і павагі да дзяржаўнага суверэнітэту, добрасумленнага і дакладнага выканання абавязацельстваў, прынятых па гандлёвых пагадненнях з замежнымі дзяржавамі.

Асноўнымі дакументамі, якія рэгулююць гандлёва-эканамічныя адносіны, з'яўляюцца гандлёвыя дагаворы і пагадненні, што ўсталёўваюць прававую базу і вызначаюць гандлёвы рэжым. У дагаворах і пагадненнях знаходзіць адлюстраванне асноўны прынцып міжна- роднага гандлю - прынцып найбольшага спрыяння.

Усебаковае і ўмелае выкарыстанне праз каналы З.г. пераваг міжнароднага падзелу працы спрыяе паскарэнню навукова-тэхнічнага развіцця вытворчасці, аптымізацыі галіновай структуры народнай гаспадаркі, забяспечвае больш поўнае задавальненне патрэб людзей.

**ЗНЕШНІ ДОУГ ДЗЯРЖАУНЫ** (Внешний долг государственный) - агульная сума запазычанасці дзяржавы па непагашаных знешніх пазыках і не выплачаных па іх працэнтах. Па тэрмінах пагашення адрозніваюцца капітальны дзяржаўны доўг (запазычанасць, па якой тэрмін плацяжу не надышоў) і бягучую запазычанасць ( па якой тэрмін плацяжу надыходзіць у гэтым або бліжэйшым бюджэтным годзе).

Знешнія пазыкі могуць спрыяць удасканаленню эканомікі краіны, развіццю яе інфраструктуры, пераадоленню крызісных сітуацый. Разам з тым пры дапамозе пазык крэдытор у шэрагу выпадкаў мае магчымасць рэальна ўплываць на эканамічнае развіццё дзяржаў-даўжнікоў, іх палітычны курс. Ва ўмовах пашырэння

міжнародных фінансава-крэдытных адносін вельмі важную ролю адыгрываюць прадуманая палітыка знешніх пазык, забеспячэнне іх эфектыўнага выкарыстання.

Неадэкватны эканамічным магчымасцям краіны рост знешняй запазычанасці можа прывесці да вычэрпвання яе матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў, інфляцыйнага росту цэн, дэвальвацыі нацыянальнай валюты.

**ЗНОС АСНОЎНЫХ ФОНДАЎ** (Износ основных фондов) - паступовая страта гэтымі фондамі сваёй спажывецкай вартасці і вартасці ў працэсе функцыяніравання ў вытворчым працэсе. Велічыня зносу характарызуе тую частку вартасці асноўных фондаў, якую яны перанеслі на створаны прадукт. Адрозніваюць фізічны (матэрыяльны) і маральны знос. Фізічны знос характарызуе матэрыяльнае зношванне як у працэсе выкарыстання асноўных фондаў, так і пры іх бяздзейнасці з прычыны ўплыву прыродных фактараў і старэння матэрыялаў, з якіх яны зроблены. Пры фізічным зносе асноўныя фонды паступова губляюць свае вытворча-тэхнічныя характарыстыкі. На яго ўзровень уплывае інтэнсіўнасць выкарыстання фондаў у працэсе вытворчасці, якасць матэрыялаў, з якіх яны зроблены, своечасовасць і якасць рамонтаў, кваліфікацыя рабочых, якія эксплуатуюць і абслугоўваюць асноўныя фонды, умовы, у якіх яны выкарыстоўваюцца, і інш. Ступень фізічнага зносу пасіўных элементаў асноўных фондаў у працэнтах або па вартасці, як правіла, вызначаецца шляхам вывучэння фактычнага тэхнічнага стану аб'екта цалкам або толькі яго важнейшых канструкцыйных элементаў. Фізічны знос актыўнай часткі асноўных фондаў вызначаецца тэрмінамі службы па формуле $З_ф = Т_ф : Т_н \times 100$, дзе $Т_ф$ і $Т_н$ - адпаведна фактычны і нарматыўны тэрміны службы. Маральны знос асноўных фондаў паказвае абясцэненне іх да поўнага фізічнага зносу ў сувязі з развіццём навукова-тэхнічнага прагрэсу. Праяўляецца ў дзвюх формах. Першая - змяншэнне вартасці аднаўлення машын і абсталявання, другая - укараненне новых, больш прагрэсіўных у тэхнічных адносінах іх відаў. Маральны знос першай формы вы-

значаецца ў працэнтах шляхам супастаўлення поўнай першапачатковай вартасці асноўных фондаў з аднаўленчай па формуле $З_{м1} = (П - А) : П \times 100$, дзе П і А - адпаведна поўная першапачатковая і аднаўленчая іх вартасць. Маральны знос другой формы вызначаецца ў працэнтах на аснове супастаўлення прадукцыйнасці старых і новых асноўных фондаў па формуле $З_{м2} = (П_н - П_с) : П_н \times 100$, дзе $П_н$ і $П_с$ - прадукцыйнасць адпаведна новых і старых асноўных фондаў. Выкарыстанне маральна ўстарэлых асноўных фондаў да іх поўнага фізічнага зносу эканамічна нявыгадна, бо гэта стрымлівае рост прадукцыйнасці працы і эфектыўнасці вытворчасці. Таму неабходна ўсямерна зблізіць тэрміны маральнага і фізічнага зносу за кошт больш інтэнсіўнай іх эксплуатацыі.

**І**

**ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ПРАЦОЎНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ** (Индивидуальная трудовая деятельность) - самастойная ініцыятыўная дзейнасць грамадзян, якая накіравана на атрыманне прыбытку або асабовага даходу і ажыццяўляецца ад свайго імя, на сваю рызыку і пад сваю адказнасць. І.п.дз. ажыццяўляецца прадпрымальнікам без утварэння юрыдычнай асобы.

Прававую базу для ажыццяўлення І.п.дз. і адпаведна рэалізацыі канстытуцыйных гарантый правоў грамадзян стварае Закон Беларускай ССР "Аб прадпрымальніцтве ў Беларускай ССР". Прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць без утварэння юрыдычнай асобы, павінны прайсці дзяржаўную рэгістрацыю ў выканкамах мясцовых Саветаў народных дэпутатаў па месцапражыванні. Для гэтага яны павінны прадставіць заяву, ліцэнзію, калі дадзены від дзейнасці падлягае ліцэнзіраванню, дакумент, які пацвярджае іх кваліфікацыю, калі прадпрымальніцкая дзейнасць можа прадстаўляць пагрозу для жыцця і здароў'я людзей ці навакольнага асяроддзя, і дакумент аб унясенні платы за рэгістрацыю.

Калі рэгістрацыя не ажыццёўлена праз 30 дзён ці ў ёй адмоўлена, грамадзянін мае права звярнуцца ў суд. Не дапускаецца заняцце прадпрымальніцкай дзейнасцю

службовымі асобамі і спецыялістамі, якія працуюць у органах дзяржаўнай улады і кіравання, пракуратуры і суда.

Паступова ствараюцца эканамічныя і прававыя ўмовы для свабоднага міжнароднага руху тавараў, фінансавых рэсурсаў, тэхналогій і людзей.

**ІНДЭКС** (Индекс) - адносная велічыня, якая паказвае суадносіны ўзроўняў якой-небудзь з'явы ў часе або прасторы. І., падлічаны для асобнага элемента складанай з'явы, называецца індывідуальным. Адносны паказчык, які характарызуе змяненне складанай з'явы, куды ўваходзяць непасрэдна несувымяральныя элементы, называецца агульным або зводным І.

Сярэдняя форма І. можа быць прадстаўлена ў выглядзе сярэднеарыфметычнага і сярэднегеаметрычнага І. Сярэднеарыфметычны І. - сярэдняя велічыня якая складаецца з індывідуальных І.

Узровень з'явы, які прымаецца за базу параўнання, называецца базісным, а ўзровень, які параўноўваецца, - справаздачным. Шэраг І., падлічаных да адной і той жа базы параўнання, называюцца базіснымі. І., падлічаны ў адносінах да папярэдняга ўзроўню атрымаў назву ланцуговага. Ланцуговыя і базісныя І. узаемазвязаны, а іменна: здабытак шэрага ланцуговых І. вядзе да ўтварэння адпаведнага базіснага І.

Значэнне І. як статыстычнага метаду заключаецца ў яго распаўсюджаным практычным прымяненні і выкарыстанні пры вывучэнні дынамікі выканання плана і прасторавага параўнання сацыяльна-эканамічных з'яў.

**ІНТЭГРАЦЫЯ** (Интеграция) - працэс умацнення ўзаемасувязей гаспадарча-эканамічных аб'ектаў. Вылучаюць наступныя віды: 1) эканамічная; 2) аграпрамысловая.

*Эканамічная І.* - гэта форма інтэрнацыяналізацыі гаспадарчага жыцця, якая адлюстроўвае аб'ектыўны працэс перапляцення нацыянальных гаспадарак і правядзення ўзгодненай міждзяржаўнай эканамічнай палітыкі.

Паступова ствараюцца эканамічныя і прававыя ўмовы для свабоднага міжнароднага руху тавараў,

фінансавых рэсурсаў, тэхналогій і людзей.

**ІНТЭНСІЎНАСЦЬ ПРАЦЫ** (Интенсивность труда) - напружанасць працы, якая вызначаецца затратамі працы ў адзінку часу. Змяненні І.п. звязаны са зменамі затрат рабочай сілы ў адзінку часу за кошт павелічэння ці змяншэння хуткасці выканання працоўных аперацый. Павышэнне І.п. за пэўны час павялічвае затраты жыццёвых сіл работніка і, такім чынам, павялічвае агульную колькасць выробленай прадукцыі. І.п. узрастае ў выніку паскарэння работы агрэгатаў, машын, абсталявання, канвеера, павелічэння колькасці адначасова абслугоўваемага абсталявання, змяншэння страт рабочага часу. Ва ўмовах сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі расходаванне мускульнай энергіі змяншаецца, але затраты нервовай, разумовай энергіі павялічваюцца.

У сувязі з высокім узроўнем механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці, вялікай доляй работ з прымусовым рытмам працы на прадпрыемствах машынабудавання і лёгкай прамысловасці ўведзены спецыяльныя даплаты да тарыфных ставак за І.п. Гэта даплата ўводзіцца для рабочых, занятых на канвеерах, паточных аўтаматычных і аўтаматызаваных лініях, на гібкіх аўтаматызаваных вытворчасцях і да т.п. У лёгкай прамысловасці памеры даплат залежаць ад каэфіцыента І.п. (К.і.п.), які ўяўляе сабой вынік ад дзялення здабытку фактычнага выпуску вырабаў у штуках за месяц на тэхнічна абгрунтаваную (штучную) норму явачнага (табельнага) часу работы за месяц.

Даплаты за І.п. устанаўліваюцца ў цэлым калектыву рабочых канвеера (патоку, брыгады, звяна і да т.п.) пры ўмове выканання планавых заданняў па аб'ёму вытворчасці ў зададзенай наменклатуры і якасці выпускаемай прадукцыі. Пры К.і.п. = 1 ... 1,1 даплата складае да 4 %, пры К.і.п. = 1,1 ... 1,2 - да 8 %, пры К.і.п. > 1,2 - да 12 %.

У машынабудаванні прадугледжаны больш складаныя метады разліку даплат за І.п. - у залежнасці ад паказчыка занятасці рабочага актыўнай працай (за цыкл, такт, змену і да т.п.).

**ІНТЭНСІФІКАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Интенсификация производства) - працэс узмацнення напружанасці ў выкарыстанні ўсіх элементаў вытворчасці (рабочай сілы, прадметаў працы і сродкаў працы) дзеля павелічэння памераў вытворчасці за кошт эканоміі на аснове прымянення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу і павышэння кваліфікацыі кадраў. Сутнасць І.в. праяўляецца ў рэсурсазберажэнні, змяншэнні затрат жывой і арэчаўленай працы на адзінку прадукцыі (работ, паслуг). Узровень інтэнсіфікацыі вытворчасці вызначаецца доляй патрэб у рэсурсах, якія задавальняюцца за кошт іх эканоміі. Ён можа быць разлічаны як у поўных патрэбах, так і ў прыросце патрэб у прымяняемых рэсурсах ці іх затрат. Усебаковая інтэнсіфікацыя вытворчасці дасягаецца шляхам стварэння процізатратнага механізму гаспадарання, актыўнага ўкаранення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, пераадолення безгаспадарчасці ў вытворчай дзейнасці.

**ІНТЭНСІФІКАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ** (Интенсификация сельского хозяйства) - працэс забеспячэння росту сельскагаспадарчай прадукцыі за кошт дадатковага паслядоўнага ўкладання сродкаў вытворчасці і працы на кожную адзінку зямлі і выкарыстання дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу. І.с.г. - адна з форм расшыранай вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. Пры экстэнсіўным развіцці павелічэнне прадукцыі сельскай гаспадаркі дасягаецца за кошт расшырэння зямельнай плошчы, росту пагалоўя жывёлы і прыцягнення працоўных рэсурсаў. І.с.г. забяспечвае сістэматычнае павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці пры нязменных (або скарочаных) працоўных і зямельных рэсурсах, пагалоўя жывёлы ў выніку павышэння эканамічнай урадлівасці глебы, паляпшэння пародзістасці і племянных якасцей жывёлы, росту ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадукцыйнасці жывёлы і птушак. Гэта дасягаецца за кошт комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, хімізацыі зямель, укаранення новай тэхнікі і прагрэсіўных тэхналогій, дасягненняў навукі і перадавога вопыту, найбольш удасканаленых форм ар-

ганізацыі працы і вытворчасці, росту кваліфікацыі працоўных кадраў.

Узровень І.с.г. наогул характарызуецца наступнымі паказчыкамі: затратамі сродкаў вытворчасці і жывой працы; шчыльнасцю пагалоўя жывёлы на 100 га зямлі; энергааснашчанасцю зямельных угоддзяў.

Эфектыўнасць І.с.г. вызначаецца: выхадам чыстай прадукцыі (валавога даходу), чыстага даходу (прыбытку) з адзінкі зямельнай плошчы; ростам прадукцыйнасці працы, зніжэннем сабекошту адзінкі прадукцыі, ростам узроўню рэнтабельнасці.

І.с.г. - генеральны напрамак яе развіцця на перспектыву, важнейшая ўмова вырашэння сацыяльна-эканамічнай праблемы вёскі.

**ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ПРАДУКЦЫЙНЫХ СІЛ** (Интернационализация производительных сил) - рост аграмаджвання вытворчасці ў міжнародным маштабе, ліквідацыя ізаляванасці паміж нацыямі, умацаванне іх супрацоўніцтва ў сферы эканамічнай дзейнасці, у абмене матэрыяльнымі каштоўнасцямі, дасягненнямі навукі і тэхнікі. І.п.с. азначае пашырэнне эканамічных працэсаў за нацыянальныя межы асобных дзяржаў, развіццё ўстойлівых эканамічных сувязей паміж краінамі і народамі. Яна абумоўлена ростам прадукцыйных сіл, паглыбленнем міжнароднага падзелу працы і ляжыць у аснове ўзмацнення эканамічнай узаемазалежнасці краін.

І.п.с. - аб'ектыўная тэндэнцыя сусветнага гістарычнага працэсу, які бярэ свой пачатак ва ўмовах пераходу да машыннай вытворчасці, калі нацыянальныя рамкі пачынаюць перашкаджаць развіццю прадукцыйных сіл. На гэтым этапе (сярэдзіна XIX ст.) І.п.с. выявілася ў фарміраванні адзінага сусветнага рынку як сферы ўстойлівых таварна-грашовых адносін, абумоўленай міжнародным падзелам працы. У далейшым яна ўсё больш спалучаецца з інтэрнацыяналізацыяй працэсу вытворчасці і капіталу. Праца набывае грамадскі характар у міжнародным маштабе.

**ІНФАРМАТЫКА** (Информатика) - навука, якая вывучае структуру і агульныя ўласцівасці навуковай

інфармацыі, а таксама заканамернасці і метады яе стварэння, пераўтварэння, перадачы і выкарыстання ў розных сферах чалавечай дзейнасці. І. склалася ў нетрах матэматыкі і кібернетыкі, сістэматыкі і электронікі, логікі і лінгвістыкі. І. з'яўляецца агульнанавуковай катэгорыяй, раскрываецца праз паняцці "мадэль", "даныя", "алгарытм" і "праграма". Ідэі і метады І. прымяняюцца пры вывучэнні інфармацыйнага ўзаемадзеяння ў біялагічных, сацыяльных і іншых прыродных сістэмах. І. - адзін з галоўных напрамкаў навукова-тэхнічнага прагрэсу.

**ІНФАРМАЦЫЯ** (Информация) - змест паведамлення або сігна- лу, веды, якія разглядаюцца ў працэсе іх перадачы або ўспрымання; адна з галоўных агульнанавуковых катэгорый, якая адлюстроўвае структуру матэрыі і спосабы яе пазнання. І. - адно з асноўных паняццяў кібернетыкі. У кібернетычным сэнсе І. - гэта адлюстраванне аднаго аб'екту ў другім, якое выкарыстоўваецца для фарміравання ўздзеянняў, што знаходзяцца ў стане кіравання. Мэтавая функцыя І. (прагматычны аспект) характарызуецца яе ўласцівасцю ўплываць на працэсы кіравання. І. заўсёды адыгрывала вельмі важную ролю ў жыцці чалавека. У сярэдзіне XX ст. у выніку сацыяльнага прагрэсу і бурнага развіцця навукі і тэхнікі роля І. нязмерна вырасла. Адбываецца лавінападобнае нарастанне аб'ёмаў разнастайнай І., якое атрымала назву інфармацыйнага выбуху. Паняцце І. звычайна прадугледжвае наяўнасць двух аб'ектаў - крыніцы І. і спажыўца І. (адрасата).

І. дае пэўную сукупнасць звестак аб навакольным свеце, падзеях, чыёй-небудзь дзейнасці; гэта форма сувязі паміж кіруемымі і кіруючымі аб'ектамі, што складаюць любую сістэму кіравання. Форма прадстаўлення І. - паведамленне. Пад паведамленнем маецца на ўвазе форма прадстаўлення І. (лічбавыя даныя, адлюстраванне, тэкст і г.д.). Разам з тым не кожнае паведамленне можа лічыцца І. Толькі тое паведамленне, якое змяншае неакрэсленасць у той галіне, да якой яно адносіцца, з'яўляецца І.

Ад паняцця І. неабходна адрозніваць паняцце даных.

І. і даныя на практыцы трактуюцца як сінонімы. Даныя ў інфарматыцы - факты або ідэі, прадстаўленыя ў фармалізаваным выглядзе, прыгодным для апрацоўкі, перадачы і захавання. Даныя атрымліваюць шляхам назірання, лагічных або арыфметычных аперацый, якія выконваюцца якім-небудзь блокам сістэмы. Даныя звычайна запісваюцца на якіх-небудзь носьбітах (МЛ, МД і інш.).

Адной з разнавіднасцей І. з'яўляецца эканамічная І. Яна характарызуе эканамічныя адносіны і працэсы грамадскага ўзнаўлення.

**ІНФЛЯЦЫЯ** (Инфляция) - перапаўненне каналаў грашовага абарачэння лішняй у параўнанні з патрэбамі абароту масай грошай і ў сувязі з гэтым абясцэньванне іх. Пры інфляцыі парушаюцца патрабаванні закону грашовага абарачэння (гл. *Закон грашовага абарачэння*).

І. можа ўзнікаць пры тых спосабах вытворчасці, дзе існуюць таварна-грашовыя адносіны. Праяўляецца яна ў агульным і нераўнамерным росце цэн на тавары і паслугі, з аднаго боку, і ў апераджальным росце даходаў у параўнанні з таварнымі масамі і паслугамі - з другога. Пры І. узнікае спекуляцыя, адбываецца "вымыванне" таннага асартыменту тавараў, замена яго дарагім і не заўсёды лепшай якасці; назіраецца дэфіцыт тавараў; адбываецца незбалансаванасць таварных і грашовых мас. Прычынамі інфляцыйных працэсаў з'яўляюцца: недасканаласць структуры грамадскай вытворчасці, затратны гаспадарчы механізм, нізкая эфектыўнасць гаспадарання, слабае выкарыстанне таварна-грашовых адносін, дэфіцыт бюджэту, недасканаласць аплаты працы, гэта значыць, недахопы ў гаспадарчым механізме, эканамічнай палітыцы. І. мае прычынную сувязь і з агульнымі сусветнымі працэсамі. У сучасных умовах да аздараўлення грашовага абарачэння могуць прывесці перабудова эканомікі, фінансавай палітыкі, паляпшэнне рынкавых адносін (уключаючы міжнародны рынак), устанаўленне дзейснага эканамічнага кантролю за дынамікай цэн, больш цесная залежнасць паміж узроўнем грашовых даходаў насельніцтва і ростам яго спажывання.

**ІНФРАСТРУКТУРА** (Инфраструктура) -- комплекс галін гаспадаркі, якія забяспечваюць агульныя ўмовы вытворчасці і жыццядзейнасці людзей. Адрозніваюць вытворчую і сацыяльна-бытавую І.

Вытворчая І. уключае ўсе віды транспарту і транспартнай гаспадаркі наогул (чыгуначныя станцыі, марскія і рачныя порты, докі, дэпо, аб'екты, якія забяспечваюць бесперабойнае функцыяніраванне нафта- і газаправодаў і да т.п.), лініі электраперадачы, якія фарміруюць энергасістэмы, сукупнасць узаемазвязаных сродкаў перадачы і апрацоўкі інфармацыі, аб'екты, што забяспечваюць рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, і іншыя сістэмы і збудаванні, якія непасрэдна не выкарыстоўваюцца пры стварэнні матэ- рыяльных даброт, але без якіх не можа існаваць вытворчасць.

Да сацыяльна-бытавой І. адносяцца галіны гандлю, аховы здароўя, усе віды пасажырскага транспарту і сувязі (занятыя абслугоўваннем насельніцтва), гарадскія камунікацыйныя збудаванні, гасцінічная гаспадарка, грамадскае харчаванне і іншыя падраздзяленні невытворчай сферы.

У іерархічнай будове І. выдзяляюцца розструктура асобнага прадпрыемства.

Развіццё І. -- важнейшая ўмова інтэнсіфікацыі вытворчасці, вырашэння сацыяльных задач, звязаных з задавальненнем матэрыяльных і духоўных патрэб грамадства, якія пастаянна растуць, актывізацыяй чалавечага фактару.

Па меры паглыблення міжнароднага падзелу працы важнае значэнне набывае ўзгодненае развіццё і ўдасканаленне ўзаемазвязаных элементаў І. народнагаспадарчых комплексаў розных краін. Міжнародная вытворчая І. -- сукупнасць нацыянальных транспартных сістэм і інфармацыйных комплексаў, якія абслугоўваюць знешнеэканамічную дзейнасць і міжнародныя зносіны, многіх аб'ектаў і збудаванняў, што забяспечваюць ахову навакольнага асяроддзя, рацыянальнае выкарыстанне натуральных рэсурсаў, добрае функцыяніраванне супольных аб'ектаў.

Удасканаленне і развіццё І. стварае спрыяльныя ўмовы для паглыблення інтэграцыйных працэсаў і пашырэння міжнародных узаемавыгадных гаспадарчых сувязей.

Сучасная навукова-тэхнічная рэвалюцыя ўзмацніла залежнасць эфектыўнасці гаспадарчай дзейнасці ад развіцця І. У сувязі з гэтым вельмі важна выяўляць і пастаянна падтрымліваць аптымальныя прапорцыі ў развіцці асноўнай вытворчасці і галін І.

## К

**КААПЕРАВАННЕ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Кооперирование производства) -- такая форма арганізацыі вытворчасці, пры якой адны прадпрыемствы на аснове працяглых вытворчых сувязей пастаўляюць другім сваю прадукцыю ў выглядзе паўфабрыкатаў, дэталей, вузлоў, агрэгатаў або іншых канструкцыйных элементаў для супольнага вырабу таго ці іншага прадукту.

Адрозніваюць агрэгатнае, падэтальнае і тэхналагічнае кааперaванне. К.в. арганізуецца таксама пры наяўнасці свабодных вытворчых магутнасцей на адных прадпрыемствах і нястачы іх на другіх. Адрозніваюць галіновае і міжгаліновае, раённае і міжраённае К.в.

Эканамічныя выгады К.в. шмат у чым абумоўлены эфектыўнасцю спецыялізацыі. Разам з тым непасрэдны эфект К.в. забяспечваецца толькі ў тым выпадку, калі пастаўляемыя дэталі, вузлы, паўфабрыкаты лепшай якасці абыходзяцца танней, чым тыя, што вырабляе ўласная вытворчасць, а пастаўкі ажыццяўляюцца камплектна і своечасова.

Для характарыстыкі ўзроўню К.в. ужываюць такія паказчыкі, як доля камплектуючых дэталей, паўфабрыкатаў, што паступаюць па кааперацыі, у агульным аб'ёме прадукцыі галіны або прадпрыемства, колькасць прадпрыемстваў, якія каапеpуюць з дадзеным прадпрыемствам, і інш.

**КААПЕРАТЫЎ** (Кооператив) -- грамадская арганізацыя грамадзян, якія добраахвотна аб'ядналіся на аснове членства для сумеснага вядзення гаспадарчай ці іншай дзейнасці на базе належачай ім на праве ўласнасці арандаванай ці прадастаўленай у бясплатнае карыстан-

не маёмасці, самастойнасці, самакіравання і самафінансавання, а таксама матэрыяльнай зацікаўленасці членаў кааператыва і найбольш поўнага спалучэння іх інтарэсаў з інтарэсамі калектыву і грамадства. Гэта -- першаснае звяно сістэмы кааперацыі.

К. з'яўляецца юрыдычнай асобай, якая карыстаецца правамі і выконвае абавязкі, звязаныя з яго дзейнасцю, мае самастойны баланс. У складзе К. могуць ствараецца наступныя структурныя падраздзяленні (уключаючы тэрытарыяльна адасобленыя): аддзяленні, цэхі, фермы, майстэрні, атэлье, магазіны і іншыя, якія дзейнічаюць, як правіла, на пачатках калектыўнага, сямейнага ці індывідуальнага падраду, у тым ліку з арэндай маёмасці. К. мае права адкрываць свае філіялы і прадстаўніцтвы.

У сістэме кааперацыі ў Рэспубліцы Беларусь функцыяніруюць К. двух асноўных тыпаў: вытворчыя і спажывецкія. Вытворчыя К. выпрабляюць тавары, прадукцыю, а таксама прадастаўляюць платныя паслугі прадпрыемствам, арганізацыям, установам і грамадзянам.

Спажывецкія К. задавальняюць патрэбы сваіх членаў і іншых грамадзян у гандлёвым і бытавым абслугоўванні, а таксама членаў кааператываў -- у жыллі, дачах і садовых участках, гаражах і стаянках для аўтамабіляў, у сацыяльна-культурных і іншых паслугах.

К. могуць быць змешанага тыпу, калі яны побач са спажывецкімі функцыямі ажыццяўляюць разнастайную вытворчую дзейнасць.

**КААПЕРАЦЫЯ ПРАЦЫ** (Кооперация труда) -- форма арганізацыі працы, пры якой значная колькасць людзей сумесна ўдзельнічае ў адным і тым жа працэсе працы ці розных, але звязаных паміж сабой працэсах. К.п. стварае новую вытворчую сілу калектыўнай працы, дазваляе эфектыўна выкарыстоўваць рабочы час і рэсурсы, дабівацца значнага паніжэння затрат працы і сродкаў пры вырабе прадукцыі, у кароткі тэрмін выконваць вялікі аб'ём работ. У гэтым заключаюцца вялікія перавагі кааператыўнай працы перад працай індывідуальнай.

На прадпрыемствах адрозніваюць чатыры формы

К.п.: міжцэхавую, міжучасткавую, унутрыўчасткавую і ўнутрыбрыгадную. Міжцэхавая К.п. мае некалькі відаў работ: працяг працэсу апрацоўкі, камплектаванне выпускаючага цэха дэталямі і вузламі, аказанне паслуг. Першы від характэрны для тэхнічных цэхаў, другі -- для прадметных, а трэці -- для дапаможных цэхаў і ўчасткаў. Міжучасткавая К.п. мае тыя ж віды і адрозніваецца ад міжцэхавай толькі маштабамі. Унутрыўчасткавая і ўнутрыбрыгадная К.п. вызначаецца тыпам вытворчасці, наяўнасцю або адсутнасцю канвеера (патокаў), узроўнем спецыялізацыі і да т.п. Тут могуць адначасова ажыццяўляцца і паслядоўная апрацоўка, і камплектаванне фінішнай аперацыі, і паслугі. К.п. цесна звязана з падзелам працы, які прадугледжвае адасабленне розных працэсаў і работ па вырабу чаго-небудзь. Падзел працы прыводзіць да з'яўлення частковай працы і адпаведна частковага прадукту, які можа ператварыцца ў гатовы выраб толькі пасля злучэння яго з іншымі частковымі прадуктамі.

**КАДРАВАЯ ПАЛІТЫКА** (Кадровая политика) -- сукупнасць тэарэтычных палажэнняў і установак, якія вызначаюць стратэгію работы з кадрамі (работнікамі прадпрыемства, арганізацыі).

Работа з кадрамі - адзін з элементаў працэсу арганізацыі вытворчасці, які ўяўляе сабой шэраг узаемазвязаных і скаардынаваных мер па аналізу катэгорый работнікаў і пасад па пытаннях падбору, расстаноўкі, падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі кадраў, арганізацыі іх работы.

Ва ўмовах перабудовы пастаянна павышаюцца патрабаванні да агульнаадукацыйнай, тэхнічнай і эканамічнай падрыхтоўкі кадраў, іх прафесіяналізму.

**КАЗНАЧЭЙСТВА** (Казначейство) -- спецыяльны дзяржаўны фінансаваны орган. У яго функцыі ўваходзяць складанне праекта дзяржаўнага бюджэту і яго выкананне, кіраванне дзяржаўным доўгам, эмісія (выпуск) дзяржаўных каштоўных папер (казначэйскіх білетаў, аблігацый, акцый і г.д.), кантроль за рухам дзяржаўнай маёмасці ў выглядзе каштоўных папер і іншыя аперацыі. Пры выкананні бюджэту К. арганізуе

збор плацяжоў, падаткаў і іншых даходаў у бюджэт, адкрывае бюджэтныя крэдыты і прадастаўляе сродкі ў адпаведнасці з зацверджанымі асігнаваннямі. Касавае выкананне бюджэту ўскладаецца на банкі.

Казначэйская эмісія ажыццяўляецца дзеля пакрыцця дзяржаўных расходаў. Казначэйскія білеты ўпершыню выпушчаны Наркамфінам у 1924 г. для пакрыцця бюджэтнага дэфіцыту. Цяпер казначэйскія білеты (1, 3, 5 руб.) выпускаюцца па меры патрэб гаспадарчага абароту. Яны знаходзяцца ў грашовым абарачэнні краіны на аднолькавых падставах з банкаўскімі білетамі, выкарыстоўваюцца для размену банкаўскіх білетаў і выканання дробных плацяжоў.

**КАЛГАС** (Колхоз) -- гэта кааператыўная арганізацыя сялян для супольнага вядзення сельскагаспадарчай вытворчасці на аснове абагуленых сродкаў вытворчасці і калектыўнай працы. У К. нашай краіны вытворча-гаспадарчая дзейнасць ажыццяўляецца на зямлі, якая з'яўляецца ўсеагульнай уласнасцю і перададзена ім для карыстання. Эканамічнай асновай К. з'яўляецца кааператыўная ўласнасць, якая першапачаткова створана аграмаджаннем сродкаў вытворчасці сялян-кааператараў. Вядомы тры формы калектыўнага вядзення сельскай гаспадаркі: а) таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі; б) камуна сельскагаспадарчая; в) арцель сельскагаспадарчая.

Мэты, асноўныя прынцыпы арганізацыі і вытворча-гаспадарчай дзейнасці калгасаў вызначаюцца Статутам калгаса. Вышэйшым органам кіравання ў К. з'яўляецца агульны сход калгаснікаў (сход упаўнаважаных), паўсядзённае кіраўніцтва ажыццяўляе выбранае сходам праўленне на чале з яго старшынёй. Для кантролю за дзейнасцю праўлення і службовых асоб сходам выбіраецца рэвізійная камісія тэрмінам на 3 гады.

Вытворча-фінансавая дзейнасць К. заснавана на гаспадарчым разліку, шырокім ужыванні матэрыяльных і маральных стымулаў. Асноўнай формай арганізацыі працы і вытворчасці з'яўляецца пастаянная вытворчая брыгада. Шырокае развіццё атрымліваюць падрадна-арэндныя звёны, атрады, брыгады. К. маюць дапамож-

ныя галіны, уваходзяць у міжгаспадарчыя аб'яднанні. Аплата працы калгаснікаў адпавядае яе колькасці і якасці. У 1966 г. была ўведзена гарантаваная аплата працы, а з 1987 г. - ад валавога даходу, па астаткаваму прынцыпу.

Грамадская гаспадарка К. развіваецца на навукова-тэхнічнай аснове, за кошт умацавання яе матэрыяльна-тэхнічнай базы.

**КАЛЕКТЫВІЗМ** (Коллективизм) -- прынцып грамадскага жыцця і дзейнасці людзей, заснаваны на агульнасці працы, уласнасці, светапогляду, мэт і ідэалаў, на свядомым падпарадкаванні асабістых інтарэсаў грамадскім, на арганічным іх спалучэнні.

К. -- прынцып, супрацьлеглы індывідуалізму, асновай якога выступае непадзельнасць, прызнанне аўтаноміі і абсалютных правоў асобы ў грамадстве. К. мае на ўвазе такія адносіны паміж грамадствам і асобай, пры якіх развіццё грамадства наогул стварае дабратворныя ўмовы для развіцця асобы, а развіццё апошняй ёсць умова прагрэсу ўсяго грамадства. К. мае на ўвазе таварыскую ўзаемадапамогу, усведамленне і выкананне абавязку перад грамадствам, свядомае спалучэнне асабістых інтарэсаў з грамадскімі, роўнасць у калектыве, павагу да калектыву і яго рашэнняў, усведамленне адказнасці перад калектывам за свае ўчынкі і паводзіны таварышаў. Калектыў клапоціцца аб чалавеку, аб задавальненні яго патрэб, аб поўным развіцці сіл і здольнасцей асобы.

**КАЛЕКТЫЎ ВЫТВОРЧЫ, ПРАЦОЎНЫ** (Коллектив производственный, трудовой) -- ячэйка грамадства, якая аб'ядноўвае ўсіх работнікаў, што ажыццяўляюць сумесную працоўную дзейнасць на дзяржаўным, грамадскім прадпрыемстве, ва ўстанове, арганізацыі, у калгасе і іншай кааператыўнай арганізацыі.

У складзе адзінага працоўнага К. у адпаведнасці са структурай прадпрыемства, установы, арганізацыі дзейнічаюць калектывы цэхаў, аддзелаў, участкаў, брыгад і іншых падраздзяленняў. Працоўныя К. ажыццяўляюць эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя функцыі, накіраваныя на рознабаковае ўмацаванне і

развіццё грамадскага ладу жыцця, садзейнічаюць актыўнаму ўдзелу працоўных у вытворчым і дзяржаўным жыцці, у кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі.

Працоўныя К. удзельнічаюць у абмеркаванні і вырашэнні дзяржаўных і грамадскіх спраў, у планаванні вытворчасці і сацыяльнага развіцця, у падрыхтоўцы і расстаноўцы кадраў, у абмеркаванні і вырашэнні пытанняў кіравання прадпрыемствамі і ўстановамі, паляпшэння ўмоў працы і быту, выкарыстання сродкаў, прызначаных для развіцця вытворчасці, а таксама на сацыяльна-культурныя мерапрыемствы і матэрыяльнае заахвочванне.

Працоўныя К. садзейнічаюць распаўсюджванню перадавых метадаў працы, умацаванню працоўнай дысцыпліны, клапоцяцца аб павышэнні грамадскай свядомасці, культуры і прафесійнай кваліфікацыі сваіх членаў калектыву. Гэтыя канстытуцыйныя палажэнні атрымалі развіццё ў Законе аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі.

Закон вызначае наступныя формы ажыццяўлення паўнамоцтваў працоўных К.: 1) непасрэднай дэмакратыі (агульныя сходы, канферэнцыі працоўных калектываў); 2) прадстаўнічай дэмакратыі (грамадскія арганізацыі і іх выбарныя органы).

**КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР** (Коллективный договор) -- пагадненне, якое заключае прафсаюзны камітэт ад імя працоўнага калектыву з адміністрацыяй прадпрыемства, арганізацыі. Заключэнню калектыўнага дагавора папярэднічае абмеркаванне яго праекта на сходзе (канферэнцыі) працоўнага калектыву, які ўхваляе К.д. і дае паўнамоцтвы прафкому падпісаць яго з адміністрацыяй. Заключаецца К.д. штогод, уступае ў сілу з дня яго падпісання, пасля чаго даводзіцца да ведама ўсіх рабочых і служачых.

У К.д. павінны ўваходзіць: 1) асноўныя палажэнні па пытаннях працы і заработнай платы, устаноўленыя для дадзенага прадпрыемства ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам; 2) палажэнні аб рабочым часе, часе адпа-

чынку, аплаце працы і матэрыяльным стымуляванні, ахове працы, якія распрацаваны адміністрацыяй і прафсаюзным камітэтам у межах прадастаўленых ім правоў і якія носяць нарматыўны характар; 3) узаемныя абавязацельствы адміністрацыі і працоўнага калектыву па выкананню вытворчых планаў, удасканаленню арганізацыі вытворчасці і працы, укараненню новай тэхнікі і павышэнню прадукцыйнасці працы, паляпшэнню якасці і сніжэнню сабекошту прадукцыі, развіццю эканамічнага спаборніцтва, умацаванню вытворчай і працоўнай дысцыпліны, павышэнню кваліфікацыі і падрыхтоўцы кадраў непасрэдна на вытворчасці; 4) абавязацельствы адміністрацыі і прафкома па далучэнню рабочых і служачых да кіравання прадпрыемствам, удасканаленню нарміравання працы, форм аплаты працы і матэрыяльнага стымулявання, па ахове працы, прадастаўленню льгот і пераваг передавікам вытворчасці, паляпшэнню жыллёвых умоў, культурна-бытавога абслугоўвання, развіццю выхаваўчай і культурна-масавай работы.

**КАЛЬКУЛЯВАННЕ** (Калькулирование) -- спосаб групоўкі затрат і атрымання інфармацыі аб сабекошце прадуктаў працы. Метады К.: пазаказны, папераробчы, падэталёвы, абязлічаны, нарматыўны і інш.

**КАЛЬКУЛЯЦЫЯ** (Калькуляция) -- састаўная частка калькулявання, спосаб разліку сабекошту адзінкі прадукцыі, работ і паслуг. У залежнасці ад прызначэння К. дзеляцца на праектныя, нарматыўныя, планавыя і фактычныя (справаздачныя).

Планавая К. павінна складацца на базе прагрэсіўных норм затрат працы і сродкаў вытворчасці, якія адлюстроўваюць выкарыстанне ў плануемым перыядзе дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу ў тэхналогіі, кіраванні і арганізацыі вытворчасці і працы. У аснове нарматыўнай К. ляжаць бягучыя, дзеючыя нормы, якія адлюстроўваюць ужо дасягнуты ўзровень затрат, а фактычная, ці справаздачная, К. характарызуе фактычны ўзровень затрат і складаецца па даных бухгалтарскага ўліку.

К. з'яўляецца неабходным паказчыкам для вызна-

чэння эфектыўнасці капітальных укладанняў і новай тэхнікі, для ажыццяўлення кантролю за ўзроўнем сабекошту і рэнтабельнасці прадукцыі, для вызначэння абгрунтаваных цэн на вырабы і паслугі, умацавання гаспадарчага разліку.

У К. адлюстроўваюцца затраты па артыкулах з улікам асаблівасцей асобных галін народнай гаспадаркі. На прамысловых прадпрыемствах выдзяляюцца наступныя затраты: сыравіна і матэрыялы, пакупныя вырабы і паўфабрыкаты, паліва і энергія на тэхналагічныя мэты, асноўная і дадатковая зарплата вытворчых рабочых, адлічэнні на сацыяльнае страхаванне, расходы на падрыхтоўку і асваенне вытворчасці, расходы на ўтрыманне і эксплуатацыю абсталявання, цэхавыя расходы, агульнагаспадарчыя (або агульназаводскія) расходы, іншыя вытворчыя расходы. У справаздачнай К. адлюстроўваюцца таксама і затраты ад браку.

**КАЛЯНДАРНАЕ ПЛАНАВАННЕ** (Календарное планирование) -- этап аператыўна-вытворчага планавання на прадпрыемстве, які заключаецца ў далейшай дэталізацыі і дыферэнцыяцыі планавых заданняў па тэрмінах, а таксама па кожнаму цэху. Аб'ектам планавання на гэтым этапе з'яўляюцца асобныя вузлы і дэталі і іх рух у вытворчасці як у межах дадзенага цэха, так і паміж асобнымі цэхамі. Планавыя заданні карэкціруюцца шляхам дэталізацыі іх для кожнага ўчастка ці брыгады па кожнаму вузлу, кожнай дэталі ці нават аперацыі. Складаецца каляндарны план вырабу не толькі па загатоўчай, апрацоўчай і зборачнай стадыях асобна, але і па дакладна ўзгодненых тэрмінах паміж імі з размеркаваннем работ па ўчастках і нават па рабочых месцах у межах кожнага цэха.

Важнае месца на гэтым этапе планавання займаюць нарматыўныя разлікі памераў партыі і працягласці вытворчых цыклаў, унутрыцэхавых і міжцэхавых запасаў загатовак, дэталей і вузлоў, неабходных для забеспячэння бесперапыннай работы цэхаў і ўчасткаў. Асновай плана з'яўляецца пабудова складанай сістэмы тэрмінаў вытворчасці па вырабу ў цэлым, па асобных вузлах і дэталях, а ў некаторых выпадках і па асобных аперацы-

ях.

Каляндарны план у сістэме міжцэхавага планавання рэгламентуе тэрміны руху прадукцыі па цэхах завода, не раскрываючы прыватных, унутрыцэхавых паапера-цыйных тэрмінаў вытворчасці па кожнаму прадмету.

У сістэме ж унутрыцэхавага планавання каляндарны план узгадняе паміж сабой работу ўчасткаў цэха ці асобных груп абсталявання ў межах кожнага ўчастка і ў выніку вызначае па кожнай дэталі (загатоўцы) ці па камплекту дэталей тэрміны запуску ў першую аперацыю, тэрміны праходжання па аперацыях тэхналагічнага працэсу ці па ўчастах цэха і тэрміны выпуску ў гатовым выглядзе.

Змест і метады пабудовы каляндарнага плана значна відазмяняюцца ў залежнасці ад вытворчых умоў на рабочых месцах участкаў і цэхаў, якія ўдзельнічаюць у выпуску плануемых вырабаў, гэта значыць яны залежаць ад тыпу вытворчасці.

К.п. узаемазвязана з 1-м этапам - аб'ёмным планаваннем і 3-м этапам - аператыўным планаваннем.

**КАМБІНАВАННЕ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Комбинирование производства) -- форма арганізацыі грамадскай вытворчасці, заснаванай на тэхналагічным і арганізацыйным злучэнні ў адным прадпрыемстве (камбінаце) розных вытворчасцей, дзе прадукты адной вытворчасці служаць сыравінай, паўфабрыкатамі, дапаможнымі матэрыяламі для другіх.

К.в. у прамысловасці выступае ў трох асноўных відах: камбінаванне, заснаванае на спалучэнні паслядоўных стадый апрацоўкі прадметаў працы (найбольш развіта ў тэкстыльнай і металургічнай прамысловасці); камбінаванне, што ўключае ў сваю аснову выкарыстанне адходаў вытворчасці (характэрна для дрэваперапрацоўчай прамысловасці); камбінаванне на базе комплекснага выкарыстання сыравіны (распаўсюджана ў вытворчасцях па перапрацоўцы арганічнай сыравіны - нафты, вугалю, сланцаў).

Пры К.в. адбываецца арганічнае зліццё разрозненых спецыялізаваных узаемазвязаных вытворчасцей у адзіны арганізацыйна-тэхнічны і, як правіла, тэрытары-

яльны комплекс.

К.в. характарызуецца: колькасцю і коштам прадуктаў, атрыманых з адзінай зыходнай сыравіны, якая перапрацоўваецца на камбінаце; суадносінамі кошту прадуктаў, якія вырабляюцца на аснове К.в., і іх кошту на некамбінаваных прадпрыемствах; ступенню комплекснага выкарыстання ў вытворчасці пярвічнай сыравіны і іншымі паказчыкамі.

К.в. дазваляе атрымаць эканамічны эфект дзякуючы канцэнтрацыі і рацыянальнай арганізацыі вытворчасці, комплекснаму выкарыстанню сыравіны, скарачэнню вытворчага цыкла, эканоміі энергарэсурсаў.

**КАНВЕРСІЯ** (Конверсия) -- істотнае змяненне зместу або ўмоў існавання эканамічнага аб'екта. Адрозніваюць К. прамысловасці і К. пазык.

*К. прамысловасці* - перавод грамадзянскіх (ваенных) прадпрыемстваў на выраб ваеннай (грамадзянскай) прадукцыі. Пераход прадпрыемстваў абароннай прамысловасці на выпуск прадукцыі грамадзянскага прызначэння забяспечвае эфект за кошт скарачэння непрадукцыйных абаронных расходаў, пашырэння стваральных магчымасцей народнай гаспадаркі. Вельмі важна пры гэтым стварыць неабходныя арганізацыйна-эканамічныя ўмовы для аптымальнай адаптацыі прадпрыемстваў, якія перапрафіліруюцца, у грамадзянскім сектары эканомікі, забяспечыць эфектыўнае выкарыстанне вытворчага патэнцыялу, што выслабаняецца.

*К. пазык* - змяненне першапачатковых умоў дзяржаўных пазык, што выяўляецца ў паніжэнні працэнта, змяненні тэрміну дзеяння і спосабу пагашэння пазыкі, аб'яднанні аблігацый розных пазык. Праводзіцца дзеля змяншэння дзяржаўнага доўгу, які ўтвараецца ва ўмовах больш нізкай пакупной здольнасці грошай.

**КАНКУРЭНЦЫЯ** (Конкуренция) -- уласцівая таварнай вытворчасці і рыначнай эканоміцы барацьба паміж вытворцамі за больш выгадныя ўмовы вырабу і збыту тавараў.

К. з'яўляецца механізмам рэгулявання грамадскай вытворчасці. Формы і метады канкурэнтнай барацьбы мяняліся на розных этапах развіцця грамадства. Сва-

бодная К. зводзілася да эканамічнага ўдушэння саперніка (да яго разарэння) галоўным чынам метадам адкрытай цэнавай К. К. выступае ў ролі магутнага фактару канцэнтрацыі вытворчасці, якая на пэўнай ступені прыводзіць да з'яўлення манаполій. Для сучаснай К. асабліва характэрна шырокае выкарыстанне розных форм няцэнавай К. (тэхнічныя перавагі, якасць і надзейнасць вырабаў, метады іх збыту, характар прадастаўляемых паслуг і гарантый, умовы аплаты, рэклама).

Ва ўмовах эканамічнай рэформы фарміраванне рынку, стымуляванне і развіццё канкурэнтных узаемаадносін паміж прадпрыемствамі здольны падарваць манапольны дыктат вытворцы над спажыўцом, стымуляваць якаснае ўдасканаленне выпускаемай прадукцыі, укараненне дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу і садзейнічаць тым самым дасягненню мэт, пастаўленых эканамічнай рэформай.

**КАНСОРЦЫУМ** (Консорциум) -- форма арганізацыйна-эканамічнага аб'яднання прадпрыемстваў, арганізацый.

К. -- добраахвотная асацыяцыя (аб'яднанне) самастойных прадпрыемстваў і арганізацый з мэтай паспяховага вырашэння народнагаспадарчых задач, эфектыўнага развіцця і аптымальнага выкарыстання ўласнага патэнцыялу на аснове прамых сувязей, самаакупнасці, самафінансавання і самакіравання.

Па прыкмеце фарміравання адрозніваюць галіновыя, міжгаліновыя і тэрытарыяльна-галіновыя К. Пры ўтварэнні К. прадпрыемства і арганізацыі, якія ўваходзяць у яго, цалкам захоўваюць сваю самастойнасць. Але ў той частцы дзейнасці, што датычыць мэтаў К., яны падпарадкоўваюцца сумесна абранаму кіраўніцтву. Прадпрыемствы і арганізацыі сваімі сіламі арганізоўваюць і ажыццяўляюць капітальнае будаўніцтва, падрыхтоўку і матэрыяльнае забеспячэнне вытворчасці, наладжваюць прамыя сувязі з пастаўшчыкамі матэрыялаў і спажыўцамі прадукцыі, плануюць і рэалізоўваюць мерапрыемствы па паскарэнню тэхнічнага прагрэсу і ахове навакольнага асяроддзя, самастойна арганізоўваюць планавую, кадравую,

фінансавую, збытавую, бухгалтарскую дзейнасць, укараняюць гаспадарчы разлік, удасканальваюць арганізацыю і аплату працы, інфармацыйна-рэкламную і знешнегандлёвую дзейнасць, вырашаюць пытанні кіравання і іншых сфер вытворчай дзейнасці. Выбарнае праўленне К. і кіруемы ім выканаўчы апарат вызначаюць стратэгію развіцця К. у адпаведнасці з агульнымі мэтамі яго ўдзельнікаў, распрацоўваюць адзіную тэхнічную палітыку, вызначаюць напрамкі паглыблення спецыялізацыі і развіцця кааперацыі, фарміруюць і расходуюць централізаваныя і рэзервовыя фонды, ствараюць новыя вытворчасці, сервісныя арганізацыі і ўстановы, сацыяльна-бытавыя аб'екты, вучэбныя цэнтры, якія выкарыстоўваюцца супольна. Рашэннем праўлення К. да прадпрыемстваў даводзяцца дзяржаўныя заказы, нарматывы і ліміты, узгодненыя з кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі кіравання. К. мае магчымасць выступаць падрадчыкам у выкананні буйных дзяржаўных заказаў, пры распрацоўцы і рэалізацыі народнагаспадарчых праектаў і праграм, развіваць уласную інфраструктуру, упаўнаважаны ажыццяўляць знешнеэканамічную дзейнасць, рыхтаваць і стымуляваць кваліфікаваныя кадры.

**КАНЦЭНТРАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Концентрация производства) -- форма арганізацыі грамадскай вытворчасці, якая адлюстроўвае працэс сканцэнтравання вытворчасці ў буйных вытворчых звёнах. К.в. арганізацыйна можа быць прадстаўлена канцэнтраваннем разнародных вытворчасцей ( універсальнае прадпрыемства ), канцэнтраваннем вытворчасці аднароднай прадукцыі (спецыялізаванае прадпрыемства) і ўзаемазвязаных разнародных вытворчасцей ( камбінаванае прадпрыемства ). Найбольш прагрэсіўнымі з'яўляюцца спецыялізаваныя і камбінаваныя прадпрыемствы аптымальных памераў.

К.в. ажыццяўляецца па-рознаму: павелічэнне памераў дзейнічаючых прадпрыемстваў шляхам іх пашырэння, рэканструкцыі і мадэрнізацыі, будаўніцтва новых прадпрыемстваў, арганізацыя аб'яднанняў.

Адрозніваюць тэхналагічную К.в. - пашырэнне

аб'ёмаў (устаноўленай магутнасці) тэхналагічна аднародных вытворчасцей; заводскую - павелічэнне памераў прадпрыемстваў; арганізацыйна-гаспадарчую - аб'ядноўванне дробных прадпрыемстваў, стварэнне вытворчых аб'яднанняў.

К.в. характарызуецца наступнымі паказчыкамі: гадавы аб'ём прадукцыі (работ, паслуг), сярэднегадавая колькасць прамыслова-вытворчага персаналу, кошт асноўных вытворчых фондаў. К.в. забяспечвае эфект за кошт аптымальнага выкарыстання абсталявання вялікай адзінкавай магутнасці і прадукцыйнасці, павышэння ўзроўню ўнутрызаводскай спецыялізацыі, прымянення больш прагрэсіўных тэхналогій і тэхнікі, магчымасці больш поўнага выкарыстання дасягненняў навукі ў рамках уласных НДІ, КБ, доследна-эксперыментальных вытворчасцей. Важнейшым напрамкам К.в. з'яўляецца стварэнне і развіццё вытворчых і навукова-вытворчых аб'яднанняў галіновага, міжгаліновага і тэрытарыяльнага характару. К.в. суправаджаецца аптымізацыяй структуры аб'яднанняў, вызначэннем такіх памераў прадпрыемстваў, якія ў найбольшай ступені адпавядаюць эканамічным, экалагічным і іншым грамадскім патрабаванням. У сучасных умовах навукова-тэхнічнага прагрэсу, дзякуючы комплекснай аўтаматызацыі вытворчасці, паглыбленню спецыялізацыі і развіццю міжзаводскай кааперацыі працы, многія перавагі буйных прадпрыемстваў робяцца даступнымі для сярэдніх і адносна дробных спецыялізаваных прадпрыемстваў. Перавагі К.в. забяспечваюцца пры аптымальным спалучэнні буйных, сярэдніх і невялікіх спецыялізаваных прадпрыемстваў.

**КАПІТАЛЬНЫЯ ЎКЛАДАННІ, або ІНВЕСТЫЦЫІ** (Капитальные вложения, или инвестиции) -- форма ажыццяўлення расшыранага ўзнаўлення (накаплення) асноўных фондаў. Гэта сукупнасць грашовых затрат на стварэнне новых, расшырэнне, рэканструкцыю, тэхнічнае пераўзбраенне дзеючых фондаў вытворчага і невытворчага прызначэння. К.у. і асноўныя фонды не раўназначныя паняцці ні па свайму эканамічнаму зместу, ні па вартаснаму выражэнню.

Якасныя адрозненні паміж імі заключаюцца ў тым, што К.у. -- гэта патэнцыяльныя асноўныя фонды, а асноўныя фонды -- гэта ўжо асвоеныя К.у. К.у. маюць галіновую, тэхналагічную, узнаўленчую і тэрытарыяльную структуру. Тэхналагічная структура - гэта суадносіны памераў К.у. у будаўніча-мантажныя работы, абсталяванне, інструмент, праектна-разведачныя і іншыя затраты; узнаўленчая - размеркаванне К.у. паміж рознымі відамі ўзнаўлення асноўных вытворчых фондаў (новае будаўніцтва, рэканструкцыя, расшырэнне, тэхнічнае пераўзбраенне). Пераважным у структуры К.у. з'яўляецца павелічэнне затрат на абсталяванне, а таксама на рэканструкцыю і тэхнічнае пераўзбраенне дзеючых аб'ектаў.

Інвестыцыйны працэс ахоплівае сферу дзейнасці шэрагу галін (капітальнае будаўніцтва, прамысловасць і інш.) на ўсіх этапах будаўніцтва - ад перадпраектнай стадыі да асваення магутнасцей на ўведзеных у эксплуатацыю прадпрыемствах. К.у. вызначаюць комплексны падыход да буйнамаштабнага будаўніцтва з улікам яго вытворчай базы, інфраструктуры, эканамічнай і сацыяльнай эфектыўнасці. Устойлівае і дынамічнае развіццё народнай гаспадаркі ў многім залежыць ад росту эканамічнай эфектыўнасці К.у., гэта значыць ад канкрэтных вынікаў, дасягнутых пры іх выкарыстанні ў адносінах да затрат.

У сучасных умовах эфектыўнасць К.у. павышаецца надзвычай марудна. Прымаюцца меры да больш рашучага правядзення інвестыцыйнай палітыкі.

**КІБЕРНЕТЫКА** (Кибернетика) -- навука аб кіраванні і сувязі ў жывых арганізмах і машынах. У розных падыходах да разгляду прадмета К. можна выдзеліць агульнае -- тлумачэнне К. як навукі аб кіраванні і інфармацыі. К. вывучае заканамернасці, звязаныя з інфармацыйным бокам працэсаў кіравання. Цэнтральнай ідэяй К. з'яўляецца тэзіс аб адзінстве працэсаў сувязі і працэсаў кіравання. Сувязь тлумачыцца як інфармацыйная з'ява, інфармацыйны працэс.

Аб'ектам вывучэння К. з'яўляюцца складаныя дынамічныя сістэмы, якія здольны да змянення свайго ста-

ну і якія змяшчаюць у сабе мноства больш простых, узаемазвязаных і ўзаемадзейнічаючых элементаў і падсістэм. Кіраванне заключаецца ў пераводзе сістэмы з аднаго стану ў іншы шляхам уздзеяння на яе параметры. Любы працэс кіравання заўсёды адбываецца на аснове прыёму, перапрацоўкі і перадачы інфармацыі ва ўмовах узаемадзеяння пэўнай сістэмы са знешнім або ўнутраным асяроддзем. К. вывучае, што менавіта неабходна зрабіць, каб перавесці сістэму ў новы стан; яна вывучае таксама пытанне аб тым, як гэтага дасягнуць аптымальным шляхам.

**КІРАВАННЕ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКАЙ** (Управление народным хозяйством) -- мэтанакіраваны працэс, які рэалізуе патрабаванні аб'ектыўных эканамічных законаў, накіраваных на спалучэнне грамадскіх, калектыўных і індывідуальных інтарэсаў, і забяспечвае функцыяніраванне і развіццё народнай гаспадаркі. К.н.г. рэалізуе характэрныя грамадству мэты. Аб'ектам кіравання з'яўляюцца народная гаспадарка і яе састаўныя элементы - галіны, тэрытарыяльныя комплексы, вытворчыя звёны, а суб'ектам кіравання - дзяржаўныя органы. Змест кіравання вызначаецца аб'ектам кіравання. Кожная галіна вытворчасці, з'яўляючыся састаўной часткай народнай гаспадаркі наогул, уяўляе сабой цэласны, адносна самастойны комплекс. Тэрытарыяльныя комплексы - таксама адносна самастойныя часткі народнай гаспадаркі. Кожны аб'ект кіравання - галіна, тэрытарыяльны комплекс, прадпрыемства - характарызуецца складанай структурай, якая функцыяніруе як адзінае цэлае.

Важнейшая функцыя кіравання - забеспячэнне ўзгодненасці, узаемасувязі і ўзаемадзеяння розных частак састаўнога цэлага. Ад арганізацыі кіравання залежыць эфектыўнасць сумесных дзеянняў, зладжанасць механізму ўзаемадзеяння паміж сістэмамі, якая кіруе і якой кіруюць.

**КРЫТЭРЫЙ АПТЫМАЛЬНАСЦІ** (Критерий оптимальности) -- прыкмета, на аснове якой даецца параўнанне, ацэнка магчымых рашэнняў (альтэрнатыў) і выбар найлепшага з іх. Змест К.а. аб'ектыўна абу-

моўлены многімі фактарамі. Прыкмета, якая мае экстрэмальнае значэнне, з'яўляецца К.а. і характарызуе гранічна дасягаемую эфектыўнасць стану або развіцця аб'екта кіравання. К.а. дапамагае абгрунтаваць выбар найлепшага варыянта дзеянняў, які забяспечвае дасягненне акрэсленага (зададзенага) выніку пры мінімальных выдатках рэсурсаў (транспартныя задачы), знайсці найлепшы варыянт выкарыстання наяўных рэсурсаў для атрымання максімальнага выніку. Рашэнне задачы любога тыпу зводзіцца да разгляду мноства альтэрнатыў з наступнай іх параўнальнай ацэнкай і выбарам найлепшай.

К.а. для транспартных задач з'яўляецца пераменны паказчык -- мінімум затрат. Задача ўскладняецца, калі апрача грашовых затрат неабходна ўлічыць расход матэрыяльных, працоўных і іншых рэсурсаў, якія не заўсёды магчыма вызначыць у грашовай форме. Для выяўлення лепшага з рашэнняў неабходна параўнаць іх па некалькіх паказчыках. У гэтым выпадку можа ўзнікнуць неабходнасць у фарміраванні К.а., які забяспечыць параўнальную ацэнку альтернатыў. У якасці К.а. можна выкарыстоўваць велічыню, якая, як і асобны паказчык, вымяраецца ў бесперапыннай, або дыскрэтнай, шкалах. Шкалы дазваляюць вызначыць, які з варыянтаў лепшы ў параўнанні з іншымі. На практыцы параўноўваюць альтэрнатывы, якія адрозніваюцца канчатковымі вынікамі і затратамі тыпу "лепш і даражэй", "горш і танней". Выбар найлепшага (аптымальнага) варыянта з ліку рацыянальных можна зрабіць з дапамогай адпаведнага К.а. Апошні павінен быць такім, каб увогуле можна было параўнаць такія варыянты, калі адзін з паказчыкаў узрастае, а другі - змяншаецца. Параўнальная ацэнка варыянтаў плана можа праводзіцца або непасрэдна па спалучэнню значэнняў паказчыкаў, або па спецыяльна сфармуляванаму К.а., які павінен забяспечыць ацэнку варыянтаў зыходзячы з пастаўленай мэты. Выбар К.а. з'яўляецца галоўным пытаннем параўнальнай ацэнкі альтэрнатыў. Асноўны метадалагічны прынцып ацэнкі - сістэмны падыход да ацэнкі магчымых рашэнняў. Параўнанне альтэрнатыў неаб-

ходна заўсёды праводзіць па аднаму крытэрыю. Гэта не выключае магчымасці па чарзе праводзіць ацэнку варыянтаў спачатку па аднаму, а потым па другому крытэрыю. Канчатковы выбар дзеяння ажыццяўляецца кіраўніком, які нясе адказнасць за прыняцце рашэння.

У сацыяльна-эканамічнай сістэме можна выдзеліць наступныя тыпы К.а.: 1) глабальны - лакальны; 2) знешні - унутраны; 3) апрыёрны - апастэрыёрны; 4) генерыруемы - рэдукаваны; 5) парадкавы - колькасны; 6) інтэгральны - тэрмінальны; 7) натурны - тэмпавы; 8) які максімалізуе вынік - які мінімалізуе затраты.

**КРЫТЭРЫЙ ГРАМАДСКА-ЭКАНАМІЧНАГА ПРАГРЭСУ** (Критерий общественно-экономического прогресса) - сродак для меркавання, мерка ацэнкі.

Глабальным крытэрыем складанага і шматпланавага працэсу грамадска-эканамічнага прагрэсу з'яўляецца ўзровень развіцця чалавека як асобы, багацце і разнастайнасць яго здольнасцей і патрэб. Ён дае абагульненую ацэнку ўзроўню развіцця прадукцыйных сіл і разгортваецца, у сваю чаргу, у сістэму ўзаемазвязаных крытэрыяў эканамічнага прагрэсу (эканомія часу, ступень падзелу працы, норма і маса прыбавачнага прадукту). Эканамічны прагрэс непарыўна звязаны з сацыяльным і складае яго аснову. Канчатковай мэтай эканамічнага прагрэсу з'яўляюцца не гаспадарчыя дасягненні самі па сабе, а іх уплыў на ўмовы грамадскага жыцця.

Аднак сувязь эканамічнага прагрэсу з сацыяльным складаная і супярэчлівая. Яна праяўляецца не ў кожным канкрэтным выпадку, а як пануючая тэндэнцыя, што дзейнічае ў рамках вялікіх гістарычных перыядаў. Прагрэсіўнай з'яўляецца тая грамадска-эканамічная сістэма, якая здольна забяспечыць лепшае спалучэнне больш высокай эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці з гуманістычнымі мэтамі грамадскага развіцця. Галоўная задача пераўтварэнняў, якія ажыццяўляюцца ў нашым грамадстве, - паслядоўна і паўсюдна праводзіць у жыццё лінію на гарманізацыю эканамічнай і сацыяльнай эфектыўнасці вытворчасці, своечасова выяўляць і знаходзіць формы вырашэння супярэчнасцей паміж імі,

забяспечваючы поўнае задавальненне грамадскіх і асабістых патрэб пры найбольш рацыянальным выкарыстанні грамадскіх рэсурсаў.

**КРЭДЫТ** (Кредит) -- сістэма эканамічных адносін паміж крэдыторам і пазычальнікам у сувязі з акумуляцыяй часова свабодных грашовых сродкаў і іх пераразмеркаваннем на зваротнай аснове. У ролі крэдытора і пазычальніка могуць выступаць дзяржава, прадпрыемствы, банкі, насельніцтва. Абавязковымі прынцыпамі крэдытнай здзелкі з'яўляюцца прадастаўленне сродкаў на ўмовах зваротнасці, як правіла, з працэнтамі.

*Крэдытныя адносіны* маюць грашовую і таварную (натуральную) формы. Ва ўнутрыэканамічным абароце развіваецца ў асноўным яго грашовая форма. К. бывае банкаўскі, дзяржаўны, камерцыйны, спажывецкі і міжнародны. *Банкаўскі К.* характарызуюць адносіны, пры якіх у ролі крэдытора выступаюць банкі. Ён выдаецца гаспадарча-разліковым прадпрыемствам, арганізацыям, насельніцтву. *Дзяржаўны К.* - сукупнасць адносін паміж дзяржавай і фізічнымі або юрыдычнымі асобамі. Ва ўнутраным абароце дзяржава звычайна з'яўляецца пазычальнікам (дзяржаўныя пазыкі). *Камерцыйны К.* - пазыка, якая прадастаўляецца пастаўшчыкамі пакупнікам у выглядзе адтэрміноўкі плацяжу за таварна-матэрыяльныя каштоўнасці, аказаныя паслугі, выкананыя работы (вэксальны крэдыт). *Спажывецкі К.* выдаецца ў грашовай і таварнай формах насельніцтву для аплаты спажывецкіх патрэб: продаж тавараў дзяржаўнымі і кааператыўнымі гандлёвымі арганізацыямі ў выглядзе адтэрміноўкі плацяжу, пазыкі на набыццё, будаўніцтва і рамонт жылля і садовых домікаў; пазыкі, якія выдаюцца грамадзянам наяўнымі грашыма для бягучых патрэб касамі ўзаемадапамогі на прадпрыемствах, у арганізацыях, установах пад абавязацельства аб пагашэнні яе з заработнай платы; крэдыт ламбардаў пад залог рэчаў.

Неабходнасць у крэдыце абумоўлена перш за ўсё таварна-грашовымі адносінамі. Задачы, якія вырашаюцца з дапамогай крэдыту, мяняюцца на кожным этапе грамадскага развіцця. Для павышэння ролі крэдыту ў

карэннай перабудове кіравання эканомікай актывізуецца яго ўздзеянне на рост эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, паскарэнне мабілізацыі ўнутрыгаспадарчых рэзерваў, укараненне поўнага гаспадарчага разліку і самафінансавання, на расшырэнне прадпрымальнасці і ўзмацненне эканамічнай адказнасці прадпрыемстваў і аб'яднанняў за канчатковыя вынікі работы. Для дасягнення гэтых мэт прадугледжаны змяненні ў крэдытным механізме, у змесце метадаў крэдытнай сістэмы.

**КРЭДЫТНАЯ СІСТЭМА** (Кредитная система) -- сукупнасць адносін крэдытных устаноў. У яе склад уваходзяць банкі (гл. *Банкі*) і іншыя крэдытныя ўстановы (напрыклад, дзяржаўныя ламбарды, касы ўзаемадапамогі).

Л

**ЛАД ЖЫЦЦЯ** (Образ жизни) -- спосаб жыццядзейнасці людзей у грамадстве (класаў, сацыяльных груп, нацый, народнасцей, сям'і), які адпавядае пэўнаму спосабу вытворчасці, характарызуе асаблівасці штодзённага жыцця. Л.ж. -- складаная, шматпланавая сацыяльна-эканамічная з'ява, якая ахоплівае разнастайныя формы жыццядзейнасці: працу, быт, спосабы задавальнення матэрыяльных і духоўных патрэб, формы выкарыстання вольнага часу, удзел у грамадскім і палітычным жыцці. Фарміраванне Л.ж. у рашаючай ступені залежыць ад спосабу вытворчасці.

Аднак Л.ж. залежыць не толькі ад эканамічных адносін, але і ад палітычнага ладу, культуры, светапогляду, маралі, якія склаліся ў пэўнай грамадска-эканамічнай фармацыі. Л.ж. не з'яўляецца пасіўным адлюстраваннем эканамічных адносін. Ён аказвае адваротны актыўны ўплыў на эканамічныя і палітычныя працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве.

**ЛІМІТЫ** (Лимиты) -- гэта адзін з элементаў зыходных даных планавання, якія выкарыстоўваюцца ў якасці асновы для фарміравання плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця кожнага прадпрыемства. Пры гэтым прадпрыемства самастойна распрацоўвае і зацвярджае план і зыходзіць з таго, што Л. устанаўліваюць гранічны па-

мер дзяржаўных цэнтралізаваных капітальных укладанняў для развіцця міжгаліновых вытворчасцей, новага будаўніцтва і вырашэння асабліва важных задач у адпаведнасці з пералікам прадпрыемстваў і аб'ектаў, уключаных у дзяржаўны план, аб'ёмаў будаўніча-мантажных і падрадных работ, матэрыяльных рэсурсаў для забеспячэння патрэб вытворчасці і будаўніцтва, якія размяркоўваюцца цэнтралізавана. Большая частка капітальных укладанняў, што застаецца ў фондах прадпрыемстваў, не падлягае лімітаванню і пераразмеркаванню з цэнтра. Гэта датычыцца і матэрыяльных рэсурсаў, большасць якіх абарочваецца па каналах аптовага гандлю.

Прадпрыемства пры распрацоўцы планаў не можа выходзіць за рамкі ўстаноўленых яму Л. Такім чынам, Л. - гэта асаблівыя абмежаванні. Увядзенне іх у практыку планавання арыентуе прадпрыемства на найбольш эканамічны расход рэсурсаў. Лімітаванне, гэта значыць цэнтралізаванае размеркаванне рэсурсаў, будзе звужвацца па меры развіцця аптовага гандлю сродкамі вытворчасці.

**ЛІЦЭНЗІЯ** (Лицензия) -- дазвол на выкананне якога-небудзь віду дзейнасці. У эканамічных адносінах Л. з'яўляецца: 1) дазвол на ажыццяўленне знешнегандлёвых аперацый (адрозніваюць экспартныя і імпартныя Л.); яны выдаюцца кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі і з'яўляюцца адной з форм дзяржаўнага кантролю за экспартам і імпартам тавараў, расходаваннем замежнай валюты; 2) дазвол на выкарыстанне вынаходніцтваў і іншых вынікаў навуковых даследаванняў і доследна-канструктарскіх распрацовак, абароненых патэнтамі, а таксама на выкарыстанне тэхнічных ведаў, сакрэтаў вытворчасці, гандлёвай маркі; прадастаўляюцца Л., як правіла, на падставе ліцэнзійнага пагаднення ў выніку камерцыйнай здзелкі.

Асноўныя віды Л.: а) простая, па якой ліцэнзіяр (уладальнік патэнта) дазваляе ліцэнзіяту (атрымальніку Л.) выкарыстоўваць вынаходніцтва ў рамках, вызначаных умовамі пагаднення, але пакідае за сабой права прымяняць яго на той жа тэрыторыі і даваць на

яго Л. іншым асобам; б) выключная, па якой ліцэнзіяр адмаўляецца ад самастойнага прымянення вынаходніцтва на пэўнай тэрыторыі і выдачы Л. трэцім асобам; в) поўная - дазваляе выкарыстоўваць усе заснаваныя на патэнце правы на працягу ўсяго тэрміну дзеяння патэнта.

**М**

**МАТЭРЫЯЛАЁМІСТАСЦЬ** (Материалоемкость) -- паказчык эфектыўнасці вытворчасці, які характарызуе ўзровень выкарыстання матэрыяльных рэсурсаў. М. паказвае велічыню матэрыяльных затрат на адзінку прадукцыі, або карыснага эфекту, і вызначаецца шляхам дзялення матэрыяльных затрат на аб'ём вытворчасці. Адрозніваюць матэрыялаёмістасць вытворчасці і матэрыялаёмістасць прадукцыі. М. вытворчасці характарызуе эфектыўнасць выкарыстання матэрыяльных рэсурсаў увогуле па вытворчасці незалежна ад віду выпускаемай прадукцыі. Разлікі робяцца па народнагаспадарчай, рэгіянальнай, галіновай і заводскай М. М. прадукцыі адлюстроўвае расход матэрыялаў на адзінку канкрэтнага віду прадукцыі (станок, аўтамабіль, рухавік і інш.). Пры гэтым адрозніваюць абсалютную, адносную (удзельную) і агульную М. *Абсалютная М.* - гэта расход асноўных відаў сыравіны і матэрыялаў у абсалютным выражэнні на фізічную адзінку выпускаемай прадукцыі (расход паліва на кілават-гадзіну электраэнергіі, расход скуры на сто пар абутку і інш.).

*Адносная (удзельная) М.* прадукцыі - гэта расход асноўных відаў сыравіны і матэрыялаў на адзінку эксплуатацыйнай або тэхнічнай характарыстыкі вырабляемай прадукцыі (расход металу на адзінку магутнасці рухавіка або адзінку грузападымальнасці аўтамабіля, расход цукру на 1 тыс. умоўных слоікаў кансерваў і інш.).

*Агульная М.* прадукцыі - кошт усіх матэрыяльных затрат на адзінку вырабаў або на рубель вырабляемай прадукцыі. Гэты паказчык дазваляе даць абагульненую ацэнку М. па ўсёй сукупнасці матэрыяльных затрат (асноўных і дапаможных матэрыялаў, пакупных паўфабрыкатаў). Зніжэнне М. - важнейшая крыніца па-

вышэння эфектыўнасці вытворчасці.

**МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ** (Материально-техническое снабжение) -- форма таварнага абарачэння, планавае размеркаванне сродкаў вытворчасці паміж спажыўцамі - прадпрыемствамі і аб'яднаннямі.

Ахоплівае істотна розныя па эканамічнаму зместу формы М.-т.з. - прамое, адраснае размеркаванне сродкаў вытворчасці і аптовы гандаль.

Прамое размеркаванне сродкаў вытворчасці органамі дзяржаўнага кіравання дазваляе сканцэнтраваць абмежаваныя матэрыяльныя рэсурсы для вырашэння важнейшых народнагаспадарчых задач. Аднак празмернае адміністраванне, распаўсюджванне такога метаду размеркавання на шырокае кола тавараў дае адмоўныя вынікі: нерацыянальнае выкарыстанне матэрыяльных рэсурсаў, дэфіцытнасць рынку, манапалізацыя.

Адраснасць размеркавання матэрыяльных рэсурсаў, гэта значыць прымацаванне спажыўцоў да пастаўшчыкоў, пазбаўляе і тых і другіх эканамічнай прадпрымальнасці, вядзе да застою ў эканоміцы.

Аптовы гандаль сродкамі вытворчасці засноўваецца на свабодным выхадзе на рынак, выбары контрагентаў, рыначным механізме рэгулявання суадносін паміж попытам і прапанаваннем (праз цэны). Таварны абмен можа ажыццяўляцца як непасрэдна паміж вытворцамі і спажыўцамі (прамыя гаспадарчыя сувязі), так і праз прадпрыемствы аптовага гандлю сродкамі вытворчасці, біржы і г.д.

М.-т.з. - гэта таксама галіна народнай гаспадаркі, частка вытворчай інфраструктуры. Яна ўключае ў сябе сістэму дзяржзабеспячэння з сеткай універсальных аптовых фірм (Аптгандлі), размешчаных на тэрыторыі рэспублікі, і падпарадкаваных ім баз і складаў, арганізацый аграпрамысловага комплексу (аграпрамзабеспячэнне), служб забеспячэння і збыту прамысловых прадпрыемстваў і аб'яднанняў, будаўнічага комплексу (УПТК), галіновых сістэм забеспячэння (міністэрствы шляхоў зносін, геалогіі, грамадзянскай авіяцыі і інш.).

Забеспячэнча-збытавыя арганізацыі ( аптова-пас -

рэдніцкія фірмы) з'яўляюцца самастойнымі гаспадарча-разліковымі звёнамі сістэмы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Яны апасродкуюць гаспадарчыя сувязі паміж вытворцамі і спажыўцамі, забяспечваюць прадметамі вытворча-тэхнічнага прызначэння дробных і сярэдніх спажыўцоў, рэалізуючы іх тавары з прадпрыемстваў (баз, складаў, магазінаў), дапамагаюць устанаўліваць прамыя гаспадарчыя сувязі паміж буйнымі вытворцамі і спажыўцамі, аказваюць вытворча-тэхнічныя і камерцыйныя паслугі шырокаму колу дзяржаўных і кааператыўных арганізацый.

**МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ ЗАТРАТЫ** (Материальные затраты) -- адзін з відаў затрат, якія ўтвараюць сабекошт прадукцыі. Уяўляюць сабой кошт спажытых у працэсе вытворчасці матэрыяльных рэсурсаў і ўключаюць кошт сыравіны, асноўных і дапаможных матэрыялаў, зрасходаваных на выраб прадукцыі (выкананне работ, аказанне паслуг), спажытага паліва і электраэнергіі, матэрыяльныя выдаткі ў складзе іншых грашовых расходаў, страты ад пашкоджання і нястачы матэрыялаў і прадукцыі ў час захоўвання на цэхавых і заводскіх складах, штрафы за перарасход матэрыяльных рэсурсаў і інш.

М.з. абумоўлены самім працэсам узнаўлення, бо кожнае грамадства дзеля падтрымання свайго багацця нават на нязменным узроўні павінна замяшчаць спажытыя на працягу года сыравіну і матэрыялы новымі экземплярамі таго ж роду і ўмела выкарыстоўваць кожны элемент сукупнага грамадскага прадукту, у тым ліку і прадметы працы.

Разлікі М.з. вядуцца з улікам і без уліку амартызацыі. М.з. з улікам амартызацыі выкарыстоўваюцца пры вывучэнні прапорцыі грамадскай вытворчасці. М.з. без амартызацыйных адлічэнняў ужываюцца для ацэнкі і аналізу эфектыўнасці выкарыстання сыравіны і матэрыялаў. М.з. складаюць амаль 75 % сабекошту прамысловай прадукцыі і з'яўляюцца важнейшай крыніцай яго зніжэння.

**МЕТАДЫ КІРАВАННЯ** (Методы управления) -- спосабы мэтанакіраванага ўздзеяння на аб'ект

кіравання для дасягнення пастаўленых мэт. М.к. забяспечваюць рацыянальнае выкарыстанне аб'ектыўных законаў, уласцівых аб'екту кіравання. Таму для аналізу М.к. неабходна ведаць гэтыя законы. Гэта эканамічныя законы, законы развіцця тэхнікі і арганізацыі вытворчасці, законы, звязаныя з людзьмі як элементам прадукцыйных сіл, і законы, звязаныя з сацыяльнымі адносінамі, якія складваюцца паміж людзьмі ў працэсе вытворчасці. Па асаблівасцях (характару) уздзеяння М.к. падзяляюцца на эканамічныя, арганізацыйна-распарадчыя і сацыяльна-псіхалагічныя. Гэтыя метады выкарыстоўваюцца на ўсіх узроўнях кіравання. М.к. цесна ўзаемазвязаны паміж сабой, утвараюць адзіную сістэму. Гарманічнае спалучэнне ўсіх метадаў з'яўляецца перадумовай эфектыўнага кіравання. Рацыянальнае выкарыстанне эканамічных законаў забяспечваецца эканамічнымі метадамі кіравання, якія ствараюць умовы для спалучэння індывідуальных, калектыўных і грамадскіх інтарэсаў.

Дзеянне эканамічных метадаў дапаўняецца арганізацыйна-распарадчымі метадамі. Галоўная рыса апошніх М.к. заключаецца ва ўздзеянні на аб'ект шляхам фарміравання аптымальных падсістэм (якая кіруе і якой кіруюць) і забеспячэння ўзаемадзеяння паміж імі на аснове ўліку законаў развіцця тэхнікі і арганізацыі вытворчасці і ўзаемаадносін паміж удзельнікамі працэсу вытворчасці.

Арганізацыйна-распарадчыя М.к. забяспечваюць арганізацыйнае і распарадчае ўздзеянне на аб'ект, прычым арганізацыйнае ўздзеянне ажыццяўляецца ў формах арганізацыйнага нарміравання і арганізацыйнага рэгламентавання.

Улік законаў фарміравання і развіцця калектываў, законаў узаемадзеяння членаў калектыву вядзецца з дапамогай сацыяльна-псіхалагічных М.к., якія забяспечваюць усебаковае развіццё асобы, задавальненне сацыяльных патрэб. Сацыяльна-псіхалагічныя М.к. выкарыстоўваюцца для фарміравання аптымальных міжасабовых адносін у калектыве, якія ўплываюць на асноўныя вытворчыя паказчыкі.

**МЕХАНІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Механизация производства) -- замена ручных вытворчых аперацый машынамі і механізмамі. Ад М.в. неабходна адрозніваць механізацыю працы, якая заключаецца ў замене ручной працы машыннай. Нават пры поўнай М.в. можа захавацца ручная праца (напр., маркіроўка і ўпакоўка прадукцыі). Па ступені аснашчанасці вытворчых працэсаў тэхнічнымі сродкамі М.в. падраздзяляецца на частковую і комплексную. Пры частковай механізацыі замяняюцца машынамі асобныя аперацыі або віды работ, звычайна найбольш працаёмкія, пры комплекснай - замяняецца машынамі ручная праца на ўсіх асноўных аперацыях і дапаможных работах. Яна ажыццяўляецца на аснове падбору машын і іншага абсталявання, што працуюць ва ўзаемна ўзгодненых рэжымах і ўвязаны па іх прадукцыйнасці. Ручная праца можа захавацца на асобных непрацаёмкіх аперацыях, механізацыя якіх не ўплывае на аблягчэнне працы і эканамічна немэтазгодна. М.в. спрыяе вызваленню чалавека ад выканання цяжкіх руцінных работ, вядзе да росту прадукцыйнасці працы, зніжэння сабекошту і паляпшэння якасці прадукцыі, павышэння кваліфікацыі рабочых, удасканалення арганізацыі вытворчасці.

**МІЖГАСПАДАРЧЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ** (Межхозяйственные предприятия) -- буйныя высокатаварныя прадпрыемствы індустрыяльнага тыпу, створаныя на аснове каапераціі, аб'яднання сродкаў, матэрыяльна-тэхнічных і працоўных рэсурсаў калгасаў, саўгасаў, кааператыўных гаспадарак, прадпрыемстваў і арганізацый для супольнай вытворчасці, перапрацоўкі і рэалізацыі прадукцыі сельскай гаспадаркі, а таксама абслугоўвання дзяржаўных і кааператыўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. З'яўляюцца вынікам працэсу спецыялізацыі і канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці на базе міжгаспадарчай кааперацыі і аграпрамысловай інтэграцыі.

Формы М.п. вызначаюцца асаблівасцямі вытворчасці, перапрацоўкі, транспарціравання і спажывання сельскагаспадарчай прадукцыі. Распаўсюджванне атрымалі М.п. мнагамэтавага прызначэння са складанай

структурай і шырокім асартыментам таварнай прадукцыі. Яны фарміруюцца ў форме аграпрамысловых камбінатаў, фірм, у выглядзе розных кааператыўных фарміраванняў. Спецыялізаваныя М.п., выкарыстоўваючы перавагі міжгаспадарчай кааперацыі, маюць магчымасць больш хутка ўкараняць дасягненні навукі і тэхнікі, больш рацыянальна выкарыстоўваць матэрыяльна-тэхнічныя сродкі і працоўныя рэсурсы, зніжаць сабекошт прадукцыі, паляпшаць яе якасць.

У выніку інтэграванай гаспадарчай дзейнасці павышаецца двухбаковая зацікаўленасць усіх удзельнікаў у павышэнні зроўню інтэнсіфікацыі, у росце рэнтабельнасці вытворчасці, ствараюцца спрыяльныя перадумовы для комплекснага вырашэння сацыяльных праблем.

**МІЖНАРОДНЫ ГАНДАЛЬ** (Международная торговля) -- абмен таварамі і паслугамі паміж дзяржаўна аформленымі нацыянальнымі гаспадаркамі. Характар гэтага абмену вызначаецца вытворчымі адносінамі ў краінах, якія ўдзельнічаюць у гандлі. М.г. садзейнічае міжнароднай спецыялізацыі і кааперацыі вытворчасці, міжнародн му навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву, расшырэнню абмену таварамі і паслугамі. Для сучаснага ўзроўню развіцця М.г. характэрна павелічэнне ўдзельнай вагі прадукцыі навукова-тэхнічнага прагрэсу - тэхнікі, абсталявання, тэхналогіі, ліцэнзій і г.д. М.г. садзейнічае эканамічнаму росту ўсіх краін, вядзе да разрадкі напружанасці, да ўзаемаразумення і ўмацавання міру паміж народамі.

**МІЖНАРОДНЫ КРЭДЫТ** (Международный кредит) -- форма міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва, пры якой дзяржавы, банкі і фінансавыя арганізацыі, фірмы, а таксама іншыя юрыдычныя, фізічныя асобы адных краін выдзяляюць сродкі адпаведным контрагентам іншых краін. Сутнасць міжнародных крэдытных адносін заключаецца ў тым, што крэдытор прадастаўляе пазычальніку ў часовае карыстанне пэўныя рэсурсы ў таварнай або грашовай форме для развіцця канкрэтных галін або на пэўныя мэты нацыянальнай эканомікі і для расшырэння ўзаемных гаспадарчых сувязей. Асноўнымі відамі М.к. з'яўляюцца:

міждзяржаўны (міжурадавы), банкаўскі, фірменны (камерцыйны). У залежнасці ад тэрмінаў выдачы прымяняюцца кароткатэрміновыя, сярэднетэрміновыя і доўгатэрміновыя М.к. Па характару пазыкі М.к. бываюць: таварныя, інвестыцыйныя і валютныя (грашовыя). Таварныя крэдыты характэрны для сферы знешняга гандлю і выдзяляюцца ў выглядзе паставак прамысловых, харчовых і іншых тавараў.

Пагашэнне таварных крэдытаў і выплата па іх працэнтаў ажыццяўляюцца звычайна таварамі традыцыйнага экспарту краіны-пазычальніцы. Інвестыцыйныя крэдыты выкарыстоўваюцца пры будаўніцтве, расшырэнні, рэканструкцыі прамысловых, транспартных, сельскагаспадарчых і іншых аб'ектаў у выглядзе камплектных паставак машын, абсталявання або поўнага будаўніцтва за кошт сродкаў крэдытора. Такія пазыкі звычайна прадастаўляюцца на кампенсацыйнай аснове, гэта значыць пагашаюцца прадукцыяй тых прадпрыемстваў, на затраты па якіх гэтыя пазыкі прызначаліся. Валютныя крэдыты выдаюцца ў свабодна канверсаванай або іншай валюце, золаце.

**МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ** (Местное самоуправление) -- сацыяльна-эканамічная і грамадска-палітычная форма самаарганізацыі членаў савецкага грамадства. Ажыццяўляецца насельніцтвам праз мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, органы грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання, мясцовыя рэферэндумы, сходы грамадзян па месцы жыхарства, іншыя формы дэмакратыі.

Асноўным звяном сістэмы М.с. з'яўляюцца мясцовыя Саветы народных дэпутатаў. У сістэму М.с. уваходзяць працоўныя калектывы, грамадскія арганізацыі, самадзейныя аб'яднанні і фарміраванні грамадзян. М.с. ажыццяўляецца на прынцыпах народаўладдзя: рэалізацыя волі народаў праз Саветы народных дэпутатаў і рэферэндумы; захаванне законнасці; падкантрольнасць і падсправаздачнасць насельніцтву ўсіх органаў М.с., а таксама мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання і службовых асоб; самадзейнасць і незалежнасць Саветаў народных дэпутатаў у межах устаноўленай зако-

нам кампетэнцыі; шырокі ўдзел у М.с. дэпутатаў і іх фарміраванняў, працоўных калектываў грамадскіх арганізацый і іншых аб'яднанняў грамадзян; спалучэнне мясцовых і агульнадзяржаўных інтарэсаў; галоснасць.

Закон аб М.с. вызначае эканамічную і фінансавую аснову М.с., яго гарантыі. Так, эканамічную аснову М.с. складаюць прыродныя рэсурсы, уласнасць суб'ектаў гаспадарання на тэрыторыі, мясцовая гаспадарка. Узаемаадносіны мясцовых Саветаў народных дэпутатаў з прадпрыемствамі будуюцца або на дагаворнай аснове (з прадпрыемствамі і арганізацыямі, якія не ўваходзяць у склад мясцовай гаспадаркі), або на непасрэдна эканамічных, прававых і арганізацыйных метадах. Дакладна вызначаны і фінансавыя рэсурсы М.с.: мясцовы бюджэт, пазабюджэтныя фінансавыя рэсурсы, фінансавыя сродкі органаў грамадска-тэрытарыяльнага самакіравання, крэдыт.

## Н

**НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ ПАЛІТЫКА** (Научно-техническая политика) -- комплекс доўгатэрміновых мер па мабілізацыі тэхнічных, эканамічных, арганізацыйных і сацыяльных фактараў, якія забяспечваюць карэннае, якаснае абнаўленне прадукцыйных сіл грамадства на аснове дасягненняў навукі і тэхнікі. Н.-т.п. прадугледжвае стварэнне неабходных умоў для развіцця навукі, тэхнікі і вытворчасці ў адпаведнасці з бягучымі і перспектыўнымі задачамі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Сутнасць і галоўнае патрабаванне Н.-т.п. -- ажыццяўленне дынамічнага, прапарцыянальнага, збалансаванага навукова-тэхнічнага развіцця галін народнай гаспадаркі на аснове ўсебаковага і эфектыўнага выкарыстання навукова-тэхнічнага патэнцыялу, паглыблення ўзаемасувязей паміж сферамі прымянення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, паміж фундаментальнай і прыкладной навукай, паміж рознымі напрамкамі навукова-тэхнічнага прагрэсу.

У сучасных умовах змест Н.-т.п. вызначаецца неабходнасцю паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу. Яна заклікана нацэліць карэнныя пераўтварэнні ў

тэхніцы і тэхналогіі на значнае павышэнне прадукцыйнасці працы, радыкальнае паляпшэнне выкарыстання прыродных рэсурсаў, сыравіны, матэрыялаў, паліва і энергіі, павышэнне тэхнічнага ўзроўню і якасці прадукцыі, лепшае выкарыстанне асноўных фондаў.

Галоўным інструментам Н.-т.п. з'яўляецца Комплексная праграма навукова-тэхнічнага прагрэсу і яго сацыяльна-эканамічных вынікаў, якая распрацоўваецца на 20 год і карэкціруецца кожныя 5 год. Важная роля ў рэалізацыі Н.-т.п. належыць мэтавым комплексным навукова-тэхнічным праграмам. Яны забяспечваюць каардынацыю дзейнасці навуковых устаноў, прадпрыемстваў (аб'яднанняў) многіх галін народнай гаспадаркі на ўсіх этапах цыкла "навука-тэхніка-вытворчасць".

З пераходам на новыя ўмовы гаспадарання ўсё большае значэнне для рэалізацыі Н.-т.п. набываюць эканамічныя метады кіравання, якія стымулююць паскоранае развіццё галін, што з'яўляюцца вызначальнымі для навукова-тэхнічнага прагрэсу, і павышаюць зацікаўленасць вучоных і інжынераў у высокаэфектыўных выніках навукова-тэхнічнай дзейнасці, а прадпрыемствы і аб'яднанні - ў абнаўленні прадукцыі.

**НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ, або НТР** (Научно-техническая революция, или НТР) -- сучасная рэвалюцыйная форма навукова-тэхнічнага прагрэсу, для якой характэрны якасныя змены ў прадукцыйных сілах на аснове карэнных зрухаў у сістэме навуковых ведаў і ператварэння навукі ў рашаючы фактар развіцця вытворчасці.

Характэрнай рысай НТР з'яўляецца яе ўсеагульнасць. Навука як непасрэдная прадукцыйная сіла ва ўмовах НТР матэрыялізуецца ў тэхніцы і тэхналогіі, прадметах працы, арганізацыі вытворчасці і рабочай сіле. Побач з гэтым НТР карэнным чынам мяняе невытворчую сферу - адукацыю, ахову здароўя, культуру.

Уздзеянне НТР на сродкі працы выяўляецца ў з'яўленні новага элемента машыны: да рабочай машыны, рухавіка і перадатачнага ўстройства дабаўляецца кіруючае ўстройства. Дзякуючы гэтаму новыя машыны

вызваляюць чалавека не толькі ад цяжкай фізічнай працы, але і ад складаных разумовых аперацый. Ва ўмовах аўтаматызаванай вытворчасці да работніка прад'яўляюцца новыя патрабаванні. Істотна ўзрастае значэнне такіх яго якасцей, як кампетэнтнасць, кваліфікацыя, узровень адукацыі, здольнасць хутка асвойваць тэхнічныя новаўвядзенні.

НТР прыводзіць да з'яўлення новых прадметаў працы з загадзя зададзенымі ўласцівасцямі, якія адсутнічаюць у прыродзе, безадходных і малаадходных тэхналогій, якія выключаюць негатыўнае ўздзеянне вытворчасці на прыроду.

Для НТР характэрна цесная сувязь навукі, тэхнікі і вытворчасці. Навука зліваецца з вытворчасцю, становіцца яе арганічнай састаўной часткай. Шырокае развіццё атрымліваюць такія формы арганізацыі вытворчасці, як навукова-вытворчыя аб'яднанні, міжгаліновыя навукова-тэхнічныя комплексы, фірмы па ўкараненню, інжынерныя цэнтры.

НТР забяспечвае ўсебаковае, комплекснае пераўтварэнне вытворчасці на аснове прымянення сістэм машын, якія ахопліваюць увесь вытворчы працэс. Ствараюцца цэхі і прадпрыемствы-аўтаматы, сістэмы аўтаматызаванага кіравання і праектавання.

Выкарыстанне дасягненняў НТР -- рашаючы фактар інтэнсіфікацыі працы, эканоміі сыравіны і матэрыялаў, павышэння аддачы вытворчых фондаў, паляпшэння якасці прадукцыі.

У сучасных умовах важнай задачай з'яўляецца ўзмацненне сацыяльнай арыентацыі НТР -- арыентацыя яе на паляпшэнне ўмоў працы і быту людзей, вырашэнне экалагічных праблем і г.д.

Дасягненні НТР не рэалізуюцца аўтаматычна. Рашаючая роля тут належыць удасканаленню гаспадарчага механізма, рэформе сістэмы кіравання эканомікай.

**НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ** (Научно-технический потенциал) -- падсістэма грамадскай вытворчасці, у склад якой уваходзяць навука, адукацыя і тэхнічныя сродкі вытворчасці. Н.-т.п. уключае ў сябе сукупнасць працоўных, тэхнічных, матэрыяльных,

інфармацыйных рэсурсаў, рэсурсаў арганізацыі і кіравання, ад узроўню якіх залежаць эфектыўнасць, тэрміны і маштабы распаўсюджання вынікаў навуковых даследаванняў і тэхнічных распрацовак у народнай гаспадарцы.

Н.-т.п. характарызуецца наступнымі паказчыкамі: колькасць вышэйшых вучэбных і навуковых устаноў, лабараторый, праектных, доследна-канструктарскіх, эксперыментальных, тэхналагічных падраздзяленняў (заводаў, цэхаў, участкаў), аддзелаў механізацыі і аўтаматызацыі, навуковай арганізацыі працы, інстытутаў, бюро або аддзелаў навукова-тэхнічнай інфармацыі; колькасць завершаных даследаванняў і распрацовак, увасобленых у чарцяжах, макетах і ўзорах новай тэхнікі, прагрэсіўнай тэхналогіі, метадычных матэрыялах, якія здольны палепшыць вытворчасць; колькасць работнікаў, якія заняты навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі, іх навуковы і кваліфікацыйны ўзровень; узровень тэхнічнай аснашчанасці працы навуковага і тэхнічнага персаналу; затраты на навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія работы, удзельная вага капітальных укладанняў у навуку, матэрыяльныя затраты, якія прыходзяцца на аднаго работніка, занятага ў сферы Н.-т.п.; аб'ём назапашаных навуковых ведаў (у тым ліку колькасць навуковых публікацый, артыкулаў, кніг, манаграфій, брашур і да т.п.).

У сучасных умовах развіццё Н.-т.п. звязана са стварэннем міжгаліновых навукова-тэхнічных комплексаў, якія ўключаюць у сябе навукова-даследчыя інсты-туты, праектныя і канструктарскія арганізацыі, прадпрыемствы, што адносяцца да розных галін народнай гаспадаркі.

Важнай задачай развіцця Н.-т.п. з'яўляецца перабудова галіновай навукі і навукі, якая развіваецца ў вышэйшых навучальных установах, максімальнае прыбліжэнне яе да вытворчасці, умацаванне яе матэрыяльнай і доследна-эксперыментальнай базы, аснашчэнне сучаснымі прыборамі і навуковым абсталяваннем.

**НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС, або НТП** (Научно-технический прогресс, или НТП) -- працэс

бесперапыннага развіцця навукі і тэхнікі, у ходзе якога назапашваюцца навуковыя веды, якія матэрыялізуюцца ў элементах тэхнікі і ўкараняюцца ў вытворчасць і ва ўсе сферы грамадскага жыцця. НТП уяўляе сабой цэласную сістэму, якая ахоплівае тры ўзаемазвязаныя стадыі -- навуку, тэхніку і вытворчасць, што развіваюцца адначасова, цесна ўзаемадзейнічаючы і пераплятаючыся адна з адной. У шырокім сэнсе пад НТП маецца на ўвазе сукупнасць сродкаў і прадметаў працы, метадаў тэхналогіі і форм арганізацыі і кіра-вання вытворчасцю. Увасабленне навуковых ідэй у тэхнічныя сродкі і новую тэхніку ажыццяўляецца праз прыкладныя даследаванні, доследна-канструктарскія і тэхналагічныя распрацоўкі і вытворчыя даследаванні. У выніку навука ўсё больш ператвараецца ў непасрэдную вытворчую сілу і тым самым усё больш змяняе матэрыяльную вытворчасць.

НТП мае дзве асноўныя формы: эвалюцыйную, якая азначае параўнальна павольнае і частковае ўдасканаленне традыцыйных навукова-тэхнічных асноў вытворчасці, і рэвалюцыйную, якая праходзіць у выглядзе навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Гэтыя формы ўзаемна абумоўліваюць адна адну: колькаснае назапашванне параўнальна невялікіх змен у навуцы і тэхніцы прыводзіць у рэшце рэшт да карэнных пераўтварэнняў у гэтай галіне, а пасля пераходу да прынцыпова новай тэхнікі і тэхналогіі рэвалюцыйныя змены паступова перарастаюць у эвалюцыйныя.

Паскарэнне НТП з'яўляецца галоўнай умовай павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці і паляпшэння якасці прадукцыі. Асноўныя шляхі паскарэння НТП: павышэнне аддачы навуковага патэнцыялу, паскарэнне тэмпаў росту машынабудавання, павышэнне тэхнічнага ўзроўню яго прадукцыі, карэннае тэхнічнае пераўзбраенне народнай гаспадаркі, інтэграцыя навукова-тэхнічнага патэнцыялу , карэнная перабудова кіравання НТП.

**НАВУКОВАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ, або НАП** (Научная организация труда, или НОТ) -- рацыянальная арганізацыя працы на аснове комплексу ар-

ганізацыйна-тэхнічных, эканамічных, санітарна-гігіенічных і псіхафізіялагічных мерапрыемстваў, заснаваных на дасягненнях навукі і перадавым вопыце. Сістэматычна ўкараняемыя ў вытворчасць, яны дазваляюць найлепшым чынам злучыць тэхніку і людзей у адзіным вытворчым працэсе, забяспечыць найбольш эфектыўнае выкарыстанне матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, бесперапыннае павышэнне прадукцыйнасці працы, садзейнічаць захаванню здароўя чалавека, паступоваму ператварэнню працы ў першую жыццёвую патрэбнасць.

НАП заклікана вырашаць наступныя задачы: эканамічную - рацыянальнае выкарыстанне працоўных рэсурсаў, павышэнне якасці прадукцыі; псіхафізіялагічную -- палягчэнне працы і стварэнне неабходнай адпаведнасці паміж працай і псіхафізіялагічнымі данымі чалавека, умоў для яго гарманічнага развіцця; сацыяльную -- паляпшэнне ўмоў працы, фарміраванне творчых адносін да працы.

Напрамкамі НАП з'яўляюцца: удасканаленне падзелу і кааперацыі працы, паляпшэнне арганізацыі і абслугоўвання рабочых месц, вывучэнне і распаўсюджванне перадавых прыёмаў і метадаў працы, падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кадраў, паляпшэнне ўмоў працы, атэстацыя і рацыяналізацыя рабочых месц, удасканаленне брыгаднай формы арганізацыі і стымулявання працы, захаванне дзяржаўнай і працоўнай дысцыпліны, удасканаленне тэхнічнага нарміравання працы, павышэнне культурна-тэхнічнага ўзроўню работнікаў.

Укараненне НАП стварае перадумовы для эканоміі грамадскай працы і павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці. Планаванне мерапрыемстваў па НАП з'яўляецца састаўной часткай планаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця прадпрыемстваў.

**НАКАПЛЕННЕ** (Накопление) -- выкарыстанне часткі нацыянальнага даходу (або прыбавачнага прадукту) для расшырэння (павелічэння) грамадскай вытворчасці. У канчатковым выніку гэта -- перавышэнне вытворчасці над спажываннем, расшыранае ўзнаўленне грамадскага прадукту і нацыянальнага багацця. Кан-

крэтна Н. уключае ў сябе развіццё матэрыяльнай базы ўсіх галін народнай гаспадаркі (прырост асноўных фондаў), прырост матэрыяльных абаротных сродкаў і рэзерваў, у тым ліку і для ўтрымання работнікаў, якія далучаюцца да вытворчасці дадаткова. Асноўнай крыніцай Н. з'яўляецца прыбавачны прадукт. Акрамя яго на расшырэнне вытворчасці выкарыстоўваецца і частка амартызацыйнага фонду. Н. ажыццяўляецца ў форме капітальных укладанняў і прыводзіць да канцэнтрацыі і цэнтралізацыі вытворчасці, суправаджаецца ростам тэхнічнай узброенасці працы (арганічнай будовы вытворчасці), пераразмеркаваннем рабочай сілы паміж галінамі і сферамі дзейнасці. Змяненне адноснай велічыні накаплення характарызуецца нормай накаплення, якая вызначаецца шляхам дзялення фонду накаплення на велічыню нацыянальнага даходу. Суадносіны накаплення і спажывання павінны быць аптымальнымі, яны складваюцца ў залежнасці ад стану эканомікі, патрэб у абнаўленні асноўных фондаў і ў забеспячэнні росту дабрабыту. Цяпер ставіцца задача адшукаць дадатковыя крыніцы сродкаў для павелічэння вырабу тавараў народнага спажывання, паслуг, паскоранага развіцця сацыяльнай сферы. Гэта патрабуе скарачэння вытворчага будаўніцтва і прыводзіць да некаторага змяншэння нормы накаплення. Аднак галоўным напрамкам павышэння ўзроўню жыцця людзей застаецца інтэнсіфікацыя вытворчасці, эканомія рэсурсаў, структурная перабудова народнай гаспадаркі.

Працэс Н. рэгулюецца законам накаплення, гэта значыць аб'ектыўнай неабходнасцю выкарыстання прыбавачнага прадукту на расшырэнне вытворчасці. Закон накаплення вызначае, што чым большыя грамадскае багацце, вытворчыя фонды і эфектыўнасць іх выкарыстання, тым вышэйшыя прадукцыйнасць працы і ўзровень жыцця насельніцтва, больш магчымасцей для эфектыўнай занятасці насельніцтва, усебаковага развіцця ўсіх членаў грамадства. Такая гістарычная тэндэнцыя Н.

**НАРМАТЫВЫ ЭКАНАМІЧНЫЯ** (Нормативы экономические) -- гранічна дапушчальныя адносныя

велічыні выкарыстання матэрыяльных, працоўных і грашовых рэсурсаў. Яны характарызуюць ступень выкарыстання прылад і прадметаў працы, затрат жывой працы, суадносіны элементаў вытворчагаспадарчых працэсаў прадпрыемства і ўстанаўліваюць велічыню параметраў, якія рэгламентуюць планавыя заданні. Прымяненне сістэмы прагрэсіўных норм і Н. на прадпрыемстве з'яўляецца неабходнай умовай рацыянальнай арганізацыі яго вытворчагаспадарчай дзейнасці, навукова абгрунтаванай распрацоўкі планаў і эфектыўнага кіравання іх рэалізацыяй, эканомнага выкарыстання ўсіх відаў рэсурсаў.

**НАРМАТЫЎНЫ МЕТАД УЛІКУ** (Нормативный метод учета) - адзін са спосабаў (метадаў) уліку затрат на выраб прадукцыі і яе калькулявання. Асноўнымі ўмовамі прымянення Н.м.у. з'яўляюцца: наяўнасць нарматыўных калькуляцый па дзеючых нормах на пачатак месяца, улік адхіленняў фактычных затрат ад дзеючых норм у момант іх узнікнення, улік змяненняў дзеючых норм. Н.м.у. лічыцца найбольш прагрэсіўным відам уліку вытворчых затрат. Ён прадугледжвае выяўленне адхіленняў ад норм у момант іх узнікнення, вызначэнне месца, прычыны і вінаватых у іх утварэнні, што садзейнічае хуткай ліквідацыі прычын перарасходаў, выяўленню і выкарыстанню канкрэтных дасягненняў у арганізацыі і кіраванні вытворчасцю. Своечасовы ўлік змянення норм і іх прычын дазваляе аператыўна кантраляваць укараненне і эфектыўнасць навукова-тэхнічных і арганізацыйных мерапрыемстваў па развіццю вытворчасці і ажыццяўленню рэжыму эканоміі.

Пачатковым этапам Н.м.у. з'яўляецца нарміраванне ўсіх затрат на вытворчасць і іх улік па дзеючых нормах. Як гэты, так і наступныя этапы (улік змянення норм, улік адхіленняў ад норм) могуць паспяхова ажыццяўляцца пры ўмове забеспячэння добрай арганізацыі і кіравання вытворчасцю. Па сваёй мэце, сутнасці і зместу Н.м.у. уяўляе сабой сістэму аператыўнага кіравання сабекоштам прадукцыі. Важнейшым фактарам стымулявання яе эфектыўнага функцыяніравання з'яўляецца поўны гаспадарчы разлік і самакіраванне гаспадарчых

прадпрыемстваў.

**НАРОДАНАСЕЛЬНІЦТВА** (Народонаселение) -- пастаянна ўзнаўляльная сукупнасць людзей, якія пражываюць на пэўнай тэрыторыі і ажыццяўляюць сваю жыццядзейнасць у рамках пэўнага грамадскага ладу. Н. можна разглядаць у маштабах зямнога шара, мацерыка, той ці іншай краіны, яе састаўных частак, гарадоў і раёнаў.

Н. -- цэнтральная катэгорыя і аб'ект вывучэння комплекснай сістэмы ведаў пра насельніцтва, якая аб'ядноўвае агульную тэорыю народанасельніцтва, дэмаграфію, эканоміку і сацыялогію Н., геаграфію, экалогію насельніцтва і інш. Важнейшай прыкметай Н. з'яўляецца пастаяннае ўзнаўленне насельніцтва ў выніку яго натуральнага руху (нараджэння і смерці), гэта значыць бесперапынная змена пакаленняў.

Н. складаецца з людзей, але яно не можа разглядацца як простае мноства людзей. Людзі ўступаюць у сумесную дзейнасць, у вытворчыя адносіны, дзеляцца на класы. Гэтыя вытворчыя адносіны мяняюцца разам са зменай спосабу вытворчасці. Н. не можа існаваць па-за вытворчымі адносінамі. Разам з тым людзі, якія здольны да мэтазгоднай працоўнай дзейнасці, уяўляюць сабой важнейшую прадукцыйную сілу грамадства,якая адухоўлівае іншыя элементы вытворчасці. Гэта значыць, што насельніцтва з'яўляецца важнейшай умовай матэрыяльнага жыцця грамадства, асновай і суб'ектам кожнай грамадскай вытворчасці, носьбітам усіх грамадскіх адносін і з'яў.

Акрамя гэтых двух бакоў, якія характарызуюць насельніцтва як элемент прадукцыйных сіл і носьбіта вытворчых адносін, існуе трэці бок, які ўласцівы жыццядзейнасці насельніцтва, - узнаўленне самога насельніцтва.

Гэтыя зыходныя пазіцыі абумоўлены вучэннем матэрыялістычнай дыялектыкі, якая разглядае заканамернасці развіцця прыроды і грамадства як адзінага цэлага, састаўныя часткі якога ўзаемаабумоўлены і знаходзяцца ў стане развіцця.

Н.- сацыяльная з'ява, якая падпарадкоўваецца зако-

нам грамадскага развіцця. Кожнай грамадска-эканамічнай фармацыі ўласцівы свой спецыфічны закон Н., які вызначае, на якіх умовах і ў якой ступені грамадства забяспечвае занятасць працаздольнай часткі насельніцтва.

**НАЦЫЯНАЛЬНАЕ БАГАЦЦЕ** (Национальное богатство) -- сукупнасць даброт, створаных у грамадстве за весь папярэдні перыяд развіцця. Важным кампанентам Н.б. з'яўляюцца асвоеныя прыродныя рэсурсы.

У шырокім сэнсе Н.б. уключае ў сябе і нематэрыяльныя даброты, духоўныя каштоўнасці: назапашаны вытворчы і жыццёвы вопыт людзей, адукацыйны патэнцыял, інфармацыйныя рэсурсы, дасягненні навукова-тэхнічнай думкі, культурныя каштоўнасці. У сукупнасці ўсе гэтыя элементы Н.б. разам з кадрамі работнікаў і вучоных складаюць эканамічны патэнцыял краіны.

Асноўнай крыніцай павелічэння Н.б. з'яўляецца прырост грамадскага прадукту. У адрозненне ад Н.б. натуральнае багацце ўключае ў сябе прыродныя даброты, да якіх не прыкладзена праца чалавека (неразведаныя нетры зямлі, дзікарослыя лясы, няўцягнутыя ў абарот землі, водныя рэсурсы).

Праблемы ўзнаўлення Н.б. уключаюць у сябе складаны комплекс пытанняў, звязаных з вытворчасцю, размеркаваннем і выкарыстаннем грамадскага прадукту, нацыянальнага даходу, абнаўленнем асноўных фондаў, вырабам і выкарыстаннем іншых матэрыяльных рэсурсаў і гатовай прадукцыі, а таксама ўзнаўленнем прыродных рэсурсаў. Апошняе звязана з клопатам аб ахове навакольнага асяроддзя, са стварэннем і зберажэннем неабходных рэсурсаў не толькі для бягучага спажывання, але і для будучых пакаленняў.

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ ДАХОД** (Национальный доход) -- нанава створаная вартасць або частка вартасці грамадскага прадукту за вылікам спажытых (патрачаных) сродкаў вытворчасці. Калі вартасць усяго грамадскага прадукту (T) распадаецца на вартасць спажытых сродкаў вытворчасці (C), вартасць неабходнага (V) і прыбавачнага (m) прадукту, то Н.д. (НД) будзе роўны V+m, або T - C. Разам з тым Н.д., менавіта як даход,

характарызуе рух нанава створанай вартасці ў працэсе размеркавання, абарачэння і спажывання грамадскага прадукту, а ў сферы вытворчасці яна набывае форму чыстага прадукту. Чыстая прадукцыя прадпрыемстваў матэрыяльнай вытворчасці характарызуе канкрэтны ўклад прадпрыемстваў у стварэнне нацыянальнага даходу, свабодны ад уплыву фактараў размеркавальнага характару і кан'юнктуры сусветнага рынку. Чысты прадукт распадаецца на неабходны і прыбавачны, а Н.д. - на фонд спажывання і фонд накаплення.

Як і сукупны грамадскі прадукт, Н.д. ствараецца ў галінах матэрыяльнай вытворчасці прадукцыйнай працай яе работнікаў. Грамадства і кожны яго член зацікаўлены ў няўхільным росце Н.д., бо ад яго аб'ёму і тэмпаў росту залежаць рэальныя даходы, узровень жыцця насельніцтва і маштабы расшырэння вытворчасці. Н.д. у гэтым сэнсе -- асноўны рэсурсны даход грамадства, асноўная крыніца яго развіцця. Таму Н.д. выступае і ў якасці абагульняючага канечнага выніку, эфекту грамадскай вытворчасці. У росце Н.д. выяўляецца павышэнне эфектыўнасці грамадскай вытворчасці.

На павелічэнне Н.д. уплываюць тры асноўныя фактары: прадукцыйнасць працы, маса працы (колькасць працуючых) у галінах матэрыяльнай вытворчасці і эканомія матэрыяльных рэсурсаў. Адным з істотных напрамкаў перабудовы эканомікі з'яўляецца павелічэнне тэмпаў росту Н.д., забеспячэнне ўсяго прыросту за кошт павышэння прадукцыйнасці працы і дасягненне значнай эканоміі матэрыяльных затрат шляхам інтэнсіфікацыі вытворчасці. Упершыню з XII пяцігодкі гэты прырост дасягаецца цалкам за кошт павышэння прадукцыйнасці грамадскай працы. Аднак тэмпы росту Н.д. неабходна павялічваць, больш рацыянальна выкарыстоўваць яго на спажыванне і накапленне. Асабліва слаба рэалізуюцца магчымасці павелічэння Н.д. за кошт інтэнсіўных фактараў - росту прадукцыйнасці працы і эканоміі матэрыяльных рэсурсаў.

**НЕАБХОДНАЯ ПРАЦА** (Необходимый труд) -- праца, якая затрачваецца работнікамі матэрыяльнай вытворчасці на стварэнне неабходнага прадукту. Час, на

працягу якога вырабляецца неабходны прадукт, уяўляе сабой неабходны рабочы час. Неабходная праца затрачваецца на стварэнне прадукту для ўзнаўлення рабочай сілы.

*Неабходны прадукт* -- частка чыстага прадукту, якая патрабуецца для ўзнаўлення рабочай сілы, гэта значыць для падтрымання яе працаздольнасці, уключаючы і падрыхтоўку новага пакалення работнікаў. Неабходны прадукт кампенсуе расходы на харчаванне, адзенне, утрыманне жылля, на задавальненне духоўных, культурных і сацыяльных патрэб, на экалагічныя патрэбы і г.д. Вартасць неабходнага прадукту выяўляецца ў грашовай форме ў выглядзе заработнай платы, выплат, ільгот з грамадскіх фондаў спажывання, даходаў ад кааператыўнай і індывідуальнай дзейнасці, ад асабістай дапаможнай гаспадаркі. Памеры і тэмпы росту неабходнага прадукту вызначаюцца ўзроўнем і тэмпамі росту прадукцыйнасці працы, змяненнямі тэхнічнай будовы вытворчасці, эфектыўнасцю накаплення, змяненнямі структуры асабістых патрэб. Узнаўленне неабходнага прадукту не абмяжоўваецца задавальненнем бягучых патрэб работнікаў, а падпарадкоўваецца мэтам усебаковага і гарманічнага развіцця духоўных і фізічных здольнасцей працуючых і членаў іх сем'яў. Павышэнне дабрабыту народа дасягаецца як за кошт росту абсалютных памераў неабходнага прадукту, так і за кошт павелічэння прыбавачнага прадукту, які ідзе на задавальненне патрэб усяго грамадства, а значыць, і кожнага асобнага яго члена.

**НЕПРАДУКЦЫЙНЫЯ РАСХОДЫ** (Непроизводственные расходы) -- затраты і страты, выкліканыя парушэннямі і недахопамі ў гаспадарчай і вытворча-фінансавай дзейнасці аб'яднанняў, прадпрыемстваў, арганізацый. Да Н.р. дапасоўваюцца страты ад браку, анулявання заказаў або спынення будаўніцтва, прастояў абсталявання, даплаты рабочым за работу, якая выканана ў звышурочны час або з адступленнем ад нармальных умоў працы, нястачы і псавання матэрыяльных каштоўнасцей пры захоўванні, страты ад спісання з балансу недаамартызаванай часткі асноўных сродкаў і да

т.п. Страты, дапушчаныя па віне канкрэтных работнікаў, кампенсуюцца імі ў памеры сапраўднага ўрону. Н.р. уключаюцца ў склад цэхавых, агульназаводскіх расходаў і ўваходзяць у фактычны сабекошт прадукцыі, тым самым яны зніжаюць балансавы і гаспадарча-разліковы прыбытак (даход) прадпрыемства. Н.р. наносяць урон народнай гаспадарцы, іх скарачэнне, ліквідацыя - важны рэзерв зніжэння сабекошту прадукцыі, павышэння рэнтабельнасці работы аб'яднанняў, прадпрыемстваў, арганізацый. З мэтай прадухілення Н.р. аналізуюцца прычыны іх узнікнення і вызначаюцца мерапрыемствы па іх ліквідацыі, прымаюцца меры па захоўванню ўстаноўленага законам парадку, абавязковага спагнання страт з вінаватых. Узяты краінай курс на інтэнсіфікацыю вытворчасці, узмацненне вытворчай, тэхналагічнай і дагаворнай дысцыпліны прадугледжвае рэзкае скарачэнне Н.р. і страт, несумяшчальных з інтарэсамі грамадства, працоўных калектываў і кожнага работніка.

**НОВЫ СУСВЕТНЫ ЭКАНАМІЧНЫ ПАРАДАК, або НСЭП** (Новый мировой экономический порядок, или НМЭП) -- канцэпцыя краін, што сталі на шлях развіцця, па перабудове міжнародных эканамічных адносін на справядлівай і раўнапраўнай аснове. Яна прадугледжвае комплекс мер па ліквідацыі з сістэмы сусветнагаспадарчых сувязей любых форм дыктату і дыскрымінацыі; сфармулявана ў прынятых VI и VII спецыяльнымі сесіямі Генеральнай Асамблеі ААН у 1974г. Дэкларацыі і Праграме дзеянняў па ўстанаўленню НСЭП.

Асноўнымі прынцыпамі НСЭП прызнаны: суверэнітэт і раўнапраўе дзяржаў, іх тэрытарыяльная цэласнасць і неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы, права кожнай краіны выбіраць найбольш прыдатны для яе шлях развіцця, суверэнітэт дзяржавы ў галіне карыстання прыроднымі рэсурсамі і ва ўсёй эканамічнай дзейнасці; кантроль за дзейнасцю транснацыянальных карпарацый (ТНК); прадастаўленне дапамогі без якіх-небудзь палітычных ці ваенных умоў. Прынцыпы НСЭП уключаюць у сябе таксама прэферанцыйны (ільготны)

рэжым для краін, што сталі на шлях развіцця, ва ўсіх галінах міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва, перабудову валютнай сістэмы, устанаўленне справядлівых суадносін паміж цэнамі на сыравіну і на прамысловую прадукцыю, рэгуляванне сыравінных рынкаў, аблягчэнне ўмоў перадачы тэхналогіі, паскарэнне працэсу індустрыялізацыі. Станаўленне НСЭП -- важны кампанент усеабдымнай сістэмы міжнароднай бяспекі, стварэнне якой мае на мэце сцвярджэнне міру на Зямлі.

**НОРМЫ ЭКАНАМІЧНЫЯ** (Нормы экономические) -- максімальна дапушчальная велічыня абсалютнага расходу сыравіны, матэрыялаў, паліва, энергіі, затрат рабочага часу і іншых вытворчых рэсурсаў для вырабу адзінкі прадукцыі (ці выканання работы ўстаноўленай якасці пры ўмовах вытворчасці плануемага года). Н.э. павінны быць: прагрэсіўнымі - адлюстроўваць сучасны ўзровень тэхнікі, тэхналогіі і арганізацыі вытворчасці; дынамічнымі - мяняцца разам са змяненнем тэхнікі, тэхналогіі і арганізацыі вытворчасці; навукова абгрунтаванымі - распрацоўвацца на аснове тэхнічных разлікаў і аналізу вытворчасці. Н.э. як эканамічная катэгорыя характарызуюць узровень грамадскага падзелу працы, з'яўляюцца колькаснай мерай затрат жывой і арэчаўленай працы на адзінку прадукцыі, у якой ў канчатковым выніку адлюстроўваецца ўзровень развіцця вытворчасці. У гэтым -- сутнасць Н.э. як праваднікa навукова-тэхнічнага прагрэсу ў вытворчасці. Таму, з'яўляючыся асновай разліку планавых паказчыкаў, Н.э. вызначаюць прагрэсіўнасць і навуковую абгрунтаванасць народнагаспадарчых планаў. Па маштабу прымянення Н.э. падраздзяляюцца на цэхавыя, заводскія, міжзаводскія (у стасунку да аднатыпнай вытворчасці), галіновыя (рэгламентуюць затраты ўсіх прадпрыемстваў галіны народнай гаспадаркі), агульнапрамысловыя (распрацоўваюцца на пэўныя віды работ і працэсаў, якія характэрныя для прадпрыемстваў розных галін прамысловасці і якія праходзяць пры прыблізна аднолькавых умовах). Н.э. з'яўляюцца сродкам кантролю за выкарыстаннем усіх рэсурсаў, стыму-

лююць найбольш рацыянальнае выкарыстанне абсталявання, працоўных рэсурсаў, затрат матэрыяльных рэсурсаў. На іх веданні будуецца дзейнасць бухгалтарскага ўліку, планавання, аналізу, стымулявання на прадпрыемстве.

**НОУ-ХАУ** (Ноу-хау) -- сукупнасць навукова-тэхнічных, арганізацыйных, камерцыйных ведаў, не абароненых ахоўнымі дакументамі і не апублікаваных у адкрытым друку, неабходных у навуковых даследаваннях, распрацоўках, пры вырабе, рэалізацыі і эксплуатацыі канкурэнтаздольнай прадукцыі.

Формы Н.-х. разнастайныя і ўключаюць тэхнічную дакументацыю (чарцяжы, схемы, інструкцыі), узоры вырабаў, звесткі камерцыйнага характару, даныя аб арганізацыі вытворчасці, падрыхтоўцы персаналу.

Спецыфічная асаблівасць Н.-х. -- неабходнасць захавання камерцыйнай тайны.

Набыццё Н.-х. звычайна ажыццяўляецца на падставе ліцэнзійных пагадненняў, што прадугледжваюць перадачу не толькі адпаведнай дакументацыі, але і дадатковай інфармацыі, якая раскрывае веды і вопыт па выпуску прадукцыі з выкарыстаннем пэўнага вынаходніцтва (арганізацыя навучання работнікаў, удзел спецыялістаў у наладжванні вытворчасці). Н.-х. можа перадавацца таксама пры заключэнні дагавораў аб пастаўцы абсталявання, аб навукова-тэхнічным, прамысловым супрацоўніцтве.

## П

**ПАДАТАК ЗА КАРЫСТАННЕ ПРЫРОДНЫМІ РЭСУРСАМІ** (Налог за использование природных ресурсов) (эканамічны падатак). П.за к.п.р. складаецца з плацяжоў за карыстанне прыроднымі рэсурсамі і за выкіды (скіды) забруджвальных рэчываў у навакольнае асяроддзе ў межах устаноўленых лімітаў, а таксама за перарасход прыродных рэсурсаў і за выкіды (скіды) забруджвальных рэчываў у навакольнае асяроддзе звыш зацверджаных лімітаў.

Стаўкі П.за к.п.р. устанаўліваюцца Саветамі Міністраў Рэспублікі Беларусь па прадстаўленню Дзяржаўнага Камітэта па экалогіі.

Унесеныя сумы падатку за карыстанне прыроднымі рэсурсамі і выкіды забруджвальных рэчываў у межах устаноўленых лімітаў адносяцца на выдаткі вытворчасці, а за выкіды забруджвальных рэчываў звыш устаноўленых лімітаў - за кошт прыбытку, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемства.

**ПАДАТАК ЗЯМЕЛЬНЫ** (плата за зямлю) (Земельный налог). П.з. устаноўлены з мэтай забеспячэння эканамічнымі метадамі рацыянальнага выкарыстання зямель, фарміравання сродкаў для ажыццяўлення мерапрыемстваў па землеўпарадкаванню, павышэнню якасці зямель і іх ахове, а таксама сацыяльнаму развіццю тэрыторый. Зямельным падаткам абкладаюцца землі сельскагаспадарчага прызначэння, населеных пунктаў, прамысловасці, транспарту, сувязі, абароны, ляснога і воднага фондаў.

Плата за зямлю спаганяецца штогод у формах зямельнага падатку або арэнднай платы.

Плацельшчыкамі зямельнага падатку з'яўляюцца юрыдычныя і фізічныя асобы, якім зямельныя участкі прадастаўлены ў валоданне, карыстанне або ва ўласнасць.

Памер платы за зямлю залежыць ад якасці і месцазнаходжання зямельнага ўчастка. Так, напрыклад, стаўка зямельнага падатку за гектар ворнай зямлі пры кадастравай ацэнцы да 27,50 балаў складае 10 руб., а пры кадастравай ацэнцы ў 65,01 і вышэй балаў -- ужо 210 руб. Стаўка зямельнага падатку для дзеючых аб'ектаў у сельскіх населеных пунктах складае 2 руб. за гектар, а ў абласным цэнтры (акрамя г.Мінска) - 18,4 руб. і г.д.

Пры адсутнасці кадастравай ацэнкі зямлі прымяняюцца сярэднія стаўкі падатку па адміністрацыйных раёнах. Напрыклад, па Бярэзінскаму раёну Мінскай вобласці стаўка складае 32 руб. за гектар, а па Нясвіжскаму - 116 руб. і г.д.

За арандаваныя зямельныя ўчасткі плата спаганяецца ў памеры, які вызначаецца дагаворам. Пры гэтым гранічны памер арэнднай платы не павінен перавышаць ставак зямельнага падатку па адпаведных катэгорыях

зямель.

**ПАДАТАК НА ДАБАЎЛЕНУЮ ВАРТАСЦЬ** (Налог на добавленную стоимость) -- гэты новы П. устаноўлены замест П. з абароту. Аб'ектам падаткаабкладання з'яўляецца вартасць, якую прадпрыемства дабаўляе да вартасці сыравіны, матэрыялаў або тавараў пры вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, выкананні работ і аказанні паслуг. Дабаўленая вартасць, якая абкладаецца падаткам, вылічваецца з сумы, атрыманай за тавары, выкананыя работы і аказаныя паслугі за вылікам матэрыяльных трат на вытворчасць гэтай прадукцыі (работ, паслуг). У складзе матэрыяльных трат амартызацыя асноўных фондаў не ўлічваецца. Сума падатку на дабаўленую вартасць уключаецца ў адпускную цану тавараў (работ, паслуг).

Да цэн з улікам падатку на дабаўленую вартасць устанаўліваюцца размеры гандлёвых і аптова-збытавых скідак, гандлёвых надбавак, нацэнак (накідак).

Стаўка падатку на дабаўленую вартасць устаноўлена ў памеры 28%.

**ПАДАТАК НА ДАХОДЫ І ПРЫБЫТАК ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, АБ'ЯДНАННЯЎ, АРГАНІЗАЦЫЙ** (Налог с доходов и прибыли предприятий, объединений, организаций). Па гэтаму П. устанаўліваюцца два аб'екты падаткаабкладання - даходы і прыбытак.

Падаткам на даходы абкладаюцца даходы, атрыманыя прадпрыемствамі ад прыналежных ім акцый, аблігацый і іншых каштоўных папер; ад долевага ўдзелу ў сумесных прадпрыемствах; відэапаказу; масавых канцэртна-відовішчных мерапрыемстваў, здачы ў арэнду дзяржаўнай маёмасці, рэалізацыі маёмасці і замежнай валюты, правядзення латарэй і інш. Пры гэтым з выручкі, атрыманай ад указаных мерапрыемстваў, вылічваюцца матэрыяльныя затраты, звязаныя з атрыманнем гэтага даходу.

Прыбытак, які абкладаецца падаткам, вылічваецца зыходзячы з балансавага прыбытку. Апошні ўяўляе сабой суму прыбытку ад рэалізацыі прадукцыі (работ, паслуг), іншых матэрыяльных каштоўнасцей (уключаючы асноўныя фонды) і даходаў ад пазарэалізацый-

ных аперацый, зменшаных на суму расходаў на гэтых аперацыях.

Прадпрыемствы, якія не знаходзяцца на гаспадарчым разліку і атрымліваюць даходы ад гаспадарчай і камерцыйнай дзейнасці, падатак выплачваюць з сум перавышэння даходаў над расходамі, якія атрымліваюцца ад гэтай дзейнасці.

Прыбытак (даход), які абкладаецца падаткам, змяншаецца на суму вылічанага падатку на нерухомасць за асноўныя фонды.

Стаўкі падаткаў устаноўлены ў памеры ад 5 да 60% у залежнасці ад віду даходу (прыбытку).

Вылічэнне падатку на даходы і прыбытак замежных юрыдычных асоб мае некаторыя асаблівасці.

**ПАДАТАК НА НЕРУХОМАСЦЬ** (Налог на недвижимость). Плацельшчыкамі П.на н. з'яўляюцца юрыдычныя асобы, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, а таксама фізічныя асобы.

П. на н. абкладаецца вартасць асноўных вытворчых і невытворчых фондаў, аб'ектаў новага і незавершанага будаўніцтва, якія з'яўляюцца ўласнасцю юрыдычных асоб, а таксама вартасць прыналежных фізічным асобам будынкаў.

Гадавая стаўка П.на н. для юрыдычных асоб ўстанаўліваецца ў памеры 5%, для фізічных асоб - 0,1% ад вартасці аб'екта падаткаабкладання.

Больш высокія стаўкі ўстаноўлены за нанава распачатае будаўніцтва аб'ектаў вытворчага прызначэння (30% каштарыснай вартасці) і на незавершанае будаўніцтва (10% вартасці звыш нарматыўнага незавершанага будаўніцтва па стану на пачатак справаздачнага квартала).

**ПАДАТАК НА ПАЛІВА** (Налог на горючее). Аб'ектам падаткаабкладання з'яўляецца выручка ад рэалізацыі бензінаў і дызельнага паліва, сціснутага і звадкаванага газу. Пад рэалізацыяй разумеецца не толькі продаж, але і перадача ва ўласнасць, абмен, бязвыплатная перадача, выкарыстанне на ўласныя патрэбы. Стаўка падатку на паліва ўстанаўліваецца ў памеры 20% ад кошту паліва. Падатак уключаецца ў адпускную

цану бензінаў і дызельнага паліва, сціснутага і звадкаванага газу.

З сум выручкі ў замежнай валюце, атрыманай ад рэалізацыі паліва, падатак выплачваецца ў гэтай валюце.

**ПАДАТАК ТРАНЗІТНЫ** (Транзитный налог). Плацельшчыкамі транзітнага падатку з'яўляюцца юрыдычныя і фізічныя асобы -- уладальнікі і карыстальнікі транспартных сродкаў, якія пражываюць за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і выкарыстоўваюць яе тэрыторыю і паветраную прастору для транзітнага перамяшчэння транспарту, грузаў і пасажыраў.

Стаўкі падатку залежаць ад віду транспарту, яго грузапад'ёмнасці і ўмяшчальнасці, класа транспартуемых грузаў. Напрыклад, аднаразовы ўзнос пры ўездзе на тэрыторыю рэспублікі на легкавым аўтамабілі - 20 руб., на аўтобусе ўмяшчальнасцю да 25 пасажыраў - 40 руб., а умяшчальнасцю звыш 25 пасажыраў -- 90 руб. і г.д. Для замежных юрыдычных і фізічных асоб стаўкі падатку ўстаноўлены ад 10 да 40 долараў ЗША.

Пры перавозцы небяспечных грузаў памер стаўкі павялічваецца ад 100 да 400%.

Для трубаправоднага, чыгуначнага, паветранага і рачнога транспарту стаўкі падатку ўстанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь на аснове міжурадавых пагадненняў.

**ПАДАТАК ПАДАХОДНЫ З ГРАМАДЗЯН** (Подоходный налог с граждан). Гэты падатак уплачваюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства.

Грамадзяне, якія маюць пастаяннае месцажыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, падатак уплачваюць з даходаў у грашовай і натуральнай формах, атрыманых на тэрыторыі рэспублікі, а таксама і за яе межамі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

Даходы грамадзян, якія не маюць пастаяннага месцажыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, абкладаюцца падаткам, калі яны атрыманы з крыніц рэспублікі.

Выплата падаткаў з даходаў, атрыманых у замежнай валюце, праводзіцца па жаданню плацельшчыка ў руб-

лях або замежнай валюце, якую купляе Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь.

Законам аб падатку прадугледжаны даходы, якія не падлягаюць падаткаабкладанню (дапамога, аліменты, стыпендыі, пенсіі і г.д.), а таксама ільготы, па якіх асобныя катэгорыі грамадзян ад выплаты падатку вызваляюцца поўнасцю або сума падатку паніжаецца.

Плацельшчыкі падатку падраздзяляюцца на пяць катэгорый. Для кожнай катэгорыі ўстаноўлены асобны парадак падаткаабкладання і стаўкі падатку. Напрыклад, пры падаткаабкладанні сум заработкаў, якія атрымліваюць грамадзяне за выкананне імі працоўных абавязкаў, зыходзяць з месячнага даходу, а пры падаткаабкладанні даходаў ад прадпрымальніцкай дзейнасці -- гадавога.

Заработная плата (месячная) рабочых і служачых у памеры да 350 руб. падаткаабкладанню не падлягае. Максімальная стаўка падатку --50% месячнага ці гадавога даходу.

**ПАДАТАК НА ЭКСПАРТ І ІМПАРТ** (Налог на экспорт и импорт) -- адзін з новых відаў падаткаў. Яго выплачваюць арганізацыі, якія займаюцца знешнегандлёвымі аперацыямі: а) прадпрыемствы, аб'яднанні і арганізацыі, якія працуюць на аснове гаспадарчага разліку, маюць самастойны баланс і з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, сумесныя прадпрыемствы ўключна; б) арганізацыі, якія не знаходзяцца на гаспадарчым разліку, але атрымліваюць даходы ад гаспадарчай і іншай камерцыйнай дзейнасці, акрамя бюджэтных арганізацый; в) міжнародныя няўрадавыя арганізацыі (аб'яднанні), якія займаюцца гаспадарчай і іншай камерцыйнай дзейнасцю.

Праз падатак на экспарт і імпарт у даход дзяржавы забіраецца чысты даход, які ўтвараецца ў сувязі з розным узроўнем знешнегандлёвых і ўнутраных цэн на асобныя віды імпартных і экспартных тавараў, пры гэтым узровень знешнегандлёвых цэн пералічваецца ў рублі па курсу Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

Падатак на экспарт і імпарт можа быць вылічаны

двума метадамі: а) па стаўках у працэнтах да знешнегандлёвай (кантрактнай) вартасці тавараў, пералічанай у рублі, указанай уладальнікам тавараў у таможнай дэкларацыі пры перамяшчэнні іх цераз мяжу; б) у выглядзе розніцы паміж знешнегандлёвымі і ўнутранымі цэнамі на асобныя віды экспартуемых або імпартуемых тавараў за вылікам накладных выдаткаў, звязаных з рэалізацыяй знешнегандлёвага пагаднення. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь вызначае пералік такіх тавараў, пералік накладных выдаткаў, памеры і тэрміны выплаты, а таксама ільготы па падатку.

**ПАДАТКІ** (Налоги) -- абавязковыя плацяжы прадпрыемстваў, арганізацый і насельніцтва, якія бярэ дзяржава ў бюджет у вызначаных законамі памерах. Права ўстанаўліваць новыя і мяняць дзеючыя П. маюць Саветы народных дэпутатаў.

У Рэспубліцы Беларусь устанаўліваюцца наступныя агульнадзяржаўныя падаткі і зборы: а) падатак на дабаўленую вартасць; б) акцызы; в) падатак на прыбытак і даходы; г) падатак за карыстанне прыроднымі рэсурсамі (экалагічны падатак); д) падатак на нерухомасць;е) падатак на экспарт і імпарт; ж) зямельны падатак (плата за зямлю); з) падатак на паліва; і) транзітны падатак; к) падаходны падатак з грамадзян. Акрамя гэтых падаткаў законам устанаўлі ваюцца непадатковыя плацяжы -- дзяржаўная пошліна і розныя зборы.

Усе сумы падаткаў і збораў залічваюцца ў бюджэт Рэспублікі Беларусь. Размеры адлічэнняў у мясцовыя бюджэты ад агульнадзяржаўных падаткаў устанаўліваюцца штогод пры зацвярджэнні бюджэту.

Пры вызначэнні памеру П. зыходзяць з адзінкі абкладання і стаўкі П. Адзінкай абкладання па П. на прыбытак і даходы з'яўляецца рубель прыбытку ці даходу, па зямельнаму П. -- гектар зямельнага участка і г.д. Памер П. на адзінку абкладання ўяўляе сабой стаўкі П. Стаўкі могуць быць прагрэсіўныя, прапарцыянальныя і ў цвёрдай суме.

**ПАДЗЕЛ ПРАЦЫ** (Разделение труда) - адасабленне розных відаў працоўнай дзейнасці ў працэсе развіцця вытворчасці. Шляхам П.п. дасягаецца абмен дзейнасцю,

у выніку чаго работнік пэўнага віду канкрэтнай працы атрымлівае магчымасць карыстацца прадуктамі працы любой іншай канкрэтнай працы. Адрозніваюць тры віды П.п. - агульны, прыватны і адзінкавы. Агульны П.п. складваецца ў маштабе грамадскай вытворчасці па родах дзейнасці: паміж сельскай гаспадаркай і прамысловасцю, паміж матэрыяльнай і нематэрыяльнай вытворчасцю. Прыватны П.п. выяўляецца паміж рознымі галінамі і вытворчасцямі: у прамысловасці - паміж машынабудаваннем і металургіяй, у лёгкай прамысловасці - паміж прадзівам і ткацтвам і г.д. Адзінкавы П.п. існуе ў рамках (унутры) асобнага прадпрыемства (аб'яднання) паміж цэхамі, участкамі, брыгадамі, рознымі работнікамі і іх групамі. Для абазначэння спецыялізацыі вытворчасці на тэрыторыі адной краіны і паміж краінамі ўжываюць тэрміны "тэрытарыяльны і міжнародны П.п.".

Працэс П.п. і яе спецыялізацыя такі ж бясконцы, як і прагрэс тэхнікі. Чым вышэйшая ступень П.п., тым больш неабходна ўзгодненасць дзеянняў асобных звёнаў вытворчасці. Таму П.п. заканамерна дапаўняецца яе кааперацыяй як неабходным спосабам фарміравання адзінай сістэмы грамадскай вытворчасці, якая эфектыўна функцыяніруе. П.п., спосабы яго грамадскай камбінацыі, спецыялізацыі і кааперацыі характарызуюць ступень развіцця прадукцыйных сіл, з'яўляюцца пастаянна дзеючымі фактарамі павышэння эфектыўнасці вытворчасці. Паглыбленне П.п., паступовае развіццё прадметнай, тэхналагічнай і падэтальнай спецыялізацыі, дапоўненае кааперацыяй працы, узмацняюць працэс абагульнення вытворчасці.

**ПАДРАД КАЛЕКТЫЎНЫ** (Подряд коллективный) -- адна з калектыўных форм арганізацыі і стымулявання працы, далейшае развіццё і ўдасканаленне брыгаднага (унутрывытворчага) гаспадарчага разліку. Гаспадарча-планавую аснову П.к. складае заключаны паміж адміністрацыяй і падрадным калектывам дагавор, які ўяўляе сабой двухбаковае пагадненне, што ўстанаўлівае правы і абавязкі бакоў, рэгламентуе ўзаемаадносіны і вызначае іх адказнасць у выпадку не-

выканання абавязкаў. У гэтым дакуменце зафіксаваны доўгачасовыя нарматывы і паказчыкі павышэння эфектыўнасці вытворчасці, разлічаныя на пяцігодку. П.к. вызначае тэмпы росту аб'ёму вытворчасці і прадукцыйнасці працы, заданні па паляпшэнню якасці прадукцыі, зніжэнню працаёмкасці і эканоміі матэрыяльных рэсурсаў, нарматыў заработнай платы. Калектыву гарантуецца агульная сума аплаты за выкананне ўстаноўленага аб'ёму работ у абумоўлены тэрмін незалежна ад таго, якой колькасцю работнікаў ён выконваецца. Адміністрацыя прадпрыемства абавязуецца забяспечыць калектыву ўсе арганізацыйна-тэхнічныя, эканамічныя і сацыяльныя ўмовы для выканання заданняў. У дагаворы прадугледжваецца права падраднага калектыву прад'яўляць матэрыяльныя прэтэнзіі любому звяну кіравання і структурнаму падраздзяленню, якое зрывае рэалізацыю таго ці іншага пункта дагавора. Паказчыкі дагавора падраднага калектыву служаць асновай для вызначэння бягучых планавых заданняў. Калектыўны заработак размяркоўваецца паміж членамі брыгады па каэфіцыенту працоўнага ўдзелу (КПУ) з улікам індывідуальнага ўкладу кожнага працаўніка ў агульныя вынікі працы калектыву. У калектыўны фонд асноўнай зарплаты не ўключаюцца сродкі на выплату індывідуальных даплат (за работу ў начныя часы, у святочныя дні, за звышурочныя часы, за выкананне дзяржаўных абавязкаў), аплату чарговых адпачынкаў і лісткоў непрацаздольнасці.

Брыгада на П.к. сама ўстанаўлівае, калі гэта патрэбна, індывідуальныя заданні, размяркоўвае работу, прымае меры да найбольш эфектыўнага выкарыстання наяўнага абсталявання і рабочага часу, эканомнага расходавання сыравіны і матэрыялаў. У такіх умовах узмацняецца агульная зацікаўленасць у пошуках рэзерваў для паскоранага і якаснага выканання падраду, павялічваецца адказнасць кожнага члена брыгады за ўмацаванне дысцыпліны. Пры П.к., як правіла, больш парадку, арганізаванасці. Далейшым развіццём гэтай формы арганізацыі працы з'яўляецца арэндны падрад.

**ПАЗЫКОВЫ ФОНД** (Ссудный фонд) -- агульная

сума рэсурсаў крэдытавання. Рэсурсамі з'яўляюцца грашовыя, матэрыяльныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца крэдыторамі для выдачы пазык.

Пазыка -- сума сродкаў у грашовай (таварнай) форме, якую крэдытор прадастаўляе ў доўг пазычальніку на пэўную мэту з выплатай (або без яе) працэнта.

У якасці рэсурсаў могуць выступаць часова свабодныя грашовыя (таварныя) сродкі народнай гаспадаркі, насельніцтва, дзяржавы, банкаў і г.д.

Сродкі, якія часова вызваляюцца ў працэсе кругаабароту, праз пэўны час павінны прыняць форму таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, затрат або грашовую форму, таму яны могуць быць пазычаны толькі на строга пэўны тэрмін і са зваротам.

П.ф. планамерна выкарыстоўваецца для павелічэння абаротных сродкаў, ажыццяўлення бягучых, капітальных затрат, пакрыцця дзяржаўных расходаў (дэфіцыту бюджэту). Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца наступныя пазыкі: на таварна-матэрыяльныя каштоўнасці, на бягучыя вытворчыя, на капітальныя затраты, на затраты па разліках, а таксама на сукупнасць затрат. У залежнасці ад тэрмінаў крэдытавання адрозніваюць кароткатэрміновыя, сярэднетэрміновыя і доўгатэрміновыя пазыкі.

**ПАЗЫКОВЫЯ АБАРОТНЫЯ СРОДКІ** (Заемные оборотные средства) - частка абаротных сродкаў прадпрыемстваў (аб'яднанняў) і арганізацый, сфарміраваная за кошт банкаўскага крэдыту і прыцягненых сродкаў (крэдыторскай запазычанасці). Сярод П.а.с. асноўную ўдзельную вагу займаюць кароткатэрміновыя крэдыты банкаў, якія прадастаўляюцца на аплату таварна-матэрыяльных каштоўнасцей (нарматыўных, звышнарматыўных, сезонных), пакрыццё вытворчых затрат, а таксама затрат па разліках. Аб'ектам крэдытавання могуць быць ужо назапашаныя абаротныя сродкі і сродкі, якія толькі ствараюцца за кошт пазыковых сродкаў. Фарміраванне абаротных сродкаў за кошт уласных і пазыковых крыніц з'яўляецца аб'ектыўнай неабходнасцю і вынікае з асаблівасцей кругазвароту абаротных фондаў і фондаў абарачэння ў розных галінах народнай

гаспадаркі, звязана з рухомасцю гэтых фондаў. Асабліва значная доля крэдыту ў фарміраванні абаротных сродкаў гандлю, легкай, харчовай прамысловасці, нарыхтоўчых, забеспячэнча-збытавых арганізацый, у будаўніцтве і інш.

Утварэнне крэдыторскай запазычанасці (планавай і пазапланавай) з'яўляецца вынікам выканання дагаворных абавязацельстваў па выкананню работ, пастаўках таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, збыту прадукцыі, аказанню паслуг; прымянення тых ці іншых форм разлікаў з пастаўшчыкамі, бюджэтам, банкам; выканання абавязацельстваў перад работнікамі гаспадарчых органаў.

П.а.с. у адрозненне ад уласных удзельнічаюць у абароце прадпрыемстваў (аб'яднанняў), арганізацый часова - на працягу загадзя вызначанага перыяду крэдытавання або да моманту завяршэння разлікаў. На велічыню ўласных і пазыковых сродкаў, іх структуру ў галінах і на асобных прадпрыемствах уплываюць асаблівасці вытворчасці, забеспячэння і збыту, аб'ём матэрыяльных запасаў і затрат, хуткасць іх абароту, узровень і якасць перапразмеркавальных працэсаў у народнай гаспадарцы і іншыя фактары. Аптымальнае спалучэнне названых крыніц - патрабаванне поўнага гаспадарчага разліку і самафінансавання, якое садзейнічае эканомнаму выкарыстанню рэсурсаў.

**ПАСЛУГІ** (Услуги) -- вынік вытворчай дзейнасці прадпрыемства, якая існуе ў форме мэтазгоднай працоўнай дзейнасці, што задавальняе грамадскія патрэбы.

Па меры развіцця грамадства ўсё больш шырокае кола як матэрыяльных, так і духоўных патрэб задавальняецца шляхам П. Гэта тлумачыцца тым, што цэнтр цяжару ў задавальненні патрэб усё больш перамяшчаецца ў плоскасць усебаковага развіцця асобы -- павышэнне адукацыі, культурнага ўзроўню, росту кваліфікацыі, расшырэнне палітычнага кругагляду, ахова здароўя, прадаўжэнне жыцця. Прыярытэтнае значэнне мае сфера П. у вырашэнні буйных сацыяльных праблем: ліквідацыя істотнай розніцы паміж горадам і вёскай, разумовай і фізічнай працай, до-

браўпарадкаванне быту, павелічэнне і больш рацыянальнае выкарыстанне вольнага часу, фарміраванне гарманічна развітай асобы.

П. падзяляюцца на матэрыяльныя і чыстыя (нематэрыяльныя). Матэрыяльныя П. звязаны з затратамі працы па давядзенню гатовага прадукту да спажыўца і абслугоўваюць размеркаванне, абмен і спажыванне (паслугі транспарту, нарыхтовак, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, вытворчыя падгаліны бытавога абслугоўвання і інш.). Чыстыя (нематэрыяльныя) П. - такія затраты працы, якія не прымаюць прадметнай формы і не ўключаюцца ў вартасць іншых тавараў (паслугі асветы, аховы здароўя, культуры, невытворчых галін бытавога абслугоўвання насельніцтва, грамадскіх арганізацый, органаў дзяржаўнага кіравання і інш.).

**ПЛАЦЕЖАЗДОЛЬНАСЦЬ** (Платежеспособность) -- магчымасць своечасова ажыццяўляць разлікі з рабочымі і служачымі, пастаўшчыкамі, вышэйстаячай арганізацыяй, выконваць абавязкі перад фінансава-крэдытнай сістэмай. Агульныя прыкметы П. -- на- яўнасць свабодных грашовых сродкаў на рахунках у банку, адсутнасць пратэрмінаванай запазычанасці па ўсіх плацяжах, магчымасць забеспячэння бесперапыннага гаспадарчага працэсу неабходнымі рэсурсамі.

На П. прадпрыемства, якая з'яўляецца галоўнай прыкметай добрага фінансавага стану, аказвае ўплыў выкананне асноўных паказчыкаў: вырабу, паставак прадукцыі, паступлення выручкі ад рэалізацыі прадукцыі (паслуг), прыбытку, рэнтабельнасці, стану абаротных сродкаў, ад якіх у многім залежыць наяўнасць сродкаў на разліковым рахунку ў банку і своечасовае ажыццяўленне разлікаў па будучых плацяжах.

У выніку парушэнняў вытворчай і фінансавай дзейнасці, а таксама неплацежаздольнасці пакупнікоў узнікаюць фінансавыя цяжкасці, якія адмоўна адбіваюцца на рытмічнасці работы прадпрыемства, выкананні плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця адпаведнага працоўнага калектыву. За несвоечасовую выплату рахункаў пастаўшчыкам за набытыя матэрыяльныя каштоўнасці, абсталяванне, пратэрміноўку плацяжоў бюд-

жэту, пагашэнне банкаўскіх пазык прадпрыемства плаціць пені, штрафы, няўстойкі. Яны памяншаюць памер прыбытку (даходу), які застаецца непасрэдна ў распараджэнні вытворчага калектыву, тым самым зніжаюць фінансавыя магчымасці задавальнення яго вытворчых і сацыяльных патрэб.

Для павышэння П. прадпрыемства неабходна дабівацца выканання ўсіх асноўных вытворчых і фінансавых заданняў, скарачэння звышнарматыўных запасаў таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, выслабаняць сродкі, імабілізаваныя ў дэбіторскай запазычанасці, узмацняць кантроль за паступленнем сродкаў ад пакупнікоў.

**ПЛАЦЕЖНЫ БАЛАНС** (Платежный баланс) - суадносіны агульнай сумы паступленняў з-за мяжы і плацяжоў за мяжой дадзенай краіны за канкрэтны перыяд часу. Пры перавышэнні паступленняў валюты над плацяжамі (станоўчае сальда) краіна мае актыўны баланс, а ў адваротным выпадку (адмоўнае сальда) -- пасіўны.

П.б. распрацоўваецца па ўсіх краінах, групах краін, па кожнай з іх, а таксама асобна па кожнай з валют. Распрацоўваецца П.б. планавымі, фінансавымі органамі, банкамі на аснове валютных планаў (паступленняў і плацяжоў у валюце) прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый, міністэрстваў, ведамстваў, якія па роду сваёй дзейнасці ажыццяўляюць міжнародныя разлікі. У планах паказваюцца асобна паступленні (плацяжы) па гандлёвых, негандлёвых аперацыях, паслугах, крэдыты і бясплатная дапамога.

З П.б. цесна звязаны разліковы баланс. Ён адлюстроўвае суадносіны патрабаванняў і абавязацельстваў дадзенай краіны па міжнародных сувязях на канкрэтную дату незалежна ад часу іх узнікнення. Разлікі гэтага балансу, метады яго складання засноўваюцца на прынцыпах, агульных з П.б.

**ПОПЫТ І ПРАПАНАВАННЕ** (Спрос и предложение) - дзве ўзаемазвязаныя, узаемаабумоўленыя катэгорыі таварнай вытворчасці і таварнага абарачэння, важнейшыя элементы рынку. Попыт выступае на рынку як форма плацежаздольных патрэб. Ён падзяляецца на

попыт прадпрыемстваў на сродкі вытворчасці і попыт насельніцтва. Попыт заўсёды канкрэтны, валодае колькаснай і якаснай пэўнасцю. Часцей за ўсё плацежаздольны попыт меншы, чым патрэбы, можа быць аднолькавы з імі, але не бывае большы, чым патрэбы. Аб'ектам попыту заўсёды выступае тавар (або паслуга), а аб'ектам патрэб можа быць і від дзейнасці, які не мае таварнай формы.

Прапанаванне - гэта прадукты, паслугі, якія знаходзяцца на рынку або будуць дастаўлены на яго. Эканамічныя інтарэсы вытворцы заключаюцца ў тым, каб прадаць тавар і тым самым кампенсаваць затраты праз чысты даход, узнавіць вытворчасць на расшыранай аснове. Таварнае прапанаванне, з'яўляючыся носьбітам спажывецкай вартасці, задавальняе патрэбы людзей, можа мець колькаснае выражэнне.

Павелічэнне таварнага прапанавання на рынку аказвае непасрэдны ўплыў на расшырэнне попыту і змяненне яго структуры. Паніжэнне попыту на які-небудзь тавар выклікае змяншэнне яго вырабу і наадварот.

Крыніцамі таварнага прапанавання з'яўляюцца выраб тавараў народнага спажывання спецыялізаванымі і неспецыялізаванымі прадпрыемствамі дзяржаўнай і мясцовай прамысловасці, дапаможнымі гаспадаркамі, кааператывамі, імпарт, індывідуальны пашыў, тавары, скупленыя ў насельніцтва і прынятыя на камісію.

**ПРАВАВАЯ ДЗЯРЖАВА** (Правовое государство) -- форма арганізацыі палітычнай улады ў рэспубліцы, заснаваная на вяршэнстве закона. Гэта азначае, што сама дзяржава звязана тымі ж законамі, якія яна стварае; дзяржаўныя органы,службовыя асобы, калектывы, партыйныя і грамадскія арганізацыі, а таксама грамадзяне абавязаны выконваць закон. Рэальнае пануванне закона ў жыцці грамадства мае на ўвазе пашырэнне сферы яго прамога дзеяння, змяненне існуючых цяпер суадносін закона і падзаконных актаў, і перш за ўсё ведамасных, значнае звужэнне сферы дзеяння ведамасных актаў. Завяршыць стварэнне такой дзяржавы павінен працэс паслядоўнай дэмакратызацыі грамадства, які адбываецца цяпер. Фарміраванне П.дз. непазбежна

цягне за сабой рэформу заканадаўства, якое датычыцца ў першую чаргу ўласнасці, планавання, гаспадарчых, працоўных, падатковых, пенсійных і іншых адносін, выпрацоўкі механізма выяўлення інтарэсаў і волі ўсяго народа і замацавання іх у законе, змянення практыкі падрыхтоўкі і прыняцця законаў. Пераўтварэнне Вярхоўнага Савета ў пастаянна дзеючы заканадаўчы орган, падрыхтоўка ім законаў, практыка ўсенароднага абмеркавання важных пытанняў дзяржаўнага жыцця -- такія першыя канкрэтныя крокі на шляху да рэалізацыі гэтай задачы. Яе вырашэнне патрабуе таксама шырокага выкарыстання рэферэндуму, выпрацоўкі механізма падвядзення вынікаў усенароднага абмеркавання законапраектаў і іх уліку ў законе.

Узаемная адказнасць дзяржавы і асобы патрабуе эфектыўных форм кантролю і нагляду за ажыццяўленнем законаў, удасканалення дзейнасці судовай сістэмы.

Рэалізацыя мер па дэмакратызацыі судовай вытворчасці, забеспячэнню прынцыпу незалежнасці суддзяў, павышэнню адказнасці пракуратуры за ажыццяўленне яе галоўнай функцыі -- нагляд за паўсюдным і дакладным выкананнем закона і інш. -- важныя ўмовы фарміравання П.дз.

**ПРАГНАЗІРАВАННЕ ЭКАНАМІЧНАЕ** (Прогнозирование экономическое) - від дзейнасці па кіраванню, звязаны са складаннем эканамічных (сацыяльна-эканамічных) прагнозаў. Апошнія ўяўляюць сабой навукова абгрунтаваныя гіпотэзы аб будучым стане сацыяльна-эканамічных сістэм, тэндэнцыях іх развіцця, характары працэсаў, што адбываюцца ўнутры іх. Гіпотэзы ўлічваюць магчымыя альтэрнатывы.

П.э. - самастойная галіна эканамічнага аналізу, інструмент папярэдняга абгрунтавання кіраўнічых рашэнняў. У адрозненне ад планавання П.э. не абмежавана прынятымі рашэннямі, мае папярэдні, варыянтны характар і дазваляе разгледзець альтэрнатыўныя магчымасці планавага развіцця.

Асноўнымі функцыямі сацыяльна-эканамічнага прагназіравання з'яўляюцца: атрыманне інфармацыі аб з'явах і працэсах, якія не ў поўнай меры паддаюцца

планаваму ўздзеянню (дэмаграфічныя, навукова-пазнаваўчыя, гандлёва-кан'юнктурныя і інш.); устанаўленне патэнцыяльна магчымых варыянтаў развіцця сацыяльна-эканамічных сістэм і вызначэнне паказчыкаў, якія характарызуюць іх развіццё; вызначэнне вынікаў прынятых рашэнняў, якія могуць мець месца за межамі сферы дзеяння планаў і праграм (перш за ўсё маюцца на ўвазе адмоўныя ўздзеянні на сацыяльнае і прыроднае асяроддзе); апераджальны кантроль за рэалізацыяй прынятых рашэнняў на аснове прагназіравання ўзроўню іх выканання (у тым ліку ўзроўню выканання планаў для забеспячэння бесперапыннасці і пераемнасці планавання); фарміраванне нарматыўнай базы планавых разлікаў у доўгатэрміновыя планаванні; пашырэнне ведаў работнікаў сферы кіравання аб аб'екце, якім яны кіруюць (навукова-пазнавальная функцыя прагназіравання).

У залежнасці ад аб'екта прагназіравання можна вылзеліць наступныя віды сацыяльна-эканамічных прагнозаў: дэмаграфічныя, працоўных рэсурсаў і рабочай сілы, сацыяльныя (перш за ўсё патрэб асобы, сацыяльных груп і грамадства наогул), навукова-тэхнічныя, эканамічныя (тэмпаў эканамічнага росту, структуры вытворчасці, унутрыгаліновых і міжгаліновых прапорцый, аб'ёмаў капітальных укладанняў, уводу і выбыцця вытворчых фондаў, эфектыўнасці вытворчасці і якасці прадукцыі і інш.), развіцця і размяшчэння прадукцыйных сіл, знешнеэканамічныя.

**ПРАГРАМІРАВАННЕ** (Программирование) -- 1) распрацоўка праграм для вылічальных машын і прыбораў. Праграма распрацоўваецца ў адпаведнасці з алгарытмам рашэння задачы, уключаючы яе наладку і далейшае яе развіццё ў працэсе прымянення. П. заўсёды выконваецца ў пэўным канкрэтным праграмным асяроддзі, якое ўключае тып ЭВМ, мову П. і тыя ці іншыя сродкі распрацоўкі праграм; 2) навуковая дысцыпліна, якая вывучае тэорыю, метадалогію і тэхналогію састаўлення, праверкі і паляпшэння праграм для вылічальных машын і прыбораў; 3) планаванне, пошук аптымальных планаў.

**ПРАДМЕТЫ ПРАЦЫ** (Предметы труда) -- адзін з рэчыўных фактараў вытворчасці, тое, на што накіравана праца чалавека. З агульнай масы П.п. выдзяляецца сыры матэрыял - прадмет, на які ўжо патрачана праца. П.п. здабываюцца з рэчыва прыроды і ўступаюць у вытворчасць як арэчаўленая праца (прадметы, да якіх ужо прыкладзена праца чалавека). Другая спецыфічная асаблівасць П.п. заключаецца ў тым, што яны становяцца матэрыяльнай асновай гатовага прадукту, яго рэчыўным носьбітам.

Узнаўленне П.п. мае вялікае эканамічнае значэнне, вызначае важныя народнагаспадарчыя прапорцыі. Так, у сукупным грамадскім прадукце на долю кошту П.п. прыходзіцца прыкладна 50% яго вартасці. У саставе сродкаў вытворчасці на долю П.п. у прамысловасці прыходзіцца каля 80%.

У праграме інтэнсіфікацыі і павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці значная (калі не першачарговая) увага нададзена: 1) выпрабу высокаэфектыўных, новых канструкцыйных і іншых прагрэсіўных відаў сыравіны, матэрыялаў, энергіі; 2) эканоміі матэрыяльных рэсурсаў шляхам укаранення рэсурсазберагаючых і безадыходных тэхналогій, высокапрадукцыйных машын і абсталявання; 3) павышэнню гаспадарча-разліковай эфектыўнасці вытворчасці прадпрыемстваў (аб'яднанняў), прыбытковасці вытворчасці шляхам зніжэння сабекошту і перш за ўсё матэрыялаёмістасці вытворчасці.

**ПРАДМЕТЫ СПАЖЫВАННЯ** (Предметы потребления) -- частка сукупнага грамадскага прадукту, якая выкарыстоўваецца для невытворчага асабістага і калектыўнага спажывання. Спецыфічным П.с. з'яўляюцца таксама паслугі.

У аснову падзелу сукупнага грамадскага прадукту на сродкі вытворчасці і П.с. пакладзена не натуральна-рэчыўная форма прадукту, а яго прызначэнне, роля ў грамадскай вытворчасці. У залежнасці ад таго, будзе той ці іншы прадукт задавальняць асабістыя і грамадскія невытворчыя патрэбы або выкарыстоўвацца ў працэсе вытворчасці, ён можа быць прадметам спажывання або

сродкам вытворчасці. Так, напрыклад, вугаль, які выкарыстоўваецца ў працэсе вытворчасці, з'яўляецца сродкам вытворчасці, а такі ж вугаль, які выкарыстоўваецца для ацяплення або прыгатавання ежы, будзе ўжо П.с.

Размежаванне прадуктаў, якія адыгрываюць зусім розную ролю ў грамадскай гаспадарцы, мае вялікае тэарэтычнае і практычнае значэнне. Яно дазваляе навукова абгрунтавана ўстанаўліваць і падтрымліваць неабходную прапарцыянальнасць у грамадскай вытворчасці, ажыццяўляць рэалізацыю сукупнага грамадскага прадукту і забяспечваць бесперапыннасць узнаўлення, вырашаць пытанні няўхільнага росту матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных, забяспечваць усебаковае гарманічнае развіццё асобы.

**ПРАДПРЫЕМСТВА** (Предприятие) -- звяно народнай гаспадаркі, якое працуе ва ўмовах грамадскага падзелу працы і эканамічнай адасобленасці таваравытворцы, на аснове самаакупнасці і самафінансавання. У палітыка-эканамічным сэнсе -- гэта і сістэма вытворчых адносін, якія забяспечваюць эканамічную жыццядзейнасць, і індывідуальнае ўзнаўленне як зыходную аснову ўсяго грамадскага ўзнаўлення. У якасці П. могуць выступаць завод (фабрыка), вытворчае аб'яднанне, кааперацыя, асацыяцыя, акцыянернае таварыства, комплекс, індывідуальнае і сямейнае прадпрыемствы. Узнаўленчы працэс на прадпрыемстве ўключае ў сябе адносіны з дзяржавай (грамадствам), з іншымі прадпрыемствамі, з работнікамі вытворчасці, з насельніцтвам. Мажліва разглядаць П. не толькі як вытворча-тэхнічнае адзінства фактараў вытворчасці, але і як эканамічную катэгорыю, гэта значыць сістэму сацыяльна-эканамічных адносін, якія складваюцца ў грамадстве на машыннай стадыі яго развіцця і ўяўляюць сабой кааперацыю працы па стварэнню прадукту сукупным работнікам, працоўным калектывам - пярвічнай ячэйкай грамадства.

П. вылучаецца ў якасці асноўнага звяна народнагаспадарчага комплексу, бо толькі ў гэтым звяне ствараецца прадукцыя, фарміруюцца працоўныя калектывы, калектыўныя інтарэсы як сувязное звяно агульнанародных і асабістых інтарэсаў. На П. канцэнтруюцца ас-

ноўныя гаспадарчыя адносіны, адносіны размеркавання і матэрыяльнага стымулявання, таварна-грашовыя адносіны.

Эканамічнае жыццё П. рэгулюецца Законам аб прадпрыемствах. П. ва ўмовах эканамічнай рэформы паслядоўна пераходзяць на прынцыпы самафінансавання, самаакупнасці і самакіравання. Для дасягнення галоў-най мэты -- выпуску высакаякаснай прадукцыі і аказання паслуг, якія адпавядаюць запатрабаванням насельніцтва, з меншымі затратамі -- П. выконваюць разнастайныя эканамічныя, сацыяльныя і культурныя функцыі. Яны ажыццяўляюць перабудову планавання і кіравання на дэмакратычных прынцыпах, развіваюць сваю матэрыяльна- тэхнічную базу, выкарыстоўваюць заробленыя рэсурсы для задавальнення сацыяльных патрэб калектыву, удзельнічаюць у вырашэнні агульнадзяржаўных задач.

**ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ** (Производительность труда) -- плённасць, рэзультатыўнасць, эфектыўнасць вытворчай дзейнасці людзей. П.п. вымяраецца колькасцю прадукцыі (паслуг), выробленай работнікам (работнікамі) за адзінку рабочага часу, або колькасцю часу, які затрачаны на выраб адзінкі прадукцыі.

Павышэнне П.п. азначае скарачэнне грамадска неабходнага рабочага часу для вырабу дадзенага тавару. Пры гэтым меншая колькаць працы набывае здольнасць вырабіць большую колькасць спажывецкай вартасці. Адрозніваюць прадукцыйнасць індывідуальнай жывой і ўсёй (сукупнай) грамадскай працы. Для характарыстыкі эфектыўнасці затрат канкрэтнай жывой працы прымяняюць паказчыкі: індывідуальная П.п. (асобнага работніка), П.п. асобнага калектыву (брыгады, участка, цэха, прадпрыемства). Грамадская П.п. - гэта рэзультатыўнасць працы на ўзроўні народнай гаспадаркі, рэгіёнаў, рэспублікі, краіны. Эфектыўнасць выкарыстання сукупных затрат жывой і арэчаўленай працы пры вырабе матэрыяльных даброт (паслуг) адлюстроўвае паказчык прадукцыйнасці грамадскай працы, які вызначаецца як адносіны нацыянальнага даходу да сярэдняспісачнай колькасці работнікаў матэрыяльнай вы-

творчасці.

Закон росту П.п. з'яўляецца ўсеагульным эканамічным законам, які выяўляе эканомію жывой і арэчаўленай працы, гэта значыць зніжэнне затрат грамадска неабходнага рабочага часу на выраб адзінкі прадукцыі. Рост П.п. прыводзіць да змяншэння кошту адзінкі прадукцыі, да павелічэння масы прадукцыі за адзінку часу. Сутнасць закона росту П.п. заключаецца менавіта ў тым, што доля жывой працы змяншаецца, а доля мінулай працы павялічваецца, але павялічваецца так, што агульная сума працы, якая заключана ў тавары, змяншаецца. Змяншэнне агульнай колькасці працы, якая ўваходзіць у тавар, служыць істотнай прыкметай павышэння прадукцыйнасці працы пры любых грамадскіх умовах вытворчасці.

Рост П.п. забяспечваецца па двух напрамках: 1) за кошт укаранення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, удасканалення рабочай сілы і сродкаў вытворчасці, метадаў іх аптымальнага злучэння; 2) за кошт давядзення інтэнсіўнасці працы да грамадска неабходнага ўзроўню на аснове ўшчыльнення рабочага часу і ўмацавання працоўнай, вытворчай і тэхналагічнай дысцыпліны працы.

**ПРАДУКЦЫЙНАЯ ПРАЦА** (Производительный труд) -- у вузкім сэнсе слова гэта праца, якая затрачваецца ў сферы матэрыяльнай вытворчасці. У шырокім тлумачэнні П.п. характарызуецца катэгорыяй грамадска карыснай працы, якая ўяўляе сабой мэтазгодную дзейнасць людзей, што забяспечвае задавальненне грамадска неабходных і карысных патрэб у адпаведнасці з іх структурай і велічынёй. Карысная праца выяўляецца ў спажывецкай вартасці, у якасці яе прадукту. Ступень грамадскай карыснасці любой працы характарызуецца яе значнасцю для грамадства, чалавека, якая вымяраецца эфектыўнасцю канкрэтнай працы. Грамадская значнасць працы ацэньваецца перш за ўсё яе ўплывам на агульную эканомію рабочага часу, рацыянальнае выкарыстанне матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, рэальным укладам у вырашэнне задач росту матэрыяльнага і духоўнага дабрабыту народа.

У залежнасці ад адносін да вытворчасці матэрыяльных даброт грамадска карысная праца прымае прадукцыйную або непрадукцыйную форму. Праца, якая стварае нематэрыяльныя паслугі, з'яўляецца грамадска карыснай працай, хоць яна не матэрыялізуецца, не ўвасабляецца ў асобным прадукце, не стварае спажывецкія вартасці і вартасці наогул, не ўдзельнічае ў фарміраванні нацыянальнага даходу. У вузкім разуменні праца ў нематэрыяльнай сферы адносіцца да непрадукцыйнай, але грамадска карыснай працы. Зыходзячы з шырокай канцэпцыі дадзеных вытворчых адносін, грамадская праца ў сферы як матэрыяльнай, так і нематэрыяльнай вытворчасці падпарадкавана адзінай мэце -- росту дабрабыту народа, развіццю прадукцыйных сіл, таму ўсю мэтазгодную працу трэба адносіць да прадукцыйнай працы.

**ПРАДУКЦЫЙНЫЯ СІЛЫ** (Производительные силы) -- сукупнасць узаемадзейных асабістых і рэчыўных фактараў вытворчасці. У якасці асабістага фактару П.с. выступае рабочая сіла -- фізічныя і разумовыя здольнасці чалавека да працы. Рэчыўным фактарам з'яўляюцца сродкі вытворчасці - прадметы працы і сродкі працы. Рашаючай, галоўнай П.с. з'яўляюцца людзі, вытворцы матэрыяльных даброт. Яны ўяўляюць сабой адзіны актыўны, творчы элемент вытворчасці, без якога сродкі вытворчасці "мёртвыя".

П.с. з'яўляюцца паказчыкам таго, наколькі чалавек авалодаў сіламі прыроды, прыстасаваў іх для задавальнення сваіх патрэб.

Узровень П.с. вызначаецца не толькі тым, наколькі развітымі з'яўляюцца асабісты і рэчыўны фактары вытворчасці. Вялікае значэнне маюць узаемадзеянне, зладжанасць іх функцыяніравання. З гэтага пункту гледжання П.с. характарызуе тэхналогія і арганізацыя вытворчасці.

У залежнасці ад ступені, характару развіцця і выкарыстання дасягненняў навукі і тэхнікі адрозніваюць эвалюцыйныя і рэвалюцыйныя формы прагрэсу П.с. Да першых адносяцца колькасныя змены ў розных элементах П.с., якія адбываюцца ў рамках аднаго тэхна-

лагічнага спосабу вытворчасці. Рэвалюцыйныя формы прагрэсу П.с. звязаны з пераходам іх з аднаго якаснага стану ў другі і суправаджаюцца пераваротамі ў тэхналагічным спосабе вытворчасці.

Можна выдзеліць чатыры этапы прагрэсу П.с.: натуральна-тэхнічны (сродкамі працы з'яўляюцца органы цела чалавека, дапоўненыя прадметамі прыроды -- палкай, каменем і да т.п.); тэхнічны (прымяненне спецыяльна выпрабленых з металу прылад працы); навукова-тэхнічны (прымяненне ў вытворчасці навуковых ведаў і ўзнікненне буйной машыннай вытворчасці); навукова-тэхнічная рэвалюцыя (якасны скачок ва ўсіх элементах П.с. на аснове пераатварэння навукі ў непасрэдную П.с., узнікненне аўтаматызаванай вытворчасці).

Змена аднаго этапа развіцця П.с. грамадства, асабліва першапачаткова, не азначае поўнага знікнення прыкмет старога этапа і абсалютнага сцвярджэння прыкмет новага. Так, напрыклад, сучасны этап, для якога характэрна развіццё навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, звязаны з выкарыстаннем пераважна аўтаматызаванай працы. Але ў гэтых умовах працягваюць існаваць формы, уласцівыя папярэднім этапам прагрэсу П.с., -- механізаваная (на аснове машыннай тэхнікі) праца, праца ручная, некваліфікаваная.

Дасягнуты ўзровень П.с. з'яўляецца вышэйшым крытэрыем грамадскага прагрэсу.

**ПРАДУКЦЫЯ** (Продукция) - матэрыялізаваны вынік працэсаў працоўнай дзейнасці, які валодае карыснымі ўласцівасцямі і прызначаны для задавальнення грамадскіх і асабістых патрэб. Вынікі працы могуць быць арэчаўленыя (сыравіна, матэрыялы, машыны, абсталяванне, харчовыя і іншыя прадукты) і неарэчаўленыя (інфармацыя, энергія, некаторыя віды паслуг).

П. характарызуецца спажывецкай вартасцю (здольнасцю задавальняць тую ці іншую патрэбу) і вартасцю (затратамі грамадска неабходнай працы на яе выраб). У сувязі з гэтым улік і планаванне П. ажыццяўляецца ў натуральным (штукі, адзінкі масы, аб'ёму і да т.п.) і грашовым выражэнні. Для гэтых мэт выкарыстоўваецца сістэма вартасных паказчыкаў, якая ўключае аб'ёмы

рэалізаванай, таварнай (або валавой), чыстай (нарматыўнай) П. Аб'ём рэалізаванай П. - гэта кошт гатовых вырабаў і паўфабрыкатаў уласнай вытворчасці, а таксама паслуг прамысловага характару, якія аплочаны ў плануемым перыядзе. Пры разліку аб'ёму рэалізацыі ўлічваюцца астаткі П. на складзе і аб'ём адгружанай П. на пачатак і канец плануемага перыяду.

*Таварная П.* - гэта кошт выробленых у плануемым перыядзе і прызначаных для рэалізацыі гатовых вырабаў, паўфабрыкатаў і работ прамысловага характару. Зыходнымі данымі для вызначэння аб'ёму таварнай П. з'яўляюцца заданні па аб'ёму рэалізаванай П. і вырабу важнейшых відаў П. у натуральным выражэнні.

*Валавая П.* уключае ў сябе: таварную П., прырост (ці страты) астаткаў паўфабрыкатаў, спецыяльныя інструменты і прыстасаванні свайго вырабу, змяненне аб'ёму незавершанай вытворчасці.

Паказчык *чыстай П.* (нарматыўнай) вызначаецца шляхам выключэння з дзеючай аптовай цаны П. прадпрыемства кошту матэрыяльных затрат на выраб П. Нарматыў чыстай П. уключае ў сябе нарматыўную заработную плату і нарматыўны прыбытак. Памножыўшы нарматывы чыстай П. па кожнаму яе віду на іх колькасць у натуральным выражэнні, атрымаем аб'ём чыстай (нарматыўнай) П. Такі метад уліку і ацэнкі П. ліквідуе магчымасць выконваць план за кошт "выгаднай", гэта значыць матэрыялаёмістай і дарагой, прадукцыі.

У вытворчай праграме прадпрыемства вызначаюцца заданні не толькі па вырабу і рэалізацыі П. пэўнай якасці, але і яе наменклатура і асартымент (наменклатура -- узбуйнены пералік П., якая вырабляецца прадпрыемствам, а асартымент - далейшая яе дэталізацыя па відах, тыпах, сартах, фасонах, малюнках).

**ПРАМЫЯ ГАСПАДАРЧЫЯ СУВЯЗІ ПРАДПРЫЕМСТВА** (Прямые хозяйственные связи предприятий) - форма таварных адносін паміж таваравытворцамі і пакупнікамі, гэта значыць паміж прадпрыемствамі (арганізацыямі), заснаваная на заключэнні непасрэдна паміж імі гаспадарчага дагавора. П.г.с.п. устанаўліваюцца для паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнага за-

беспячэння прадпрыемстваў і характэрныя для масавай і буйнасерыйнай вытворчасці пры ўмове ўстойлівага спажывання прадукцыі. Пры П.г.с.п. пастаўшчык і спажывец самі вызначаюць наменклатуру, віды, якасць пастаўляемай прадукцыі, тэрміны пастаўкі, матэрыяльную адказнасць за зрыў паставак і ўзнагароджанне за выкананне іх умоў. Гэтыя сувязі дазваляюць рэгуляваць перыядычнасць паставак, скарачаюць затраты часу на ўзгадненне ўмоў паставак, асартыменту, дадатковых тэхнічных патрабаванняў. Спажыўцы могуць стымуляваць у вытворцаў выпуск высакаякаснай і тэхнічна дасканалай прадукцыі, а вытворцы, зацікаўленыя ў збыце прадукцыі, - аказваць розныя паслугі і дапамогу спажыўцам. П.г.с.п. забяспечваюць увязку графіка вырабу прадукцыі па часу, рытмічнасць працы, надзейнасць у забеспячэнні, дазваляюць спалучаць цэнтралізаванае планавае кіраванне з гаспадарчай самастойнасцю прадпрыемстваў; садзейнічаюць развіццю поўнага гаспадарчага разліку і самафінансавання; умацоўваюць узаемную матэрыяльную адказнасць пастаўшчыка і спажыўца за вынікі вытворчасці.

Нягледзячы на ўказаныя перавагі, для многіх прадпрыемстваў П.г.с.п. непрыдатныя. Не заўсёды, напрыклад, можна своечасова і поўна ўлічыць колькасныя, наменклатурныя і асартыментныя змяненні запатрабаванняў асобных прадпрыемстваў, збалансаваць планы вытворчасці і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. У такіх выпадках больш эфектыўным можа быць забеспячэнне на аснове аптовага гандлю.

З развіццём вытворчых адносін паміж прадпрыемствамі народнай гаспадаркі значную ролю набываюць кааператыўныя пастаўкі матэрыяльна-тэхнічных сродкаў.

**ПРАПОРЦЫІ ГРАМАДСКАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Пропорции общественного производства) - суадносіны паміж элементамі, часткамі, падраздзяленнямі грамадскай вытворчасці, галінамі народнай гаспадаркі, раёнамі краіны; складваюцца пад уздзеяннем аб'ектыўных эканамічных умоў.

П.г.в. падзяляюцца на: а) агульнаэканамічныя (суадносіны сукупнага грамадскага прадукту і нацыяналь-

нага даходу, неабходнага і прыбавачнага прадукту, паміж I і II падраздзяленнямі грамадскай вытворчасці, спажываннем і накапленнем і г.д.); б) міжгаліновыя (суадносіны паміж прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, здабываючай і перапрацоўчай прамысловасцю); в) вытворчыя (паміж спалучанымі галінамі вытворчасці: здабычай і перапрацоўкай руды, паміж узаемазаменнымі відамі прадукцыі); г) тэрытарыяльныя (развіццё народнай гаспадаркі саюзных і аўтаномных рэспублік, эканамічных раёнаў); д) міждзяржаўныя (паміж народнай гаспадаркай розных краін і асобнымі галінамі вытворчасці гэтых краін).

Па форме выражэння П.г.в. могуць быць натуральна-рэчыўныя і вартасныя (грашовыя). Неабходна падтрымліваць прапорцыі паміж плацежаздольным попытам і прапанаваннем тавараў, паміж колькасцю грошай у абарачэнні і таварнай масай, увязваць натуральна-рэчыўныя і вартасныя прапорцыі руху грамадскай працы і прадукту.

**ПРАЦА** (Труд) -- мэтазгодная дзейнасць чалавека па стварэнню матэрыяльных і духоўных даброт, неабходных для задавальнення патрэб кожнага індывідуума і грамадства наогул. П. -- асноўная крыніца і першая ўмова ўсяго чалавечага жыцця.

У вытворчасці П. выступае ў выглядзе працэсу П. Да простых момантаў працэсу П. адносяцца мэтазгодная дзейнасць (сама П.), прадметы працы і сродкі працы. У працэсе П. жывая П. чалавека пры дапамозе сродкаў працы змяняе прадметы працы, арэчаўліваецца ў матэрыяле. Усе тры моманты працэсу - матэрыял, прылада, праца -- зліваюцца ў выніку, гэта значыць у прадукце П. Ва ўмовах таварнай вытворчасці П. набывае дваісты характар: выступае як канкрэтная П. і абстрактная П. Канкрэтная П. уяўляе сабой П. у асаблівай, мэтазгоднай форме як творца спажывецкіх вартасцей. Абстрактная П. "ачышчаецца" ад якасных асаблівасцей ў працоўнай дзейнасці і выступае як затраты П. наогул, субстанцыя вартасці тавару.

У структуры грамадскай П. выдзяляюцца змест П. і сацыяльна-эканамічны характар П. *Змест* П. раскры-

вае ўзаемадзеянне чалавека з прыродай, уяўляе сабой сукупнасць якасна пэўных працоўных функцый, накіраваных на выраб спажывецкіх вартасцей, характарызуе канкрэтныя віды дзейнасці чалавека ў працэсе вытворчасці. У змесце П. выдзяляюць простую і складаную П. Простая П. - П., якая не патрабуе ад работніка спецыяльнай падрыхтоўкі, некваліфікаваная П. Складаная П. - П. работніка, які мае кваліфікацыю, гэта значыць кваліфікаваная П. У працэсе вытворчасці складаная П. стварае ў адзінку часу большую вартасць, чым простая П.

*Характар П.* выяўляе сацыяльна-эканамічную грамадскую форму П., або грамадскае ўпарадкаванне П., і ўяўляе сабой сукупнасць адносін паміж удзельнікамі П., яе найбольш адметныя рысы, уласцівыя таму ці іншаму спосабу вытворчасці. Палітыка-эканамічнай катэгорыяй з'яўляецца не П., а толькі яе грамадская форма, грамадскае ўпарадкаванне П., гэта значыць адносіны паміж людзьмі па іх удзелу у грамадскай П.

Для забеспячэння пэўных вытворчых мэт патрэбна адпаведная арганізацыя П. *Арганізацыя П.* на ўзроўні народнай гаспадаркі забяспечвае планамернае прыцягненне людзей да працы, эфектыўны падзел і кааперацыю П. у грамадстве, прадвызначае размеркаванне грамадскага прадукту ў залежнасці ад колькасці і якасці П., выклікае неабходнасць забеспячэння планамернага ўзнаўлення рабочай сілы, адпаведнай падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў, павышэння іх кваліфікацыі. На ўзроўні прадпрыемства навуковая арганізацыя П. дазваляе на аснове выкарыстання дасягненняў навукі і тэхнікі найлепшым чынам злучыць тэхніку і людзей у адзіным вытворчым працэсе дзеля забеспячэння высокіх паказчыкаў у прадукцыйнасці П., дабратворных яе ўмоў. Арганізацыя П. у калектыве мае на ўвазе эфектыўны падзел і кааперацыю П., арганізацыю і абслугоўванне рабочых месц, распаўсюджванне перадавых прыёмаў і метадаў П., павышэнне кваліфікацыі кадраў, паляпшэнне ўмоў П., нарміраванне П., высокую працоўную дысцыпліну. Дынаміка навукова-тэхнічнага прагрэсу і арганізацыя вытворчасці патрабуюць удаска-

налення форм арганізацыі П., укараненне калектыўных, брыгадных, гаспадарча-разліковых падрадных і арэндных форм арганізацыі і аплаты П.

**ПРАЦАЁМКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ** (Трудоемкость продукции) -- колькасць рабочага часу, затрачанага на выраб адзінкі прадукцыі ці на выкананне адзінкі аб'ёму работ. У залежнасці ад форм уліку затрат працы адрозніваюць нарматыўную, планавую і фактычную П.п. Нарматыўная П.п. вызначаецца затратамі рабочага часу на адзінку вырабу, устаноўленымі дзеючымі нарматывамі часу. Фактычная П.п. характарызуецца дзеючымі затратамі рабочага часу на адзінку вырабу ў пэўны перыяд. Як паказчык, адваротны выпрацоўцы, П.п. вызначае ўзровень прадукцыйнасці працы. Калі, напрыклад, у ліцейным цэху выпрабляецца 1000 т прадукцыі і на яе выраб траціцца 500 чал.-гадз., то П.п. будзе раўняцца 0,5 чал.-гадз. (500:100), а выпрацоўка - 2 т-гадз. (1000:500). З гэтага прыкладу відаць, што чым ніжэйшая П.п., тым большая выпрацоўка, вышэйшая прадукцыйнасць працы. Для павелічэння прадукцыйнасці працы рашаючае значэнне мае выяўленне і скарыстанне рэзерваў зніжэння П.п., якія маюцца на кожным рабочым месцы. Важнейшыя напрамкі зніжэння П.п.: удасканаленне канструкцыі вырабаў, укараненне працазберагаючай тэхнікі, тэхналогіі, навуковай арганізацыі працы і вытворчасці, прымяненне прагрэсіўных норм і нарматываў, хуткасных рэжымаў работы абсталявання, павышэнне кваліфікацыі кадраў, распаўсюджанне перадавога вопыту і г.д.

Як сумарная працаёмкасць працэсаў вырабу прадукцыі па затратах працы сярод розных катэгорый работнікаў П.п. можа падзяляцца на поўную (улічвае затраты працы ўсіх катэгорый прамыслова-вытворчага персаналу), тэхналагічную (толькі асноўных вытворчых рабочых) і вытворчую (асноўных і дапаможных рабочых).

**ПРАЦЭНТЫ ЗА КРЭДЫТ** (Проценты за кредит) - плата пазычальніка крэдытору за карыстанне пазычанымі грашыма ці матэрыяльнымі каштоўнасцямі.

Асновай П.за к. як эканамічнай катэгорыі з'яўля-

юцца крэдытныя адносіны паміж крэдыторам і пазычальнікам. Суб'ектамі такіх адносін могуць выступаць банкі, прадпрыемствы, насельніцтва, дзяржава. Па-за крэдытам няма П.за к., ён засноўваецца толькі на руху пазыковага фонду.

Узровень працэнтных ставак вызначаецца велічынёй, характарам, тэрмінам пазыкі, асаблівасцямі вытворчасці пазычальніка і да т.п. Крыніца выплаты -- чысты даход (прыбытак) прадпрыемстваў, арганізацый, даходы насельніцтва, накапленні дзяржавы.

П.за к. абумоўлены гаспадарча-разліковымі інтарэсамі крэдытора і пазычальніка. Выкарыстоўваюцца ў якасці стымулятара развіцця гаспадарчага разліку, больш рацыянальнага расходавання (захавання) пазыковага фонду. П.за к. як размеркавальная катэгорыя з'яўляюцца прамым вылікам з прыбытку прадпрыемства-пазычальніка. Адсюль імкненне апошняга да эканоміі на крэдыце за кошт яго рацыянальнага выкарыстання і да атрымання больш таннага крэдыту. Гаспадарча-разліковае прызначэнне П.за к. характэрна і для крэдытора. За кошт сум П.за к. крэдытор кампенсуе свае расходы, атрымлівае прыбытак і не толькі захоўвае пазыковы фонд, але і павялічвае яго.

Размеркавальная функцыя П.за к. звязана з размеркаваннем не ўсёй вартасці, а толькі той яе часткі, якая выражае нанава створаную вартасць. Размеркаванне шляхам П.за к. носіць не галіновы, а агульна-гаспадарчы характар. На народнагаспадарчым узроўні выплаты пазыковага П.за к. звязаны з размеркаваннем нацыянальнага даходу.

**ПРОСТАЯ ТАВАРНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ** (Простое товарное производство) - індывідуальная дробная вытворчасць самастойных, адасобленых адзін ад аднаго вытворцаў, заснаваная на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і асабістай працы таваравытворцаў і членаў іх сем'яў. Тыповыя прадстаўнікі П.т.в. - сяляне і рамеснікі.

Матэрыяльнай ўмовай узнікнення П.т.в. з'яўляецца грамадскі падзел працы, а непасрэднай прычынай -- эканамічнае адасабленне вытворцаў адзін ад аднаго з

прычыны прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці.

Маштабы развіцця і сацыяльна-эканамічная прырода П.т.в. вызначаюцца існуючым спосабам вытворчасці, а гэта азначае, што ў розных фармацыях яны розныя. У П.т.в. адсутнічае эксплуатацыя чужой працы, мэтай развіцця вытворчасці з'яўляецца задавальненне патрэб таваравытворцы і членаў яго сям'і. Дробны таваравытворца непасрэдна звязаны са сродкамі вытворчасці і з'яўляецца ўласнікам прадуктаў сваёй працы. Ён мае дваістую прыроду. З аднаго боку, дробны таваравытворца - працаўнік, які вырабляе сродкі існавання, што набліжае яго да наёмных рабочых. З другога боку, ён - прыватны ўласнік сродкаў вытворчасці і гатовага прадукту і імкнецца выгадаць за кошт іншых, што набліжае яго да буржуазіі. П.т.в., заснаваная на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці, развіваецца анархічна, стыхійна, што нярэдка прыводзіць да масавага разарэння дробных таваравытворцаў.

**ПРОЦІЗАТРАТНЫ ГАСПАДАРЧЫ МЕХАНІЗМ** (Противозатратный хозяйственный механизм) - сістэма гаспадарання, якая арыентуе прадпрыемствы і арганізацыі на найлепшае задавальненне грамадскіх патрэб пры мінімальных затратах жывой і арэчаўленай працы, атрыманне максімальных канчатковых вынікаў на аснове рацыянальнага выкарыстання ўсіх вытворчых рэсурсаў. Асновай П.г.м. з'яўляецца поўны гаспадарчы разлік, які прадугледжвае абавязковае сувымярэнне вынікаў вытворчасці з затратамі, стымуляванне іх усямернай эканоміі. У сістэме планавых паказчыкаў цэнтральнае месца павінны займаць тыя, паляпшэнне якіх абумоўліваецца эканоміяй матэрыяльных і працоўных затрат. Да ліку іх, напрыклад, адносяцца чыстая прадукцыя, прыбытак, даход. У фарміраванні П.г.м. важная роля належыць эканамічным і тэхніка-эканамічным нарматывам, якія рэгламентуюць затраты працы і вызначаюць грамадскія патрабаванні да эфектыўнасці вытворчасці.

Наданне гаспадарчаму механізму процізатратнага характару шмат у чым залежыць ад сістэмы цэнаўтварэння: у аснове цаны павінны быць не індывідуальныя,

а грамадска неабходныя затраты працы. У сістэме П.г.м. цэны закліканы стымуляваць павышэнне якасці вырабаў пры зніжэнні затрат вытворчасці і абарачэння. У фарміраванні П.г.м. узрастае роля эканамічнага спаборніцтва за найбольш поўнае задавальненне попыту спажыўцоў з найменшымі затратамі. Адной з перадумоў П.г.м. з'яўляецца такая сістэма аплаты працы, якая б забяспечвала строгую залежнасць фонду аплаты працы і заработак кожнага работніка ад вынікаў працы і выключала магчымасць атрымання незаробленых сродкаў.

**ПРЫБАВАЧНАЯ ПРАЦА** (Прибавочный труд) - праца, якая затрачваецца працаўніком сферы матэрыяльнай вытворчасці звыш неабходнай працы, што стварае неабходны прадукт. Магчымасць узнікнення П.п., а значыць, і прыбавачнага прадукту, вызначаецца ростам прадукцыйнасці грамадскай працы. Толькі на вядомым этапе развіцця чалавецтва ствараюцца ўмовы для вытворчасці лішку прадукту над той яго колькасцю, якая неабходна для існавання самога працаўніка і яго сям'і. З'яўленне П.п., якая стварае прыбавачны прадукт, стала асновай усякага грамадскага прагрэсу і яго супярэчлівага развіцця. Працягласць часу П.п. прама прапарцыянальна тэмпам узрастання асабістых патрэб членаў грамадства і адваротна прапарцыянальна прадукцыйнасці працы. Наша грамадства зацікаўлена ў росце нормы П.п., якая выражаецца адносінамі прыбавачнай працы да неабходнай працы (у працэнтах). З яе павышэннем узрастае прыбавачны прадукт і расшыраюцца магчымасці грамадства ў рэалізацыі яго гуманных ідэалаў, дасягненні сапраўднай свабоды для ўсіх членаў грамадства.

**ПРЫБЫТАК** (Прибыль) - адна з форм чыстага даходу грамадства. Гэта - частка вартасці прыбавачнага прадукту, якая ўключае частку вартасці і неабходнага прадукту (прэміі з П.). У колькасным выражэнні П. вызначаецца як розніца паміж выручкай ад рэалізацыі прадукцыі (у аптовых цэнах прадпрыемства) і затратамі на яе выраб і рэалізацыю (поўным сабекоштам). П. з'яўляецца адным з асноўных, абагульняючых гаспа-

дарча-разліковых паказчыкаў вынікаў работы прадпрыемства.

У адрозненне ад іншых форм грашовых накапленняў (падатак з абароту, адлічэнні на сацыяльнае страхаванне) П. найбольш поўна характарызуе гаспадарча-разліковую эфектыўнасць вытворчасці. У се колькасныя і якасныя бакі фінансава-гаспадарчай дзейнасці выяўляюцца ў велічыні атрыманага П. У ацэнцы работы прадпрыемства ў сучасных умовах гаспадарання прымяняецца паказчык П. ад рэалізацыі прадукцыі, выкананых работ і аказаных паслуг. Найбольшую долю ў агульнай суме П. (звыш 90%) складае П. ад рэалізацыі асноўнай прадукцыі.

Агульная сума П. уключае ў сябе таксама П. ад іншай дзейнасці прадпрыемства (дапаможная сельская гаспадарка, паслугі, якія аказваюцца пабочна, уключаючы работы па капітальнаму будаўніцтву і капітальнаму рамонту).

Разліковы П. уяўляе сабой агульную суму П. за вылікам платы за фонды і працэнтаў за карыстанне банкаўскімі пазыкамі.

У працэсе размеркавання П. частка яго па ўстаноўленых нарматывах накіроўваецца ў дзяржаўны бюджэт і бюджэт вышэйстаячай арганізацыі. П. (гаспадарча-разліковы), які застаецца ў распараджэнні прадпрыемства, выкарыстоўваецца для ўтварэння фондаў эканамічнага стымулявання (фонду развіцця вытворчасці, навукі і тэхнікі, матэрыяльнага заахвочвання і сацыяльнага развіцця).

**ПРЫЛАДЫ ПРАЦЫ** (Орудия труда) -- механічныя сродкі працы: машыны, станкі, абсталяванне, інструменты і г.д. П.п. з'яўляюцца галоўным элементам сродкаў працы і паказчыкам тэхнічнага прагрэсу, характарызуюць магчымасці, якія мае грамадства ў галіне вытворчасці матэрыяльных даброт.

Ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі П.п. карэнна мяняюцца. На змену сістэме машын, якая складаецца з трох звёнаў - рабочай машыны, рухавіка, перадатачнага ўстройства, прыходзіць чатырохзвённая сістэма, дзе чацвертым элементам з'яўляецца кіруючае

ўстройства. З'яўленне чацвертага звяна азначае пераход да тэхнікі, якая ўвасабляе функцыі не толькі фізічнай, але і разумовай працы. Машына замяняе чалавека ў аперацыях па кантролю, рэгуляванню і кіраванню вытворчымі працэсамі.

Пераўтварэнням у П.п. надаецца важная роля ў паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу, абнаўленні матэрыяльна-тэхнічнай базы грамадства. На аснове комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці, шырокага прымянення робататэхнікі, ротарных і ротарна-канвеерных ліній, гібкіх аўтаматызаваных вытворчасцей трэба будзе дабіцца высокай прадукцыйнасці працы, карэнным чынам пераўтварыць рабочыя месцы, зрабіць працу рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі творчай, прывабнай.

**ПРЫРОДНЫЯ БАГАЦЦІ** (Природные богатства) -- сукупнасць натуральных матэрыяльных рэсурсаў, важнейшых кампанентаў навакольнага асяроддзя, якія складаюць неабходныя прыродныя ўмовы існавання чалавечага грамадства і выкарыстоўваюцца ў працэсе вытворчасці і для задавальнення патрэб людзей.

П.б. з'яўляюцца ўсеагульнымі сродкамі вытворчасці, неабходнай умовай эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу. Да іх адносяцца: зямля, водныя і мінеральныя рэсурсы, расліны і жывёльны свет, усе натуральныя крыніцы энергіі (сонца, вецер, прылівы і адлівы, унутрызямное цяпло і інш.). П.б. падзяляюцца на ўзнаўляльныя і неўзнаўляльныя. Яны не толькі адкрываюць шырокія магчымасці для развіцця грамадства, але і ствараюць умовы для эканамічнага росту.

Далейшае развіццё чалавечай цывілізацыі і рост маштабаў грамадскай вытворчасці ў сучасных умовах усё больш сутыкаюцца з праблемамі сыравіны і энергіі. Вырашэнне гэтай праблемы толькі за кошт пашырэння выкарыстання неўзнаўляльных мінеральных рэсурсаў немагчыма. Неабходны сумесныя пошукі шляхоў выкарыстання іншых крыніц энергіі, укараненне безадыходных тэхналогій.

Хуткае развіццё вытворчасці і інтэнсіўнае ўмяшанне ў прыродныя сістэмы вядзе да катастрафічнага забруд-

жвання навакольнага асяроддзя, збядненне расліннага і жывёльнага свету, да нарастання экалагічнага крызісу. Перад усім чалавецтвам востра стаіць задача рацыянальнага выкарыстання П.б., забеспячэння экалагічнай абароны нашай планеты ў інтарэсах далейшага сацыяльна-эканамічнага прагрэсу і захавання жыцця на Зямлі.

## Р

**РАБОЧАЕ МЕСЦА** ( Рабочее место) -- прасторавая зона, аснашчаная неабходнымі сродкамі, у якой адбываецца працоўная дзейнасць работніка ці групы работнікаў, што сумесна выконваюць вытворчыя заданні. Р.м. з'яўляецца часткай вытворча-тэхналагічнай структуры прадпрыемства (арганізацыі) і прызначана для выканання часткі тэхналагічнага (вытворчага) працэсу.

На Р.м. адбываецца злучэнне элементаў вытворчага працэсу - сродкаў працы, прадметаў працы і самой працы, дасягаецца галоўная мэта працы - якасны, эканамічны і своечасовы выраб прадукцыі ці выкананне ўстаноўленага аб'ёму работы. У залежнасці ад асаблівасцей тэхналагічнага працэсу, характару працоўных функцый, форм арганізацыі працы вядзецца класіфікацыя Р.м. Па ўзроўню механізацыі Р.м. падзяляюцца на аўтаматызаваныя, механізаваныя і ручныя; па падзелу працы -- індывідуальныя і калектыўныя (брыгадныя); па спецыялізацыі -- універсальныя, спецыялізаваныя і спецыяльныя; па колькасці абслугоўваемага абсталявання -- аднастаночныя і многастаночныя; па ступені рухомасці -- стацыянарныя і перасоўныя; па катэгорыях працуючых -- Р.м. асноўных, дапаможных, абслугоўваючых рабочых, спецыялістаў, служачых, кіраўнічага персаналу.

Для павышэння эфектыўнасці вытворчасці, якасці прадукцыі, рацыянальнага выкарыстання асноўных фондаў і працоўных рэзерваў не радзей двух разоў за пяцігодку праводзіцца атэстацыя і рацыяналізацыя Р.м.

**РАЗМЕРКАВАННЕ** (Распределение) - неабходная стадыя працэсу ўзнаўлення грамадскага прадукту, адзін з бакоў вытворчых адносін. Грамадскі прадукт у сваім руху ад вытворчасці да спажывання праходзіць стадыі Р. і абмену, якія апасродкуюць сувязь паміж імі, ства-

раюць своеасаблівы механізм іх узаемадзеяння і вырашэння супярэчнасцей, што ўзнікаюць пры гэтым. На гэтым шляху і складваюцца тыя адносіны людзей, якія мы называем эканамічнымі. Р. заўсёды іх выражае, ахопліваючы ўвесь сукупны грамадскі прадукт. У гэтым яно часткова само ўваходзіць у вытворчасць у выглядзе Р. сродкаў вытворчасці і адпаведна членаў грамадства па сферах і галінах вытворчасці, прадпрыемствах, эканамічных рэгіёнах. У той жа час Р. выступае як самастойная функцыя і стадыя ўзнаўлення, на якой вызначаецца доля розных класаў, сацыяльных груп і індывідуумаў у нанава створаным прадукце. Праз механізм Р. галоўным чынам і рэалізуюцца іх жыццёвыя інтарэсы. І тут павінны вырашацца праблемы, што дзяліць і як дзяліць. Характар і прынцыпы іх вырашэння пры Р. сукупнага грамадскага прадукту, створанага агульнай працай, а таксама формы Р. знаходзяцца ў вызначальнай залежнасці ад уласнасці на сродкі вытворчасці.

Тая частка грамадскага прадукту, якая прызначана для асабістага спажывання, размяркоўваецца ў грамадстве і ідзе ў індывідуальнае і калектыўнае спажыванне. Для павышэння эфектыўнасці Р. патрэбна ўстойлівае забеспячэнне збалансаванасці паміж грашовымі даходамі насельніцтва і іх пакрыццём таварамі і паслугамі. Не менш важным з'яўляецца выкарчоўванне сацыяльна-эканамічных прычын атрымання непрацоўных даходаў і любых іншых з'яў сацыяльнага паразітызму. Адным словам, дзеянне закону Р. па працы не ажыццяўляецца аўтаматычна. Яго рэалізацыя звязана з удасканаленнем кіравання ўсёй народнай гаспадаркай, з дзейснай сістэмай уліку і кантролю грамадства над мерай працы і мерай узнагароджання.

**РАЗМЯШЧЭННЕ ПРАДУКЦЫЙНЫХ СІЛ** (Размещение производительных сил) - планамернае размеркаванне сродкаў вытворчасці і работнікаў у адпаведнасці з прыроднымі, сацыяльнымі і эканамічнымі ўмовамі раёнаў, асаблівасцямі тэрытарыяльнага падзелу працы.

Прынцыпы Р.п.с.: улік узроўню развіцця навукі і

тэхнікі, комплекснае развіццё народнай гаспадаркі розных раёнаў, набліжэнне прадпрыемстваў да крыніц сыравіны і раёнаў спажывання прадукцыі, рацыянальны падзел працы паміж эканамічнымі раёнамі. Стварэнне і развіццё буйных тэрытарыяльна-вытворчых комплексаў -- асаблівасць сучаснага этапу развіцця эканомікі.

На Р.п.с. вялікі ўплыў аказваюць навукова-тэхнічны прагрэс, асваенне новых раёнаў. Сучасны этап эканамічнага развіцця вызначыў прагрэсіўныя зрухі ў Р.п.с., якія больш поўна ўлічваюць тэрытарыяльныя асаблівасці вытворчасці, неабходнасць прыбліжэння энергаёмкіх вытворчасцей да паліўна-энергетычных баз. Плануецца шырэй выкарыстоўваць магчымасці для развіцця малых і сярэдніх гарадоў і рабочых пасёлкаў для размяшчэння невялікіх спецыялізаваных прадпрыемстваў, філіялаў, асобных цэхаў дзеючых прадпрыемстваў па абслугоўванню сельскай гаспадаркі, перапрацоўцы яе прадукцыі і вырабу прадукцыі з мясцовай сыравіны.

**РЫНАК КАШТОУНЫХ ПАПЕР** (Рынок ценных бумаг) - рынак акцый, аблігацый і іншых каштоўных папер, якія з'яўляюцца прадметам куплі-продажу па цэнах (курсах), што рэгіструюцца на фондавай біржы. Курсы каштоўных папер схільны мяняцца пад уплывам попыту і прапанавання, змяненняў дывідэнду і нормы працэнту.

Каштоўныя паперы ўяўляюць сабой сродак размеркавання і пераразмеркавання фінансавых рэсурсаў паміж вытворча-гаспадарчымі адзінкамі і ў маштабах усёй эканомікі, стымулявання развіцця таварна-грашовых адносін. У СССР у 20-я гады існавалі дзяржаўныя акцыянерныя таварыствы і фондавыя біржы, шматлікія акцыянерныя таварыствы за мяжой, унутраныя аблігацыйныя пазыкі. Сёння прызнана неабходным выкарыстоўваць каштоўныя паперы для вырашэння надзённых эканамічных праблем.

Эмісія каштоўных папер паставіла пытанне аб іх другасным абароце, гэта значыць аб куплі-продажы. У большасці выпадкаў гэтыя функцыі выконваюць фондавыя біржы, могуць і банкі. Апошнія за камісійнае

ўзнагароджанне абслугоўваюць прадаўцоў і пакупнікоў, захоўваюць каштоўныя паперы, выплачваюць працэнты і дывідэнды. Каштоўныя паперы могуць эфектыўна выконваць свае функцыі толькі ў выпадку існавання адзінага рынку, які валодае ўсёй інфармацыяй аб попыце і прапанаванні на канкрэтны від аблігацый, акцый.

Традыцыйна Р.к.п. існуе ў выглядзе фондавай біржы. У сувязі са значным выпускам каштоўных папер створана такая біржа і ў Рэспубліцы Беларусь. Існуюць таксама валютныя аукцыёны, якія дазваляюць прадпрыемствам свабодна прадаваць належачую ім замежную валюту. Пакупнікамі з'яўляюцца тыя прадпрыемствы, якім неабходна стварыць у сябе валютны фонд ці павялічыць яго, прадаўцамі -- прадпрыемствы, якім па тых ці іншых прычынах патрэбны дадатковыя сродкі ў рублях.

**РЭАЛІЗАЦЫЯ ГРАМАДСКАГА ПРАДУКТУ** (Реализация общественного продукта) -- сістэма мер па абмену грамадскага прадукту паміж двума падраздзяленнямі грамадскай вытворчасці, галінамі, рэгіёнамі і прадпрыемствамі, якая забяспечвае працэс расшыранага ўзнаўлення. Сутнасць Р.г.п.-- забяспечыць у кожны дадзены перыяд (напрыклад, за год) кампенсаванне (замяшчэнне выкарыстаных новымі) кожнай састаўной часткі прадукту па вартасці і па натуральнай форме.

Уся грамадская вытворчасць (і грамадскі прадукт) складаецца з двух падраздзяленняў: I -- выраб сродкаў вытворчасці і II -- выраб прадметаў спажывання. Па натуральна-рэчыўнаму саставу грамадскі прадукт складаецца са сродкаў вытворчасці і прадметаў спажывання, а па вартасці -- з вартасці спажытых сродкаў вытворчасці (C), вартасці неабходнага прадукту (Q) і вартасці прыбавачнага прадукту (m).

Створаныя сродкі вытворчасці выкарыстоўваюцца для кампенсавання C у I і II падраздзяленнях, а вырабляюцца яны толькі ў I падраздзяленні, а неабходны яны для ўзнаўлення рабочай сілы і ў I, і ў II падраздзяленнях. У сувязі з гэтым Р.г.п. адбываецца двума патокамі: 1) унутры падраздзяленняў -- паміж галінамі, рэгіёнамі і

прадпрыемствамі па абмену сродкамі вытворчасці (сыравінай, матэрыяламі, машынамі) для замяшчэння выкарыстаных, зношаных, а таксама прадметамі спажывання праз рынак для работнікаў II падраздзялення; 2) паміж падраздзяленнямі, паколькі II падраздзяленню патрэбны сродкі вытворчасці, I -- прадметы спажывання. Вызначаны ўмовы (прапорцыі) Р.г.п. Адна з зыходных умоў расшыранага ўзнаўлення: нанава створаная вартасць (V+m) I падраздзялення павінна быць большай, чым спажытыя сродкі вытворчасці II падраздзялення: I (V+m) >II C.

Р.г.п. у сучасны момант ажыццяўляецца ва ўмовах, калі ўсё большая ўвага звяртаецца на развіццё другога падраздзялення з мэтай стварэння спажывецкага рынку, прымаюцца рашучыя меры па ўпарадкаванню міжрэспубліканскіх і міждзяржаўных сувязей на гаспадарча-разліковай аснове, змяняецца галіновая структура народнай гаспадаркі, узмацняюцца дагаворныя сувязі.

**РЭДУКЦЫЯ ПРАЦЫ** (Редукция труда) -- працэс звядзення складанай працы да простай. Складаная праца -- гэта памножаная простая, што ўвасабляецца ў рознай велічыні вартасці, якая ствараецца рознай па складанасці працай за адзін і той жа час. Базай для Р.п. з'яўляецца простая (некваліфікаваная) праца, якая не патрабуе спецыяльнага прафесійнага навучання, тарыфікуецца ніжэйшым (1-м) разрадам і прадугледжвае звычайныя ўмовы вытворчасці, сярэднія фізічныя і разумовыя здольнасці чалавека. Простая праца не з'яўляецца катэгорыяй з пастаяннымі характарыстыкамі, яна змяняецца па меры развіцця прадукцыйных сіл. Аб'ектыўная аснова для Р.п. - затраты часу самога работніка на атрыманне кваліфікацыі пры найбольш эфектыўных формах падрыхтоўкі ў іх аптымальным спалучэнні, а таксама затраты грамадства на навучанне работніка для выканання складанай працы. Р.п. уключае ў сябе таксама працэс звядзення больш інтэнсіўнай і цяжкай працы да грамадска неабходнага ўзроўню інтэнсіўнасці і цяжкасці працы ў грамадстве.

Затраты работніка на атрыманне кваліфікацыі кам-

пенсуюцца на працягу ўсёй яго працоўнай дзейнасці шляхам выплаты яму больш высокай заработнай платы. Р.п. улічваецца пры фарміраванні цэн, разліку поўных затрат працы на выраб прадукцыі як у адной краіне, так і пры міжнародных супастаўленнях.

**РЭЗЕРВЫ ВЫТВОРЧЫЯ** ( Резервы производственные ) --выяўленыя і нявыкарыстаныя магчымасці росту і развіцця вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці, якім дадзена колькасная ацэнка. Гэтыя магчымасці прадпрыемства ( аб'яднання ) заключаюцца ў эфектыўным выкарыстанні вытворчых рэсурсаў, якія ўяўляюць сабой сукупнасць яго матэрыяльных, фінансавых, тэхнічных, энергетычных і працоўных рэсурсаў. Р.в. падзяляюцца на наступныя рэзервы: эканоміі рабочага часу (зніжэнне працаёмкасці прадукцыі, паляпшэнне выкарыстання рабочага часу, рацыянальная арганізацыя працы і тэхнічнага нарміравання і інш.); эканоміі сродкаў працы (павелічэнне фонду часу работы абсталявання, яго прадукцыйнасці, скарачэнне тэрмінаў уводу ў дзеянне новых машын і абсталявання); эканоміі прадметаў працы (зніжэнне матэрыяльных затрат на адзінку прадукцыі, змяншэнне браку, скарачэнне транспартна-нарыхтоўчых расходаў і інш.); павышэння якасці прадукцыі (захаванне стандартаў, павышэнне даўгавечнасці, надзейнасці і іншых спажывецкіх уласцівасцей прадукцыі ); агульнавытворчыя ( скарачэнне працягласці вытворчага цыклу, змяншэнне аб'ёму незавершанай вытворчасці); невытворчыя (скарачэнне расходаў па збыту прадукцыі, штрафаў, пені, няўстоек і іншых невытворчых расходаў). Асноўным спосабам выяўлення ўнутрывытворчых рэзерваў з'яўляецца тэхніка-эканамічны аналіз вытворчагаспадарчай дзейнасці. Вынікі аналізу вытворча-гаспадарчай дзейнасці абагульняюцца наступным чынам: даецца ацэнка дзейнасці прадпрыемства ці яго падраздзяленняў, адлюстроўваецца дасягнуты ўзровень выкарыстання рэсурсаў, прыводзіцца аналіз прычын, якія стрымліваюць рост эфектыўнасці вытворчасці, а таксама адлюстроўваюцца выяўленыя ўнутрывытворчыя рэзервы. Прапановы па выніках аналізу афармляюцца ў вы-

глядзе загадаў ці распараджэнняў па прадпрыемству, цэху. Апошнія дапаўняюцца распрацоўкай арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў па выкарыстанню выяўленых рэзерваў.

**РЭКЛАМАЦЫЯ** (Рекламация) - прэтэнзія (заява), якая прад'яўляецца спажыўцом прадукцыі яе вырабшчыку (пастаўшчыку) у сувязі з нізкай якасцю прадукцыі (не адпаведнай умовам дагавора) з патрабаваннем кампенсацыі страт. Паслядоўнасць афармлення і прад'яўлення Р. устаноўлена інструкцыямі і палажэннямі. Колькасць Р., атрыманых ад спажыўцоў за пэўны перыяд часу (год, месяц), у агульным выглядзе характарызуе якасць прадукцыі і якасць работы прадпрыемстваў (аб'яднанняў). Павелічэнне колькасці Р., а таксама рост сумы, выплачанай спажыўцам у выглядзе штрафаў, няўстоек за пастаўку недабраякасных вырабаў, у параўнанні з базісным перыядам, сведчыць аб пагаршэнні работы калектыву, аб паніжэнні якасці выпускаемай прадукцыі. Найбольш шырока выкарыстоўваюцца паказчыкі, якія характарызуюць колькасць Р. і суму сродкаў, выплачаных па прэтэнзіях спажыўцоў, што прыпадае, напрыклад, на 100 вырабаў ці на 1 тыс. руб., 1 млн руб. выробленай прадукцыі. Вывучэнне Р. дазваляе выявіць прычыны, якія выклікаюць прэтэнзіі спажыўцоў, распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па іх ліквідацыі і паляпшэнню якасці прадукцыі.

**РЭНТА** (Рента) -- даход, які рэгулярна атрымліваецца з зямлі, капіталу або маёмасці і не звязаны з прадпрымальніцкай дзейнасцю. Рэнтай называюць таксама і даход, які маюць уладальнікі аблігацый дзяржаўнай пазыкі.

Сярод рэнтных адносін важнае месца належыць *зямельнай рэнце*. Зямельная рэнта ўзнікла разам з зямельнай уласнасцю і стала эканамічнай формай яе рэалізацыі. Яе крыніцай стаў прыбавачны прадукт, які ствараўся прыбавачнай працай непасрэднага вытворцы і дармова прысвойваўся ўласнікам зямлі.

Зямельная рэнта выступае ў двух асноўных формах: *дыферэнцыяльнай*, якая спараджаецца манаполіяй на зямлю як на аб'ект гаспадарання, і *абсалютнай*, якая

спараджаецца манаполіяй прыватнай уласнасці на зямлю. Дыферэнцыяльную рэнту I і II атрымліваюць уласнікі лепшых і сярэдніх па ўрадлівасці зямель. Яны ж, разам з уласнікам горшых зямель, атрымліваюць і абсалютную рэнту. Прычына яе стварэння - прыватная ўласнасць на зямлю, якая не дазваляе ўключыць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы ў механізм фарміравання сярэдняга прыбытку.

Зыходнай агульнай умовай рэгулявання рэнтных плацяжоў, як і ўстанаўленне арэнднай платы, велічыні падаткаў, з'яўляецца *эканамічная ацэнка зямлі*, якая дазваляе больш справядліва размяжоўваць уплыў на стварэнне прыбавачнага прадукту аб'ектыўных умоў гаспадарання, з аднаго боку, і якасць працы вытворцаў сельскагаспадарчых прадуктаў -- з другога. Плата за зямлю і яе багацці па сваёй эканамічнай прыродзе ідэнтычная плаце за іншыя вытворчыя рэсурсы.

**РЭНТАБЕЛЬНАСЦЬ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Рентабельность производства) -- абагульнены паказчык эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці. Р.в. паказвае не толькі на рэзультатыўнасць матэрыяльных, працоўных і фінансавых затрат, але і на ўзровень выкарыстання авансаваных рэсурсаў -- вытворчых фондаў. Адрозніваюць агульную і разліковую Р.в. Агульная Р.в. ўяўляе сабой адносіны балансавага прыбытку ад прамысловай дзейнасці да сярэднегадавой вартасці асноўных вытворчых фондаў і абаротных сродкаў, якія нарміруюцца. Яна адлюстроўвае эфектыўнасць выкарыстання прадпрыемствам вытворчых фондаў, вызначае магчымасць узносаў у дзяржаўны бюджэт, платы за рэсурсы. Разліковая Р.в. -- гэта адносіны балансавага прыбытку, паменшанага на велічыню плацяжоў у дзяржбюджэт і працэнтаў за банкаўскі крэдыт, да сярэднегадавой вартасці асноўных вытворчых фондаў і абаротных сродкаў, якія нарміруюцца.

Узровень разліковай Р.в. выкарыстоўваецца для ацэнкі дзейнасці прадпрыемства (аб'яднання), а паказчык рэнтабельнасці прадукцыі (вырабу) -- для ацэнкі эфектыўнасці выдаткаў прадпрыемства на выраб і рэалізацыю асобных відаў прадукцыі. Апошні ўяўляе са-

бой адносіны прыбытку, атрыманага ад рэалізацыі пэўнага віду прадукцыі, да яе поўнага сабекошту. Для матэрыялаёмістых вытворчасцей гэты паказчык вызначаецца як адносіны прыбытку ад адзінкі пэўнага віду прадукцыі да поўнага яе сабекошту за мінусам прамых матэрыяльных затрат, звязаных з вырабам адзінкі гэтай прадукцыі (кошт выкарыстанай сыравіны, матэрыялаў, паліва, энергіі, паўфабрыкатаў і камплектуючых вырабаў).

## С

**САБЕКОШТ ПРАДУКЦЫІ** (Себестоимость продукции) -- сукупнасць затрат прадпрыемства, выражаная ў грашовай форме, на выраб і збыт прадукцыі. Уключае ў сябе вартасць спажытых у працэсе вытворчасці прадметаў працы, перанесеную вартасць сродкаў працы, выдаткі на аплату працы, расходы па збыту і рэалізацыі прадукцыі. С.п. адлюстроўвае якасць работы працоўнага калектыву: ступень выкарыстання матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, вынікі ўкаранення новай тэхнікі і прагрэсіўнай тэхналогіі, узровень арганізацыі працы і вытворчасці, рацыянальнасць кіравання.

Пры планаванні, уліку і аналізе С.п. вызначаюцца: выдаткі на выраб (каштарыс), сабекошт адзінкі прадукцыі (калькуляцыя), выдаткі на рубель таварнай прадукцыі, сабекошт таварнай і рэалізаванай прадукцыі і зніжэнне сабекошту.

Зніжэнне С.п. - важнейшая крыніца павелічэння прыбытку і павышэння эфектыўнасці вытворчасці. Яно дасягаецца за кошт павышэння тэхнічнага ўзроўню вытворчасці (укараненне новай тэхнікі і тэхналогіі), удасканалення арганізацыі працы і вытворчасці (зніжэнне страт рабочага часу), эканоміі матэрыяльных рэсурсаў (сыравіна, матэрыялы, паліва, электраэнергія), паляпшэння выкарыстання асноўных фондаў.

С.п. выкарыстоўваецца ў гаспадарчым разліку для ацэнкі эфектыўнасці работы прадпрыемства і яго структурных падраздзяленняў, а таксама служыць для ўстанаўлення і змянення цэн на прадукцыю (паслугі).

**САМААКУПНАСЦЬ** (Самоокупаемость) -- зыходны, канстытуіруючы прынцып, сутнасць гаспадарча-

га разліку. Пад С. разумеецца пакрыццё гаспадарча-разліковым звяном сваіх затрат на вытворчасць, збыт сваёй прадукцыі і атрыманне прыбытку, адна частка якога застаецца на прадпрыемстве, а другая ідзе на ўтрыманне дзяржавы.

С.-- эканамічны метад індывідуальнага ўзнаўлення сродкаў вытворчасці, прыродных, фінансавых і іншых рэсурсаў за кошт прыбытку. Ініцыятыўны таваравытворца аб'ектыўна імкнецца да найбольшага прыбытку -- стымулу гаспадарча-разліковай вытворчай дзейнасці. Атрыманы прыбытак як канчатковы вынік гаспадарчай дзейнасці ў параўнанні з укладаннямі ў асноўныя фонды і абаротныя сродкі служыць паказчыкам рэнтабельнасці, эфектыўнасці іх выкарыстання. А гэта, у сваю чаргу, дазваляе характарызаваць аддачу капіталаўкладанняў, вызначаць тэрміны іх акупнасці (пры норме прыбытку, скажам, 20% гэтыя ўкладанні акупляюцца за пяць гадоў, пры 5% -- за дваццаць гадоў і г.д.). А тэрмін акупнасці, вылічаны на аснове прыбытку, дапамагае эканамічна абгрунтаваць накіраванне капіталаўкладанняў, іх структуру, устанавіць грамадска неабходную велічыню амартызацыі, затрат жывой і арэчаўленай працы.

Калектывы, якія працуюць ва ўмовах С., могуць быць цесна звязаны з бюджэтам, уносіць туды частку свайго прыбытку і адтуль жа атрымліваць сродкі, якіх ім не хапае. Дзяржава ў гэтым выпадку ўмешваецца ў пытанні вытворчасці, фарміравання і выкарыстання рэсурсаў і даходаў, фонду амартызацыі і г.д., у значнай частцы бярэ на сябе адказнасць за работу калектыву і, калі трэба, пакрывае яго страты за кошт прадпрыемстваў, якія працуюць добра. Так спараджаюцца ўтрыманства, ураўнілаўка, упэўненасць у тым, што, як бы прадпрыемства ні працавала, дзяржава зарплату забяспечыць. Значыць, для эфектыўнага правядзення гаспадарчага разліку С. яшчэ недастаткова. Ён павінен быць узняты на больш высокі ўзровень і ажыццяўляцца па прынцыпу самафінансавання.

**САМАКІРАВАННЕ** (Самоуправление) -- самастойнае кіраванне ўласнымі справамі людзей у розных

сферах іх дзейнасці. У эканоміцы С. -- адзін з важнейшых прынцыпаў гаспадарчага разліку тэрыторый і прадпрыемстваў. С. пры тэрытарыяльным разліку абласцей, гарадоў, раёнаў выражаецца ў самастойным вырашэнні ўсіх пытанняў развіцця мясцовай гаспадаркі і грамадскіх спраў, сацыяльных, экалагічных і іншых праблем мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў, а таксама ў стварэнні належных умоў для гэтага.

С. калектываў забяспечваецца надзяленнем іх неабходнымі правамі і паўнамоцтвамі. Вырашаецца праблема стварэння для гаспадарча-разліковых калектываў такіх арганізацыйна-эканамічных і прававых умоў, пры якіх яны, не ўступаючы ў супярэчнасць з агульнанароднымі інтарэсамі, змаглі б раскрыць і цалкам выкарыстаць свае рэзервы і магчымасці, праявіць дзелавую ініцыятыву.

С. немагчыма без унутрывытворчых гаспадарчых адносін, іх дэмакратызацыі, якія павінны ахапіць кожнае падраздзяленне, кожнае рабочае месца. Пераадольваючы скажэнні каманднa-адміністрацыйнай сістэмы, дэмакратызуючы гаспадарчае жыццё, вытворчыя калектывы спалучаюць сваю дзейнасць з цэнтралізаваным кіраваннем і самакіраваннем тэрыторый. Але гэтыя адносіны, як і адносіны паміж партнёрамі, павінны быць заснаваны не на дыктаце, а на ўліку ўзаемных інтарэсаў, на гаспадарчым разліку, на добрасумленным выкананні кожным сваіх абавязкаў.

**САМАСТОЙНАСЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВА, або ГАСПАДАРЧАЯ САМАСТОЙНАСЦЬ** (Самостоятельность предприятий, или Хозяйственная самостоятельность) - важнейшы прынцып гаспадарчага разліку, які забяспечваецца шэрагам прадастаўленых прадпрыемству правоў. Пры С.п. у сваё распараджэнне прадпрыемства атрымлівае пэўныя матэрыяльныя і грашовыя сродкі і мае магчымасць найбольш рацыянальна іх выкарыстоўваць. Як самастойная гаспадарчая адзінка прадпрыемства з'яўляецца юрыдычнай асобай. Яно мае права выкарыстоўваць сваю прадукцыю на ўласныя патрэбы, рэалізоўваць яе іншым прадпрыемствам і насельніцтву, абменьваць яе з іншымі прадпрыемствамі

пры захаванні адной умовы - поўным выкананні ўсіх дагаворных абавязацельстваў. Акрамя таго, прадпрыемства мае права перадаваць, прадаваць частку сваёй маёмасці, сыравіны і іншых матэрыяльных каштоўнасцей іншым прадпрыемствам, абменьваць яе. Пры С.п. ім ніхто не зацвярджае ніякіх паказчыкаў, яны самі распрацоўваюць і зацвярджаюць планы. Планаванне дзейнасці прадпрыемстваў засноўваецца на эканамічных нарматывах, дзяржаўных заказах, кантрольных лічбах, лімітах і дагаворах. Прыбытак, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемства, пераразмеркаванню ці канфіскацыі не падлягае.

Новыя далягляды для С.п. адкрывае арэнда маёмасці прадпрыемстваў. Пасля заключэння дагавора аб перадачы маёмасці дзяржаўнага прадпрыемства ў арэнду арганізацыі арандатараў апошняя становіцца правапераемнікам усіх фінансавых і іншых правоў і абавязкаў прадпрыемства. Устанаўліваецца прамая залежнасць паміж вынікамі вытворчасці і даходам, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемства, з'яўляецца магчымасць фарміраваць, але толькі за кошт уласных сродкаў, долевы фонд членаў арганізацыі арандатараў. Прызначэнне фонду - зацікавіць арандатараў у стварэнні новых вытворчых фондаў і зрабіць кожнага члена працоўнага калектыву гаспадаром прадпрыемства.

**САМАФІНАНСАВАННЕ** (Самофинансирование) -- прынцып гаспадарчага разліку, які патрабуе пакрыцця прадпрыемствамі і рэгіёнамі ўсіх затрат на ўзнаўленне за кошт уласных сродкаў. Прадпрыемства пасля выплаты ўстаноўленых плацяжоў у дзяржаўны бюджэт цалкам распараджаецца гаспадарча-разліковым даходам (або астаткавым прыбыткам), а таксама амартызацыйнымі адлічэннямі. Калектыў прадпрыемства сам, за кошт уласных рэсурсаў, зробленых ім сродкаў вызначае расходы на далейшае развіццё вытворчасці, яе абнаўленне, выдзяляе сродкі для вырашэння сацыяльных праблем і стварае фонд аплаты працы. Праўда, пры гэтым ёсць рэальная магчымасць супрацьпаставіць бягучыя інтарэсы калектыву ў вызначэнні фонду аплаты працы яго ж перспектыўным інтарэсам у далейшым

развіцці і ўдасканаленні вытворчасці. Але гэта можна папярэдзіць эканамічнымі мерамі (падаткамі, нарматывамі і інш.). Пры С. дзяржава не нясе матэрыяльнай адказнасці за канчатковыя вынікі работы калектыву. У выпадку, калі калектыву не будзе ставаць зробленых сродкаў, іх можна папоўніць, але ўжо не беззваротна з бюджэту, а на строга эканамічнай аснове - за кошт крэдытаў банка або сумежнікаў, сродкі якіх трэба будзе вярнуць з працэнтамі. С. не выключае бюджэтных асігнаванняў, што выкарыстоўваюцца для ўздзеяння дзяржавы на тэмпы і структуру грамадскага ўзнаўлення. Але гэта не змяншае значэння прадпрыемства, вытворчыя і ўзнаўленчыя функцыі якога значна пашыраюцца.

С. іграе вызначальную ролю пры ўкараненні рэгіянальнага гаспадарчага разліку і выкарыстоўваецца для кіравання экономікай і сацыяльнай сферай тэрыторый. За тэрыторыямі заканадаўча замацоўваюцца пастаянныя крыніцы даходаў: адлічэнні з прыбытку (даходу) ад усіх размешчаных на адпаведнай тэрыторыі прадпрыемстваў і арганізацый; падаткаў і збораў; платы за прыродныя і працоўныя рэсурсы і г.д. С. тэрыторый і поўны гаспадарчы разлік прадпрыемстваў узаемаабумоўлены і дапаўняюцца адно другім. Паспяховая работа прадпрыемстваў, арганізацый і індывідуальная працоўная дзейнасць грамадзян гарантуюць устойлівыя даходы тэрытарыяльным органам кіравання, а апошнія вымушаны ствараць для гэтага адпаведныя ўмовы, бо яны зацікаўлены ў павелічэнні даходаў.

**САЦЫЯЛЬНАЯ ЭФЕКТЫУНАСЦЬ** (Социальная эффективность) -- рэзультатыўнасць, якая дасягаецца ў сацыяльнай сферы, у рэалізацыі сацыяльнай палітыкі. Эканамічная і С.э. цесна ўзаемазвязаны і па сутнасці адлюстроўваюць з розных бакоў рэзультатыўнасць вытворчасці, праведзеных гаспадарчых мерапрыемстваў. Сацыяльную эфектыўнасць у грамадстве характарызуюць паказчыкі ступені задавальнення патрэб наогул і сацыяльных у прыватнасці. Да іх адносяцца змяненні ў характары працы і задаволенасць працай, рэалізацыя асноўнага прынцыпу размеркавання па працы і забеспячэння сацыяльнай справядлівасці, узровень жыцця на-

сельніцтва, у прыватнасці рэальныя даходы на душу насельніцтва, забяспечанасць жыллём, паслугамі, таварамі, сталасць сацыяльна-класавых і нацыянальных адносін, грамадская актыўнасць, паляпшэнне навакольнага асяроддзя.

На асобным прадпрыемстве (у аб'яднанні) С.э. вытворчасці выяўляецца ў развіцці даходаў работнікаў працоўнага калектыву, матэрыяльнай базы сацыяльна-культурнай сферы, у клопаце аб выкарыстанні пазарабочага часу і, асабліва, вольнага часу, аб маральна-псіхалагічным клімаце, развіцці новых форм арганізацыі працы і вытворчасці.

У сучасных умовах ставіцца і вырашаецца задача паскоранага сацыяльнага развіцця, адмаўлення ад астаткавага прынцыпу ў планаванні невытворчай сферы і пры выдзяленні капіталаўкладанняў.

**САЦЫЯЛЬНЫ ПРАГРЭС** (Социальный прогресс) -- працэс паступальнага развіцця грамадства, дасягнення ім якасна новых рубяжоў. Ажыццяўляецца на аснове аб'ектыўных законаў развіцця грамадства, выкарыстання набытага станоўчага гістарычнага вопыту, грамадскіх і іншых навук. С.п. вымяраецца дасягненнямі ў галіне практычнай рэалізацыі вышэйшай мэты грамадскай вытворчасці - задавальненне сацыяльных патрэб, усебаковае развіццё ўсіх членаў грамадства. На сучасным этапе перабудовы С.п. уключае ў сябе ажыццяўленне шэрага практычных мер па гуманізацыі эканомікі ў ходзе правядзення эканамічнай рэформы, дэмакратызацыі ўсяго грамадскага жыцця. У гэтым рэчышчы абмеркаваны і прынятыя I З'ездам народных дэпутатаў СССР і Вярхоўным Саветам СССР першачарговыя рашэнні па павышэнню ўзроўню жыцця, перш за ўсё малазабяспечаных сем'яў і інвалідаў вайны; прыняты або ўдасканалены законы па пенсійнаму забеспячэнню, прадастаўленню сапраўднай самастойнасці прадпрыемствам (аб'яднанням) ва ўмовах самафінансавання, па забеспячэнню поўнай і эфектыўнай занятасці насельніцтва, сістэме падаткаабкладання, павышэнню ролі Саветаў. Працягваецца ажыццяўленне шэрага комплексных сацыяльных праграм: бесперапыннай адукацыі, жыллё-

вай і харчовай, аховы навакольнага асяроддзя, развіцця аховы здароўя.

**СІСТЭМА РЫНАЧНАЙ ГАСПАДАРКІ** (Система рыночного хозяйства) - гаспадарка, заснаваная на куплі-продажы тавараў. Яна ўласціва таварнай вытворчасці. Рынак вызначае ўзровень цэн на таварную прадукцыю і тым самым рэгулюе аб'ём і структуру вытворчасці. Сучасны стан эканомікі характарызуецца ажыўленнем рыначных адносін. Ажыццяўляецца фарміраванне побач са спажывецкім рынкам тавараў народнага спажывання рынку сродкаў вытворчасці, рынку каштоўных папер.

Асноўнымі элементамі рынку з'яўляюцца попыт, прапанаванне і цана. Распазнаюць наступныя тыпы рынкаў: свабодны, манапалізаваны, рэгулюемы, сусветны эканамічны.

*Свабодны рынак* -- гэта рынак з вялікай колькасцю ўдзельнікаў абмену, свабодным цэнаўтварэннем, развітай канкурэнцыяй; у чыстым выглядзе яго практычна нідзе няма.

*Манапалізаваны рынак* -- гэта рынак, для якога характэрны дамінаванне пастаўшчыка, рост цэн, неабходнасць жорсткага кантролю з боку дзяржавы.

*Рэгулюемы рынак* -- гэта такі рынак, дзе колькасць асноўных вытворцаў невялікая і яны здольны кантраляваць адзін аднаго. Яму характэрны выраб на заказ, моцная служба інфармацыі аб прадуктах, вытворцах, службах прагназіравання і фарміравання попыту, магутнае аптовае звяно.

*Сусветны эканамічны рынак* -- гэта рынак, на якім абарочваюцца тавары, выраблены ў краінах свету, звязаных паміж сабой знешнім гандлем і іншымі формамі эканамічных адносін, заснаваных на міжнародным падзеле працы.

**СПАЖЫВАННЕ** (Потребление) -- выкарыстанне грамадскага прадукту для задавальнення вытворчых і асабістых патрэб людзей, заключная стадыя ўзнаўлення. На гэтай стадыі бачна канчатковая мэта вытворчасці, рэалізуецца спажывецкая вартасць грамадскага прадукту і задавальняюцца патрэбы людзей.

Патрэбы вельмі featuresрознабаковыя, таму і існуе вялікае мноства спажывецкіх вартасцей. Яны могуць існаваць у форме рэчы ці паслугі. Патрэбы, у адрозненне ад жаданняў, аб'ектыўныя і выражаюць неабходнасць атрымання матэрыяльных і духоўных даброт для забеспячэння жыццядзейнасці чалавека, калектыву, сацыяльнай групы, грамадства наогул. Развіццё вытворчасці, навукі і тэхнікі памнажае і ўзбагачае патрэбы людзей і разам з тым адкрывае ўсё новыя магчымасці для росту С.

Адрозніваюць С. вытворчае і асабістае. *Вытворчае С.* уваходзіць непасрэдна ў працэс вытворчасці і азначае С. розных сродкаў вытворчасці (машыны, інструменты, паліва, сыравіна і г.д.) і рабочай сілы чалавека. *Асабістае С.* забяспечвае ўзнаўленне жыццяздольнасці людзей. Гэта - перш за ўсё выкарыстанне ежы, адзення, жылля, прадметаў хатняга ўжытку і культурна-бытавога прызначэння для задавальнення фізіялагічных патрэб чалавека, а таксама яго патрэб у адукацыі, адпачынку, зберажэнні здароўя і г.д. Гэта фінальная стадыя руху грамадскага прадукту, на якой прадукт, стаўшы фондам С., выкарыстоўваецца адразу і цалкам (напрыклад, ежа) або паступова (напрыклад, адзенне) і знікае, забяспечваючы пры гэтым узнаўленне самога жыцця чалавека і яго дзейнасці. Асабістае С., выконваючы важнейшую грамадскую функцыю ўзнаўлення рабочай сілы, стварае магутны імпульс, стымул развіцця і ўдасканалення вытворчасці, бо ўзнаўляе ўзрастаючыя патрэбы ў новых прадуктах, рэчах, паслугах.

Канчатковым вынікам размеркавання фонду асабістага С. з'яўляецца фарміраванне сямейных бюджэтаў, сукупных даходаў працуючых і непрацуючых членаў сям'і ў грашовай форме, у выглядзе паслуг і натуральных прадуктаў.

Сямейныя бюджэты і іх выкарыстанне - актыўны сродак задавальнення патрэб усіх членаў сям'і. Акрамя таго, імкненне палепшыць матэрыяльнае становішча сям'і, стварыць умовы для разумнага выкарыстання вольнага часу, клопаты аб дзецях і састарэлых - магутныя стымулы працоўнай дзейнасці.

**СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Специа-

лизация производства) - форма арганізацыі грамадскай вытворчасці, пры якой вытворчасць канструкцыйна і тэхналагічна аднароднай прадукцыі адасабляецца ў самастойныя вытворчыя адзінкі. Эканамічны сэнс С.в. заключаецца ў забеспячэнні аднароднасці вытворчасці шляхам яе размеркавання па галінах і прадпрыемствах, а ўнутры апошніх - па ўчастках вытворчасці аднародных па характару выпуску вырабаў або асобных частках складанага прадукту.

Адрозніваюць прадметную, падэтальную і тэхналагічную С.в. Прадметная С.в. характарызуецца выпускам канструкцыйна і тэхналагічна аднароднай гатовай прадукцыі (заводы па вытворчасці працяжных, фрэзерных, заточных станкоў і інш.). Падэтальная С.в. мае на ўвазе засяроджанне на прадпрыемствах вытворчасці асобных частак, вузлоў або дэталей прадукту (завод па вытворчасці падшыпнікаў, шасцерняў, рысор і інш.). Тэхналагічная С.в. азначае такую форму С.в., пры якой асобныя стадыі або аперацыі тэхналагічнага працэсу выдзелены у самастойныя вытворчыя (ліцейныя, прадзільныя і іншыя) прадпрыемствы. Найбольш прагрэсіўнай і эфектыўнай з'яўляецца падэтальная і тэхналагічная С.в., бо ў гэтым выпадку дасягаецца найвышэйшая ступень тэхналагічнай аднароднасці вытворчасцей.

С.в. -- важнейшы фактар павышэння яе эфектыўнасці. На спецыялізаваных прадпрыемствах ствараюцца ўмовы для арганізацыі паточнай вытворчасці, паскарэння і эфектыўнага выкарыстання прагрэсіўнага абсталявання. У выніку паказчыкі эфектыўнасці вытворчасці на спецыялізаваных прадпрыемствах у 2-3 разы вышэйшыя, чым на неспецыялізаваных.

**СПОСАБ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Способ производства) -- гістарычна канкрэтнае адзінства прадукцыйных сіл і вытворчых адносін, якое характарызуе ўзровень развіцця вытворчасці неабходных для жыцця матэрыяльных даброт.

Вытворчасць матэрыяльных даброт ва ўсіх умовах была грамадскім працэсам, у якім прадукцыйныя сілы і вытворчыя адносіны знаходзяцца ў дыялектычна-супя-

рэчлівым адзінстве. Прадукцыйныя сілы, бесперапынны характар і ўзровень іх развіцця вызначаюць грамадскую форму свайго існавання -- сістэму эканамічных адносін (формы ўласнасці, размеркавання, абмену і г.д.), а таксама абумоўліваюць яе замену. Вытворчыя адносіны, у сваю чаргу, могуць забяспечыць магутнае развіццё прадукцыйных сіл, але і могуць затармазіць іх ці нават прывесці да разбурэння. У апошнім выпадку ўзнікае канфлікт паміж прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі, гістарычная неабходнасць замены аджыўшага С.в. новым, больш прагрэсіўным, які адпавядае больш высокаму ўзроўню прадукцыйных сіл. Пераход ад аднаго С.в. да другога азначае замену старых адносін новымі. Супярэчнасць паміж прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі, іх канфлікт вырашае сацыяльная рэвалюцыя. Яе неабходнасць вызначаецца агульным эканамічным законам адпаведнасці вытворчых адносін характару і ўзроўню прадукцыйных сіл.

С.в. належыць рашаючая роля ў стварэнні сацыяльна-эканамічных і духоўных умоў жыцця грамадства. Ён вызначае асноўныя рысы грамадства, яго тэорыі, ідэі, мараль, палітычныя погляды. С.в., узяты ў адзінстве з ідэалагічнай і палітычнай надбудовай, з усімі характэрнымі для яго формамі дзейнасці людзей, складае грамадска-эканамічную фармацыю. Змена С.в. - аб'ектыўны працэс узыходжання чалавечага грамадства ад самых прымітыўных форм вытворчасці і жыцця да самага прагрэсіўнага грамадства, дзе ўсе дасягненні цывілізацыі падпарадкаваны інтарэсам поўнага дабрабыту і ўсебаковага развіцця кожнага члена.

**СРОДКІ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Средства производства) -- сукупнасць прадметаў і сродкаў працы, якія прымяняюцца чалавекам для вырабу матэрыяльных даброт.

С.в. ствараюць рэчыўны фактар вытворчасці, з'яўляюцца састаўной часткай прадукцыйных сіл грамадства. Пад уплывам пануючых вытворчых адносін С.в. у розных грамадска-эканамічных фармацыях выступаюць у розных формах. Адной з такіх форм з'яўляюцца вытворчыя фонды (гл.*Вытворчыя фонды*).

**СТАНДАРТЫЗАЦЫЯ** (Стандартизация) -- уста-

наўленне і прымяненне адзіных абавязковых норм і патрабаванняў да фізічных і размерных велічынь, вырабаў вытворчасці, прадуктаў і паўфабрыкатаў, сыравіны і матэрыялаў і да ўмоў іх вытворчасці.

Канкрэтны вынік работ па С., прыняты і зацверджаны адпаведнай кампетэнтнай арганізацыяй, уяўляе сабой стандарт. Сістэма стандартаў -- гэта комплекс узаемазвязаных стандартаў, якія падзяляюцца на 4 катэгорыі: дзяржаўныя, галіновыя, рэгіянальныя, стандарты прадпрыемстваў. Дзяржаўныя стандарты ўстанаўліваюцца на групы прадукцыі ці на асобныя яе віды і вызначаюць поўную тэхнічную характарыстыку прадукцыі, якая стандартызуецца. Яны абавязковыя для прымянення ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Значная частка прадукцыі, асабліва паўфабрыкатаў і матэрыялаў, выпрабляецца па ведамасных і заводскіх нормах, па тэхнічных умовах, якія распрацоўваюцца і зацвярджаюцца міністэрствамі, ведамствамі, аб'яднаннямі, прадпрыемствамі.

Рэгулярны перагляд стандартаў дазваляе ўлічваць навейшыя навукова-тэхнічныя дасягненні і ўстанаўліваць паказчыкі якасці прадукцыі ў адпаведнасці з патрэбамі спажыўцоў і магчымасцямі вытворцаў.

Захаванне патрабаванняў стандартаў носіць абавязковы характар, з'яўляецца элементам планавай дысцыпліны.

**СТАТУТ ПРАДПРЫЕМСТВА або АБ'ЯДНАННЯ** (Устав предприятия или объединения) - дакумент, які вызначае задачы, правы і галіну дзейнасці прадпрыемства (аб'яднання), яго становішча ў сістэме фінансавых і гаспадарчых органаў. С.п. зацвярджаецца органам, які прыняў рашэнне аб стварэнні прадпрыемства, і змяшчае наступныя звесткі: найменне прадпрыемства (аб'яднання) і яго месцазнаходжанне (паштовы адрас); найменне вышэйстаячага органа, якому прадпрыемства (аб'яднанне) непасрэдна падпарадкавана; прадмет і мэты дзейнасці; звесткі аб статутным фондзе і яго памерах; пералік і месцазнаходжанне структурных адзінак, якія ўваходзяць у склад аб'яднання; прозвішча, імя і імя па бацьку службовай асобы, якая ўзначальвае прадпрыем-

ства (аб'яднанне).

У С.п. могуць быць уключаны і іншыя палажэнні, звязаныя з асаблівасцямі дзейнасці прадпрыемстваў (аб'яднанняў) і якія не супярэчаць дзеючаму заканадаўству.

Прадпрыемства (аб'яднанне) набывае звязаныя з яго вытворча-гаспадарчай дзейнасцю правы і абавязкі з моманту зацвярджэння яго статута вышэйстаячай арганізацыяй. На аснове С.п. кіраўнік прадпрыемства (аб'яднання) і яго намеснікі ўступаюць у свае правы, кіруюць ім і дзейнічаюць без асобных на тое даручэнняў з боку вышэйстаячых арганізацый.

**СТАТУТНЫ ФОНД** (Уставный фонд) -- сума асноўных і абаротных сродкаў, якія знаходзяцца ў карыстанні і распараджэнні прадпрыемстваў (аб'яднанняў) для забеспячэння эфектыўнай вытворча-гаспадарчай дзейнасці. С.ф. - велічыня дынамічная. Яна змяняецца ў сувязі з укараненнем у вытворчасць дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, абнаўленнем асноўных фондаў за кошт рэканструкцыі, расшырэння прадпрыемстваў і іх тэхнічнага пераўзбраення, са спісаннем фізічна зношаных і маральна састарэлых машын і абсталявання, перыядычнай пераацэнкай асноўных фондаў па ўзнаўленчай вартасці, змяненнем нарматыўных запасаў таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, папаўненнем абаротных сродкаў у сувязі з павелічэннем аб'ёму вытворчасці і інш. Усе змяненні С.ф. улічваюцца на бухгалтарскіх рахунках, а агульная яго сума адлюстроўваецца ў артыкуле "Статутны фонд" пасіву бухгалтарскага балансу прадпрыемства.

Асноўнай крыніцай павелічэння С.ф. з'яўляецца фонд развіцця вытворчасці, навукі і тэхнікі прадпрыемства (аб'яднання).

**СТРАХАВАННЕ** (Страхование) -- сістэма эканамічных адносін па стварэнню цэнтралізаванага страхавога фонду і яго размеркаванню паміж прадпрыемствамі, арганізацыямі і грамадзянамі з мэтай кампенсацыі ўрону і аказання матэрыяльнай дапамогі.

Фонд дзяржаўнага С. фарміруецца за кошт грашовых запасаў страхавальнікаў - дзяржаўных прадпрыем-

стваў ( з 1990г.), калгасаў, іншых кааператыўных і грамадскіх арганізацый, саўгасаў, грамадзян. Ён ужываецца на кампенсаванне затрат і выплату страхавых сум у сувязі са стыхійнымі бедствамі, няшчаснымі выпадкамі і іншымі падзеямі. Сродкі страхавога фонду выкарыстоўваюцца як крэдытныя рэсурсы і як важная крыніца мабілізацыі фінансавых рэсурсаў у інтарэсах развіцця народнай гаспадаркі.

Па формах правядзення распазнаюць абавязковае і добраахвотнае С. *Абавязковае С.* ажыццяўляецца на аснове заканадаўчых актаў. Гэта форма шырока выкарыстоўваецца пры С. маёмасці. Абавязковае С. дзейнічае бесперапынна, пакуль маёмасць знаходзіцца ў гаспадарцы. *Добраахвотнае С.* праводзіцца на аснове дагавора паміж страхоўшчыкам і страхавальнікамі. Яно дзейнічае ў межах абумоўленага дагаворам тэрміну.

Адрозніваюць два віды С.: маёмаснае і асабістае. Аб'ектамі маёмаснага С. выступаюць матэрыяльныя каштоўнасці, а асабістага - жыццё, здароўе, працаздольнасць грамадзян.

Відамі маёмаснага С. з'яўляецца С. сельскагаспадарчых культур, жывёл, збудаванняў і г.д. У асабістым С. распазнаюць наступныя віды: змешанае С. жыцця, С. дзяцей, С. да шлюбу, С. дадатковай пенсіі, С. ад няшчасных выпадкаў, С. пасажыраў і інш. С. пасажыраў праводзіцца ў абавязковым парадку, астатнія віды С. -- толькі на добраахвотных пачатках.

**СТРУКТУРНАЯ ПАЛІТЫКА** (Структурная политика) -- сукупнасць мер па змяненню прапорцый народнай гаспадаркі, накіраваных на фарміраванне такой сістэмы грамадскай вытворчасці, якая б найбольш поўна адпавядала грамадскім патрэбам, забяспечвала дынамізм, збалансаванасць і высокую эфектыўнасць узнаўленчых працэсаў на базе кардынальнага паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, тэхнічнай рэканструкцыі. Рэалізуецца С.п. праз дзяржаўны план эканамічнага і сацыяльнага развіцця.

Сучасная С.п. прадугледжвае рэсурсазберажэнне, фарсіраванае развіццё перапрацоўчых галін, асабліва машынабудаўнічага комплексу; канцэнтрацыю

капітальных укладанняў па рэалізацыі агульнадзяржаўных праграм - харчовай, энергетычнай, электранізацыі народнай гаспадаркі. Прыняты новы падыход да ўзнаўлення асноўных фондаў -- павелічэнне сродкаў на тэхнічнае пераўзбраенне і рэканструкцыю прадпрыемстваў. Стратэгічным напрамкам С.п. з'яўляецца далейшае ўзмацненне сацыяльнай арыентацыі эканомікі, павелічэнне долі спажывання ў нацыянальным даходзе, павышэнне дабрабыту народа, якаснае пераўтварэнне ўмоў жыцця і працы савецкіх людзей.

Праграма аздараўлення эканомікі прадугледжвае ажыццяўленне радыкальнага абнаўлення структуры народнай гаспадаркі, карэннае змяненне інвестыцыйнай палітыкі, рэзкае скарачэнне колькасці аб'ектаў, якія ўзводзяцца адначасова, зніжэнне аб'ёму капітальных укладанняў на вытворчыя патрэбы, развіццё групы "Б" прамысловасці.

**СТЫМУЛЯВАННЕ** (Стимулирование) -- адзін з прынцыпаў гаспадарчага разліку, які забяспечваецца сістэмай арганізацыйна-эканамічных мер, накіраваных на рэалізацыю матэрыяльнай і маральнай зацікаўленасці асобы або калектыву ў дасягненні рэальных вынікаў карысці, выгады, задавальнення. Гэтая сістэма эканамічна забяспечвае самаакупнасць, самафінансаванне і самакіраванне гаспадарча-разліковых калектываў, якія без С. не змогуць захавацца і ўзнаўляць сябе, утрымацца ў спаборніцтве са сваімі партнёрамі. С. вызначаецца дзеяннем эканамічных законаў і непасрэдна заснавана на выкарыстанні закону размеркавання па працы і катэгорый таварна-грашовых адносін (вартасць, цана, зарплата, прэмія і да т.п.). С. чырвонай ніткай праходзіць праз усю сістэму эканамічных адносін, якія без актывізацыі чалавечага фактару малаэфектыўныя.

Матэрыяльныя інтарэсы выступаюць рухаючай сілай вытворчасці тады, калі яны звязаны з рэальнымі вынікамі гаспадарча-разліковай дзейнасці калектыву. Менавіта гэта і стварае яго матэрыяльную зацікаўленасць у эфектыўным вядзенні гаспадаркі. Калі гэтага няма, то ў калектывах і ў яго асобных членаў фарміруецца рвацкая псіхалогія, імі авалодваюць эгаістычныя

інтарэсы, жаданне ўзяць ад грамадства больш таго, чым аддаюць самі. Сапраўдны ж змест С. у тым, каб патрэбнае грамадству зрабіць выгадным калектыву і кожнаму яго члену, каб кожны атрымаў толькі тое, што заслужыў (зарплату, прэмію, даход, ордэн і г.д.).

С. рэалізуе не толькі зацікаўленасць, але і адказнасць за выкананне сваіх абавязкаў перад дзяржавай і сваімі партнёрамі. За парушэнне планавых заданняў, дагавораў, за нанесеныя страты прадпрыемствы плацяць штрафы, пені, няўстойкі. На жаль, гэты бок С. дзейнічае вельмі слаба, паколькі сістэма матэрыяльнай адказнасці пакуль мала звязана з матэрыяльнай зацікаўленасцю, эканамічныя санкцыі - з матэрыяльным заахвочваннем асобы.

З развіццём і станаўленнем творчых адносін да працы усё большае значэнне набывае яе маральнае С., якое засноўваецца на прызнанні плённасці працоўных намаганняў чалавека, вялікага іх значэння ў вачах людзей, усяго грамадства. Матэрыяльнае і маральнае С. найбольш дзейснае пры іх спалучэнні. Яны павінны быць, поруч са стварэннем матэрыяльна-тэхнічнай базы, галоўнымі сродкамі выхавання сапраўдных творчых адносін да працы.

**СУБВЕНЦЫЯ** (Субвенция) -- грашовыя сродкі, якія выдаюцца з вышэйстаячага бюджэту ніжэйстаячаму для пакрыцця разрыву паміж даходамі і расходамі іх бюджэту. У адрозненне ад датацыі С. накіроўваецца на фінансаванне канкрэтных мерапрыемстваў і мае строга мэтавы характар.

Як метад бюджэтнага рэгулявання С. уведзена ў практыку бюджэтнага планавання ў 1924г. Субвенцыйны фонд фарміраваўся тады са сродкаў саюзнага бюджэту і размяркоўваўся паміж саюзнымі рэспублікамі з улікам узроўню іх эканамічнага і сацыяльнага развіцця, стану даходнай базы бюджэтаў, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, а таксама неабходнасці фінансавання аб'ектаў, якія маюць не толькі мясцовае, але і агульнадзяржаўнае значэнне. С. выкарыстоўвалася як сродак паскоранага пад'ёму адсталых у сваім развіцці тэрыторый. Яна выдавалася на фінансаванне мясцовай

гаспадаркі, адукацыі, культуры, аховы здароўя і забяспечвала больш высокія тэмпы развіцця адпаведнага рэгіёна. Меўся на ўвазе абавязковы ўдзел у гэтым працэсе ўласных сродкаў з мясцовых бюджэтаў дзеля павышэння іх зацікаўленасці ў адшукванні дадатковых крыніц даходаў. Аднак пры недастаткова моцнай фінансавай базе мясцовых бюджэтаў выкананне гэтага патрабавання ўскладнялася. У 1931г. С. была адменена. Уводзілася, як лічылася, больш прагрэсіўная форма бюджэтнага рэгулявання - адлічэнні ад агульнасаюзных дзяржаўных даходаў і падаткаў.

Пры складанні бюджэту былога Саюза на 1990г. зноў была выкарыстана С. для выраўноўвання сацыяльна-эканамічнага развіцця асобных рэспублік.

Закон Рэспублікі Беларусь "Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь" прадугледжвае ў неабходных выпадках вылучэнне органам мясцовага самакіравання С. з вышэйстаячага бюджэту на выкананне мэтавых праграм і мерапрыемстваў. С. закліканы замяніць ранейшую практыку абязлічаных датацый на пакрыццё разрыву паміж даходамі і расходамі, носяць мэтавы характар і будуць выдавацца з вышэйстаячага бюджэту на кампенсацыю недаатрыманых даходаў у сувязі з нераўнамерным іх размеркаваннем паміж рэгіёнамі ва ўмовах дзеючай сістэмы цэн, а таксама на фінансаванне мерапрыемстваў па выраўноўванню сацыяльнай забяспечанасці.

**СУКУПНЫ ПРАЦАЎНІК** (Совокупный работник) - сукупнасць працаўнікоў, грамадская камбінацыя індывідуальных рабочых сіл, якія непасрэдна ці апасродкавана удзельнічаюць у вытворчым працэсе, ствараючы пэўныя спажывецкія вартасці.

У С.п. трэба адрозніваць два бакі. Па-першае, з пункту погляду зместу ён выступае важнейшым элементам прадукцыйных сіл, выяўляе адносіны чалавека да прыроды, ператвараецца з індывідуальнага вытворцы ў члена камбінаванага вытворчага персаналу. Па-другое, з пункту погляду формы С.п. уключае ў сябе сістэму вытворчых адносін прамога абмену дзейнасцю і яе вынікамі.

**СУМЕСНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ** (Совместные предприятия) - новая форма знешнеэканамічных сувязей любой краіны СНД з іншымі дзяржавамі. С.п. ствараюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ці замежных краін на базе агульнай уласнасці ўдзельнікаў, на двухбаковай і шматбаковай аснове. Іх мэты наступныя: 1) прыцягненне ў нашу эканоміку перадавой замежнай тэхналогіі і вопыту кіравання; 2) больш поўнае насычэнне ўнутранага рынку краіны якаснай прадукцыяй, у тым ліку за кошт імпартазамяшчэння; 3) прыцягненне дадатковых матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў; 4) развіццё экспартнай базы краіны.

Гаспадарчае супрацоўніцтва ажыццяўляецца з прадпрыемствамі замежных краін (доля нашага ўдзельніка ў агульнай уласнасці павінна складаць не менш 51%). Па структуры кіравання С.п. мала чым адрозніваецца ад звычайных карпарацый. Іх вышэйшым органам з'яўляецца праўленне, якое складаецца з асоб, назначаных партнёрамі. Кіраўніцтва бягучай дзейнасцю ажыццяўляецца дырэкцыяй, якая фарміруецца з нашых і іншаземных грамадзян (старшыня праўлення і генеральны дырэктар С.п. павінны быць грамадзянамі Рэспублікі Беларусь). Галоўны прынцып дзейнасці - валютная самаакупнасць. С.п. могуць крэдытавацца ў Знешэканомбанку краіны на стаўках сусветнага грашовага рынку або, з іх згоды, у замежных банках. Яны адказваюць па сваіх абавязках ўсёй сваёй маёмасцю. Ім не ўстанаўліваюцца абавязковыя дзяржаўныя планы, аднак не гарантуецца і збыт іх прадукцыі на тэрыторыі краіны.

Вельмі важным для сумеснай прадпрымальнасці з'яўляецца падаткаабкладанне аперацый С.п. У краінах СНД для гэтага выбрана сярэдняя міжнародная стаўка абкладання -- 30%; з чыстага (размеркаванага) прыбытку іншаземнага партнёра пры вывазе за мяжу ў свабоднай валюце бярэцца збор у памеры да 20%. Стварэнне С.п. садзейнічае больш эфектыўнай рэалізацыі нашых навукова-тэхнічных дасягненняў на сусветным рынку. Задача заключаецца ў тым, каб выкарыстаць гэтыя прадпрыемствы не толькі для пакрыцця ўнут-

ранага попыту, але і для пашырэння экспарту. Ужо дзеючыя С.п. маюць самую разнастайную галіновую накіраванасць. З мэтай аказання садзейнічання нашым прадпрыемствам (аб'яднанням) ва ўстанаўленні кантактаў з партнёрамі з іншых краін створаны асацыяцыі дзелавога супрацоўніцтва з замежнымі краінамі.

Т

**ТАВАР** (Товар) - прадукт працы, выраблены не для ўласнага спажывання, а з мэтай абмену на іншыя прадукты або грошы. Адсюль вынікаюць асаблівасці прыродных і грамадскіх уласцівасцей Т. З аднаго боку, Т. - гэта рэч або паслуга, здольная задавальняць якую-небудзь патрэбу чалавека сваімі натуральнымі ўласцівасцямі; з гэтага боку Т. ёсць *спажывецкая вартасць* (хлеб, соль, папера і г.д.). У Т. яна павінна быць грамадскай спажывецкай вартасцю, гэта значыць задавальняць патрэбы не самога вытворцы, а іншых людзей, грамадства. Яна цікавіць вытворцу толькі таму, што здольна абменьвацца на іншыя Т. Т. паступае ў спажыванне толькі праз абмен. Гэтая здольнасць Т. атрымала назву *менавай вартасці.*

Увасобленая ў Т. грамадская праца стварае яго *вартасць.* Яна і ляжыць у аснове колькасных адносін пры абмене. Менавая ж вартасць з'яўляецца формай вартасці, яе знешнім праяўленнем. Такім чынам, Т. выступае як непарыўнае, хаця і супярэчлівае, адзінства двух фактараў - спажывецкай вартасці і вартасці.

Дваістасць Т. абумоўлена дваістым характарам працы таваравытворцаў. З аднаго боку -- гэта якасна вызначаная, мэтанакіраваная, *канкрэтная праца.* Яе вынік -- спажывецкая вартасць. З другога боку - гэта праца як часціна сукупнай грамадскай працы безадносна да яе канкрэтнай формы, як праца наогул - *абстрактная праца.* Яна стварае вартасць Т. Значыць, і вартасць ёсць адносіны паміж таваравытворцамі, але прыхаваныя рэчавай абалонкай. Вартасць - гэта не прыродная, а толькі грамадская ўласцівасць Т., выражэнне эканамічных адносін паміж таваравытворцамі. У гэтых адносінах, якія ажыццяўляюцца на аснове закону вартасці, які патрабуе эквівалентнасці абмену тавараў, ра-

шаючае значэнне мае велічыня вартасці Т. Яна вымяраецца затратамі грамадска неабходнай працы, якая ідзе на выраб пераважнай большасці канкрэтных Т. Вартасць адзінкі Т. залежыць ад прадукцыйнасці працы: чым яна вышэйшая, тым ніжэйшая вартасць.

**ТАВАРНА-ГРАШОВЫЯ АДНОСІНЫ** (Товарно-денежные отношения) - сістэма вытворчых адносін, якая складаецца ў грамадстве паміж яго членамі, прадпрыемствамі і дзяржавай (яе арганізацыямі) у сувязі з купляй-продажам прадуктаў-тавараў, апасродкуецца грашыма і вартаснымі формамі.

Неабходнасць Т.-г.а. звязана з захаваннем і развіццём грамадскага падзелу працы і эканамічнай адасобленасці таваравытворцаў -- прадпрыемстваў, індывідуальнай працоўнай дзейнасці і асабістых гаспадарак. Прадукты іх працы паступаюць у спажыванне праз абмен, які апасродкуецца грашыма. Асноўнымі катэгорыямі Т.-г.а. з'яўляецца тавар, вартасць, цана як грашовае выражэнне вартасці, грошы, сабекошт, прыбытак, фінансы, крэдыт і інш.

Развіццё поўнага гаспадарчага разліку, размеркавальных адносін, эканамічнага стымулявання выкарыстоўваецца для павышэння эфектыўнасці вытворчасці і азначае актывізацыю Т.-г.а. у рэалізацыі розных відаў і груп інтарэсаў. Рынак зможа паспяхова развівацца і служыць інтарэсам чалавека ў тым выпадку, калі мы створым эфектыўны эканамічны механізм яго рэгулявання, які забяспечыць надзейную ахову інтарэсаў грамадзян ад рыначнай стыхіі.

**ТАВАРНАЕ АБАРАЧЭННЕ** (Товарное обращение) -- абмен тавараў пры дапамозе грошай (формула абарачэння Т-Г-Т). У адрозненне ад непасрэднага абмену тавараў (Т-Т), дзе акты куплі і продажу супадаюць, пры Т.а. абмен распадаецца на два самастойныя акты: продажу (Т-Г) і куплі (Г-Т). Паміж Т.а. і вытворчасцю існуе не толькі сувязь, але ўзаемная залежнасць (пры вядучай ролі вытворчасці). Т.а. даводзіць гатовы прадукт вытворчасці да спажыўцоў. Яго магчымасць, аб'ём, структура вызначаюцца вытворчасцю, а апошняя, у сваю чаргу, можа бесперабойна дзейнічаць і

развівацца пры рэалізацыі выробленых і прапануемых тавараў і задавальненні яго попыту на сродкі вытворчасці, рабочую сілу і маркетынгавую інфармацыю. На аснове куплі-продажу тавараў і іншых аб'ектаў уласнасці ўся сфера абарачэння (грошай, крэдыту, каштоўных папер і інш.) сфарміравалася як складаная сістэма гаспадарчых і грамадскіх адносін. Характар яе дзейнасці вызначаецца пануючай формай уласнасці.

Таварная вытворчасць і Т.а., уся сістэма таварна-грашовых адносін, іх законы і катэгорыі арганічна ўласцівы нашай эканоміцы. На аснове выкарыстання розных форм грамадскай уласнасці абумоўліваюцца іх развіццё і падпарадкаванне дасягненню адзінай мэты - задавальненню інтарэсаў грамадства, калектыву і кожнага яго члена. Гэтыя рознабаковыя інтарэсы задавальняюцца ў іх спалучэнні, ва ўзаемнай залежнасці адзін ад другога і рэалізуюцца толькі тады, калі выраблены прадукт знойдзе свайго спажыўца і тым самым дакажа сваю грамадскую карысць. Сфера Т.а. (матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне і аптовы гандаль, нарыхтоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, рознічны гандаль ва ўсіх формах і знешні гандаль) дазваляе выявіць ступень адпаведнасці выраблених сродкаў вытворчасці і прадметаў спажывання патрэбам грамадства і, уздзейнічаючы на вытворчасць, задаволіць іх. Шлях да гэтага ў асноўным і галоўным вызначаецца самой вытворчасцю, характарам яе сувязі са сферай спажывання, а ў мностве разнастайных выпадкаў - праз куплю-продаж, праз рынак. Рацыянальнай формай гэтага своеасаблівага і супярэчлівага сінтэзу планамернасці і таварна-грашовых адносін з'яўляецца гаспадарчы разлік, які звязвае сферу вытворчасці і Т.а. у адзінае цэлае.

**ТАВАРНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ** (Товарное производство) -- такая арганізацыя грамадскай вытворчасці, пры якой эканамічныя адносіны паміж людзьмі праяўляюцца праз рынак, праз куплю-продаж прадуктаў іх працы. Асноўная яе рыса - вытворчасць прадуктаў для продажу.

Для ўзнікнення Т.в. патрэбны дзве ўмовы: 1) грамадскі падзел працы, які дыктуе неабходнасць абмену;

2) эканамічнае адасабленне вытворцаў, якое вызначае форму гэтага абмену - куплю-продаж. Апошняе заснавана на такіх тыпах і формах прыватнай і грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці і прадукты працы, якія пры сваёй рэалізацыі патрабуюць вартасных эквівалентных сувязей.

**ТАВАРЫ НАРОДНАГА СПАЖЫВАННЯ** (Товары народного потребления) - прадукты працы, матэрыяльныя даброты, прызначаныя для асабістага спажывання насельніцтва. У грамадскім узнаўленні ствараюць групу прадметаў спажывання - прадукт II падраздзялення. У прамысловасці Т.н.с. складаюць групу "Б". У нацыянальным даходзе сумарны аб'ём (па вартасці) Т.н.с. меншы, чым фонд спажывання, бо апошні траціцца і на аплату паслуг.

Выдзяленне Т.н.с. у самастойную групу мае вялікае эканамічнае, узнаўленчае значэнне. Іх сукупнасць фарміруе спажывецкі рынак, а выраб і прапанаванне Т.н.с. павінны знаходзіцца ў пэўных суадносінах-прапорцыях з вырабам сродкаў вытворчасці (прадуктам II падраздзялення грамадскай вытворчасці, групай "А" - у прамысловасці), з аднаго боку, і плацежаздольным попытам - з другога. Т.н.с. у якасці аб'екту планавання і кіравання іграюць першаступенную ролю, бо яны задавальняюць першачарговыя патрэбы насельніцтва - патрэбы ў матэрыяльных дабротах.

Т.н.с. падраздзяляюцца на дзве групы: прамысловыя і прадуктовыя (непрамысловыя). Арыенцірам для распрацоўкі праграмы вырабу Т.н.с. з'яўляюцца так званыя рацыянальныя нормы спажывання, а адным з паказчыкаў эканамічнай магутнасці краіны і ўзроўню жыцця насельніцтва -- выраб Т.н.с. на душу насельніцтва.

Аздараўленне эканомікі краіны ўключае ў сябе ў якасці састаўной часткі павышэнне тэмпаў росту і асабліва якасці Т.н.с. Мінулыя гады XII пяцігодкі не забяспечылі дастатковае насычэнне рынку спажывецкімі таварамі. Больш таго, узмацніліся такія негатыўныя працэсы, як маруднае павышэнне якасці, незабяспечанасць попыту, рост цэн, узмацненне дэфіцыту і

інш. Таму адным з цэнтральных пытанняў дзейнасці ўрада Рэспублікі Беларусь застаецца праграма павелічэння вырабу і павышэння якасці Т.н.с., першачарговае задавальненне попыту на тавары першай неабходнасці.

**ТРЭСТ** (Трест) -- арганізацыйна-гаспадарчае аб'яднанне вытворчых прадпрыемстваў. У сучаснай эканамічнай літаратуры вылучаюць тры віды Т.:

1) адна з форм аб'яднанняў, у рамках якой удзельнікі губляюць вытворчую, камерцыйную, а часам і юрыдычную самастойнасць. Рэальная ўлада пры гэтым сканцэнтроўваецца ў руках праўлення або галаўной кампаніі. Найбольшае распаўсюджанне атрымалі ў канцы XIX -- пачатку XX ст. у галінах, якія выраблялі аднародную прадукцыю. У сучасных умовах дыверсіфікацыя вытворчасці сустракаецца рэдка;

2) гаспадарча-разліковыя аб'яднанні прадпрыемстваў адной галіны або тэрытарыяльна-галіновыя, якія атрымалі развіццё ў СССР у гады НЭПа. Знаходзячыся пад кантролем ВСНГ, Т. неслі поўную адказнасць перад дзяржавай за выкананне плана, захаванасць даверанай маёмасці, займаліся спецыялізацыяй вытворчасці, збытам гатовай прадукцыі аб'яднаных фабрык і заводаў, забеспячэннем іх сыравінай і матэрыяламі, фарміравалі фонды вытворчага і сацыяльнага развіцця. Т. падраздзяляліся на агульнасаюзныя, рэспубліканскія і мясцовыя. Ліквідаваны ў сярэдзіне першай пяцігодкі (1929--1932гг.);

3) арганізацыйна-вытворчая адзінка будаўнічай індустрыі (напрыклад, будаўніча-мантажныя Т. і інш.).

**ТЭРЫТАРЫЯЛЬНА-ВЫТВОРЧЫ КОМПЛЕКС, або ТВК** (Территориально-производственный комплекс, или ТПК) -- сукупнасць эканамічна ўзаемазвязаных вытворчасцей, якія прапарцыянальна развіваюцца і сканцэнтраваны на абмежаванай тэрыторыі, а таксама комплексна выкарыстоўваюць яе рэсурсы. ТВК уключае ў сябе спецыялізаваныя прадпрыемствы, вытворчасці, што іх дапаўняюць, аб'екты вытворчай і сацыяльнай інфраструктуры. Фарміраванне ТВК -- адзін з напрамкаў удасканалення размяшчэння прадукцыйных

сіл. У рамках ТВК ствараюцца спрыяльныя перадумовы для развіцця прагрэсіўных форм арганізацыі вытворчасці -- спецыялізацыі, кааперавання, камбінавання, рацыянальнага выкарыстання прыродных і эканамічных умоў. Аптымальнае спалучэнне ў комплексах узаемазвязаных вытворчасцей, арганізацыя і выкарыстанне адзінай вытворчай і сацыяльнай інфраструктуры забяспечваюць эканомію капітальных укладанняў і бягучых затрат. Галоўным фактарам фарміравання ТВК з'яўляецца наяўнасць паліўна-энергетычных і сыравінных рэсурсаў.

Павышэнне комплекснасці і эфектыўнасці ТВК, якія фарміруюцца, цесна звязана з удасканаленнем планавання і кіравання. Схемы фарміравання і развіцця ТВК распрацоўваюцца на аснове варыянтных тэхніка-эканамічных разлікаў, зыходзячы з ацэнкі прыродных і эканамічных умоў і вызначэння іх ролі ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных задач, што стаяць перад эканамічнымі раёнамі, на тэрыторыі якіх яны фарміруюцца. На базе гэтых схем ствараюцца мэтавыя комплексныя праграмы развіцця і размяшчэння прадукцыйных сіл па найбольш буйных і значных у народнагаспадарчым сэнсе ТВК.

**ТЭХНІЧНЫ УЗРОВЕНЬ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Технический уровень производства) - сістэма паказчыкаў, якая характарызуе ступень развітасці матэрыяльных элементаў, што прымяняюцца ў вытворчасці (сродкі працы і прадметы працы), а таксама адпаведнасць тэхналогіі і прадукцыі навейшым дасягненням навукі і тэхнікі. У комплексе з арганізацыйным, эканамічным і сацыяльным узроўнямі, паміж якімі існуе цесная сувязь і ўзаемазалежнасць, Т.у.в. характарызуе вытворча-гаспадарчую дзейнасць прадпрыемства і яго падраздзяленняў. Т.у.в. вызначаецца асноватворным уплывам навукова-тэхнічнага прагрэсу на ўсе бакі вытворчасці. Змераць яго -- значыць вызначыць ступень адпаведнасці дзеючай вытворчасці сучаснаму ўзроўню развіцця навукі і тэхнікі, устанавіць зыходную базу для планавання арганізацыі вытворчасці, эканамічных паказчыкаў і сацыяльнага развіцця, а таксама прагназіраваць і плана-

ваць непасрэдна сам тэхнічны прагрэс, выяўляць рэзервы і абгрунтоўваць шляхі яго далейшага развіцця.

У прамысловасці для вызначэння Т.у.в. выкарыстоўваецца каля 350 паказчыкаў. Яго крытэрыем з'яўляецца ўзровень прагрэсіўнасці выкарыстоўваемай тэхнікі і выпускаемай прадукцыі. Ён павінен адпавядаць патрабаванню пастаяннага ўдасканалення тэхнічнага базісу вытворчасці і паддавацца колькаснаму вымярэнню. Сістэма паказчыкаў грунтуецца на тэхнічных параметрах, і кожны з іх у асноўным вызначаецца адносінамі гэтага параметра ў дзеючых умовах да эталонных, гэта значыць да тых, якія існуюць у дадзены момант у нашай краіне і за мяжой. Вось некаторыя з іх:

1) каэфіцыент прагрэсіўнасці парку абсталявання $К_{па}=П_а/П_э$, дзе $П_а$ і $П_э$ - прадукцыйнасць абсталявання, якое выкарыстоўваецца, і прадукцыйнасць эталону;

2) каэфіцыент прагрэсіўнасці прадметаў працы $К_{пп}=М_п/М_а$, дзе $М_п$ і $М_а$ - аб'ёмы прагрэсіўных матэрыялаў і сыравіны і аб'ёмы, агульныя ў прынятых адзінках вымярэння;

3) каэфіцыент прагрэсіўнасці тэхналогіі вытворчасці $К_{пт}=В_т/В_а$, дзе $В_т$ і $В_а$ - аб'ёмы выпушчанай прадукцыі (выкананых работ) па прагрэсіўных тэхналагічных працэсах і аб'ёмы, агульныя ў прынятых адзінках вымярэння;

4) каэфіцыент прагрэсіўнасці прадукцыі, які з'яўляецца абагульняючым паказчыкам Т.у.в. $К_{пп}=В_я/В_а$, дзе $В_я$ - аб'ём выпушчанай прадукцыі вышэйшай катэгорыі якасці (ці ўстаноўленага параметра) у прынятых адзінках вымярэння.

Ступень дасканаласці сродкаў і прадметаў працы, метадаў тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца на прадпрыемстве, адлюстроўваецца наступнымі паказчыкамі:

1) ступень механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці $С_{мв}=П_п/П_а$ або $В_м/В_а$, ступень механізацыі і аўтаматызацыі працы $С_{мп}=К_м/К_а$, дзе $П_п$, $В_м$, $К_м$ і $П_а$, $В_а$, $К_а$ - аб'ёмы выпрацаванай прадукцыі ў прынятых адзінках вымярэння (норма - гадз., шт., т і г.д.), колькасць рабочых на механізаваным (аўтаматызаваным) абсталяванні і іх агульная колькасць;

2) ступень хімізацыі вытворчасці $С_{хв}=З_{хм}/Т_п$ або $З_{хм}/С_а$, дзе $З_{хм}$-затраты на хімічныя матэрыялы ў руб., $Т_п$ або $С_а$ -- сабекошт ці аб'ём таварнай прадукцыі ў руб.

Разлік прыведзеных і іншых паказчыкаў Т.у.в. патрабуе ўдасканалення работы службы інфармацыі на прадпрыемстве.

## У

**УДЗЕЛ ПРАЦОЎНЫХ У КІРАВАННІ ВЫТВОРЧАСЦЮ** (Участие трудящихся в управлении производством) -- важная форма і паказчык дэмакратызацыі грамадства. У.п. у к.в. -- шматграннае паняцце. Яно рэалізуецца праз наступныя формы: прадстаўнічыя -- дэпутацкія групы, грамадскія арганізацыі, непасрэдныя -- рабочыя сходы, самадзейныя фарміраванні (грамадскія аддзелы кадраў, грамадскія бюро эканамічнага аналізу, грамадскія канструктарскія бюро і да т.п.), розныя камісіі; змешаныя формы - удзел у кіраванні сумесна з адміністрацыяй; асабісты ўдзел працоўных у кіраванні, у тым ліку і ініцыятыўны.

Можна выдзеліць 3 узроўні У.п. у к.в.: першы - без выказвання свайго пункту гледжання, шляхам галасавання на сходах, нарадах, мітынгах, канферэнцыях і адабрэння ці неадабрэння іх рашэнняў; другі (больш высокі) - непасрэдны ўдзел у прыняцці рашэнняў па кіраванню, якія датычацца кожнага рабочага месца, шляхам падачы прапаноў, выказвання сваёй думкі, а таксама прыняццем усіх мер па рэалізацыі сваіх рашэнняў; трэці (найбольш высокі) - практычная дзейнасць працоўных у розных грамадскіх фарміраваннях. Аднак грані паміж імі рухомыя. Самай высокай формай У.п. у к.в. з'яўляецца самакіраванне працоўнага калектыву.

Каб У.п. у к.в. быў эфектыўны для агульнай працы, карысным для кожнага чалавека і прыносіў пажаданыя вынікі, яго арганізацыя павінна будавацца з улікам агульных прынцыпаў кіравання. У той жа час як спецыфічны працэс яна павінна падпарадкоўвацца асобым прынцыпам: усеагульнасці, адпаведнасці, перманентнасці, планавага кіравання, сістэмнага падыходу, кампетэнтнасці, нарматыўных гарантый і прававога рэгулявання ўцягвання працоўных у кіраванне. Эфект дзей-

насці працоўных у кіраванні выяўляецца ў трох напрамках: 1) у галіне рэалізацыі галоўных мэт вытворчасці (выраб, развіццё, эканоміка, збыт і да т.п.); 2) у галіне сацыяльных адносін у калектыве (межасабовыя адносіны, паляпшэнне сацыяльнага клімату, ліквідацыя канфліктаў і інш.); 3) у галіне паляпшэння псіхалагічнага стану асобы (усебаковае яе развіццё, сацыяльны і душэўны камфорт і інш.).

**УЗНАУЛЕННЕ ГРАМАДСКАЕ** (Воспроизводство общественное) - працэс грамадскай вытворчасці, які працякае ў пастаянным і бесперапынным яго аднаўленні. Грамадства не можа спыніць спажыванне, значыць, не можа спыніць і вытворчасць грамадскага прадукту. Узнаўляюцца прадукцыйныя сілы грамадства і вытворчыя адносіны. Узнаўленне прадукцыйных сіл азначае пастаяннае аднаўленне рабочай сілы і сродкаў вытворчасці, а таксама прыродных рэсурсаў. Рабочая сіла і сродкі вытворчасці ўзнаўляюцца пры іх спалучэнні ў пэўных прапорцыях на аснове іх якаснага развіцця. Парушэнне такіх прапорцый непазбежна вядзе да перабояў у вытворчасці, зніжэння яе эфектыўнасці. Адначасова з прадукцыйнымі сіламі ўзнаўляюцца і адпаведныя ім вытворчыя адносіны. З развіццём прадукцыйных сіл ажыццяўляецца рэвалюцыйная змена вытворчых адносін і развіццё грамадскай вытворчасці выступае як адзіны прагрэсіўны гістарычны працэс.

Адрозніваюць два тыпы ўзнаўлення: простае і расшыранае. Пры простым узнаўленні велічыня і якасць створанага прадукту ў кожным наступным цыкле вытворчасці застаюцца нязменнымі, таму што і фактары вытворчасці застаюцца без змен. Увесь створаны прадукт выкарыстоўваецца вытворцамі для асабістага спажывання. Пры расшыраным узнаўленні памеры створанага прадукту, як і яго якасць, узрастаюць на аснове павышэння фактараў вытворчасці. Крыніцай гэтых змен з'яўляецца прыбавачны прадукт, які прысвойваецца ўласнікамі і падзяляецца на дзве часткі: накапляемую і спажываемую. Матэрыяльнай асновай ўзнаўлення з'яўляецца грамадскі прадукт, які з кожнага наступнага цыклу выходзіць павялічаным па аб'ёму і больш даска-

налым па сваёй структуры і якасці. Яго рост вызначаецца з дапамогай тэмпаў прыросту, якія павінны мець рэальны змест спажывецкіх вартасцей, што адпавядаюць грамадскім патрэбам і лепшым сусветным дасягненням. Гэта дазваляе забяспечваць расшыранае ўзнаўленне прадукцыйных сіл -- сродкаў і прадметаў працы, сукупнай рабочай сілы і ўсёй сістэмы арганізацыі вытворчасці на розных узроўнях народнай гаспадаркі. Сацыяльная накіраванасць, пераход ад частковай і ўсебаковай інтэнсіфікацыі, паляпшэнне якасці прадукцыі, структурная перабудова эканомікі - галоўныя напрамкі ўзнаўлення прадукцыйных сіл.

**УЛАСНАСЦЬ АГУЛЬНАЯ** (Собственность общая) -- адносіны паміж грамадзянамі па лініі маёмасці, якая належыць адначасова некалькім асобам. У нашай краіне маёмасць членаў сям'і выступае як агульная, сумесная. Выключэнне складаюць толькі прадметы індывідуальнага карыстання - адзенне, абутак і да т.п. У.а. можа быць долевай або сумеснай.

У.а. мае месца і тады, калі адзін з членаў сям'і не працуе, часцей за ўсё жонка, дзеці, гэта значыць знаходзіцца на ўтрыманні мужа, бацькі.

Аб'ектамі У.а. могуць з'яўляцца жылы дом, кватэра, атрыманая ад дзяржавы або набытая ў кааператыўным ці іншым жыллёвым фондзе, дача, садовы домік, насаджэнні на зямельным участку, грашовыя зберажэнні, акцыі і іншыя каштоўныя паперы, прадметы хатняга ўжытку, сродкі вытворчасці для вядзення дапаможнай гаспадаркі ці для індывідуальнай (сямейнай) дзейнасці, транспартныя сродкі і інш.

Памеры У.а. не абмежаваныя, вызначаюцца толькі абставінамі яе набыцця. Крыніцай У.а. могуць быць толькі працоўныя даходы або атрыманне спадчыны, паявыя ўзносы. Многія эканамісты адносяць атрыманне спадчыны да непрацоўных даходаў, і таму выказваецца думка аб неабходнасці канфіскавання значнай яго часткі ў даход дзяржавы праз падаткаабкладанне на атрыманае ў спадчыну. Да таго ж, здараюцца выпадкі несумленнага (непрацоўнага) набыцця У.а., якая, аднак, пераходзячы ў спадчыну родзічам, становіцца як бы законнай.

У нас пры стварэнні сям'і не заведзена заключаць шлюбныя кантракты. Гэта абставіна спараджае нямала маёмасных спрэчак пры скасаванні шлюбу. Неабходна, выкарыстоўваючы сусветны вопыт, загадзя, пры ўступленні ў шлюб, вызначыць умовы валодання, распараджэння У.а.

**УЛАСНАСЦЬ ГРАМАДЗЯН** (Собственность граждан) - адносіны паміж членамі нашага грамадства, а таксама паміж імі або калектывамі і дзяржавай наогул па лініі набыцця, выкарыстання, валодання прадметамі індывідуальнага або сямейнага карыстання, а таксама сродкамі вытворчасці для вядзення дапаможнай гаспадаркі, індывідуальнай (сямейнай) працоўнай дзейнасці.

Аб'ектамі У.г. з'яўляюцца розныя прадметы спажывання, якія выкарыстоўваюцца грамадзянамі паводле свайго меркавання для задавальнення сваіх разнастайных матэрыяльных і духоўных патрэб (Гл. *Уласнасць агульная*).

Крыніцай фарміравання У.г. з'яўляюцца: 1) працоўныя даходы (удзел у грамадскай вытворчасці, даходы з грамадскіх фондаў спажывання, вядзенне асабістай дапаможнай гаспадаркі, індывідуальная працоўная дзейнасць); 2) непрацоўныя даходы. Апошнія, ў сваю чаргу, падзяляюцца на: а) законныя (легальныя) - пераход маёмасці грамадзян у спадчыну, ўкладанні ў крэдытныя ўстановы (працэнт, выігрыш у латарэі, пазыцы), б) незаконныя, гэта значыць атрыманыя пазаэканамічнымі спосабамі. Абвешчаная ў краіне задача барацьбы з непрацоўнымі даходамі мае на ўвазе менавіта нелегальныя даходы, якія паступаюць ва У.г. шляхам крадзяжу, рабаўніцтва, спекуляцыі, прыпісак, злоўжывання службовым становішчам, хабарніцтва і г.д.

Багацце народа характарызуецца не толькі памерам У.г., але і ідэйна-маральнымі, духоўнымі каштоўнасцямі.

**УЛАСНАСЦЬ ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ПРАЦОЎНАЯ** (Собственность индивидуальная трудовая) - адносіны паміж членамі грамадства, калектывамі і дзяржавай па лініі набыцця, выкарыстання і валодання

індывідамі прадметамі асабістага карыстання і сродкамі вытворчасці, атрыманымі толькі за кошт працоўных даходаў (Гл. *Уласнасць агульная; Уласнасць грамадзян*).

**УЛАСНАСЦЬ КАЛЕКТЫЎНАЯ** (Собственность коллективная) - адносіны паміж працоўным (творчым і інш.) калектывам і дзяржавай па лініі выкарыстання, валодання, размеркавання вытворчых фондаў, выпрацаванай прадукцыі і атрыманых даходаў ад гаспадарчай дзейнасці. Калектыўныя ўтварэнні ў форме арэнднага прадпрыемства, кааператыўнага прадпрыемства, вытворчых, навуковых, пасрэдніцкіх і іншых кааператываў ствараюцца за кошт перадачы (выкупу) аб'екта дзяржаўнай уласнасці ў арэнду або на долевых, паявых і акцыянерных пачатках.

У.к. атрымлівае далейшае развіццё ва ўмовах разнастайнасці форм уласнасці ў перабудовачны перыяд. Вылучаюцца наступныя віды У.к.: уласнасць працоўнага калектыву дзяржаўнага прадпрыемства, уласнасць асацыяцыі працоўных, уласнасць кааператываў, уласнасць гаспадарчых таварыстваў, уласнасць акцыянернага таварыства, уласнасць гаспадарчых асацыяцый, уласнасць грамадскіх арганізацый, уласнасць рэлігійных арганізацый. Прадугледжваецца, што ў дзяржаўным прадпрыемстве можа ўтварацца і доля У.к., павелічэнне якой магчыма за кошт паступовага выкупу ў дзяржавы асноўных вытворчых фондаў. Калі яны поўнасцю пяройдуць ва У.к., то па рашэнню працоўнага калектыву можа быць утворана асацыяцыя працоўных (калектыўнае прадпрыемства), кааператыў, гаспадарчае або акцыянернае таварыства.

Ва ўмовах У.к. работнік, які выкарыстоўвае сродкі вытворчасці, з'яўляецца іх паўнаўладным гаспадаром. Працоўны калектыў вызначае памеры ўкладу кожнага свайго члена ў стварэнне У.к. Гэта можа быць асабісты працоўны ўдзел, грашовыя або маёмасныя ўзносы. Велічыня ўкладу, а таксама памер працоўных налічэнняў вызначаюцца штогод для кожнага работніка працоўным калектывам. Даход, атрыманы членам працоўнага калектыву, можа выкарыстоўвацца паводле яго асабістага меркавання.

У выпадку, калі член У.к. перапыняе працоўныя адносіны, то права атрымання працэнтаў на свой уклад за ім захоўваецца. Пры ліквідацыі прадпрыемства, заснаванага на У.к., уклад члена працоўнага калектыву кампенсуецца яму ў выглядзе грошай або каштоўных папер.

Стварэнне У.к. - важнейшы шлях дэмантажу адміністрацыйна-каманднай сістэмы.

**УЛАСНАСЦЬ СУМЕСНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ** (Собственность совместных предприятий) - гэта адносіны паміж прадпрыемствамі (фірмамі), кааператывамі і партнёрамі з замежных краін па лініі стварэння і наступнай гаспадарчай дзейнасці змешаных вытворчых адзінак. Мэтай іх арганізацыі з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці выкарыстання наяўнага вытворчага патэнцыялу для больш поўнага задавальнення грамадскіх патрэб.

Сумесныя прадпрыемствы пачалі ствараецца, былі вызначаны арганізацыйна-эканамічныя і прававыя асновы іх стварэння. Урадавымі актамі акрэслены асноўныя структурныя элементы іх дзейнасці: матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне; фарміраванне актываў: размеркаванне актываў і валютнай выручкі; прынцыпы падаткаабкладання, арганізацыі і аплаты працы, сацыяльнага забеспячэння і г.д. Кіраванне суместнымі прадпрыемствамі ажыццяўляюць, як правіла, саветы дырэктароў, куды абавязкова ўваходзяць і прадстаўнікі замежнага капіталу. Прадукцыя, прыбытак размяркоўваюцца калектыўна.

Зацікаўленасць нашай дзяржавы ва ўтварэнні У.с.п. заключаецца ў тым, каб атрымаць магчымасць для выкарыстання перадавой тэхнікі і тэхналогіі, сучаснай сістэмы менеджэрызму, дадатковых матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў, для развіцця экспартнай базы і рацыяналізавання імпарту.

У.с.п. функцыяніруе на аснове гаспадарчага разліку і валютнай самаакупнасці. У.с.п. - гэта адроджаная (існавала пры НЭПе) і, магчыма, перспектыўная форма ўласнасці, якая дазволіць вырашыць праблему навукова-тэхнічнага прагрэсу і інтэнсіфікацыі вытворчасці. Аднак трэба бачыць і адмоўныя бакі гэтага працэсу: з

рэспублікі вывозіцца прыбавачная вартасць; намецілася тэндэнцыя ўвозу да нас экалагічна шкоднай вытворчасці з развітых капіталістычных краін. Значыць, стварэнне У.с.п. патрабуе кантролю з боку грамадскасці, Саветаў народных дэпутатаў.

**УЛІК НАРОДНАГАСПАДАРЧЫ** (Учет народнохозяйственный) -- спосаб адлюстравання фактычных вынікаў працэсаў ці з'яў, якія адбываюцца ў эканамічнай, сацыяльнай і іншых сферах народнай гаспадаркі, і ўваходзіць у сістэму кіравання як яе састаўны элемент. Існуе адзіная сістэма народнагаспадарчага ўліку. У яе ўключаюць тры віды ўліку: бухгалтарскі, статыстычны і аператыўны. Асноўнымі адметнымі прыкметамі першага лічацца дакументальнасць, суцэльнае бесперапыннае адлюстраванне гаспадарчых аперацый, прымяненне грашовага вымяральніка, выкарыстанне спецыяльных прыёмаў (рахункі, двайны запіс, балансавае абагульненне сродкаў і іх крыніц). Статыстычны ўлік прызначаецца для абагульнення і вывучэння масавых сацыяльна-эканамічных з'яў, а аператыўны -- для забеспячэння сістэмы аператыўнага кіравання неабходнай фактычнай інфармацыяй. Гаспадарчы ўлік у кіраванні можа падзяляцца, як і аналіз гаспадарчай дзейнасці, на асобныя віды. Яго мэта заключаецца ў забеспячэнні канкрэтнай сістэмы кіравання неабходнай фактычнай інфармацыяй аб аб'екце кіравання. Пры гэтым інфармацыя павінна быць дакладнай, своечасовай і поўнай. Не менш важнай мэтай гаспадарчага ўліку, у прыватнасці бухгалтарскага, з'яўляецца дакладнае выкананне сваёй функцыі ў сістэме эканоміі рэсурсаў.

**УНУТРАНЫ РЫНАК** (Внутренний рынок) -- катэгорыя таварнай гаспадаркі, якая ўяўляе сабой сістэму эканамічных адносін, што ўзнікаюць паміж прадаўцамі і пакупнікамі ў працэсе рэалізацыі тавараў адной краіны. У.р. падзяляецца на рынак сродкаў вытворчасці (Гл.*Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне*), спажывецкі рынак, рынак каштоўных папер.

*Рынак спажывецкі* - рынак тавараў народнага спажывання. Эканамічныя адносіны на рынку тавараў народнага спажывання выяўляюцца ў форме

ўзаемадзеяння паміж попытам і прапанаваннем, рэалізуюцца ў актах куплі-продажу. У.р. прадметаў спажывання ўключае ў сябе галіновыя і рэгіянальныя таварныя рынкі, абмежаваныя рамкамі эканамічных раёнаў.

Ёмістасць рынку тавараў народнага спажывання -- гэта магчымы аб'ём іх рэалізацыі пры адпаведных грашовых даходах насельніцтва, прапанаванні тавараў і цэнах. Кан'юнктура таварнага рынку -- гэта стан гандлю за пэўны перыяд часу, які складваецца пад уплывам попыту і таварнага прапанавання ў канкрэтных умовах гаспадарчай дзейнасці гандлёвых арганізацый і прадпрыемстваў. Мэтам стварэння жыццяздольнага рынку тавараў народнага спажывання садзейнічае перабудова вытворча-збытавай і камерцыйнай дзейнасці на аснове прымянення маркетынгу. Асноўнымі элементамі маркетынгавай дзейнасці з'яўляюцца: даследаванні маркетынгу, планаванне асартыменту прадукцыі, збыт і рэалізацыя, стымуляванне збыту і рэклама.

Для стварэння паўнацэннага рынку неабходна збалансаваць і прывесці ў адпаведнасць абарот матэрыяльных і грашовых рэсурсаў, ліквідаваць дэфіцыт, правесці рэформу цэн, дэманапалізаваць вытворчую структуру народнай гаспадаркі, стварыць умовы для развіцця канкурэнцыі. Трэба вырашыць праблему ўмелага спалучэння рыначных стымулаў і пэўных эканамічных і сацыяльных гарантый для прадпрыемстваў і іх работнікаў.

**УРАЎНІЛАЎКА** (Уравниловка) - размеркаванне матэрыяльных даброт паміж работнікамі пароўну, незалежна ад ступені іх удзелу ў грамадскай вытворчасці. У. узнікае ў выніку парушэння прынцыпу аплаты працы ў адпаведнасці з яе колькасцю і якасцю і праяўляецца ў адсутнасці залежнасці паміж прыростам заработнай платы працоўных калектываў і асобных работнікаў і паляпшэннем вытворчых паказчыкаў, ростам прадукцыйнасці працы.

Пры У. больш інтэнсіўная і эфектыўная праца можа аплачвацца горш, чым работа, выкананая на паўсілы, сярэдняя заработная плата ў адстаючых калектывах можа быць вышэйшай, чым у перадавых. У. вядзе да ніве-

ліравання здольнасцей людзей, уніфікуе іх патрэбы, ігнаруе матэрыяльнае стымуляванне і асабістую зацікаўленасць у выніках працы і, такім чынам, з'яўляецца тормазам развіцця працоўнай актыўнасці работнікаў.

Аб'ектыўныя перадумовы для ліквідацыі У. ствараюцца ва ўмовах поўнага гаспадарчага разліку і самафінансавання, калі работнікі пастаўлены ў такія эканамічныя ўмовы, што ім не ўсё роўна, як, якімі намаганнямі і які эфект дасягаецца кожным членам калектыву.

## Ф

**ФІНАНСАВА-КРЭДЫТНЫ МЕХАНІЗМ** (Финансово-кредитный механизм) -- сукупнасць форм фінансавых і крэдытных адносін, а таксама метадаў іх ажыццяўлення, прызначаных для рэалізацыі задач і мэт эканамічнай палітыкі.

Фінансавыя адносіны могуць выступаюць у форме платы за фонды, платы за працоўныя рэсурсы, падатку з абароту, адлічэнняў ад прыбытку, падаходнага падатку з калгасна-кааператыўных прадпрыемстваў, фінансавання з бюджэту, фондаў эканамічнага стымулявання, падаткаў з насельніцтва і да т.п. Крэдытным адносінам надаюцца формы розных пазык і плацяжоў за карыстанне пазыкамі. Формы фінансава-крэдытных адносін уяўляюць сабой фінансава-крэдытныя рычагі, з дапамогай якіх можна актыўна ўздзейнічаць на вынікі гаспадарання.

Метады арганізацыі форм фінансава-крэдытных адносін уключаюць у сябе тры асноўныя звяны: а) парадак арганізацыі ўказаных форм (вылічэнне, умовы і тэрміны ажыццяўлення, ільготнасць і да т.п.); б) стымулы, якія ўяўляюць сабой магчымасць той ці іншай формы фінансава-крэдытных адносін уздзейнічаць рублём на гаспадарчыя паводзіны калектыву ці асобнага работніка; в) нарматывы, якія вызначаюць важкасць, памер стымулу (такім чынам нарматывы забяспечваюць рэальнасць стымулюючага механізму форм фінансава-крэдытных адносін).

Анализ Ф.-к.м. 70-х - першай палавіны 80-х гадоў паказвае, што ён састарэў, не здольны выконваць ролю

актыўнага стымулятара эфектыўнай работы і таму патрабуе карэннай перабудовы. Асноўныя напрамкі гэтай перабудовы: пашырэнне межаў самастойнасці прадпрыемстваў (аб'яднанняў), устаноў, абласцей, раёнаў; забеспячэнне рэальных стымулаў да павелічэння сродкаў на эканамічнае і сацыяльнае развіццё; станаўленне сістэмы эканамічных нарматываў працяглага дзеяння: плацяжоў, падаткаў, фінансавання, матэрыяльнага заахвочвання і пакарання, плацяжоў за пазыкі і да т.п., якія забяспечваюць інтарэс да найбольш рацыянальнага гаспадарання; устанаўленне навукова абгрунтаваных цэн; забеспячэнне сур'ёзнай структурнай перабудовы эканомікі, якая дазволіла б дасягнуць збалансаванасці плацежаздольнага попыту насельніцтва і прапанавання тавараў і паслуг; выпуск акцый для працоўных і для прадпрыемстваў; увядзенне абавязковага страхавання маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў; устанаўленне канверсаванасці рубля.

**ФІНАНСАВАЕ АЗДАРАУЛЕННЕ ЭКАНОМІКІ** (Финансовое оздоровление экономики) -- сістэма мерапрыемстваў дзяржавы, накіраваных на ліквідацыю нездавальняючага фінансавага становішча, на ўдасканаленне фінансавай палітыкі і фінансава-крэдытнага механізму ў перыяд выхаду з крызіснага стану.

Фінансавае становішча дзяржавы характарызуецца перш за ўсё станам бюджэту і грашовага абарачэння. Дэфіцытнасць бюджэту, істотнае адставанне росту нацыянальнага даходу і рознічнага тавараабароту ад росту грашовых даходаў насельніцтва сведчаць аб нездавальняючым фінансавым становішчы краіны.

На абвастрэнне фінансавага становішча аказвае ўздзеянне складанае перапляценне многіх фактараў. Вытокі фінансавых цяжкасцей у многім ляжаць у нетрах каманднa-адміністрацыйнай сістэмы. Напрыклад, у 1970--1985гг. збалансаванне бюджэту насіла нездаровы характар (фарсіраванае павелічэнне продажу за мяжу нафты, газу і іншых сыравінных тавараў, рост віннагарэлачнай прадукцыі, прамое і ўтоенае павышэнне рознічных цэн, запазычанне сродкаў у банка, эмісія грошай, безаплатная канфіскацыя грошай у прадпрыем-

стваў). Бюджэтны дэфіцыт у 1989г. дасягнуў 120 млрд руб. -- гэта ў 5 разоў больш, чым у 1985г.

Найбольш рэальнымі шляхамі збалансавання бюджэту з'яўляюцца: скарачэнне цэнтралізаваных капітальных укладанняў на аснове ўсеагульнай інвентарызацыі распачатага будаўніцтва і вызначэння эканамічнай і сацыяльнай мэтазгоднасці стварэння гэтых аб'ектаў; скарачэнне расходаў на абарону і канверсія ваеннай вытворчасці; змяншэнне датацыі стратным прадпрыемствам; удасканаленне структуры органаў дзяржаўнага і гаспадарчага кіравання, скарачэнне расходаў на іх утрыманне; пераарыентацыя імпартнай палітыкі. Акрамя таго, дадатковымі мерамі на Ф.а.э. могуць быць: продаж зямлі; пераарыентацыя выкарыстання валюты на закупкі зерня, металу, на набыццё прамысловых тавараў шырокага спажывання; значнае скарачэнне незавершанай вытворчасці; продаж кватэр, выпуск акцый, аблігацый; стварэнне стымулаў для збераджэнняў; павышэнне ставак за крэдыт.

**ФІНАНСАВАЕ ПЛАНАВАННЕ** (Финансовое планирование) -- сістэма мер, якія забяспечваюць свядомы, навукова абгрунтаваны рух фінансавых рэсурсаў і адпаведных фінансавых адносін. Неабходнасць Ф.п. абумоўлена законам планамернага, прапарцыянальнага равіцця народнай гаспадаркі, законам вартасці і выкарыстаннем фінансаў для актыўнага ўздзеяння на вытворчасць. Аб'ектам Ф.п. з'яўляецца фінансавая дзейнасць дзяржавы, асобных рэгіёнаў, галін, прадпрыемстваў, устаноў, якая мае на ўвазе фарміраванне і выкарыстанне фондаў грашовых сродкаў для задавальнення агульнадзяржаўных, калектыўных і асабістых патрэб членаў грамадства.

Ф.п. прадугледжвае распрацоўку перспектыўных, бягучых і аператыўных фінансавых планаў на ўсіх узроўнях кіравання. Яны аб'ядноўваюцца ў цэнтралізаваныя або агульнадзяржаўныя планы (дзяржаўны бюджэт, фінансавы план дзяржаўнага маёмаснага і асабістага страхавання, бюджэт сацыяльнага страхавання, баланс фінансавых рэсурсаў дзяржавы) і дэцэнтралізаваныя планы (фінансавыя планы прадпрыемст-

ваў, устаноў, арганізацый, ведамстваў, міністэрстваў).

Фінансавыя планы адлюстроўваюць даходы і расходы кожнага звяна і распрацоўваюцца на аснове вытворчых паказчыкаў і нарматываў. Пры вызначэнні фінансавых заданняў правяраецца ступень напружанасці паказчыкаў, якія прымаюцца, мэтазгоднасць планавых мерапрыемстваў, абгрунтоўваецца эканамічная эфектыўнасць запланавых затрат, укладанняў, ажыццяўляецца выбар рацыянальных форм мабілізацыі рэсурсаў і іх накіравання на планавы перыяд. З дапамогай фінансавых планаў вызначаюцца фінансавыя магчымасці дзяржавы, галіны і іх пярвічных звёнаў, устанаўліваюцца параметры іх фінансавай дзейнасці і канчатковыя вынікі, узгадняецца рух фінансавых і матэрыяльных каштоўнасцей.

Ва ўмовах перабудовы эканомікі дэмакратызуецца арганізацыя Ф.п., расшыраюцца правы рэгіянальных органаў улады, прадпрыемстваў па складанню і выкананню іх фінансавых планаў. Асновай для іх распрацоўкі становяцца кантрольныя лічбы, ліміты, нарматывы.

**ФІНАНСАВЫ КАНТРОЛЬ** (Финансовый контроль) -- адна з важнейшых форм дзяржаўнага кантролю, які ажыццяўляецца ў працэсе ўтварэння, размеркавання і выкарыстання фондаў грашовых сродкаў у народнай гаспадарцы. Спецыфіка Ф.к. заключаецца ў тым, што ён ажыццяўляецца ў грашовай форме. Яго асноўнае прызначэнне: з дапамогай фінансавых форм і метадаў забяспечыць праверку законнасці і правільнасці, а таксама эфектыўнасці выкарыстання грашовых фондаў дзяржавы, прадпрыемстваў (аб'яднанняў), арганізацый і ўстаноў. Ф.к. з'яўляецца адным з інструментаў гаспадарчага механізму і прымяняецца ў ходзе складання і выканання фінансавых планаў і каштарысаў, праверкі эфектыўнасці выкарыстання ў планавым кіраўніцтве эканомікай таварна-грашовых адносін і такіх эканамічных рычагоў, як цана, прыбытак, бюджэт і інш.

Важнейшымі прынцыпамі арганізацыі Ф.к. з'яўляюцца: галоснасць, рэгулярнасць, усеагульнасць,

рэзультатыўнасць.

Па формах правядзення Ф.к. падзяляецца на папярэдні, бягучы і наступны. Папярэдні кантроль ажыццяўляецца перад афармленнем фінансавагаспадарчых аперацый, ён накіраваны на папярэджанне парушэнняў законаў і нерацыянальнага расходавання сродкаў. Бягучы кантроль праводзіцца ў час афармлення аперацый па паступленню даходаў, расходаванню грашовых сродкаў і матэрыяльных каштоўнасцей і інш.; наступны кантроль - пасля правядзення гаспадарча-фінансавых аперацый.

Да асноўных метадаў Ф.к. адносяцца: падліковыя праверкі бухгалтарскіх балансаў і справаздач, аналіз гаспадарчай дзейнасці, сустрэчныя праверкі, інвентарызацыя таварна-матэрыяльных каштоўнасцей, рэвізіі (планавыя і пазапланавыя, тэматычныя і комплексныя).

**ФІНАНСАВЫ РЫНАК** (Финансовый рынок) -- рынак грашовых рэсурсаў і каштоўных папер. На Ф.р. могуць адбывацца здзелкі (аукцыёны) па продажу і куплі замежных валют. Асновай Ф.р. з'яўляецца наяўнасць свабодных грашовых сродкаў у распараджэнні прадпрыемстваў, арганізацый і насельніцтва. Частка з іх можа быць з выгадай для ўладальнікаў прадастаўлена іншым прадпрыемствам, банку, дзяржаве. Акцыі, аблігацыі, вэксалі і іншыя каштоўныя паперы, якія абарочваюцца на Ф.р., з'яўляюцца інструментам мабілізацыі дадатковых рэсурсаў для інвестыцый, расшыраюць фінансавую базу перабудовы, узмацняюць працэс аздараўлення фінансаў, грашовага абарачэння.

Стварэнне паўнацэннага Ф.р. дазволіць з цягам часу адмовіцца ад сістэмы галіновага пераразмеркавання фінансавых рэсурсаў, якая падрывае прынцыпы поўнага гаспадарчага разліку і самафінансавання ў выніку безэквівалентнай канфіскацыі сродкаў у адных гаспадарчых органаў і безаплатнай іх перадачы іншым.

Правядзенне валютных аукцыёнаў па продажу і куплі сродкаў у свабодна канверсаванай валюце на рублі (першы праведзены ў 1989г.) павышае зацікаўленасць прадпрыемстваў у развіцці экспартнай

вытворчасці, стварае дадатковыя магчымасці для павелічэння вырабу тавараў народнага спажывання, а таксама для паступовага пераходу да канверсаванага рубля.

**ФІНАНСЫ** (Финансы) -- эканамічная катэгорыя, якая адлюстроўвае эканамічныя адносіны ў працэсе фарміравання і выкарыстання фондаў грашовых сродкаў. Ф. -- асобная форма эканамічных адносін, якія ўзнікаюць у працэсе ўтварэння і выкарыстання цэнтралізаваных фондаў грашовых сродкаў у народнай гаспадарцы. Гэтыя фонды выкарыстоўваюцца на мерапрыемствы па расшыранаму ўзнаўленню, задавальненню матэрыяльных і культурных патрэб працоўных, на абарону краіны. У нашай краіне Ф. складаюцца з: 1) фінансаў прадпрыемстваў (аб'яднанняў), арганізацый і галін народнай гаспадаркі, якія з'яўляюцца асновай ўсіх фінансаў, бо менавіта на прадпрыемствах ствараецца рашаючая доля нацыянальнага даходу і за кошт грашовых накапленняў прадпрыемстваў (аб'яднанняў), арганізацый фарміруюцца ў асноўным даходы дзяржаўнага бюджэту; 2) агульнадзяржаўных фінансаў, якія ўключаюць у сябе такія цэнтралізаваныя фонды грашовых сродкаў, як дзяржаўны бюджэт, бюджэт дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і фонд дзяржаўнага і асабістага страхавання.

Сутнасць і механізм дзеяння Ф. у грамадстве раскрываецца ў іх функцыях, якія забяспечваюць: размеркаванне грашовых даходаў і фондаў грашовых сродкаў; кантроль за працэсам фарміравання і выкарыстання грашовых даходаў і фондаў.

**ФІНАНСЫ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ** (Финансы предприятий) -- як эканамічная катэгорыя сукупнасць эканамічных адносін, звязаных з утварэннем, размеркаваннем і выкарыстаннем грашовых накапленняў, рэсурсаў прадпрыемстваў (аб'яднанняў). Ф.п. -- гэта размеркавальныя адносіны, якія апасродкаваны грашовай формай і ўзнікаюць паміж дзяржавай і прадпрыемствам (пры ўзносах плацяжоў у бюджэт і ў працэсе фінансавання з дзяржаўнага бюджэту); прадпрыемствам і вышэйстаячай арганізацыяй (пры ўзносе часткі

даходаў у цэнтралізаваныя фонды і рэзервы, пры атрыманні фінансавай дапамогі з іх пры часовых фінансавых цяжкасцях); прадпрыемствам і банкам (пры атрыманні пазык, а таксама пры іх вяртанні і выплаце працэнтаў за карыстанне); прадпрыемствам і калектывам работнікаў (пры аплаце працы і размеркаванні гаспадарча-разліковага даходу для матэрыяльнага стымулявання работнікаў); прадпрыемствам і іншымі прадпрыемствамі (пры куплі-продажы тавараў).

Ф.п. уключаюць у сябе фінансы першасных звёнаў прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўніцтва, транспарту, сувязі, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і іншых галін народнай гаспадаркі. Галіновыя адрозненні Ф.п. вызначаюцца асаблівасцямі фарміравання фінансавых рэсурсаў і іх размеркавання. У залежнасці ад форм уласнасці адрозніваюць фінансы дзяржаўных прадпрыемстваў (аб'яднанняў) і фінансы калектыўных прадпрыемстваў і арганізацый.

Канкрэтны змест Ф.п. раскрываецца ў іх функцыях: размеркавальнай і кантрольнай. Размеркавальная функцыя характарызуе працэсы размеркавання і пераразмеркавання грамадскага прадукту, даходаў прадпрыемстваў (аб'яднанняў). Кантрольная функцыя забяспечвае кантроль рублём за вынікам фінансава-гаспадарчай дзейнасці.

**ФОНД КАМПЕНСАЦЫІ** (Фонд возмещения) -- адзін з узнаўленчых фондаў грамадскага прадукту, які ўяўляе тую яго частку, што прызначана для забеспячэння бесперапыннасці вытворчасці, узнаўлення яе рэчыўных фактараў. Аснова Ф.к. -- вартасць спажытых сродкаў вытворчасці, якая ў грашовым выражэнні ўключае ў сябе матэрыяльныя затраты пры вырабе грамадскага прадукту: затраты сыравіны, паліва, энергіі, іншых матэрыялаў, знос машын і абсталявання, усіх асноўных фондаў (іх амартызацыя).

У сукупным грамадскім прадукце стран СНД Ф.к. складае 59%. Эканомія Ф.к. на 1% дае выйгрыш народнай гаспадарцы звыш 9 млрд руб. Асноўным грамадскім прызначэннем, галоўнай функцыяй Ф.к. з'яўляецца ўзнаўленне, працяг вытворчасці на аснове кампенсацыі

спажытых сродкаў вытворчасці як па вартасці, так і па натуральна-рэчыўнай форме. Другой важнай функцыяй Ф.к. з'яўляецца ўзнаўленне выкарыстаных сродкаў вытворчасці на новай,больш высокай тэхнічнай аснове. Значэнне гэтай функцыі ўзрастае ў сувязі з праявдзеннем структурнай перабудовы народнай гаспадаркі і новай інвестыцыйнай палітыкі. З дапамогай Ф.к. павінна расшырацца спажыванне новых матэрыялаў, прагрэсіўнай, безадыходнай тэхналогіі і высокапрадукцыйнай тэхнікі. Ф.к., акрамя таго, выкарыстоўваецца для расшырэння грамадскай вытворчасці як на аснове вырабу найбольш эфектыўных напрамкаў рэальнай кампенсацыі, так і за кошт магчымасцей выкарыстання амартызацыі для расшырэння асноўных фондаў. Значныя і сацыяльныя задачы Ф.к. З яго дапамогай ствараецца матэрыяльна-тэхнічная база прадпрыемстваў, якая забяспечвае паляпшэнне ўмоў працы, развіццё сацыяльнай і культурнай сферы.

Планамернае рэгуляванне працэсаў кампенсацыі ажыццяўляецца з дапамогай паказчыкаў матэрыяламістасці і фондаёмістасці вытворчасці. У гаспадарчым механізме, у сістэме гаспадарчага разліку пастаяннай павінна быць нацэленасць на эканомію рэсурсаў Ф.к. і выкарыстанне яе як фактару росту нацыянальнага даходу -- асноўнай крыніцы расшырэння вытворчасці і павышэння дабрабыту народа.

**ФОНДААДДАЧА** (Фондоотдача) -- абагульнены паказчык узроўню выкарыстання асноўных вытворчых фондаў. Вызначаецца шляхам дзялення кошту прадукцыі (таварнай або чыстай) на сярэднегадавую вартасць асноўных вытворчых фондаў і паказвае, колькі прадукцыі атрымаецца з кожнага рубля асноўных фондаў, якія выкарыстоўваюцца ($Ф_{адд}=П/Ф_{асн}$). Напрыклад, калі прадпрыемства за год вырабіла прадукцыі на 10 млн руб. і пры гэтым выкарыстоўвалася на 1 млн руб. асноўных фондаў, то Ф. будзе роўная 10 руб., гэта значыць, што з кожнага рубля, укладзенага ў асноўныя фонды, прадпрыемства атрымала прадукцыі на 10. руб Ф. характарызуе эфектыўнасць выкарыстання асноўных вытворчых фондаў.

Грамадства і кожнае прадпрыемства зацікаўлены ў росце Ф., які дасягаецца на аснове інтэнсіфікацыі вытворчасці, развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу і сведчыць, у сваю чаргу, аб інтэнсіфікацыі вытворчасці. Ф.- важны напрамак інтэнсіфікацыі грамадскай вытворчасці. Рост Ф. дасягаецца рознымі шляхамі. Асноўнымі з іх у сучасных умовах з'яўляюцца: рэканструкцыя і тэхнічнае пераўзбраенне; абнаўленне асноўных фондаў шляхам укаранення навейшых машын і абсталявання; зніжэнне кошту будаўніцтва; скарачэнне тэрмінаў уводу ў дзеянне аб'ектаў; хутчэйшае асваенне вытворчых магутнасцей; паляпшэнне выкарыстання дзеючых асноўных фондаў шляхам павышэння зменнай загрузкі абсталявання, атэстацыі рабочых месц, ліквідацыі прастояў па розных прычынах; узмацненне арыентацыі гаспадарчага механізму на паляпшэнне выкарыстання асноўных фондаў.

У нашай гаспадарцы пакуль што пераважаюць экстэнсіўныя фактары развіцця эканомікі, у выніку чаго Ф. не расце, а зніжаецца. Гэтаму садзейнічаюць і ўзмацненне сацыяльнай накіраванасці абнаўлення ўмоў працы, прыродаахоўны характар абнаўлення асноўных фондаў і некаторыя іншыя прычыны (ліквідацыя стыхійных бедстваў, структурная перабудова эканомікі).

Перад кожным прадпрыемствам пастаўлена задача стабілізаваць Ф., а потым забяспечыць яе павышэнне. Варта памятаць, што павышэнне Ф. толькі на 1% дае выйгрыш у народнай гаспадарцы, які перавышае 15 млрд руб.

**ФОНДАЁМІСТАСЦЬ** (Фондоёмкость) - паказчык, які характарызуе кошт асноўных фондаў у адзінцы выраблёнай канкрэтнай прадукцыі ці грамадскага прадукту. Гэта паказчык, адваротны фондааддачы. Калі фондааддача раўняецца 10 руб., то Ф. складзе 0,1 руб. ($1/Ф_{адд}$). Гэта азначае, што ў стварэнні вартасці на 1 руб. прадукцыі ўдзельнічала асноўных вытворчых фондаў на 10 кап. Ф. прымяняецца і для характарыстыкі аб'ёму асноўных фондаў, якія неабходны для вырабу прадукцыі ў натуральным выражэнні (1 ц зерня, 1 ц

малака, 1 т сталі і г.д.).

Ф. выкарыстоўваецца пры эканамічных разліках патрэбнага аб'ёму капітальных укладанняў для прадпрыемстваў і галін народнай гаспадаркі, пры цэнаўтварэнні, пры ажыццяўленні структурнай палітыкі. Ф., як і фондааддача, дае ўяўленне аб інтэнсіфікацыі вытворчасці. Вынікам інтэнсіфікацыі з'яўляецца зніжэнне Ф. Для дасягнення заканамернага зніжэння Ф. неабходны: эфектыўныя напрамкі навукова-тэхнічнага прагрэсу; зніжэнне кошту машын і абсталявання на адзінку магутнасці, прадукцыйнасці; укараненне рэсурсазберагаючых тэхналогій. Грамадства можа свядома ісці і на часовае павышэнне Ф., калі гаворка ідзе аб паляпшэнні ўмоў працы, ахове навакольнага асяроддзя, паскораным развіцці сацыяльнай інфраструктуры і інш. Аднак такое "негатыўнае" змяненне Ф., як правіла, акупляецца павышэннем прадукцыйнасці грамадскай працы, дасягненнем большай збалансаванасці і актыўнасці ўсіх фаз узнаўлення, больш поўнай рэалізацыяй вышэйшай мэты грамадскай вытворчасці.

**ФОНДАЎЗБРОЕНАСЦЬ ПРАЦЫ** (Фондовооруженность труда) -- паказчык тэхнічнага прагрэсу, які характарызуе ўзровень аснашчанасці работнікаў, занятых у галінах матэрыяльнай вытворчасці, асноўнымі фондамі. Вызначаецца шляхам дзялення сярэднегадавога балансавага кошту гэтых фондаў на сярэднегадавую колькасць работнікаў. Выкарыстоўваецца для эканамічнага аналізу і планавання. Ф.п. у розных галінах матэрыяльнай вытворчасці неаднолькавая. Гэта тлумачыцца спецыфікай тэхналогіі, тэхнічнымі і канструкцыйнымі асаблівасцямі асноўных фондаў, коштам іх асобных элементаў. Рост Ф.п. - аб'ектыўны эканамічны працэс, абумоўлены колькасным і якасным ростам сродкаў працы, які ўласцівы ўсім галінам народнай гаспадаркі. Выяўляецца ў павышэнні тэхнічнага ўзроўню вытворчасці, ва ўсё большым замяшчэнні жывой працы машынамі. Асабліва хутка расце Ф.п. ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, калі ў вытворчасць у шырокіх маштабах укараняюцца новыя віды абсталявання з па-

вышанай адзінкавай магутнасцю, механізаваныя і аўтаматызаваныя паточныя лініі.

Рост Ф.п. забяспечвае павышэнне прадукцыйнасці працы, рэнтабельнасці вытворчасці, якасці прадукцыі, зніжэнне яе сабекошту, паляпшэнне ўмоў працы работнікаў. Найбольшы эканамічны эфект дасягаецца тады, калі прадукцыйнасць працы расце хутчэй, чым Ф.п., у гэтым выпадку яе рост адбываецца адначасова з павышэннем фондааддачы.

**ФОНДЫ АБАРАЧЭННЯ** (Фонды обращения) -- сукупнасць матэрыяльных і грашовых рэсурсаў, якія функцыяніруюць у сферы абарачэння і абслугоўваюць працэс абмену, а таксама забяспечваюць няспыннасць кругаабароту і абарот вытворчых фондаў, планамернасць аднаўлення, размеркавання і абмену грамадскага прадукту. Кругаабарот Ф.а. адбываецца адначасова ў натуральнай і вартаснай формах у параўнальна кароткія перыяды.

Ф.а. прадпрыемстваў уключаюць у сябе наступныя асноўныя элементы: гатовую, але яшчэ нерэалізаваную прадукцыю на складзе прадпрыемства; адгружаную, але яшчэ не аплачаную прадукцыю (разлікі ў шляху); грашовыя сродкі ў касе і на рахунках Дзяржбанка, у разліках і інш.; рэсурсы, неабходныя для рэалізацыі гатовай прадукцыі, яе захаванне, давядзення да якасці, якая адпавядае патрабаванням спажыўца; сродкі, якія выкарыстоўваюцца для абслугоўвання забеспячэння і збыту гатовай прадукцыі. У вартаснай форме Ф.а. уяўляюць сабой авансаваную ў іх частку абаротных сродкаў. Ф.а. не ўдзельнічаюць у стварэнні спажывецкай вартасці прадукту вытворчасці, але спрыяюць яе захаванню.

Структура Ф.а. -- гэта суадносіны паміж асобнымі іх элементамі (гатовай прадукцыяй на складах прадпрыемства, адгружанымі таварамі і інш.), выражаныя ў працэнтах, да выніку.

Аптымізацыя саставу, структуры, руху Ф.а. прадпрыемстваў і грамадства робіць вялікі ўплыў на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню працоўных. Яна дазваляе

паскорыць кругаабарот сродкаў у народнай гаспадарцы, павысіць прадукцыйнасць працы і эфектыўнасць грамадскай вытворчасці.

**ФОНДЫ ЭКАНАМІЧНАГА СТЫМУЛЯВАННЯ, або ФЭС** (Фонды экономического стимулирования, или ФЭС) - сродкі прадпрыемстваў, прызначаныя для павышэння матэрыяльнай зацікаўленасці работнікаў у канчатковых выніках працы. Яны ўключаюць у сябе фонд матэрыяльнага заахвочвання (ФМЗ), фонд сацыяльнага развіцця (ФСР) и фонд развіцця вытворчасці, навукі і тэхнікі (ФРВНіТ). На прадпрыемствах, якія развіваюць экспартныя адносіны, ствараецца спецыяльны валютны фонд (ВФ).

ФЭС фарміруецца ў залежнасці ад той формы гаспадарчага разліку, якая выкарыстоўваецца на прадпрыемстве. Пры нарматыўным размеркаванні прыбытку з яго робяцца адлічэнні ў бюджэт і разлікі з вышэйстаячымі органамі, выплачваюцца працэнты за крэдыт. З астаткавага прыбытку па нарматывах утвараецца ФЭС. Пры нарматыўным размеркаванні даходу, атрыманага пасля кампенсацыі з выручкі матэрыяльных затрат, з яго робяцца адлічэнні ў бюджэт і разлікі з вышэйстаячым органам, выплачваюцца працэнты за крэдыт. З атрыманага гаспадарча-разліковага даходу фарміруецца адзіны фонд аплаты працы (АФАП) як астатак гаспадарча-разліковага даходу калектыву пасля ўтварэння з яго ФРВНіТ і ФСР. Законам аб прадпрыемствах прадугледжана выкарыстанне ФМЗ на выплату прэмій, узнагароджванняў, матэрыяльную дапамогу.

ФРВНіТ прадпрыемства траціць на фінансаванне навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ, абнаўленне і расшырэнне асноўных фондаў на сучаснай тэхнічнай аснове, прырост уласных абаротных сродкаў. ФСР працоўны калектыў выкарыстоўвае на жыллёвае будаўніцтва, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыяльна-культурнай сферы, утрыманне яе аб'ектаў, правядзенне аздараўленчых, культурна-масавых мерапрыемстваў і задавальненне іншых сацыяльных патрэб. Прадпрыемства са згоды працоўнага калектыву мае права накіроўваць ў ФСР частку сродкаў ФМЗ і

ФРВНіТ на жыллёвае будаўніцтва ў межах, устаноўленых заканадаўствам.

ФМЗ і ФСР прадпрыемстваў (аб'яднанняў) ў пяцігадовым і гадавым планах утвараюцца па стабільных нарматывах ад планавай сумы прыбытку, якая застаецца ў іх распараджэнні. Яны вызначаюцца, зыходзячы з прапорцыі яе размеркавання ў базавым годзе, з заданняў і разлікаў пяцігадовага плана. Нарматывы разлічваюцца як адносіны адпаведна ФМЗ і ФСР да прыбытку (у працэнтах). Крыніцамі ўтварэння ФРВНіТ з'яўляюцца: амартызацыйныя адлічэнні, прызначаныя для поўнага ўзналеўння асноўных фондаў; адлічэнні ад прыбытку, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемстваў па нарматывах, устаноўленых у працэнтах да яго; выручка ад рэалізацыі лішняй маёмасці, якая лічыцца ў складзе асноўных фондаў (за мінусам затрат, звязаных з яе ліквідацыяй). Дыферэнцыравана, у залежнасці ад ступені зносу асноўных фондаў прадпрыемствам зацвярджаюцца на пяцігодку (з размеркаваннем па гадах) стабільныя нарматывы ўтварэння ФРВНіТ.

Сродкі ФЭС трацяцца па каштарысу, зацверджанаму сумесным рашэннем адміністрацыі прадпрыемства (аб'яднання), савета працоўнага калектыву і камітэта прафсаюза.

**ФУНКЦЫЯНАЛЬНА-ВАРТАСНЫ АНАЛІЗ** (Функционально-стоимостный анализ) - аналіз аднача-сова і ва ўзаемасувязі функцый аб'ектаў (прадукцыі, паслуг і іншых вынікаў працы) і іх вартасці (гэта значыць затрат працы на гэтыя функцыі).

Мэта Ф.-в.а. - знайсці аптымальныя суадносіны паміж спажывецкай вартасцю і вартасцю аб'екта, які аналізуецца. Гэта мэта дасягаецца з дапамогай методыкі Ф.-в.а., якая ўключае ў сябе наступныя асноўныя этапы: 1) падрыхтоўчы, на якім ажыццяўляецца выбар аб'екта Ф.-в.а., вызначэнне канкрэтнай яго задачы, складанне рабочага плана і афармленне рашэння аб яго правядзенні; 2) інфармацыйны, на якім праводзяцца збор і сістэматызацыя інфармацыі аб аб'ектах і яго аналагах; 3) аналітычны, на якім складаецца функцыяналь-

на-структурная мадэль, якая наглядна паказвае ўзаемасувязь і супадпарадкаванасць функцый і іх матэрыяльных носьбітаў. Гэтаму этапу папярэднічаюць вывучэнне і дакладнае вызначэнне ўсіх функцый аб'екта і іх матэрыяльных носьбітаў, групоўка функцый па іх значнасці, іх ацэнка і вызначэнне затрат па функцыях у адносінах да затрат па аб'екту наогул. На базе гэтых звестак будуецца функцыянальна-вартасная дыяграма, якая дазваляе візуальна вызначыць дарагія (па кошту) функцыі і прыступіць да фарміравання задач па ўдасканаленню аб'екта; 4) творчы, на якім выпрацоўваюцца шляхі ўдасканалення аб'екта: ліквідацыя лішніх функцый, скарачэнне затрат на дарагія (па кошту) дапаможныя і асноўныя функцыі, не зніжаючы ўзроўню галоўнай функцыі; 5) даследча-рэкамендацыйны этап, які дазваляе выбраць лепшыя прапановы і пасля іх дэталёвага абмеркавання рэкамендаваць да ўкаранення. Найбольшы эфект Ф.-в.а. дае на праектнай і падпраектнай стадыях распрацоўкі аб'ектаў, а найбольш добратворныя ўмовы для яго прымянення - поўны гаспадарчы разлік і самастойнасць працоўных калектываў.

## Ц

**ЦАНА** (Цена) -- грашовае выражэнне вартасці тавару. Пры таварнай вытворчасці, заснаванай на прыватнай уласнасці, Ц. складваецца на рынку і вагаецца вакол вартасці (у простай таварнай гаспадарцы) або вакол цаны вытворчасці (пры развітой таварнай гаспадарцы) у залежнасці ад попыту і прапанавання.

У рэгулюемай таварнай гаспадарцы ў аснове Ц. таксама ляжыць вартасць. Яе велічыня вызначаецца, як вядома, грамадска-неабходнымі затратамі працы, якія разглядаюцца на ўзроўні інтарэсаў народнай гаспадаркі. Таму Ц. павінна ўключаць у сябе выдаткі вытворчасці (сабекошт прадукцыі) плюс чысты даход па норме ад выка- рыстаных працоўных рэсурсаў, узнаўляльных вытворчых фондаў і прыродных рэсурсаў. Пабудаваная такім чынам Ц. дае магчымасць выкарыстоўваць яе для: 1) уліку і вымярэння затрат грамадскай працы; 2) падтрымання прапарцыянальнасці і раўнавагі ў народнай

гаспадарцы, забеспячэння эквівалентнасці абмену; 3) стымулявання або абмежавання вытворчасці і спажывання тых або іншых тавараў; 4) размеркавання і пераразмеркавання нацыянальнага даходу. Ц. - важнейшы сродак кіравання рэальнымі эканамічнымі працэсамі і забеспячэння рэальных даходаў працоўных.

Па структурнай будове і прызначэнню адрозніваюць: 1) аптовыя цэны, па якіх адны прадпрыемствы прадаюць выробленыя тавары іншым прадпрыемствам і арганізацыям; 2) тарыфы на перавозку грузаў, выкарыстанне энергіі, цяпла, вады і да т.п.; 3) закупачныя цэны, па якіх ідзе нарыхтоўка сельскагаспадарчай прадукцыі; 4) рознічныя цэны на спажывецкім рынку тавараў і паслуг.

**ЦЭНТРАЛІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Централизация производства) --аб'яднанне шэрага вытворчасцей у адно буйное прадпрыемства, узбуйненне вытворчасці на аснове аб'ектыўнага працэсу развіцця прадукцыйных сіл на базе машыннай тэхнікі. Буйная вытворчасць, якая мае рашаючыя эканамічныя перавагі перад дробнай, значна пашырае магчымасці выкарыстання навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі. Ц.в. ажыццяўляецца дзеля далейшага росту і ўдасканальвання вытворчасці, павышэння дабрабыту народа. Развіццё працэсу цэнтралізацыі, устанаўленне яго аптымальных межаў спрыяе больш поўнаму і рацыянальнаму выкарыстанню працоўных і матэрыяльных рэсурсаў у адпаведнасці з супольнымі грамадскімі патрэбамі. Навукова-тэхнічны прагрэс, развіццё грамадскага падзелу працы ўзмацняюць і ўскладняюць эканамічныя сувязі паміж усімі звёнамі народнай гаспадаркі і значна паскараюць цэнтралізацыю вытворчасці. Адбываецца фарміраванне вытворчых аб'яднанняў, міжгаліновых навукова-тэхнічных комплексаў, міжгаліновых народнагаспадарчых комплексаў, асацыяцый, кансорцыумаў. Стварэнне і развіццё вытворчых аб'яднанняў, вытворча-гаспадарчых комплексаў дазваляюць забяспечыць канцэнтрацыю матэрыяльных, працоўных і фінансавых рэсурсаў, паскорыць выкарыстанне ў вытворчасці навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі, тэхналогіі, узняць тэхнічны

ўзровень вытворчасці і якасць прадукцыі, комплексна ўжываць прыродныя рэсурсы і такім чынам забяспечыць лепшыя ўмовы для эфектыўнага выкарыстання фактараў эканамічнага росту.

**ЦЯКУЧАСЦЬ РАБОЧАЙ СІЛЫ** (Текучесть рабочей силы) - знешні абарот рабочай сілы прадпрыемства (аб'яднання); працэс руху рабочай сілы і адпаведнае яму змяненне колькасці работнікаў. Да Ц.р.с. адносяць выпадкі пазапланавага руху рабочай сілы: звальненне работнікаў за прагулы і іншыя парушэнні працоўнай дысцыпліны; звальненне па ўласнаму жаданню, якое часцей за ўсё абумоўлена незадаволенасцю арганізацыяй працы, заработнай платы, адсутнасцю ў прадпрыемства сацыяльных даброт. У справаздачнасці (форма № 2т) улічваецца цякучасць толькі рабочых. Каэфіцыент цякучасці ($К_ц$) вызначаецца адносінамі колькасці рабочых, якія выбылі па пазапланавых прычынах, да сярэдняспісачнай колькасці рабочых. Важнае значэнне мае дынаміка $К_ц$, якая характарызуе вынік барацьбы з Ц.р.с. Ад Ц.р.с. трэба адрозніваць змяняльнасць (на адных і тых жа рабочых месцах) работнікаў, якая адлюстроўвае ўсялякае (а не толькі пазапланавае) змяненне колькасці. Паказчыкам змяняльнасці з'яўляюцца адносіны (у працэнтах) меншай з двух лічбаў (прынятых або звольненых з прадпрыемства за пэўны перыяд) да сярэдняспісачнай колькасці.

## Ч

**ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР** (Человеческий фактор) - сукупнасць фізічных, інтэлектуальных, маральна-эстэтычных здольнасцей асобы, эканамічных і іншых грамадскіх адносін, увасобленых у ёй, ступень яе ўдзелу ў творчай, стваральна-пераўтваральнай грамадскай дзейнасці.

Ч.ф., з аднаго боку, з'яўляецца галоўнай прадукцыйнай сілай грамадства, а з другога - суб'ектам усяго спектру грамадскіх адносін: эканамічных, палітычных, ідэалагічных, нацыянальных, маральных, сямейных. Ч.ф. нармальна функцыяніруе і развіваецца, толькі актыўна ўдзельнічаючы ў сумеснай працоўнай дзейнасці. Як носьбіт грамадскіх адносін, Ч.ф. заўсёды функцы-

яніруе ў гістарычна пэўнай сацыяльна-эканамічнай форме і выяўляе рэальна існуючае адзінства двух бакоў спосабу вытворчасці.

У век навукова-тэхнічнай рэвалюцыі актывізацыя Ч.ф. - галоўная ўмова паскарэння эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу грамадства. Актывізацыя Ч.ф. мае на ўвазе сістэматычнае павышэнне адукацыйнага і прафесійна-кваліфікацыйнага ўзроўню працоўных, фарміраванне ў іх пачуцця гаспадара, зацікаўленасці ў больш высокіх выніках, пашырэнне ў іх дзейнасці дэмакратычных пачаткаў, выхаванне гарманічна развітай, сацыяльна актыўнай асобы.

## Ш

**ШТРАФ** (Штраф) - адміністрацыйнае або судовае пакаранне ў выглядзе грашовага спагнання. Памер Ш. вызначаецца ў заканадаўчым парадку, як правіла, у працэнтах ад сумы, за якую ён спаганяецца.

Сістэма Ш. асабліва шырока прымяняецца для рэгулявання маёмаснай адказнасці пры пастаўках тавараў. Так, за кожны выпадак парушэння ўзгодненага графіка адгрузкі тавараў пастаўшчык выплачвае Ш. у памеры 1% ад кошту не адгружаных або не прынятых у тэрмін тавараў. Ш. выплачваецца незалежна ад уплаты няўстойкі за пратэрміноўку пастаўкі або недапастаўку тавараў.

У выпадку, калі пастаўленыя тавары не адпавядаюць па якасці стандартам, тэхнічным умовам, а таксама пры пастаўцы некамплектных тавараў пастаўшчык выплачвае Ш. у памеры 20% ад кошту гэтых тавараў. У тых выпадках, калі тавары адпавядаюць стандартам, тэхнічным умовам, але не адпавядаюць павышаным патрабаванням да якасці, якія прадугледжаны дагаворам, Ш. за пастаўку такіх тавараў прадугледжваецца ў дагаворах.

## Э

**ЭКАНАМІЧНАЕ МЫСЛЕННЕ** (Экономическое мышление) - працэс пазнаваўчай дзейнасці, звязаны з фарміраваннем эканамічнай свядомасці на аснове выкарыстання аб'ектыўных эканамічных законаў. Першая задача Э.м. - глыбокае ўсведамленне ўсімі працоўнымі

эканамічнай палітыкі і эканамічнай стратэгіі перабудовы. Гаворка ідзе перш за ўсё пра аднаўленне вытворчых адносін, у цэнтры якіх - чалавек працы, яго інтарэсы і патрэбы, пра гуманізм эканомікі, аб прыярытэце сацыяльнага развіцця.

Сучаснае (новае) Э.м. нацэлена на засваенне і правільнае разуменне неабходнасці перабудовы кіравання эканомікай, у прыватнасці пераадольванне існуючых стэрэатыпаў і сцвярджэнне новых падыходаў, новых эканамічных форм і прынцыпаў гаспадарання. У адпаведнасці з задачамі цяперашняга этапу - этапу практычнага ажыццяўлення намечаных мер - павышаецца значэнне рэзультатыўнасці эканамічнай рэформы. Новае мысленне са сферы "як трэба разумець" пераходзіць у сферу "як і што трэба рабіць". У сувязі з гэтым першаступеннае значэнне набывае авалоданне новымі формамі і прынцыпамі гаспадарання. За ўсім гэтым - удасканаленне вытворчых, эканамічных адносін з разнастайнасцю форм уласнасці, гаспадарання, арганізацыі працоўнай дзейнасці. Глабальная задача - пераход ад Э.м. да эканамічнай культуры, якая вызначае не толькі веданне, але і паводзіны людзей у практычнай дзейнасці ў адпаведнасці з эканамічнымі законамі.

**ЭКАНАМІЧНАЯ РЭФОРМА** (Экономическая реформа) - істотнае па свайму значэнню і выніках пераўтварэнне, змяненне, перабудова гаспадарчага механізму. Яна можа распаўсюджвацца на ўвесь гаспадарчы механізм або закранаць асобныя сферы гаспадарчага жыцця (народнай гаспадаркі), напрыклад, рэформы арганізацыі кіравання прамысловасці, грашовая, падатковая, крэдытная і інш.

Цяпер у нашай дзяржаве праводзіцца кардынальная рэформа кіравання эканомікай. Яна носіць усеабдымны характар, ахоплівае ўсе ўзроўні ад вышэйстаячага (Дзяржплан, Мінфін, банкаўская сістэма, Дзяржкампрацы і інш.) да сярэдняга звяна і заканчваецца непасрэдна прадпрыемствам. Э.р. азначае: правядзенне серыі рэформ - сістэм цэнаўтварэння, банкаўскай, крэдытнафінансавай, падатковай, аплаты працы, сацыяльнага забеспячэння; пераход ад развёрсткі сродкаў вытворчасці

да аптовага гандлю імі; карэнныя змены ў знешнім гандлі і знешнеэканамічнай дзейнасці, у развіцці інтэграцыі. У канчатковым выніку рэалізацыя гэтых рэформ накіравана на аздараўленне эканомікі, развіццё ініцыятывы, дзелавітасці, прадпрымальнасці і зацікаўленасці калектыву і кожнага работніка ў канчатковых выніках іх дзейнасці. Э.р. суправаджаецца юрыдычным афармленнем - прыняццем адпаведных нарматыўных прававых актаў, законаў, пастаноў, інструкцый аб яе правядзенні.

**ЭКАНАМІЧНАЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ** (Экономическая эффективность) - суадносіны паміж вынікамі вытворчасці і затратамі працы і сродкамі вытворчасці на іх дасягненне. Распазнаюць: 1) эканамічную эфектыўнасць вытворчасці; 2) эканамічную эфектыўнасць капітальных укладанняў; 3) эканамічную эфектыўнасць новай тэхнікі.

*Э.э. вытворчасці* - яе рэзультатыўнасць, суадносіны вынікаў вытворчай дзейнасці і затрачаных на іх дасягненне працоўных і матэрыяльных рэсурсаў. Сутнасць працэсу павышэння Э.э. вытворчасці заключаецца ў павелічэнні эканамічных вынікаў на адзінку затрат.

Для ацэнкі ўзроўню Э.э. вытворчасці выкарыстоўваецца сістэма абагульняючых і дыферэнцыраваных паказчыкаў. Абагульняючыя (прадукцыйнасць грамадскай працы, каэфіцыент абсалютнай эфектыўнасці, рэнтабельнасць вытворчасці, затраты на адзін рубель таварнай прадукцыі і інш.) характарызуюць эфектыўнасць выкарыстання ўсіх або некалькіх відаў рэсурсаў. Дыферэнцыраваныя паказчыкі (прадукцыйнасць працы, фондааддача і матэрыялаёмістасць вытворчасці) адлюстроўваюць ступень эфектыўнасці выкарыстання асобных відаў рэсурсаў. Грамадства аднолькава зацікаўлена ў павышэнні эфектыўнасці выкарыстання ўсіх відаў затрат і рэсурсаў, таму крытэрыем Э.э. вытворчасці з'яўляецца рост прадукцыйнасці працы, або эканомія супольнай грамадскай працы.

*Э.э. капітальных укладанняў* -- суадносіны затрат грамадства на аднаўленне і пашырэнне асноўных фондаў і вынікаў, якія ад гэтага атрымліваюцца. Канчатко-

вы вынік капітальных укладанняў -- прырост прадукцыі і паслуг, а ў маштабе грамадства - прырост нацыянальнага даходу. Адрозніваюць: абсалютную (агульную) і параўнальную эфектыўнасць капітальных укладанняў. Паказчык абсалютнай эфектыўнасці капітальных укладанняў уяўляе сабой адносіны прыросту чыстай прадукцыі да капітальных укладанняў, якія гэты прырост выклікалі. Параўнальная Э.э. капітальных укладанняў ужываецца для выбару лепшага з магчымых варыянтаў. У яе аснове ляжыць супастаўленне розніцы капітальных укладанняў і розніцы бягучых затрат па варыянтах. Лепшым з'яўляецца варыянт, дадатковыя капітальныя ўкладанні па якім акупяцца за кошт эканоміі ад зніжэння сабекошту за найбольш кароткі час, які не перавышае ўстаноўленага нарматыўнага часу.

Варыянты могуць параўноўвацца і па велічыні прыведзеных затрат.

*Э.э. новай тэхнікі* - суадносіны затрат грамадскай працы на вытворчасць і ўкараненне новай тэхнікі і атрыманых ад яе выкарыстання эканамічных вынікаў. Затраты на вытворчасць новай тэхнікі зводзяцца ў асноўным да капітальных укладанняў для гэтай мэты, а вынік - да павелічэння аб'ёму прадукцыі, яе патаннення, павышэння якасці і росту прадукцыйнасці працы. Э.э. новай тэхнікі вызначаецца тымі ж метадамі, што і Э.э. капітальных укладанняў.

**ЭКАНАМІЧНЫ ПРАГРЭС** (Экономический прогресс) - працэс пастyпальнага развіцця грамадскай вытворчасці, які характарызуецца ўстойлівым эканамічным ростам і павышэннем эфектыўнасці вытворчасці, атрыманнем большых вынікаў пры меншых затратах.

Вузлавымі момантамі Э.п. выступаюць пераходы ад аднаго гістарычнага спосабу вытворчасці да другога. Разам з тым Э.п. мае месца ў рамках кожнага дадзенага спосабу вытворчасці не толькі ў форме колькасных змяненняў, але і ў выглядзе пэўных якасных зрухаў.

Вынікам Э.п. з'яўляецца нацыянальнае багацце, якое ў ходзе расшыранага ўзнаўлення не толькі расце, але і пастаянна абнаўляецца і тым самым становіцца

передумовай Э.п. Адзін з магістральных напрамкаў Э.п. -- усямернае выкарыстанне эканамічнага патэнцыялу, яго пастаяннае нарошчванне і ўдасканальванне.

Для ацэнкі Э.п. выкарыстоўваецца сістэма ўзаемазвязаных крытэрыяў. Асноватворным з'яўляецца ўзровень прадукцыйных сіл, які разам са ступенню развіцця падзелу і кааперацыі працы выяўляе патэнцыяльныя магчымасці Э.п. Вынікі Э.п. выражаюцца ў павышэнні фактычнай эфектыўнасці вытворчасці, росце велічыні прыбавачнага прадукту, павышэнні ўзроўню жыцця і развіцці асобы, разнастайнасці яе здольнасцей і патрэб.

Э.п. непарыўна звязаны з сацыяльным прагрэсам і складае яго аснову.

**ЭКАНАМІЧНЫЯ ІНТАРЭСЫ** (Экономические интересы) --матэрыяльныя матывы, стымулы гаспадарчай дзейнасці людзей, абумоўленыя іх месцам у сістэме адносін уласнасці і грамадскага падзелу працы, а таксама ўласцівымі ім патрэбамі. У інтарэсах выяўляюцца эканамічныя адносіны грамадства. Усвядомленыя інтарэсы з'яўляюцца матывамі, стымуламі дзейнасці людзей, магутным рухавіком эканамічнага прагрэсу. Як вядома, сэнс перабудовы заключаецца ва ўліку інтарэсаў, ва ўздзеянні на інтарэсы, у кіраванні імі і з дапамогай іх. Іменна інтарэсы, а не страх ці прымус забяспечваюць эфектыўнае ўцягненне ў рэчышча працоўнага спосабу жыцця, добрасумленныя і адказныя адносіны да працы кожнага члена грамадства ў адпаведнасці з яго здольнасцямі і тым самым гарантуюць высокі ўзровень жыцця і сацыяльны статут працоўнага. Э.і. маюць вельмі складаную структуру. У грамадстве кожны чалавек выступае як яго член і адначасова як член калектыву, у якім працуе, і як асоба. Таму і яго інтарэсы ў эканамічнай дзейнасці розныя і супярэчлівыя. Але тут справу можна паставіць так, каб кожны член грамадства, задавальняючы свае асабістыя інтарэсы, рэалізаваў інтарэсы калектыву, рэгіёна і ўсяго грамадства. Такую магчымасць і дае гаспадарчы разлік, які арганізацыйна-эканамічна забяспечвае зацікаўленасць працоўнага ладу жыцця, рэальную свабоду асобы ў сферы эканомікі,

стварае і пашырае матэрыяльныя і духоўныя ўмовы творчага ўдзелу людзей у ствральнай працы. Толькі ў такім адзінстве, калі інтарэсы грамадства і асобы не проціпастаўляюцца, асабістае набывае грамадскую значнасць: працаўнік узнаўляецца і як асоба, і як гаспадар, забяспечваецца яго свабодная жыццядзейнасць як самамэта развіцця грамадства.

**ЭКАНАМІЧНЫЯ КАТЭГОРЫІ** (Экономические категории) -- тэарэтычныя выражэнні абстракцыі грамадскіх адносін вытворчасці. Дзякуючы навуковай абстракцыі мы ачышчаем нашы ўяўленні аб вывучаемых працэсах ад выпадковага, адзінкавага і выдзяляем у іх трывалае, устойлівае, тыповае, або, інакш, улоўліваем сутнасць з'яў, пераходзім ад сутнасці аднаго ўзроўню да сутнасці больш высокага ўзроўню, тэарэтычна вызначаем катэгорыі і законы навукі, якія адлюстроўваюць гэтыя сутнасці. Кожная Э.к. - гэта фундаментальнае навуковае паняцце, якое абстрактна, агульна характарызуе сутнасць якой-небудзь эканамічнай з'явы, яе істотныя бакі. Прыкладам такіх навуковых абстракцый могуць служыць катэгорыі цаны як грашовага выражэння вартасці, вытворчых фондаў як матэрыяльных і грашовых сродкаў, якія грамадства перадае прадпрыемствам для забеспячэння планамернай дзейнасці і абарачэння, і г.д. Э.к. носяць гістарычны характар і мяняюцца разам з тымі вытворчымі адносінамі, якія яны выражаюць. Пры гэтым палітычная эканомія выпрацоўвае новыя Э.к., якія адлюстроўваюць новыя вытворчыя адносіны, а таксама захоўвае ранейшыя, але ўжо з прынцыпова новым іх зместам. Такімі, напрыклад, з'яўляюцца катэгорыі таварнай вытворчасці з іх розным зместам у простай таварнай гаспадарцы, пры развітой таварнай гаспадарцы (тавар, вартасць, грошы, цана, заработная плата і інш.).

Э.к., кожная з якіх выражае сутнасць вызначанай групы эканамічных адносін, цесна ўзаемазвязаны паміж сабой. Сукупнасць Э.к. таго або іншага спосабу вытворчасці характарызуе яго ўнутраную структуру, у якой заўсёды будуць катэгорыі, якія адлюстроўваюць яго сувязь з папярэднім этапам развіцця і тым, які прыйдзе

яму на змену. Вылучэнне такіх агульных адносін і катэгорый дазваляе выявіць сувязь і паслядоўнасць у развіцці чалавечага грамадства, найбольш устойлівыя аб'ектыўныя залежнасці і ўзаемасувязі ў эканамічных працэсах і фармуляваць эканамічныя законы. Іх вылучэнне і свядомае выкарыстанне -- важнейшая ўмова навуковага кіравання развіццём грамадства.

**ЭКАНАМІЧНЫЯ МЕТАДЫ КІРАВАННЯ** (Экономические методы управления) - сукупнасць спосабаў рацыянальнага выкарыстання эканамічных законаў у гаспадарчай практыцы. Праз Э.м.к. рэалізуецца змест кіраўніцкай дзейнасці, вырашаюцца пастаўленыя перад аб'ектам кіравання задачы па рэалізацыі выбранай (устаноўленай) мэты. Складанасць задач, якія вырашаюцца любым аб'ектам, вызначае разнастайнасць метадаў, што выкарыстоўваюцца для рэгулявання дзейнасці аб'ектаў. На практыцы, як правіла, адначасова выкарыстоўваецца некалькі розных метадаў, якія арганічна дапаўняюць адзін аднаго. Суб'ект кіравання ўздзейнічае на яго аб'ект шляхам стварэння і змянення эканамічнай сітуацыі, якая і вызначае функцыяніраванне аб'екта (напрыклад, вызначэнне працэнтаў за крэдыт, нарматываў адлічэнняў ад прыбытку).

Э.м.к. павінны забяспечваць узмацненне зацікаўленасці калектыву і кожнага асобнага работніка ў павышэнні эфектыўнасці вытворчасці, а таксама ўзгадненне інтарэсаў грамадства наогул, калектыву і кожнага асобнага работніка. Такім чынам, Э.м.к. базіруюцца на ўліку і ўзаемасувязі агульнанародных, калектыўных і індывідуальных інтарэсаў. Вызначальным фактарам эканамічнага развіцця з'яўляюцца агульнанародныя інтарэсы. Улік разнастайных інтарэсаў, узгадненне інтарэсаў розных сацыяльных груп і кожнага работніка з агульнанароднымі, увязка дзяржаўных, галіновых і мясцовых (тэрытарыяльных) інтарэсаў -- найбольш складаныя кіраўніцкія задачы, якія можна вырашыць з дапамогай Э.м.к. Па меры развіцця асобы, калектываў і грамадства могуць узнікаць супярэчнасці паміж грамадскімі, калектыўнымі і асабістымі інтарэсамі, што абумоўлівае неабходнасць удаскана-

лення Э.м.к., змяненне суадносін паміж імі.

Э.м.к. у адрозненне ад адміністрацыйных уздзейнічаюць на аб'ект, якім кіруюць, не непасрэдна, а ўскосна, праз складаны механізм эканамічных адносін. Э.м.к. садзейнічаюць развіццю ініцыятывы працоўных калектываў і асобных работнікаў, паколькі прадастаўляюць калектывам дастатковую самастойнасць пры адначасовай поўнай адказнасці за прынятыя рашэнні і іх вынікі, вызваляюць адпаведныя органы ад неабходнасці штодзённага кантролю за дзейнасцю гэтых калектываў. Да Э.м.к. адносяцца гаспадарчы разлік, планаванне, цэнаўтварэнне, фінансаванне, крэдытаванне і стымуляванне, а таксама эканамічныя нормы і нарматывы.

**ЭКАНАМІЧНЫЯ РЫЧАГІ І СТЫМУЛЫ** (Экономические рычаги и стимулы) - эканамічныя катэгорыі, якія выкарыстоўваюцца ў якасці інструментаў планавага кіравання народнай гаспадаркай. Да іх адносяцца гаспадарчы разлік, прыбытак, сабекошт прадукцыі, цана, крэдыт, фонды эканамічнага стымулявання і інш. Яны аб'яднаны ў адзіную сістэму і заснаваны на выкарыстанні прынцыпу матэрыяльнай зацікаўленасці і матэрыяльнай адказнасці.

Э.р. і с. складаюць неабходны і абавязковы элемент дзяржаўнага кіраўніцтва эканомікай. Іх выкарыстанне эфектыўнае, калі яны прымяняюцца не толькі асобна, але і ва ўсёй сукупнасці, з улікам існуючых паміж імі сувязей і залежнасцей. Шматбаковасць, разнастайнасць выкарыстання Э.р. і с. асабліва поўна раскрываюцца пры арганізацыі гаспадарча-разліковых адносін. З іх дапамогай выкарыстоўваюцца многія рычагі і стымулы развіцця вытворчасці і павышэння яе эфектыўнасці. Праз Э.р.і с. да прадпрыемстваў даводзяцца заданні па выпрабу прадукцыі і нормах затрат, аказваецца ўздзеянне на эканамічныя інтарэсы вытворчых калектываў і асобных работнікаў у дасягненні мэт, пастаўленых грамадствам.

Э.р. і с. развіваюцца і ўдасканальваюцца разам з усёй сістэмай планавага кіравання народнай гаспадаркай ў залежнасці ад аб'ектыўных умоў і задач.

**ЭКАНАМІЧНЫЯ РЭСУРСЫ** (Экономические ресурсы) - сродкі працы, прадметы працы, прадметы спажывання, вынікі навукова-тэхнічных работ (канструкцыі, праекты, распрацоўкі), а таксама рабочая сіла - тыя, хто ўдзельнічае або можа ўдзельнічаць у грамадскай вытворчасці, гэта значыць у вытворчасці, размеркаванні, абмене і спажыванні. Адрозніваюць наступныя Э.р.: вытворчасці - вытворчыя рэсурсы, якія прымаюць формы вытворчых фондаў; абарачэння - рэсурсы, якія выступаюць у форме фондаў абарачэння; спажывання - рэсурсы, якія ўтвараюць фонд спажывання нацыянальнага даходу. У практычнай дзейнасці вылучаюць таксама рэсурсы матэрыяльныя, прыродныя, працоўныя, фінансавыя і да т.п. Акрамя таго, распазнаюць узнаўляльныя (прадукцыя, рабочая сіла пэўнай прафесіі і кваліфікацыі і г.д.) і неўзнаўляльныя рэсурсы (напр., запасы карысных выкапняў).

**ЭКАНАМІЧНЫЯ СУПЯРЭЧНАСЦІ** (Экономические противоречия) - узаемадзеянне процілеглых бакоў, якія ўзаемна выключаюць адзін аднаго, што ўнутрана ўласцівы сістэме вытворчых адносін і спосабу вытворчасці наогул і якія разам з тым знаходзяцца ва ўнутраным адзінстве і ўзаемапранікненні, служаць крыніцай самаруху і развіцця эканамічнага жыцця грамадства. Э.с. аб'ектыўна ўласцівы не толькі спосабу вытворчасці, але і кожнаму эканамічнаму закону, катэгорыі.

Э.с. з'яўляюцца выражэннем закону адзінства і барацьбы процілегласцей у эканамічным жыцці грамадства. Яны рэалізуюцца ў раздваенні адзінага цэлага на процілеглыя бакі, ва ўзаемасувязях, узаемадзеянні і барацьбе гэтых процілеглых бакоў.

Кожнай грамадска-эканамічнай фармацыі аб'ектыўна ўласціва спецыфічная сістэма супярэчнасцей, якая адэкватна сістэме вытворчых адносін і узроўню развіцця прадукцыйных сіл. Вылучаюць глыбінныя эканамічныя супярэчнасці, уласцівыя асноўным вытворчым адносінам, і неасноўныя, якія адлюстроўваюць больш павярхоўныя слаі адносін. Э.с. можна класіфікаваць і па фазах узнаўлення, гэта значыць су-

пярэчнасці непасрэднай вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання.

Унутранай крыніцай развіцця грамадства таксама з'яўляюцца супярэчнасці. Вырашаюцца яны ў працэсе свядомай дзейнасці па ўдасканаленню сістэмы вытворчых адносін і няўхільнаму развіццю прадукцыйных сіл, якая мае на ўвазе пастаяннае ўдасканаленне форм уласнасці, арганізацыйна-эканамічных адносін, форм і метадаў гаспадарання.

**ЭКАНОМІКА** (Экономика) -- 1) сукупнасць вытворчых адносін гістарычна вызначанага спосабу вытворчасці, эканамічны базіс грамадства; 2) народная гаспадарка краіны, якая ўключае адпаведныя галіны і віды вытворчасці або іх частку; 3) галіна навукі, якая вывучае функцыянальныя і галіновыя аспекты эканамічных адносін.

*Э. як сукупнасць вытворчых адносін.* У кожным грамадстве вытворчыя (эканамічныя) адносіны ўтвараюць цэласную сістэму, з абумоўленымі ёю мэтай развіцця вытворчасці, формамі яе арганізацыі і метадамі гаспадарання, якая і характарызуе Э. дадзенага гістарычна вызначанага спосабу вытворчасці.

*Э. як народная гаспадарка.* Народная гаспадарка краіны, з'яўляючыся прадуктам гістарычнага развіцця, фарміруецца ў выніку паглыблення грамадскага падзелу працы і акгрaмаджання вытворчасці. Яна ўяўляе сабой узаемазвязаную сістэму міжгаліновых комплексаў, галін і відаў вытворчасці. У адпаведнасці з гэтым Э. той ці іншай краіны ўключае ў сябе галіны матэрыяльнай вытворчасці (прамысловасць, сельскую гаспадарку, будаўніцтва, транспарт і інш.) і галіны невытворчай сферы, або нематэрыяльнай вытворчасці (асвета, ахова здароўя, культура і інш.).

*Э. як галіна навукі.* У склад Э. як навукі ўваходзіць цэлая сістэма навуковых дысцыплін, якія ўтвараюць састаўную частку групы грамадскіх навук. Тэарэтычнай і метадалагічнай асновай эканамічных навук, іх стрыжнем служыць палітычная эканомія. У сістэму эканамічных навук уваходзяць навукі, якія вывучаюць функцыянальныя аспекты развіцця Э. (фінансы і крэ-

дыт, цэнаўтварэнне, эканоміка працы, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, планаванне эканамічнага і сацыяльнага развіцця і інш.) або яе галіновыя асаблівасці (эканоміка прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту і інш.).

**ЭКАНОМІКА-МАТЭМАТЫЧНЫЯ МЕТАДЫ** (Экономико-математические методы) - комплекс эканамічных і матэматычных дысцыплін (тэрмін увёў акадэмік В.С.Немчынаў), якія аб'ядноўвае: 1) эканоміка-статыстычныя метады (эканамічная статыстыка, матэматычная статыстыка); 2) эканаметрыю - напрамак у прымяненні матэматычных метадаў у эканамічных даследаваннях з мэтай колькаснага апісання заканамернасці і ўзаемасувязі эканамічных аб'ектаў і працэсаў на аснове тэарэтычных уяўленняў аб іх важнейшых, вызначальных фактарах з дапамогай матэматычных мадэляў і статыстычных метадаў апрацоўкі даных; 3) даследаванне аперацый (метады прыняцця аптымальных рашэнняў); 4) эканамічную кібернетыку, якая займаецца сістэмным аналізам эканомікі, тэарэтычнымі і практычнымі пытаннямі кіравання ў эканамічных сістэмах (эканамічная інфармацыя).

**ЭМІСІЯ** (Эмиссия) -- выпуск грошай, каштоўных папер у абарачэнне. Эмісійным цэнтрам у Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца Нацыянальны банк, якому належыць манапольнае права выпуску ў абарачэнне на тэрыторыі рэспублікі банкаўскіх і казначэйскіх білетаў, металічнай манеты. Каштоўныя паперы могуць выпускаць банкі, фінансавыя інстытуты, гаспадарчыя органы, дзяржава.

Памер Э. грошай вызначаецца патрэбамі гаспадаркі і разлічваецца на аснове даных аб усіх паступленнях наяўных грошай і іх выдачах праз касы банкаў. Пры недастатковасці паступленняў наяўнымі грашыма для забеспячэння плацяжоў можа прадугледжвацца выпуск дадатковых грошай. Ва ўмовах бюджэтнага дэфіцыту Э. можа выкарыстоўвацца для яго пакрыцця, што прыводзіць да інфляцыі (гл.*Інфляцыя*).

Павелічэнне (ці памяншэнне) колькасці грошай у абарачэнні ў тэрытарыяльным разрэзе праводзіцца з

дапамогай рэзервовых фондаў банкаўскіх, казначэйскіх білетаў і разменнай манеты. Рэзервовыя фонды ў кожнай буйной установе банка забяспечваюць апературнасць Э., своечасовасць папаўнення абароту наяўнымі грашыма. Грошы ў рэзервовых фондах знаходзяцца па-за сферай абарачэння, і толькі пры Э. адбываецца перадача іх з гэтых фондаў у гаспадарчы абарот праз абаротную касу банкаў (прыходныя, расходныя, разменныя касы і да т.п.). Наяўнасць рэзервовых фондаў ва ўстановах банка дазваляе таксама значна скараціць перавозкі грошай з адной тэрыторыі на другую, з аднаго банка ў другі, знізіць расходы на арганізацыю наяўна-грашовага абароту ў краіне. Парадак выпуску каштоўных папер (акцый, аблігацый, вэксаляў, сертыфікатаў, чэкаў і інш.) мае свае асаблівасці і адрозніваецца ад Э. грошай.

**ЭРГАНОМІКА** (Эргономика) -- галіна навукі, якая вывучае чалавека (або групу людзей) і яго (іх) дзейнасць ва ўмовах сучаснай вытворчасці з мэтай аптымізацыі прылад, умоў і працэсаў працы. Асноўны аб'ект даследавання Э. - сістэма "чалавек--машына". Метад даследавання - сістэмны падыход. Прадметам Э. з'яўляецца адзін функцыянальны комплекс: аператар--машына (выраб) - вытворчае асяроддзе. Планаванне і ўкараненне ў вытворчасць указанага комплексу засноўваецца на эрганамічных патрабаваннях: біяфізічным - машына, органы кіравання і аператар павінны адпавядаць адзін аднаму ў сэнсе патрэбнай сілы, магутнасці, хуткасці, дакладнасці і тэмпу кіруючых дзеянняў; антрапаметрычным - стварэнне рацыянальна арганізаванага рабочага месца з улікам антрапалагічных асаблівасцей чалавека; тэхніка-эстэтычным -- патрабаванні, якія забяспечваюць прывабнасць машыны (форма, афарбоўка і да т.п.) і пры рабо[illegible] на ёй задавальненне працай.

Эрганамічныя паказчыкі, якія адпавядаюць гэтым патрабаванням, характарызуюць зручнасць і бяспеку эксплуатацыі машыны (вырабу).

Укараненне ў вытворчасць патрабаванняў і дасягненняў Э. дае магчымасць стварыць умовы працы, якія

адпавядаюць павышэнню яе прадукцыйнасці, зберажэнню здароўя працаўніка і яго працаздольнасці.

**ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ГРАМАДСКАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ** (Эффективность общественного производства) - яго рэзультатыўнасць, вызначаная суадносінамі створанага нацыянальнага даходу ці канчатковага прадукту да сукупных затрат (рэсурсаў). Павышэнне Э.г. в. раўназначна апераджальнаму росту нацыянальнага даходу або канчатковых вынікаў у параўнанні са зробленымі затратамі.

У грамадстве вышэйшым крытэрыем Э.г.в. выступае рэалізацыя асноўнага эканамічнага закону, гэта значыць ступень задавальнення матэрыяльных і духоўных патрэб з меншымі затратамі і ў больш кароткія тэрміны. Крытэрый Э.г.в. дае ёй якасную характарыстыку, зыходзячы з пануючых вытворчых адносін і мэты грамадскай вытворчасці. Колькасную ацэнку Э.г.в. выражаюць яе паказчыкі. Да ліку важнейшых паказчыкаў Э.г.в. адносяцца прадукцыйнасць працы, матэрыялаёмістасць, фондааддача і павышэнне якасці прадукцыі.

Адрозніваюць эканамічную (вытворча-эканамічную), сацыяльна-эканамічную, гаспадарча-разліковую і ўласна сацыяльную эфектыўнасць.

Э.г.в. у сучасных умовах змяняецца супярэчліва. Прадукцыйнасць працы павышаецца, аднак тэмпы росту прадукцыйнасці грамадскай працы невысокія і яе рост дасягаецца толькі на 50% за кошт навукова-тэхнічнага прагрэсу. Матэрыялаёмістасць зніжаецца, але яе зніжэнне не перавышае 0,5% штогод. За кошт эканоміі матэрыяльных рэсурсаў задаволена толькі 50% прыросту патрэб у іх замест запланаваных 70-75%. Пакуль што не расце фондааддача. Павольна павышаецца і якасць прадукцыі.

Два комплексныя напрамкі (фактары) павінны забяспечваць павышэнне Э.г.в.: інтэнсіфікацыя вытворчасці на аснове паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу і правядзенне радыкальнай эканамічнай рэформы, удасканаленне ўсёй сістэмы эканамічных адносін.

## Я

**ЯКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ** (Качество продукции) -

сукупнасць уласцівасцей прадукцыі, якія абумоўліваюць яе прыдатнасць, задавальняюць пэўныя патрэбы ў адпаведнасці з яе прызначэннем. Эканамічны бок Я.п., які дазваляе вызначыць яе карыснасць і эфектыўнасць спажывання, выяўляецца толькі пры яе спажыванні. Дзякуючы яе спажывецкай вартасці адбываецца працэс абмену. Але карысным тавар можа быць у рознай ступені ў залежнасці ад яго ўласцівасцей і ўмоў спажывання. Гэта ступень яго карыснасці ў адносінах да патрэб або мера яго спажывецкай вартасці дае ўяўленне аб Я.п. Значыць, спажывецкая вартасць складае аснову Я.п., а яна, у сваю чаргу, адлюстроўвае ўзровень спажывецкай вартасці, гэта значыць колькаснае задавальненне патрэб у пэўным відзе вырабу.

Сучасная навука і практыка выпрацавалі сістэму колькаснай ацэнкі ўласцівасцей, якія складаюць Я.п. Для гэтага прымяняюцца наступныя паказчыкі: адзінкавыя, якія характарызуюць адну з уласцівасцей прадукцыі (магутнасць, хуткасць, надзейнасць, даўгавечнасць і інш.); абагульненыя, якія адлюстроўваюць усю сукупнасць уласцівасцей прадукцыі; інтэгральныя, якія паказваюць суадносіны сумарнага карыснага эфекту ад эксплуатацыі (спажывання) прадукцыі з агульнай велічынёй затрат на яе стварэнне і спажыванне.

Прыведзеная сістэма паказчыкаў выкарыстоўваецца для вызначэння ўзроўню Я.п. Апошні ўяўляе сабой адносную характарыстыку яе якасці, заснаваную на параўнанні сукупнасці паказчыкаў дадзенай прадукцыі з адпаведнай сукупнасцю базавых паказчыкаў. Адрозніваюць узровень Я.п. і тэхнічны яе ўзровень.

Узровень Я.п. характарызуецца сукупнасцю ўсіх тэхнічных, эрганамічных, эстэтычных, патэнтна-прававых і іншых паказчыкаў, а тэхнічны ўзровень -- пераважна тэхнічнымі паказчыкамі. Таму ўзровень Я.п. з'яўляецца больш агульным паказчыкам у параўнанні з тэхнічным узроўнем.

Павышэнне Я.п. садзейнічае не толькі павелічэнню аб'ёму яе вырабу, але і зберажэнню працоўных і матэрыяльных рэсурсаў, больш поўнаму задавальненню

патрэб грамадства. Гэта прадвызначыла на сучасным этапе развіцця эканомікі аб'ектыўную неабходнасць пастаноўкі праблемы якасці на ўзровень агульнадзяржаўнай эканамічнай задачы.

**ЯКАСЦЬ ПРАЦЫ РАБОТНІКАЎ АБО КАЛЕКТЫВУ** (Качество труда работников или коллектива) - сукупнасць уласцівасцей працэсу працоўнай дзейнасці, абумоўленых здольнасцю і імкненнем работніка (калектыву) выконваць пэўнае заданне ў адпаведнасці з вызначанымі патрабаваннямі.

Я.п.р.або к. залежыць ад яго складанасці, кваліфікацыі, навыкаў, псіхафізіялагічнага стану (здольнасцей работнікаў і іх адносін да працы); уплывае на якасць таксама колькасць прадукцыі, якая ствараецца і эксплуатуецца. Паказчык Я.п.р.або к. - колькасная характарыстыка ўласцівасцей працэсу працы і яе вынікаў, якія складаюць якасць: працэнт здачы прадукцыі з першага прад'яўлення, выхад прыгоднай або, наадварот, бракаванай прадукцыі; працэнт захавання параметраў, якія характарызуюць стан кіруемага працэсу; колькасць і значнасць працы; паказчыкі якасці вынікаў работы, якасці прадукцыі, якая ствараецца.

**ЯКАСЦЬ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ** (Качество экономического роста) - характарыстыка развіцця, заснаваная на выкарыстанні інтэнсіўных фактараў: навукова-тэхнічным прагрэсе, удасканаленні структуры вытворчасці, кіраванні і метадах гаспадарання, павышэнні якасці прадукцыі, актывізацыі чалавечага фактару.

Вядомы два напрамкі эканамічнага росту - экстэнсіўны і інтэнсіўны. Інтэнсіўны рост на аснове дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі выяўляецца ў павышэнні прадукцыйнасці працы, зніжэнні матэрыялаёмістасці, росце фондааддачы і павышэнні якасці прадукцыі.

У канцэпцыі сучаснага эканамічнага развіцця гаворка ідзе пра новую якасць росту. Новая Я.э.р. азначае: 1) апорнымі і рашаючымі крыніцамі эканамічнага росту ў цяперашніх умовах становяцца навукова-эканамічны прагрэс, рэканструкцыя, якасць, эфектыўнасць; 2) пастаўлена і вырашаецца задача пераходу ад частковай да

ўсебаковай інтэнсіфікацыі грамадскай вытворчасці, якая ахоплівае ўсе яе фактары і ўсе народнагаспадарчыя рэсурсы; 3) неабходны якасныя зрухі ў сацыяльнай сферы, удасканаленне грамадскіх адносін, правядзенне моцнай сацыяльнай палітыкі, якая б сцвярджала актыўную ролю чалавечага фактару; 4) сацыяльна-эканамічны рост заснаваны на глыбокіх структурных зрухах у эканоміцы, новых метадах арганізацыі, кіравання і гаспадарання, спалучэнні найбольш эфектыўных форм планавага кіравання народнай гаспадаркай з самастойнасцю і адказнасцю асноўных яе звёнаў - прадпрыемстваў, аб'яднанняў і г.д., павышэннем дзейснасці гаспадарчага разліку.

## РУССКО-БЕЛОРУССКИЙ СЛОВАРЬ ПРИВЕДЕННЫХ ЭКОНОМИЧЕСКИЙ ТЕРМИНОВ

### А

Автоматизация производства--аўтаматызацыя вытворчасці

Автоматизированная система управления--аўтаматызаваная сістэма кіравання

Аграрная политика--аграрная палітыка

Аграрно-промышленная интеграция--аграрна-прамысловая інтэграцыя

Аграрно-промышленный комплекс--аграрна-прамыслови комплекс

Аграрные отношения--аграрныя адносіны

Акциз--акцыз

Акционерные общества--акцыянерныя таварыствы

Амортизация--амартызацыя

Анализ хозяйственной деятельности--аналіз гаспадарчай дзейнасці

Аренда--арэнда

Арендная плата--арэндная плата

Арендный подряд--арэндны падрад

Ассоциация предприятий--асацыяцыя прадпрыемстваў

Аттестация кадров--атэстацыя кадраў

Аттестация рабочих мест--атэстацыя рабочых месц

### Б

База данных--база даных

Баланс бухгалтерский--баланс бухгалтарскі

Баланс денежных доходов и расходов населения--баланс грашовых даходаў і расходаў насельніцтва

Баланс межотраслевой--баланс міжгаліновы

Баланс народного хозяйства--баланс народнай гас-

падаркі

Баланс национального дохода--баланс нацыянальнага даходу

Баланс общественного продукта--баланс грамадскага прадукту

Баланс основных фондов--баланс асноўных фондаў

Баланс производственных мощностей--баланс вытворчых магутнасцей

Балансовый метод планирования--балансавы метад планавання

Баланс трудовых ресурсов--баланс працоўных рэсурсаў

Балансы материальные--балансы матэрыяльныя

Банк данных--банк даных

Банки--банкі

Банковская система--банкаўская сістэма

Благосостояние--дабрабыт

Брак производственный--брак вытворчы

Бригада производственная-брыгада вытворчая

Бригадный хозрасчет--брыгадны гаспадарчы разлік

Бюджет государственный--бюджэт дзяржаўны

Бюджетная система--бюджэтная сістэма

## В

Валовой доход--валавы даход

Валовой национальный продукт--валавы нацыянальны прадукт

Валюта--валюта

Ведомственность--ведамаснасць

Внешний долг государственный--знешні доўг дзяржаўны

Внешняя торговля--знешні гандаль

Внутренний рынок--унутраны рынак

Воспроизводство общественное--узнаўленне грамадскае

Выработка--выпрацоўка

Г

Госзаказ--дзяржзаказ

Гуманизация производства--гуманізацыя вытворчасці

Д

Денежная система--грашовая сістэма

Денежный контроль--грашовы кантроль

Деньги--грошы

Дерево целей--дрэва мэт

Дефицит--дэфіцыт

Дисбаланс--дысбаланс

Дисциплина--дысцыпліна

Договор поставки--дагавор пастаўкі

Договор хозяйственный--дагавор гаспадарчы

Дотация--датацыя

Доходы предприятия--даходы прадпрыемства

Е

Единовременные затраты--аднаразовыя затраты

З

Заемные оборотные средства--пазыковыя абаротныя сродкі

Закон возвышения потребностей--закон узвышэння патрэбнасцей

Закон денежного обращения--закон грашовага абарачэння

Закон перемены труда--закон перамены працы

Закон соответствия производственных отношений характеру и уровню развития производительных сил--закон адпаведнасці вытворчых адносін характару і ўзроўню развіцця прадукцыйных сіл

Закон спроса и предложения--закон попыту і прапанавання

Закон экономии времени--закон эканоміі часу

Законы экономические--законы эканамічныя

Закупкі сельскохозяйственной продукции--закупкі сельскагаспадарчай прадукцыі

Запасы производственные--запасы вытворчыя

Заработная плата--заработная плата

Золотой стандарт--залаты стандарт

## И

Издержки обращения--выдаткі абарачэння

Издержки общества--выдаткі грамадства

Издержки предприятия--выдаткі прадпрыемства

Износ основных фондов--знос асноўных фондаў

Индекс--індэкс

Индивидуальная трудовая деятельность--індывідуальная працоўная дзейнасць

Интеграция--інтэграцыя

Интенсивность труда--інтэнсіўнасць працы

Интенсификация производства--інтэнсіфікацыя вытворчасці

Интенсификация сельского хозяйства--інтэнсіфікацыя сельскай гаспадаркі

Интернационализация производительных сил--інтэрнацыяналізацыя прадукцыйных сіл

Инфляция--інфляцыя

Информатика--інфарматыка

Информация--інфармацыя

Инфраструктура--інфраструктура

## К

Кадровая политика--кадравая палітыка

Казначейство--казначэйства

Календарное планирование--каляндарнае планаванне

Калькулирование--калькуляванне

Калькуляция--калькуляцыя

Капитальные вложения, или инвестиции--капітальныя ўкладанні, або інвестыцыі

Качество продукции--якасць прадукцыі

Качество труда работников или коллектива--якасць працы работнікаў або калектыву

Качество экономического роста--якасць эканамічнага росту

Кибернетика--кібернетыка

Коллектив производственный, трудовой--калектыў вытворчы, працоўны

Коллективизм--калектывізм

Коллективный договор--калектыўны дагавор

Колхоз--калгас

Комбинирование производства--камбінаванне вытворчасці

Конверсия--канверсія

Конкуренция--канкурэнцыя

Консорциум--кансорцыум

Концентрация производства--канцэнтрацыя вытворчасці

Кооператив--кааператыў

Кооперация труда--кааперацыя працы

Кооперирование производства--кааператыванне вытворчасці

Кредит--крэдыт

Кредитная система--крэдытная сістэма

Критерий общественно-экономического прогресса--крытэрый грамадска-эканамічнага прагрэсу

Критерий оптимальности--крытэрый аптымальнасці

## Л

Лимиты--ліміты

Лицензия--ліцэнзія

Лицо юридическое--асоба юрыдычная

## М

Материалоемкость--матэрыялаёмістасць

Материально-техническое снабжение--матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне

Материальные затраты--матэрыяльныя затраты

Международная торговля--міжнародны гандаль

Международный кредит--міжнародны крэдыт

Межхозяйственные предприятия--міжгаспадарчыя прадпрыемствы

Местное самоуправление--мясцовае самакіраванне

Методы управления--метады кіравання

Механизация производства--механізацыя вытворчасці

## Н

Накопление--накапленне

Налог за использование природных ресурсов--падатак за карыстанне прыроднымі рэсурсамі

Налог земельный--падатак зямельны

Налоги--падаткі

Налог на горючее--падатак на паліва

Налог на добавленную стоимость--падатак на дабаўленую вартасць

Налог на недвижимость--падатак на нерухомасць

Налог на экспорт и импорт--падатак на экспарт і імпарт

Налог подоходный с граждан--падатак падаходны з грамадзян

Налог с доходов и прибыли предприятий, объединений, организаций--падатак на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый

Налог транзитный--падатак транзітны

Народонаселение--народанасельніцтва

Научная организация труда, или НОТ--навуковая арганізацыя працы, або НАП

Научно-техническая политика--навукова-тэхнічная

палітыка

Научно-техническая революция, или НТР--навукова-тэхнічная рэвалюцыя, або НТР

Научно-технический потенциал--навукова-тэхнічны патэнцыял

Научно-технический прогресс, или НТП--навукова-тэхнічны прагрэс, або НТП

Национальное богатство--нацыянальнае багацце

Национальный доход--нацыянальны даход

Необходимый труд--неабходная праца

Непроизводительные расходы--непрадукцыйныя расходы

Новый мировой экономический порядок, или НМЭП--новы сусветны эканамічны парадак, або НСЭП

Нормативный метод учета--нарматыўны метад уліку

Нормативы экономические--нарматывы эканамічныя

Ноу-хау--ноу-хау

## О

Облигации государственных займов--аблігацыі дзяржаўных пазык

Обмен--абмен

Обновление основных фондов--узнаўленне асноўных фондаў

Обобществление производства--абагульненне вытворчасці

Оборотные средства--абаротныя сродкі

Оборотные фонды--абаротныя фонды

Образ жизни--лад жыцця

Общественные фонды потребления--грамадскія фонды спажывання

Общественный продукт--грамадскі прадукт

Оплата труда--аплата працы

Оптовая торговля средствами производства--аптовы гандаль сродкамі вытворчасці

Организационная структура управления--арганізацыйная структура кіравання

Органическое строение производства--арганічная будова вытворчасці

Орудия труда--прылады працы

Основные производственные фонды--асноўныя вытворчыя фонды

П

Платежеспособность--плацежаздольнасць

Платежный баланс--плацёжны баланс

Подряд коллективный--падрад калектыўны

Потребление--спажыванне

Правовое государство--прававая дзяржава

Предметы потребления--прадметы спажывання

Предметы труда--прадметы працы

Предприятие--прадпрыемства

Прибавочный труд--прыбавачная праца

Прибыль--прыбытак

Природные богатства--прыродныя багацці

Прогнозирование экономическое--прагназіраванне эканамічнае

Программирование--праграміраванне

Продукция--прадукцыя

Производительность труда--прадукцыйнасць працы

Производительные силы--прадукцыйныя сілы

Производительный труд--прадукцыйная праца

Производственная мощность--вытворчая магутнасць

Производственная программа--вытворчая праграма

Производственная сфера--вытворчая сфера

Производственные отношения--вытворчыя адносіны

Производственные фонды--вытворчыя фонды

Производственный цикл--вытворчы цыкл

Производство--вытворчасць

Пропорции общественного производства--прапорцыі грамадскай вытворчасці

Простое товарное производство--простая таварная вытворчасць

Противозатратный хозяйственный механизм--працізатратны гаспадарчы механізм

Проценты за кредит--працэнты за крэдыт

Прямые хозяйственные связи предприятий--прамыя гаспадарчыя сувязі прадпрыемстваў

## Р

Рабочее время--рабочы час

Разделение труда--падзел працы

Размещение производительных сил--размяшчэнне прадукцыйных сіл

Распределение--размеркаванне

Реализация общественного продукта--рэалізацыя грамадскага прадукту

Редукция труда--рэдукцыя працы

Резервы производственные--рэзервы вытворчыя

Рекламация--рэкламацыя

Рента--рэнта

Рентабельность производства--рэнтабельнасць вытворчасці

Рынок ценных бумаг--рынак каштоўных папер

## С

Самоокупаемость--самаакупнасць

Самостоятельность предприятий, или хозяйственная самостоятельность--самастойнасць прадпрыемстваў, або гаспадарчая самастойнасць

Самоуправление--самакіраванне

Самофинансирование--самафінансаванне

Сбалансированность народного хозяйства--збалансаванасць народнай гаспадаркі

Свободное время--вольны час

Себестоимость продукции--сабекошт прадукцыі

Система рыночного хозяйства--сістэма рыначнай гаспадаркі

Собственность граждан--уласнасць грамадзян

Собственность индивидуальная трудовая--уласнасць індывідуальная працоўная

Собственность коллективная--уласнасць калектыўная

Собственность общая--уласнасць агульная

Собственность совместных предприятий--уласнасць сумесных прадпрыемстваў

Совместные предприятия--сумесныя прадпрыемствы

Совокупный работник--сукупны працаўнік

Социальная эффективность--сацыяльная эфектыўнасць

Социальный прогресс--сацыяльны прагрэс

Специализация производства--спецыялізацыя вытворчасці

Способ производства--спосаб вытворчасці

Спрос и предложение--попыт і прапанаванне

Средства производства--сродкі вытворчасці

Ссудный фонд--пазыковы фонд

Стандартизация--стандартызацыя

Стимулирование--стымуляванне

Стоимость--вартасць

Страхование--страхаванне

Структурная политика--структурная палітыка

Субвенция--субвенцыя

**Т**

Текучесть рабочей силы--цякучасць рабочай сілы

Территориально-производственный комплекс, или ТПК--тэрытарыяльна-вытворчы комплекс, або ТВК

Технический уровень производства--тэхнічны ўзровень вытворчасці

Товар--тавар

Товарно-денежные отношения--таварна-грашовыя адносіны

Товарное обращение--таварнае абарачэнне

Товарное производство--таварная вытворчасць

Товары народного потребления--тавары народнага

спажывання

Торговая прибыль--гандлёвы прыбытак

Торговля--гандаль

Торговые посредники--гандлёвыя пасрэднікі

Трест--трэст

Труд--праца

Трудоёмкость продукции--працаёмкасць прадукцыі

## У

Управление народным хозяйством--кіраванне народнай гаспадаркай

Уравниловка--ураўнілаўка

Услуги--паслугі

Устав предприятия или объединения--статут прадпрыемства або аб'яднання

Уставный фонд--статутны фонд

Участие трудящихся в управлении производством--удзел працоўных у кіраванні вытворчасцю

Учет народнохозяйственный--улік народнагаспадарчы

## Ф

Финансовое оздоровление экономики--фінансавае аздараўленне эканомікі

Финансовое планирование--фінансавае планаванне

Финансово-кредитный механизм--фінансава-крэдытны механізм

Финансовый контроль--фінансавы кантроль

Финансовый рынок--фінансавы рынак

Финансы--фінансы

Финансы предприятий--фінансы прадпрыемстваў

Фонд возмещения--фонд кампенсацыі

Фондовооруженность труда--фондаўзброенасць працы

Фондоёмкость--фондаёмістасць

Фондоотдача--фондааддача

Фонды обращения--фонды абарачэння
Фонды экономического стимулирования, или ФЭС -- фонды эканамічнага стымулявання, або ФЭС
Функционально-стоимостный анализ--функцыянальна-вартасны аналіз

## Х

Хозрасчетная эффективность--гаспадарча-разліковая эфектыўнасць
Хозрасчетный доход--гаспадарча-разліковы даход
Хозяйственный механизм--гаспадарчы механізм
Хозяйственный расчет--гаспадарчы разлік

## Ц

Цена--цана
Централизация производства--цэнтралізацыя вытворчасці

## Ч

Человеческий фактор--чалавечы фактар

## Ш

Штраф--штраф

## Э

Экономика--эканоміка
Экономико-математические методы--эканоміка-матэматычныя метады
Экономическая реформа--эканамічная рэформа
Экономическая эффективность--эканамічная эфек-

тыўнасць

Экономические интересы--эканамічныя інтарэсы

Экономические категории--эканамічныя катэгорыі

Экономические методы управления--эканамічныя метады кіравання

Экономические противоречия--эканамічныя супярэчнасці

Экономические ресурсы--эканамічныя рэсурсы

Экономические рычаги и стимулы--эканамічныя рычагі і стымулы

Экономический прогресс--эканамічны прагрэс

Экономическое мышление--эканамічнае мысленне

Эмиссия--эмісія

Эргономика--эрганоміка

Эффективность общественного производства--эфектыўнасць грамадскай вытворчасці

Справочное издание

**Александрович** Яков Александрович, **Асмоловский** Валентин Васильевич, **Балдин** Игорь Валентинович и др.

Краткий экономический словарь.
Минск,БГЭУ
На белорусском языке

Справачнае выданне

**Александровіч** Якаў Александравіч, **Асмалоўскі** Валянцін Васільевіч, Балдзін Ігар Валянцінавіч і інш.

Кароткі эканамічны слоўнік

Рэдактары Л.П.Марозава, З.В.Міхнавец
Карэктар Н.Б.Гуліш

Падпісана ў друк 18.02.1993. Фармат 84×108/32. Папера аўсетная №2. Гарнітура Dutch. Аўсетная пячаць. Умоўн. друк.арк. 13,4. Умоўн. фарба-адбіт. 13,4. Ул.-выд.арк. 16,3. Тыраж 10 000 экз. Заказ 154.

Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт.
220672, Мінск, пр.Партызанскі, 26.

Тэкст набраны і апрацаваны на персанальных камп'ютэрах тыпу IBM PC у тэкставым працэсары "Лексікон". Вёрстка ажыццёўлена на настольным рэдакцыйна-выдавецкім комплексе, які пастаўлены фірмай 'Мірта".

Тыпаграфія выдавецтва "Беларускі Дом Друку".
220005, г.Мінск, пр.Ф.Скарыны, 79.

КАРОТКІ ЭКАНАМІЧНЫ СЛОЎНІК